Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”

А. А. Станкевіч, К. Л. Хазанава, А. М. Воінава

Абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны: этналінгвістычны аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2015

УДК 811.161.3’373:392.1:811.161.3’282.2(476.2)

Станкевіч, А. А.

Абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны: этналінгвістычны аналіз / А. А. Станкевіч, К. Л. Хазанава, А. М. Воінава / пад рэд. А. А. Станкевіч ; М-ва адукацыі РБ, Гом. дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. – 269 с.

ISBN 978-985-439-994-2

У манаграфіі на аснове матэрыялаў дыялекталагічнага архіва кафедры беларускай мовы ГДУ імя Ф. Скарыны, сабраных у час экспедыцый у розных раёнах Гомельскай вобласці, а таксама асобных фальклорна-этнаграфічных зборнікаў гэтага рэгіёну, апісваецца сямейна-абрадавая і каляндарна-абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны паводле лексіка-тэматычнай, семантычнай, матывацыйнай, слова-ўтваральнай, стылістычнай і генетычнай характарыстыкі. Вызначаюцца важнейшыя лексічныя парадыгмы абрадавых намінацый – агентыўная (назвы асоб), акцыянальная (найменні выконваемых дзеянняў) і рэчыўная (абазначэнні рытуальных прадметаў). Выяўляецца ўсходне-славянскі кантэкст абрадавых намінацый Гомельшчыны – прыводзяцца да іх шматлікія беларуска-рускія і беларуска-ўкраінскія паралексы.

Для вучоных, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, а таксама фалькларыстаў, гісторыкаў, этнографаў.

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук *В. С. Новак*;
кандыдат філалагічных навук *В. У. Авяр’янава*

Рэкамендавана да друку навукова-тэхнічным саветам установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”

ISBN 978-985-439-994-2

© Станкевіч А. А., Хазанава К. Л., Воінава А. М., 2015
© УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», 2015

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Змест

А. А. Станкевіч
Уводзіны
Канцэптасфера духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час …….. 6

1 Сямейна-абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны …….. 10
А. А. Станкевіч
1.1 Лексіка вясельнай абраднасці на Гомельшчыне …….. 10
1.1.1 Лексіка-тэматычная класіфікацыя назваў вясельнай абраднасці …….. 12
1.1.1.1 Акцыянальная парадыгма вясельнага абраду …… 12
Назвы абрадавых дзеянняў і рытуалаў перадшлюбнага этапу ……... 12
Лексіка, звязаная з абрадам сватання ў гаворках Гомельшчыны ……. 12
Назвы перадвясельнага вечара ў гаворках Гомельшчыны: тыпы структурна-семантычнай матывацыі ……... 18
Лексіка каравайнага абраду ў гаворках Гомельшчыны ……. 23
Назвы сімвалічных дзеянняў і актаў шлюбнага этапу ….. 30
Назвы паслявясельнага этапу шлюбнай абраднасці ў гаворках Гомельшчыны ……. 40
1.1.1.2 Лексічная парадыгма агентыўных намінацый у вясельнай абраднасці Гомельшчыны ……... 46
1.1.1.3 Прадметны код вясельнай абраднасці і яго моўнае выражэнне ў гаворках Гомельшчыны ……. 53
К. Л. Хазанава
1.1.2 Лексіка вясельнай абраднасці ва ўсходнеславянскім кантэксце …… 65
1.1.2.1 *Вянок* і *вянец* у беларускім вяселлі …….. 66
1.1.2.2 Беларуска-рускае моўнае ўзаемадзеянне ў беларускай вясельнай лексіцы ……. 70
1.1.2.3 Усходнеславянскія моўныя паралелі беларускай вясельнай лексікі ……... 77
1.1.2.4 Вяселле ў прыказках і прымаўках усходніх славян …….. 80
А. А. Станкевіч
1.1.3 Паэтыка вясельна-абрадавай песні ……. 90

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1.1.3.1 Моўны механізм стварэння эмацыянальна-ацэначнай канатацыі ў вясельных песнях Гомельшчыны ……... 91
1.1.3.2 Метафарызацыя паэтычнага кантэксту вясельнай песні Гомельшчыны …… 98
1.1.3.3 Моўныя сродкі наглядна-вобразнай канкрэтызацыі: эпітэт і параўнанне ў вясельных песнях Гомельшчыны ……... 104
1.1.3.4 Паўторная намінацыя і яе стылістычная функцыя ў вясельных песнях Гомельшчыны ……. 111
К. Л. Хазанава
1.2 Лексіка радзінна-хрэсьбіннай абраднасці ва ўсходнеславянскім кантэксце ……. 119
1.2.1 Лексіка-тэматычная групоўка лексікі радзінна-хрэсьбінных традыцый ……. 120
1.2.2 Найменні асоб у радзінна-хрэсьбінным абрадзе беларусаў . 121
1.2.3 Беларуска-рускія лексічныя паралелі ў намінацыі асоб радзінна-хрэсьбіннага абраду …….. 124
1.2.4 Радзіны і хрэсьбіны ў гаворках беларуска-ўкраінскага памежжа: традыцыі, уплывы, асаблівасці …….. 127
1.2.5 Бабка і бабіна каша ў беларускіх і ўкраінскіх гаворках …... 131
1.2.6 Адведкі ў радзінна-хрэсьбіннай культуры беларусаў …….. 137
1.2.7 Кум і кума ва ўсходнеславянскіх гаворках ……... 140
1.2.8 Хрышчэнне ва ўсходнеславянскіх мовах …….. 144
1.2.9 Уплыў генезісу на варыянтнасць радзінна-хрэсьбіннай лексікі беларускіх гаворак ……... 149
А. М. Воінава
1.3 Лексіка пахавальнай абраднасці …… 154

2 Каляндарна-абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны …… 167
А. М. Воінава
2.1 Лексіка каляндарна-абрадавага цыклу на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна: структурна-семантычны аналіз ……... 167
А. А. Станкевіч
2.2 Каляндарна-абрадавая лексіка на тэрыторыі руска-беларускага памежжа …… 188
К. Л. Хазанава
2.3 Каляндарна-абрадавая лексіка ва ўсходнеславянскім кантэксце …… 203
2.3.1 Лексіка-тэматычная дыферэнцыяцыя каляндарна-абрадавых назваў у беларускіх гаворках …… 203
2.3.2 Каляндарна-абрадавая найменні ў беларускай і рускай лексіцы ……... 207

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2.3.3 Беларуска-ўкраінскія моўныя паралелі ў каляндарна-абрадавай лексіцы зімовага цыклу …….. 210
2.3.4 Сустрэча вясны ў абрадавым календары ўсходніх славян .. 215
2.3.5 Лексіка летняга каляндарна-абрадавага цыклу ў беларускай і ўкраінскай мовах …… 221
2.3.6 Пятроўкі ў беларускіх і рускіх гаворках …… 229
2.3.7 Восень у абрадавым календары беларусаў …… 233
2.3.8 Суфіксацыя ў дэрывацыі каляндарна-абрадавай лексікі гаворак беларуска-рускага памежжа ……... 239
2.3.9 Кніжнаславянізмы ў каляндарна-абрадавай лексіцы ўсходнеславянскіх моў …… 241
2.3.10 *Куцця* ва ўсходнеславянскай традыцыі …… 244

А. М. Воінава, К. Л. Хазанава
3 Абрадавая лексіка ў літаратурных творах …….. 254
3.1 Беларуская абрадавая лексіка ў выданнях Францыска Скарыны ……. 254
3.2 Адлюстраванне старажытных уяўленняў і абрадавых традыцый усходніх славян у творчай спадчыне Максіма Багдановіча …… 258
3.3 Духоўная і матэрыяльная культура беларусаў у творчасці Максіма Танка ……... 265

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А. А. Станкевіч

Уводзіны

Канцэптасфера духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час

Понеже от прирожения Звери ходящие въ пустыни знають ямы своя. Птицы летающие по возъдуху ведають гнезда своя, Риби плывающие по морю и в рекахъ чують виры своя. Пчелы и тымъ подобная боронять ульевъ своихъ. Такожь и люди игде зродилися и ускормлены суть по бозе къ тому месту великую ласку имають

Ф. Скарына

Нябачнай рукой вечнасці праз стагоддзі прадзецца нітка часу, пераплятаючы лёсы многіх пакаленняў, яднаючы эпохі, злучаючы продкаў і нашчадкаў. Не страціць пераемнасць эпох, звязаць сучаснае і мінулае, тым самым перакінуўшы мост у будучае, нам дапамагае памяць. Яна падаўжае наша хуткаплыннае быццё, дазваляючы ўявіць яго не кароткім імгненнем, а непарыўным поступам стагоддзяў. Без памяці пра гісторыю свайго народа, без ведання яго матэрыяльнай і духоўнай культуры немагчыма быць сапраўдным грамадзянінам.

Даследаванне матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа мае ў наш час асаблівае значэнне. Зварот да народнай культуры вельмі важны для гуманізацыі грамадства, яго духоўнага развіцця, адраджэння многіх страчаных ім эстэтычных ідэалаў, мае значэнне і для патрыятычнага выхавання моладзі, паколькі павышае яе цікавасць да гісторыі роднага краю, фарміруе павагу і пашану да традыцыйнай культуры, павышае ўзровень нацыянальнай свядомасці.

Цікавасць да народнай культуры, яе вывучэнне павінны таксама супрацьстаяць разбурэнню традыцыйнай этнасацыяльнай структуры ўсходніх славян, парушэнню грамадска-сацыяльных і гісторыка-культурных сувязей славянскіх народаў. І ў той жа час вывучэнне розных аспектаў традыцыйнай культуры павінна садзейнічаць захаванню этнакультурнай самабытнасці народаў, што набывае асаблівую актуальнасць у сувязі з працэсамі глабалізацыі ў сучасным грамадстве. Таму можна сцвярджаць, што захаванне, зберажэнне і развіццё разнастайных форм і традыцый народнай культуры – абавязак кожнага сумленнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Усходняе Палессе – унікальны рэгіён са своеасаблівай гісторыяй, культурнымі і моўнымі адметнасцямі, які адыграў істотную ролю ў фарміраванні беларускага этнасу, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры. Культурная прастора Усходняга Палесся, якая мае глыбокія гістарычныя карані, захоўвае шматлікія рэліктавыя з'явы агульнаславянскай і ўсходнеславянскай культуры. На гэтай тэрыторыі найбольш поўна ў розных формах праяўлення – абрадах, звычаях, рытуалах, міфах, паданнях, паэтычнай творчасці, лексіцы – захаваліся архаічныя элементы традыцыйнай народнай культуры, якія даказваюць генетычнае адзінства ўсходнеславянскіх народаў.

Асаблівая значнасць у даследаванні палескай тэрыторыі звязана з яе цэнтральным становішчам на сумежжы трох усходнеславянскіх этнасаў і ўсходне-заходнім славянскім памежжы, што робіць дадзены рэгіён зонай інтэнсіўных міжэтнічных узаемасувязей і ўзаемаўплываў [1, с. 4–5].

Актуальнасць і неабходнасць вывучэння ў наш час традыцыйнай культуры Усходняга Палесся абумоўлена многімі фактарамі: па-першае, тым, што самабытная матэрыяльная і духоўная культура беларускага народа, як і іншых славянскіх народаў, яшчэ не вывучана ў поўным аб'ёме; па-другое, каштоўнасці народнай культуры паступова страчваюцца пад уплывам фактараў часу, у працэсе урбанізацыі сельскага насельніцтва, у выніку парушэння пераемнасці пакаленняў, калі новыя генерацыі не ў поўным аб'ёме валодаюць духоўнай спадчынай і народнымі традыцыямі; па прычыне міграцыі насельніцтва, у выніку дэмаграфічнага спаду; па-трэцяе, многія этнакультурныя элементы – помнікі гісторыі і архітэктуры, традыцыйныя народныя рамёствы і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фальклорна-этнаграфічная спадчына, абрадавая культура, дыялектны лексічны фонд – паступова знікаюць у сувязі з адсяленнем значнай колькасці жыхароў Беларусі (пераважна палескага рэгіёну) з Чарнобыльскай зоны.

Народная культура – паняцце шматпланавае, яно ўключае ў сябе цэлы спектр з'яў – разнастайныя яе формы і праявы. Калі ўявіць сабе традыцыйную культуру як сукупнасць канцэптаў, то неабходна прызнаць, што ў цэнтры яе канцэптасферы стаіць чалавек, таму што па прыродзе сваёй і сутнасці яна антрапацэнтрычная. Важнейшымі кампанентамі, што вызначаюць яе напаўненне і змест, з'яўляюцца ўзаемазвязаныя паняцці *чалавек – сям'я – праца – прырода – рэлігія,* якія можна назваць асноўнымі, сутнаснымі, на аснове якіх і выдзяляюцца разнастайныя формы традыцыйнай культуры.

Узаемасувязь розных форм духоўнай культуры ўтварае свайго роду яе канцэптасферу. Такое разуменне духоўнай культуры абумоўлівае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сістэмны падыход да вывучэння яе з'яў. Розныя формы і з'явы народнай культуры выдзяляюцца на аснове сістэмы наступных карэляцый : *чалавек ↔ яго ўнутраны, духоўны свет; чалавек ↔ сям'я; чалавек ↔ праца; чалавек ↔ грамадства; чалавек ↔ рэлігія; чалавек ↔ гісторыя; чалавек ↔ прырода; чалавек ↔ сусвет*.

Змест названых апазіцый раскрываецца праз разнастайныя формы духоўнай культуры, напрыклад:

апазіцыя *чалавек ↔ сям'я* рэалізуецца ў такіх формах, як сямейна-абрадавы фальклор (радзінна-хрэсьбінны, вясельны, пахавальны фальклор), традыцыі і абрады сямейнага ўкладу жыцця, сямейна-абрадавая лексіка;

апазіцыя *чалавек ↔ праца* рэалізуецца ў такіх формах, як каляндарна-абрадавы фальклор, звязаны з народным календаром, каляндарна-абрадавая лексіка, народнагаспадарчая лексіка;

чалавек ↔ духоўны свет праяўляецца ў такіх формах, як пазаабрадавая паэзія , любоўная лірыка;

чалавек ↔ рэлігія абумоўлівае такія разнавіднасці народнай культуры, як традыцыі і абрады, звязаныя з народнымі святамі, міфалагічныя звесткі, звязаныя з богам, народная рэлігійная лексіка;

чалавек ↔ грамадства выклікае сацыяльна-бытавыя жанры вуснай народнай творчасці, сацыяльную лексіку;

чалавек ↔ гісторыя звязана з пазаказачнай прозай, гістарычнай лексікай

чалавек ↔ прырода праяўляецца ў прыкметах і павер'ях, казках, метэаралагічнай, батанічнай і заалагічнай лексіцы;

чалавек ↔ сусвет рэалізуецца ў міфалагічных звестках, звязаных з узнікненнем свету, нябеснымі з'явамі, у міфалагічнай лексіцы і г. д.

Абазначаны сістэмны падыход да вывучэння разнастайных з'яў народнай культуры дасць магчымасць паказаць іх узаемасувязь і ўзаемадзеянне, дазволіць выявіць фактары, якія вызначылі агульнае і лакальнае, традыцыйнае і рэгіянальнае ў фарміраванні і развіцці фальклорна-этнаграфічнай і лінгвістычнай спадчыны.

Комплекснае вывучэнне традыцыйнай культуры Ўсходняга Палесся як своеасаблівай канцэптасферы будзе садзейнічаць апісанню спецыфічных асаблівасцей усходнепалескай культурнай прасторы, якія вызначаюць яе месца ў адзіным усходнеславянскім кантэксце. Канцэптуальны аспект даследавання народнай культуры абумоўлівае сістэмнае вывучэнне яе зместу, вызначэнне яе структуры, выдзяленне асноўных, сутнасных канцэптаў, дэманстрацыю іх узаемасувязі з рознымі праявамі духоўнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вынікі вывучэння канцэптасферы традыцыйнай народнай культуры маюць вялікае ідэйна-патрыятычнае, выхаваўчае, вучэбна-адукацыйнае, краязнаўчае і пазнавальнае значэнне. Яны могуць выкарыстоўвацца як спецыялістамі ў галіне культуры, навукі, адукацыі, так і ўсімі, хто цікавіцца гісторыяй і культурай роднага краю. Матэрыялы даследавання будуць садзейнічаць развіццю рэгіёназнаўства і краязнаўства, спрыяць папулярызацыі гісторыі і культуры ‘малой радзімы’. Яны будуць карыснымі для супрацоўнікаў абласных і гарадскіх устаноў культуры, краязнаўчых аб’яднанняў, органаў адукацыі, могуць з поспехам выкарыстоўвацца як рэгіянальная кампанента ў працэсе выкладання адпаведных дысцыплін у сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1 Сямейна-абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны

А. А. Станкевіч

1.1 Лексіка вясельнай абраднасці на Гомельшчыне

Традыцыйная беларуская нацыянальная культура, якая фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў, адлюстравала ў сабе народную мудрасць і вопыт, нашу нацыянальную свядомасць і менталітэт. Усходняе (Гомельскае) Палессе мае адметныя этнічныя, культурныя і моўныя асаблівасці, у якіх найбольш поўна захаваліся ў розных праявах архаічныя элементы традыцыйнай народнай матэрыяльнай і духоўнай культуры. Каштоўнасць форм праяўлення аўтэнтычнай культуры гэтага рэгіёну вызначаецца тым, што гэта сведчанне жывых традыцый сацыяльнага ўкладу палешукоў-беларусаў. Большасць архаічных элементаў традыцыйнай народнай спадчыны існуюць у адзначанай культурнай прасторы як звыклая, важнейшая форма зносін іх носьбітаў паміж сабою, сродак выражэння іх этнічнай самасвядомасці, форма праяўлення гарманічнай сувязі з акаляючым светам. Разнастайныя з’явы народнай культуры ўзаемазвязаныя паміж сабой.

Многія формы праяўлення традыцыйнай духоўнай палескай культуры з’яўляюцца ў нашы дні яшчэ жыццяздольнымі, але могуць знікнуць у бліжэйшы час [1, с. 5].

Народная мова з’яўляецца адным з важнейшых састаўных кампанентаў духоўнай культуры. Нагадаем вядомае выказванне В. фон Гумбальта: “Мова – душа народа, і душа народа – яго мова.” Лексічная сістэма народнай мовы ўключае розныя тэматычныя групы слоў, у тым ліку і абрадавыя назвы, адзін з самых старажытных і аксіялагічна значных пластоў народнага слоўніка. Адной з самых цікавых і пакуль што недастаткова даследаваных у беларускім мовазнаўстве тэматычных груп народна-дыялектнай мовы з’яўляецца сямейна-абрадавая лексіка, якая называе самыя значныя падзеі ў жыцці чалавека, з’яўляецца вербальным кодам разнастайных рытуальных актаў і дзеянняў.

Народны абрад як факт традыцыйнай культуры, які спалучае матэрыяльны і духоўны пачатак, валодае максімальнай ступенню сімвалізацыі і ўяўляе асаблівую цікавасць для даследчыка.

Кацэптасфера традыцыйнай духоўнай культуры, па сутнасці, з’яўляецца антрапацэнтрычнай і грунтуецца на ўзаемазвязанай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сістэме карэлятаў, у цэнтры якіх знаходзіцца канцэпт “чалавек”. Сістэмны падыход да вывучэння формы і зместу сямейных абрадаў дазваляе паказаць іх даволі складаную структуру напаўнення, якая змяшчае акцыянальны, агенсны, вербальны і рэчыўны кампаненты. У сувязі з гэтым кодавая сістэма абраду, як адзначаюць даследчыкі, уключае устойлівыя слоўныя, дзейсныя і прадметныя коды. Састаўнымі элементамі абраду з’яўляюцца, такім чынам, абрадавыя акты, выканаўцы рытуальных дзеянняў і інвентар рэалій [2, с. 57].

З усіх сямейных абрадаў найбольш поўна ў фальклорна-этнаграфічным плане апісаны самы працяглы па часе вясельны абрад, які ўключае шматлікія рытуальныя дзеянні, акты і цырымоніі, звязаныя з рознымі этапамі вяселля і які, як адзначаюць даследчыкі, “з’яўляецца адным з найбольш устойлівых кампанентаў традыцыйна-бытавой культуры, што ў вядомай ступені абумоўлена замкнутасцю і кансерватыўнасцю сямейнага побыту” [3, с. 31]. Вясельную абраднасць даследчыкі звычайна падзяляюць на тры этапы: дашлюбны, шлюбны і пасляшлюбны [4, с. 126]. Вясельны абрад на Гомельшчыне, як і ў іншых рэгіёнух Беларусі, у цэлым мае такую ж структуру.

Як адзначаюць даследчыкі, багаты матэрыял для вывучэння значэння і сутнасці абрадавага фальклору дае сялянскае вяселле, якое аб’ядноўвае ў адзінай структуры з’явы, розныя па сваёй прыродзе: кампаненты матэрыяльнай культуры, абрадавыя дзеянні, удзельнікаў абраду, слоўны і музычны фальклор і інш. [5, с. 216]. Адным з найбольш развітых, самабытных, яркіх ва ўсходнеславянскім свеце з’яўляецца беларускае вяселле.

У сістэме вясельных абрадаў вызначаюцца асноўныя, абавязковыя, або спецыфічныя і дадатковыя, факультатыўныя элементы. Асноўныя і дадатковыя абрады могуць быць, акрамя таго, устойліва прымеркаванымі, якія маюць строгую часавую прымеркаванасць або мабільнымі, якія выконваюцца ў розных канкрэтных варыянтах у розны час вяселля [6, с. 12]. Сістэма абрадавых дзеянняў вясельнага цыклу мае, такім чынам, пэўныя лакальныя і часавыя параметры, свайго роду вясельны “хранатоп”, у якім яна рэалізуецца.

Лексіка сямейнай абраднасці ўключае адпаведна назвы абрадаў, выконваемага дзеяння, намінацыі асноўных і другарадных удзельнікаў абрадаў, выканаўцаў і адрасатаў абрадавых дзеянняў, а таксама абазначэнні рытуальных прадметаў, сімвалаў, выкарыстоўваемых у час абраду. Вясельны абрад як складаны рознажанравы шматактны фальклорна-этналінгвістычны комплекс, які адлюстроўвае духоўную культуру народа, цалкам адпавядае такой тыпалогіі. Лексіка вясельнага абраду як аднаго з найбольш важных комплексаў сямейный абраднасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў беларускім мовазнаўстве пакуль што вывучана недастаткова і таму ўяўляе значную цікавасць для даследавання

Крыніцай фактычнага матэрыялу паслужыў дыялекталагічны архіў кафедры беларускай мовы ГДУ імя Ф. Скарыны, складзены па выніках дыялекталагічных практык у розных раёнах Гомельскай вобласці, а таксама асобныя выданні фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў гэтага рэгіёну.

1.1.1 Лексіка-тэматычная класіфікацыя назваў вясельнай абраднасці

1.1.1.1 Акцыянальная парадыгма вясельнага абраду

Назвы абрадавых дзеянняў і рытуалуў перадшлюбнага этапу

Сістэма вясельнага рытуалу, як адзначалася, уключае устойлівыя слоўныя, дзейсныя і рэчыўныя кампаненты. Асноўным у вясельным абрадзе лічыцца дзейсны (акцыянальны) код, у сувязі з чым найбольш шматлікай з'яўляецца лексіка, якая называе розныя этапы і эпізоды гэтага абраду, дзеянні, якія выконваюцца на гэтых этапах.

Да абавязковых, прымеркаваных да пэўнага часу, вясельных абрадаў адносяцца сватанне, заручыны, адзяванне маладой або маладога, бласлаўленне, застолле ў доме нявесты, развітанне маладой са сваёй раднёй перад выездам да жаніха, пераезд у дом жаніха, застолле ў доме жаніха, пасцельны абрад, праведванне маладой жонкі яе бацькамі пасля вяселля. Мабільнымі, не прымеркаванымі да пэўнага часу, з'яўляюцца такія абрады, як адорванне маладых, расплятанне касы нявесты, выкуп нявесты, пасад нявесты, пасад жаніха і інш.

Лексіка, звязаная з абрадам сватання ў гаворках Гомельшчыны

Значную ролю ў вясельнай абраднасці адыгрывае перадшлюбны этап, найбольш важным і адказным эпізодам якога лічыцца сватанне.

Значымасць абраду сватання ў сістэме перадшлюбных актаў пацвярджае наяўнасць вялікай колькасці найменняў для яго абазначэння, розных па структуры і спосабах ўтварэння. У іх ліку як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аднаслоўныя намінатыўныя адзінкі – дзеясловы *сватацца, пасватацца, сватаць, пасватаць, высватаць, засватаць, высватаваць*, субстантывы-аддзеяслоўныя дэрываты з працэсуальным значэннем: *сватанне, сватаўство*, метанімічныя назвы *сваты* (перанос назвы асоб на дзеянне, утвараемае імі), *магарыч* (перанос назвы рэаліі на час і працэс яе выкарыстання), так і шматлікія ўстойлівыя спалучэнні: *ісці ў сваты, ісці сватацца, пасылаць сватоў, прысылаць сватоў, прыйсці ў сваты, хадзіць у сваты, прыходзіць у сваты, прыехаць у сваты, прыхадзіць у сваты*, а таксама фразеалагізаваныя спалучэнні тыпу *ваўкі ішлі* ‘сваты былі’: *Ка мне сваты прыходзілі, у мяне тры дочкі, я ўсіх пааддавала* (в. Уць, Добр.); *Прыіжджалі ка мне сваты з дзярэўні ў кварціру. Ну папілі, паелі, дагаварылісь* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Ой, тады такая беднасць была! Так гулялі: прыедуць за маладой, ужо пасватаюць сваты, маладую высватаюць і там па чарцы гарэлачкі, закускі* (в. Хальч, Ветк.); *Сватанне называецца магарычом* (в. Бялёў, Жытк. – ВНГ, с. 59); *Дзяўчыну ўжо сасваталі. Потым пьюць, гуляюць .. Людзі на гэта гавораць: “Ваўкі ішлі”, г. зн. сваты былі* (в. Затон, Жлоб. – ВНГ, с. 56).

У сваты ішлі, як правіла, самыя блізкія людзі – бацька і маці хросныя, дзядзька, брат маладога, бралі з сабою ў пачастунак хлеб або пірог, бутэльку гарэлкі, якую перавязвалі чырвонай стужкай: *Можна і бацьку, і матку хросных узяць на сваты, дзядзьку, цётку там родную, прыходзяць раднейшыя, чалавек шэсць-сем* (в. Стаўбун, Ветк.).

Перш чым ісці ў сваты, стараліся высветліць, ці атрымае малады чалавек ад патэнцыяльнай нявесты згоду на шлюб. Гэты працэс называўся *пярэпыты, перапыты, перапытаць, прапыткі, заказы, аглядзіны*. Гэта мог быць зговар паміж маладымі, які выражаўся праз сімвалічныя дзеянні: *Калі маладому падабаецца дзяўчына, ён на адной з вечарынак павінен надзець ёй на галаву вяночак у знак таго, што скора прыйдзе да яе ў сваты. Калі дзяўчына не супраць, то яна не знімае з галавы вяночак* (в. Красная Слабада, Акц. – ВНГ, с. 9), або праз абмен рытуальнымі прадметамі: *Када жаніху платок дадуць, гавораць, ідзём к надзёжнай, ну. Она ўжэ за цебя пайдзёт* (г. Ветка). Гэта магло быць папярэдняе апытванне членаў сям’і будучай нявесты на прадмет яе згоды. *Пярэпыты* маглі насіць яўны, адкрыты, «афіцыйны» характар: *Найперш у дом нявесты прыходзяць сваха і маці хлопца – у прапыткі. У прапытках высвятляюць, ці згодна дзяўчына выйсці замуж за гэтага хлопца* (в. Казацкія Балсуны, Ветк. – В., с. 231); *Спачатку былі заказы. Бацька з маткай маладога прыходзяць і кажуць, калі прыйдуць у сваты* (в. Стаўбун, Ветк. – ВНГ, с. 112); *Калі хлопец надумае жаніцца, ён аб гэтым гавора дома.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тагда цётка, маці, хросная маці ідуць у хату нявесты на аглядзіны (в. Кругавец, Гом. – ВНГ, с. 176); а маглі быць тайнымі, выконваліся пастароннім чалавекам, якога жартаўліва называлі *шпіёнам*: *Калі хлопцу спадабалася дзяўчына і ён захацеў з ёй пажаніцца, бацькі хлопца адпраўлялі ў тую вёску, дзе жыве дзеўка, шпіёна. Шпіён хадзіў ля дому дзеўкі, слухаў, разгаварываў з рознымі людзьмі, узнаваў, ці добрая дзеўка. Шпіён прыязджаў да бацькоў хлопца і гаварыў, што можна ехаць у сваты або не* (в. Дуброва, Акц. – ВНГ, с. 21).

Згода нявесты выражалася праз яе пэўныя дзеянні ў час сватання: разрэзаць хлеб: *Жаніх прывозіць хлеб, абвернуты палаценцам, ложыць ета ўсё на стол. Еслі невеста згодна, яна разразае хлеб* (в. Вязок, Браг. – ВНГ, с. 28); *Калі нявеста давала згоду ісці замуж, то яна павінна была перарэзаць хлеб, які прынеслі сваты. Адну палавіну гэтага хлеба яна выносіла на вуліцу.. і кідала хлеб уверх. Было такое павер'е: хто першы зловіць гэты хлеб, той наступны пойдзе замуж* (в. Міхноўка, Браг. – ВНГ, с. 38-39); прыняць лапці: *Колісь казалі: малады адчыніць дзверы да лапці кіне; як возьме яна тыя лапці, прыме, значыць, пойдзе замуж, а як вукіне назад за дзверы, значыць, к другой ідзі* (в. Малыя Зімовішчы, Маз. – ВНГ, с. 325); выпіць чарку: *Першую чарку давалі выпіць маладым. Калі яны выпіваюць, то, значыць, згодныя* (в. Жгунь, Добр. – ЗЧД, с. 251); падарыць ручнік, насыпаць жыта : і інш.*Калі нявеста сагласная была выйсці замуж, то яна дарыла бацькам жаніха ручнік – ета для бацькі і хусцінку – для маці* (в. Пянчын, Б.-Каш. – ВНГ, с. 86); У некаторых рэгіёнах Гомельшчыны дзяўчына рассцілала перад сватамі вышыты ёю ручнік (в. Малыя Казловічы, Жлоб.); *Потым маладая дае бацькам збан з жытам. Гэта сведчыць аб тым, што яна дае згоду і аддае ім сваё жыццё. Бацькі гэта жыта сыпалі у двары і ў хаце, каб добра жылося і каб выгнаць нячыстую сілу* (в. Агароднікі, Калінк. – ВНГ, с. 266). Маці з бацькам пытаюцца ў дачкі, ці згодная яна. Калі згодная, яна падыходзіць да стала, на якім стаіць бутэлька з гарэлкай, і развязвае чырвоную стужку на бутэльцы.

Калі маладая і яе бацькі былі згодны, то маладых перавязвалі ручнікамі (в. Страдубка, Лоеўск. – ВНГ, с. 319); Іншы раз нявеста рабіла выгляд, што яна раздумвае, вагаецца, не спяшаецца замуж: *За месяц да свадзьбы прыязджаюць сваты.. Прыходзяць у хату да маладой, тая стаіць ля прыпечку, калупае яго, робіць выгляд, што не хоча ісці* (в. Маркаўскае, Лельч. – ВНГ, с. 315). Дзяўчына магла калупаць у сцяне мох паміж бярвеннямі (в. Верасніца, Жыт. – ВТГ, с. 4). Даследчыкі адзначаюць, што гэта дзеянне нявесты мела карпаганічны сэнс.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Многія інфарматары адзначаюць, што, ідучы ў сваты, бралі з сабою гарбуз, які быў своеасаблівы “індыкатарам” паспяховага завяршэння справы: *Ну, прыходзяць раднейшыя, чалавек шэсць-сем. Нявеста даўжна закуску прыгатовіць. Стол накрыць. Садзіліся, пілі, дамаўляліся. Са стараны жаніха бяруць з сабой гарбуз, заходзяць і пакацілі па хаце* (в. Стаўбун, Ветк.); *Сёння мы ідзём у сваты. Дзержым гарбуз. Біром гарбуз і коцім к невесцінаму дому. Такой быў абычай перад сватамі* (в. Старое Сяло, Ветк.) .

Такім чынам, згода маладой на шлюб выражалася наступнымі дзеяннямі і адпаведнымі ім слоўнымі формуламі: *надзець вяночак, даць платок, прыняць хлеб, разрэзаць хлеб, перарэзаць пірог, выпіць чарку, прыняць лапці, прыняць гарбуз, насыпаць жыта, развязаць лентачку, падарыць бацьку жаніха ручнік, а маці – хусцінку, паднесці бацькамі нявесты будучаму зяцю каравай, калупаць мох у сцяне, калупаць прыпечак* .

Сімвалічнымі і разнастайнымі былі таксама спосабы адмовы дзяўчыны выйсці замуж, у якіх таксама выкарыстоўваліся розныя прадметы: *гарбуз, тыква, ступа, венік, кажух, баранкі, хлеб, чайнік*: *Калі малады не падабаецца, то дзеўка хлеб іхны аддае назад* (г. Ветка); *Адзін раз, каб адказаць хлопцу, павесілі баранкі, на нітку надзелі* (в. Церуха, Гом.); *Калі дзеўка не хацела выходзіць замуж за етага хлопца, тут жа перад сватамі выкатвала гарбуз. А ета бальшы пазор хлопцу* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Калі нявеста не сагласна, яна ставіць на стол гарбузу* (в. Зашчоб’е, Рэч. – ВНГ, с. 398); *Як вукіне назад* [лапці] *за дзверы, значыць, к другой ідзі* (в. Малыя Зімовішчы, Маз. – ВНГ, с. 325); *Калі радзіцелі не сагласны, жаніху выносілі тыкву во такую* (в. Церуха, Гом.); *Калі ж дзяўчына вымятала мусар з ізбы, гэта значыла, што яна не згодна, і малады з дружынай пакідалі хату* (в. Страдубка, Лоеўск. – ВНГ, с. 319). У знак адмоўнага рашэння дзяўчына магла выйсці да сватоў у апранутым навыварат кажусе (Лоеўск. – ВТГ, с. 5). Як паказчык адмовы выкочвалі пад ногі сватам ступу (в. Карма, Добр. – ВТГ, с. 5). Калі нявеста не згодна на шлюб, то жаніху прывязвалі чайнік, і той павінен выйсці з чайнікам (в. Васільеўка, Добр. – ВТГ, с. 6).

У некаторых выпадках адмоўны адказ насіў ускосны, ветлівы характар: *Калі не жадае нявеста выходзіць замуж, яе бацька, каб не пакрыўдзіць сватоў, гавора, што дачка яго яшчэ зусім маладая. Няхай падрасце яшчэ* (в. Кругавец, Добр. – ВНГ с. 180). Дзеянні, звязаныя з адмовай дзяўчыны на шлюб, перадаваліся, такім чынам, наступнымі выразамі: *зняць вяночак, аддаць хлеб, чаркі не браць, выкаціць (вынесці) гарбуз (тыкву), выкінуць лапці, месці падлогу,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

апранаць вывернуты кажух, выкочваць ступу, даваць ступу, даваць матузку з веніка, даваць чайнік. Іншы раз указваўся матыў адмовы, як правіла, надуманы: *маладая яшчэ*.

Абрад сватання часта меў гульнёвую форму, ён насычаўся сімвалічнымі дзеяннямі, алегарычнымі формуламі, прыказкамі, прымаўкамі. Напрыклад, сваты часта гаварылі, што заблудзіліся і прасілі пусціць іх пераначаваць (в. Лубенікі, Браг. – ВНГ, с. 33). Маладому чаплялі за адзенне драўляны коўш з вадою, які ён павінен быў цягаць па хаце: *Той коўш з вадой у той хаце зачапілі павадком такім і маладому на спіну за хлясцік на фуфайцы ці чым прычапілі, штоб пацёг па хаце. Гэта рабілі для смеху, мол, дзеўка не хацела ісці замуж .. Сваталі-сваталі, усе тры сваты па хаце пацягалі коўш туды-сюды, угаварвалі, потым сагласіліся* (в. Шкураты, Браг. ВНГ, с. 43–44). Існаваў таксама рытуал выкупу пеўня, які праводзілі ў час сватання. Пеўня шылі спецыяльна, абшывалі яго лентамі і прапаноўвалі сватам выкупляль яго (в. Грабаўка, Гом. – ВТГ, с. 7)

Сваты ўступалі ў дыялог з бацькамі маладой, выкарыстоўваючы іншасказальную форму: "*Добры вечар, добры вечар, - гавораць, - нам сказалі, што ў вас цёлачка ё харошая, пародзістая тамака..." Ужо прыдумаюць... "Дак можа б нам прадалі тую цёлачку, а яны: - Ёсцяка, ёсцяка цёлачка ў нас, паглядзіце, панаравіцца, дак прададзім, а не панаравіцца, дак не*" (в. Старое Сяло, Ветк.); *Зашлі к молодой, а тут ужо з юмором гавораць, што цёлка зашла во двор, а хто говорыць, што куніца зашла ў двор, а ў нас охотнік* (в. Валаўск, Ельск.); *Сваты кажуць: У вас прадаецца цяліца? Чулі, можа купіці? Бацька: Можна, заходзьце. Сваты: Колькі стоіць? Бацька: Две бутылкі. Выпіваюць, дагаворваюцца, на які дзень свадзьба. Абычна праз две-тры нядзелі* (в. Церуха, Гом.). Такая размова называлася торгам: *І тут пачынаецца торг. Сваты гаварылі, што можа тут цялушка есць і мо прадасце яе. Бацькі адказвалі, што ніякой цялушкі няма, а есць у іх дочка* (в. Сямурадцы, Жытк.); "*Кагда прыязжаюць у сваты, то сразу не гавораць, чаго прыехалі. А гавораць, што хацяць купіць цялушку. Тагда гавораць "вам тавар – нам купец". Кагда сваты уязжаюць, то ўжэ гавораць, што прапілі дзеўку"* (в. Церуха, Гом.); Сваты пыталіся: – *А праўда, што ў вас ёсць цёлачка? – Не толькі цёлка, а і кароўка, выбірайце! – Нам тую, што вы цёлачкай назвалі* (в. Малажын, Браг. – ВТГ, с. 36–37); *Як прыйдуць да дзеўкі, дак у хату не заходзяць, а стануць на парозі дай пытаюцца: "Ці не загубіўся наш бычок? Мо ён к вам прыйшоў. Мы прыйшлі яго шукаць"* (в. Чамярысы, Браг. – ВТГ, с. 49).

Падобныя дыялогі, як бачна, насычаны метафарычнымі назвамі жаніха (*бык, бычок, охотнік, купец*) і нявесты (*цяліца, цёлачка,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цялушка, цёлка, тавар, куніца), якія мелі сімвалічнае значэнне і ўмела ўпляталіся ў алегарычны кантэкст перадшлюбнай цырымоніі сватання.

У сваты звычайна хадзілі позна вечарам, у субботу, ёсць розная матывацыя гэтага звычая: *Едуць яны ў цёмнае, каб людзі іх не бачылі, бо нявеста можа перадумаць* (в. Патапаўка, Б.-Каш. – ВНГ, с. 90); *На сватанне ехалі ўвечары, як пачынала цямнець, "каб дурныя вочы не бачылі і не маглі паддзелаць*" (г. Рэчыца); *Ішлі сватаць вечарам, каб ніхто не сурочыў, на месячнай поўні, каб было поўнае шчасце* (в. Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с. 104).

Пасля атрымання папярэдняй згоды на шлюб праводзіўся рытуал *запоіны, прыпоіны, заповіны*, пад час якіх яшчэ раз, ужо канчаткова, вызначалася згода на шлюб: *Пасля сватання, праз некаторы час, праходзяць запоіны. У час запоін дзеўку "запіваюць да роду жаніха", пасля чаго яна ўжо не можа адказацца* (в. Агароднікі, Калінк. – ВНГ, с. 266); *Сначала былі заповіны. Ну, эта была, еслі дзеўчына саглашалася ісці замуж і бацька ейны ўсім гаварыў аб этым* (в. Старое Сяло, Ветк – В., с. 224); *Сваты спрашывалі: Ці выдаеце вы дачку сваю замуж? Мы атвечаем: Выдаем, канешне. Прыпоіны папілі – свадзьба будзе* (г. Ветка); *Калі нявеста сагласная, тады п'юць, прапіваюць маладую* (г. Ветка). *Праз тыдзень-другі ідуць запіваць дзеўку. У запоіны ідзе той, хто буў у сватох* (в. Пухавічы, Жытк.). На запоінах больш блізка знаёміліся, абменьваліся падарункамі родныя жаніха і нявесты.

Пасля прыняцця канчатковай згоды на вяселле адбываліся *заручыны: На другі дзень пасля сватання бацька нявесты крэпка біў са сватамі па рукам, перадаваў сватам дачку як бы з рук у рукі* (в. Баршчоўка, Добр.– ЗЧД, с. 248); *Маладыя станавіліся на абрус, ім звязвалі рукі – заручалі* (в. Літвінавічы, Карм.). Гэты эпізод перадшлюбнай цырымоніі называўся таксама *змовіны*: *Змовіны апяць праходзілі ў хаце нявесты, пасля таго, як прайшла адна нядзеля пасля заповін .. Нявеста ўжо не магла адказацца ад замужжа* (в. Дуброва, Акц. – ВНГ, с. 22); *Змовіны – дагаворваліся аб свадзьбе. А патом дзелалі свадзьбу чэраз месяц, двое. Бывала, і такое, што пасля змовін адказваліся, тады гаварылі: "Свадзьбу разарыла"* (в. Казацкія Балсуны, Ветк.). На гэтым этапе агаворваліся ўмовы шлюбу, абмяркоўваліся матэрыяльныя выдаткі на вяселле.

Пасля *заручын* былі яшчэ *печаглазіны*, *агледзіны*, *аглядзіны*, на якіх праводзіўся агляд гаспадаркі жаніха: *На іх дамаўляліся, калі ўжо сабірацца на свадзьбу* (в. Казацкія Балсуны, Ветк. – ВНГ, с. 129).

Лексіка, якая называе розныя эпізоды перадшлюбнага абраду сватання, мае празрыстую структурна-семантычную матывацыю і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адносіцца пераважна да аддзеяслоўных субстантыўных дэрыватаў, матываваных характарам выконваемага дзеяння, што пацвярджае актыўны, дзейсны характар гэтага акту: *сватанне, сватаўство* (матывуецца дзеясловам *сватаць*); *пярэпыты, прапыткі* (*пытаць, перапытаць*), *заказы* (*заказваць*), *запоіны, заповіны, прыпоіны (прапіваць, запіваць), заручыны* (*заручаць* ‘звязваць рукі’, *заручацца* ‘біць па руках’), *змовіны* (*дамаўляцца*), *агледзіны, аглядзіны* (*глядзець, аглядаць*). Па сваёй структуры гэта як аднаслоўныя намінатыўныя адзінкі тыпу *сватанне, запоіны, заручыны, аглядзіны*, так і словазлучэнні свабоднага і ўстойлівага характару: *хадзіць у сваты, кідаць лапці, каціць гарбуз, даваць ступу* і інш. Побач з лексічнымі адзінкамі, якія выкарыстоўваліся ў прамым значэнні для намінацыі галоўных удзельнікаў шлюбнай цырымоніі тыпу *хлопец, дзяўчына, малады, маладая, дачка, сын,* у час сватання актыўна ўжываліся іх метафарычныя (зааморфныя) назвы *бык, бычок, охотнік, купец; цяліца, цёлачка, цялушка, цёлка, тавар, куніца,* што было абумоўлена алегарычнай формай дыялогу і звязана з традыцыйнай вясельнай сімволікай. Такім чынам, самая адметная асаблівасць лексікі, звязанай са сватаннем, – значная перавага ў яе складзе працэсуальных і метафарычных назваў.

Назвы перадвясельнага вечара ў гаворках Гомельшчыны: тыпы структурна-семантычнай матывацыі

Апошні вечар перад вяселлем, які нявеста і жаніх праводзяць асобна, разам са сваімі сяброўкамі ці сябрамі, з’яўляецца абавязковым, прымеркаваным да пэўнага часу, эпізодам перадвясельнай абраднасці і мае ў гаворках Гомельшчыны розныя назвы. Так, калі вяселле пачыналася ў нядзелю, гэты вечар праводзіўся ў суботу і называўся *зборная субота.* Калі ж першым днём вяселля была субота, то вечар быў у пятніцу і меў розныя назвы.

Самай пашыранай на Гомельшчыне з’яўляецца састаўная назва *зборная субота*, матываваная як часам правядзення, так і мэтай гэтага мерапрыемства – сабраць сяброўак або сяброў. У некаторых мясцовасцях адзначаецца, што *зборную суботу* праводзілі як нявеста са сваімі сяброўкамі, так і жаніх з сябрамі, братамі і сёстрамі: *У суботу перад свацьбай у жаніха і нявесты была зборная субота. Жаніх сабіраўся ў сваёй хаце, а нявеста – у сваёй* (в. Мормаль, Жлоб. – ВТГ, с. 144).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У іншых рэгіёнах Гомельшчыны *зборнай суботай* называўся толькі вечар нявесты з сяброўкамі, а ў жаніха сустрэча з сябрамі ў гэты час мела назву *хлапечнік*: *Жаніх хлапечнік збіраў* (в. Азершчына, Рэч. – ВТГ, с. 383). Акрамя назвы *зборная субота*, для абазначэння вечара ў суботу перад вяселлем выкарыстоўваліся варыянтныя намінацыі *суборная субота, вечар у суботу*: *На суборную суботу ўбіралі нявесту, хату* (в. Б.-Люшаўская, Б.-Каш. – ВТГ, с. 196); *У суботу вечарам у хаце маладой збіраліся яе сяброўкі* (г. п. Церахоўка – ВнГ, с. 175).

У многіх раёнах Гомельскай вобласці зафіксаваны наміцыі гэтага вечара, матываваныя суб'ектам дзеяння. Гэта пераважна аднаслоўныя найменні, адыменныя суфіксальныя дэрываты *дзявочнік, дзявічнік, дзявішнік, дзявічкі, девічнік, дзевішнік, дзівішнік, дзяўчатнік, хлапечнік*: *Девічнік – дзень, калі дзяўчына сабірала сваіх дружак і прашчалася са сваім прошлым жыццем* (в. Церахоўка, Добр.); *Перад свадзьбай дзеўкі збіраліся ў пятніцу на дзявішнік* (в. Дзімамеркі, Лоеўск. – ВТГ, с. 278); *Звычайна дзявічкі збіраюць у пятніцу перад вяселлем* (в. Іпалітаўка, Чач. – ВнГ, с.462); *На вечар напярэдадні вяселля ў нас казалі "дзявічнік"* (в. Губічы, Б.-Каш. – ВТГ, с. 55); *Вечар у дзяўчыны называўся дзяўчатнік* (в. Сялец, Б.-Каш. – ВТГ, с. 63); *Былі па-настаяшчэму дзівішнікі. Ужэ дзевачкі прашчаліся з нявестай* (в. Новае жыццё, Гом. – ВТГ, с. 93). Састаўной назвай у гэтай групе з'яўляецца даволі пашыраная на Гомельшчыне намінацыя *дзявочы вечар*, якая мае суб'ектна-тэмпаральную матывацыю: *Перад вяселлем у суботу вечарам у маладой сабіраліся яе падружкі на дзявочы вечар* (в. Вароніна, Жытк. – ВТГ, с. 192). Адзінкавай таксама з'яўляецца субстантываваная назва гэтага вечара – *зборная*, матываваная выконваемым дзеяннем: *А ўжо ў суботу перад вяселлем кожны з маладых зборную рыхтаваў з дружкамі. Нявеста сабе, жаніх сабе* (в. Азершчына, Рэч. – ВТГ, с. 383).

Тэмпаральную матывацыю маюць досыць распаўсюджаныя назвы аналізуемага перадвясельнага эпізода *вечар, вечарына, вечарынка, вячоркі*: *Таксама збіраліся шахверкі нявесты і гулялі – называлася "вечар"* (в. Шыхаў, Жлоб. – ВТГ, с. 155); *Вечарынку гулялі перад свадзьбай* (г. Ветка); *Вячоркі – апошні вечар перад вяселлем* (в. Покаць, Чач.).

У Брагінскім раёне занатавана назва *прашчальны вечар* з двайной матывацыяй, у якой адзначаецца час збору моладзі і мэта гэтага мерапрыемства: *Перад свадзьбай у маладой быў прашчальны вечар* (в. Храпкава, Браг. – ВТГ, с.47).

Экспрэсіўнай з'яўляецца аддзеяслоўная намінацыя *гаратнік* (ад *гараваць*), якая ўказвае на мінорную настраёвасць развітальнага з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сяброўкамі вечара ў хаце нявесты: *Вечар напярэдадні вяселля ў дзяўчыны называўся “гаратнік”, таму што дзяўчына развітвалася назаўсёды з падружкамі, з маці, з родным дваром, .. плакала на гэтым вечары* (в. Янова, Гом. – ВТГ, с. 78).

Перадвясельны вечар быў насычаны разнастайнымі рытуальнымі дзеяннямі і актамі. Так, нявеста са сваімі сяброўкамі-дружкамі рыхтавалі вясельнае дрэўца, якое называлася *ёлка, ёлачка, ялец, елец, вёльца, в’ёльца, велца, вельца, велейка, велечка, вельца, свадзебнае дрэўца.* Гэты абрад называўся “віць ельца”, “віць елку”. Днём дзяўчаты прыносілі з лесу маладую ёлачку, “завівалі” яе – упрыгожвалі рознакаляровымі папяровымі кветкамі, стужкамі, свечкамі, цукеркамі, на вярхушку ёлкі вешалі прыгожы вянок. Ёлку ставілі на стол, вакол “ёлкі” сядзелі дзяўчаты, спявалі песні. Затым ёлку хавалі ў кладоўку, каб ніхто не змог да вяселля зламаць яе верхавіну. Калі малады з дружкамі прыязджалі па нявесту, ёлку ўносілі ў хату, малады яе выкупляў. Дзяўчаты сцераглі ёлку. Дружкі маладога або сваты стараліся ўхапіць верх ёлкі. Пасля гэтага ёлку маладая везла да маладога: “*І потым ужо нада пасядзець за сталом, потым маладая выносіць гэту ёлку на двор, і толькі пераступіць парог, як усе, і старыя, і маладыя расхватваюць гэту ёлку і цвяты, малады ламае вярхушку ёлачкі*” (в. Сямёнаўка, Карм. – ВнГ, с. 29); *Усе прысутныя імкнуліся адламаць ад яе галінку ці сарваць кветку, у першую чаргу дзяўчаты, каб хутчэй выйсці замуж* (в. Плёсы, Гом. – ВнГ, с. 159); *Свадзебнае дрэўца ўкрашалі, штоб добра жылоса* (в. Івакі, Добр.); *Дзерава украшалі лентамі, бусінамі разнымі, ставілі пазаді маладых на санях. Азначала прадалжэнне рода, сліянне двух сямей* (в. Покаць, Чач.). Зламаны верх ёлкі сімвалізаваў развітанне нявесты з роднай сям’ёй, завяршэнне яе вольнага дзявочага жыцця, пераход у іншы сямейны статус.

Ролю вясельнага дрэўца выконвалі таксама букецікі з яліцы, галінак грушы, якія ўпрыгожвалі кветкамі, устаўлялі ў хлеб або кадушку з зернем і ставілі на стол: *Віюць вельца з ігрушы з галлямі, упрыгожваюць лентамі, цацкамі, бумагамі. Вельца пасля свадзьбы прыбівалі на хату маладых, пакуль не іссохне* (в. Сувіды, Браг. – ФСГ, с. 49); *Ельца – цвяты, прыдзеланыя к палцы з рагуліны. Ельца стаяла ўсю свадзьбу, штоб маладыя, сям’я іх цвяла, штоб мір быў у сям’і* (в. Дзікалаўка, Гом.).

У маладога таксама маглі завіваць такую ёлку, якую пасля яго дружкі прыносілі да маладой і закідалі на страху, каб у хаце дабро вялося: *Са стараны маладога дзелалі елец. Нескалькі свяцілак .. украшалі ёлачку цвятной бумагай* (в. Перадавец, Ветк. – ВнГ, с. 121).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У сувязі з такім рытуалам існуе назва зборнай суботы “*ёлка*”, якая ўтварылася на аснове метанімічнага пераносу і матывуецца аб’ектам дзеяння: *Нявеста збірала дзевачак, ёлку вілі. Называлася гэта “ёлка”* (в. Задуб’е, Карм. – ВнГ, с. 286).

У гэты ж вечар сяброўкі маладой вілі ёй вянок, дапамагалі прымяраць вясельны ўбор, рыхтавалі кветкі дружкам маладога: *Робяць вянок для маладой, чапляюць к ему каснікі* (в. Дуброва, Лельч. – ВнГ, с. 294); *У суботу раніцай пяць дружак маладой робяць кожнаму дружку жаніха па кветачцы* (в. Баравое, Лельч. – ВнГ, с. 302). У сувязі з гэтым у некаторых мясцовасцях зборны вечар называўся метанімічнай назвай “*вянкі*”, матываванай аб’ектам рытуальнага дзеяння: *Еты вечар так і называўся “вянкі”* (в. Зашыр’е, Ельск. – ВТГ, с. 112); *У суботу дзяўчына запрашала падружак “на вянкі”* (в. Глухаўка, Ветк. – ВТГ, с. 67). Важнейшыя рытуальныя прадметы гэтага вясельнага эпізода – вянок і вясельнае дрэўца – сімвалізавалі прыгажосць, маладосць нявесты, яе чыстату і цнатлівасць.

У зборны вечар у хаце нявесты адбываліся і іншыя рытуальныя дзеянні. “*Завівалі*” не толькі елку, але і нявесту: *Дружкі завівалі нявесту, запляталі касу, надзявалі вянок. Гэты вянок астаўляла нявеста сваім падругам* (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с. 24); *У суботу з раніцы завівалі молоду. Бралі помытую, чысценькую дзяжу, на яе клалі платок з мохрамі, мёд і масла. Потым бралі платок, обвязвалі вокруг головы, а мохры, каб віселі, і пелі* (в Урыцкае, Гом. – ВнГ, с. 163). Дзявочая каса, як вядома, асэнсоўваецца не толькі як сімвал прыгажосці (каса – дзявочая краса), але і як адзнака вольнага, бесклапотнага дзявочага жыцця, з якім цяжка развітвацца [6, с. 48]. Пакрыванне галавы платком сімвалізавала будучую змену ў жыцці маладой і, акрамя таго, выконвала засцерагальную функцыю. “*Завіванне*” суправаджася такімі рытуальнымі дзеяннямі, як падстрыганне і падсмальванне валасоў: *Нявесце падругі яе расчосвалі косы, падсмальвалі трохі. І тады запляталі ў касу* (в. Мохаў, Лоеўск. – ВТГ, с. 300); *Потым падстрагалі валася. Сястра з нажніцамі і свечкай стрыгла валася спераду, ззаду і па баках. Калі ў дзеўкі была каса, то яе распляталі* (в. Лугінічы, Б.-Каш. – ВнГ, с. 94). Названыя рытуальныя дзеянні мелі сімвалічны сэнс. Лёгкае падсмальванне валасоў выконвала магічную функцыю, яно сімвалізавала ачышчэнне праз агонь, іменна такім было сакральнае значэнне агню. Падстрыганне валасоў сімвалізавала абнаўленне жыццёвага ўкладу дзяўчыны, пераход у іншы сямейны статус.

У гэты вечар, акрамя таго, у некаторых мясцовасцях адбываўся “*пасад*” нявесты: *У еты вечар яшчэ многа чаго было. Садзілі на*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кажух, якім накрывалі сундук, – радзіцелі так благаслаўлялі (в. Лугінічы, Б.-Каш. – ВнГ, с. 94); *Перад свадзьбай нявесту дзеўкі украшалі, рабілі прынцэсай настаяшчай і садзілі на квашню, для таго, каб ражала здаровых дзяцей і здаровая была* (в. Покаць, Чач.). Дзяжа, на якую садзілі нявесту, успрымалася як прадуцыравальны сродак на дзетанараджэнне, а кажух як апатрапея ад нячыстай сілы.

У зборную суботу вечарам у хлопца-жаніха таксама збіраліся яго сябры, дружкі, браты і сёстры. Вечар у жаніха не быў так насычаны рытуальнымі дзеяннямі, як у нявесты. Госці маладога ладзілі вясельны поезд, упрыгожвалі яго галінкамі сасны і елкі, лентамі: *Яны гатовілі коней і сані да заўтрага, украшалі веткамі сасны і ёлкі, лентамі .. Шчыталася, што яны праважалі яго хлапецкую жызню. Пасля застолля-вечарыны моладзь накіроўвалася на вячоркі ў хату, дзе яны праходзілі* (в. Лугінічы, Б.-Каш. – ВнГ, с. 94).

Абавязковым атрыбутам перадвясельнага вечара былі песні, як правіла, сумныя, развітальныя: *Да дзяўчыны прыходзілі яе падружкі-шаферкі, .. спявалі песні вясельныя і жалобныя, маладая ў гэты вечар нярэдка плакала, праводзячы сваю маладосць* (в. Лугінічы, Б.-Каш. – ВнГ, с. 94); *А ў пятніцу, напярэдадні вяселля, нявеста рабіла дзявочы вечар .. Сяброўкі спявалі сумныя песні, як бы адгаваруючы маладую ад вяселля* (в. Зашчоўб'е, Рэч. – ВнГ, с. 399); *Дзяўчына развітвалася назаўсёды з падружкамі, з маці, з родным двaром. Абавязкова будучая маладая плакала на гэтым вечары* (в. Янова, Гом. – ВТГ, с. 78). Гэта адлюстроўвалася і ў песнях, прысвечаных развітальнаму вечару: *Зборная суботанька, Зборны дзень. Сабрала дзевачак у ціхі цень, Вяночкі дзевачкі плятуць, За падругу слёзкі льюць* (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с. 24).

Апошні развітальны з сябрамі вечар перад вяселлем характэрны для шлюбнай абраднасці і іншых славянскіх народаў. Блізкія і назвы гэтага перадвясельнага эпізода. Так, у рускай мове апошні вечар перад вяселлем называецца *девичник, девичий вечер, вечерина, прощальный вечер* і інш. [8, 9, 10], ва ўкраінскай мове ён мае адпаведныя назвы *дівич-вечір, вечерини, вечеринка, вечерок, вечерушки, вечір, весільніі вечір, прошчальний вечір, свадібний вечір, дівічнік* і інш. [11, 12].

Такім чынам, перадвясельны развітальны вечар быў абавязковым эпізодам шлюбнай абраднасці на Гомельшчыне, насычаным рознымі рытуальнымі дзеяннямі і актамі. Назвы гэтага вечара разнастайныя паводле структуры, у іх ліку аднаслоўныя намінацыі: *дзявічнік, вечар*, састаўныя найменні: *зборная субота, дзявочы вечар*; розныя і спосабы ўтварэння гэтых намінацый, сярод якіх суфіксальныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэрываты: *вячоркі, хлапечнік, гаратнік*, субстантываваныя назвы: *зборная*, метанімізаваныя найменні: *вянкі, ёлка*. Найменні апошняга вечара перад вяселлем у гаворках Гомельшчыны матываваны часам правядзення, яго мэтай, суб'ектам або аб'ектам дзеяння. Вусная форма існавання народна-дыялектнай мовы, спантаннасць выражэння і непасрэднасць зносін абумовілі актыўнае вар'іраванне намінацый апошняга вечара перад вяселлем у гаворках Гомельшчыны.

Да перадшлюбнай цырымоніі адносіцца таксама "*завіванне*" (упрыгожванне) вясельнага дрэўца, найчасцей ёлкі: *Ёлку дзелалі раньшэ. Вечарам сабіраюцца дзеўкі, ставяць ёлку, украшэнні самі дзелалі, і ужо пеюць тады песні свадебныя абрадныя* (в. Задаты Рог, Ветк.). (Пра вясельнае дрэўца гл. ніжэй, у р. 3 " Прадметны код вясельнай абраднасці і яго моўнае выражэнне ў гаворках Гомельшчыны".

Лексіка каравайнага абраду ў гаворках Гомельшчыны

Да перадшлюбных абрадаў, акрамя таго, належыць выпечка каравая.

Вяселле на Гомельшчыне, як адзначаюць даследчыкі, адносіцца да каравайнага тыпу [13, с. 207]. Каравайны абрад, надзвычай развіты на Палессі, з'яўляецца кульмінацыйным эпізодам шлюбнай цырымоніі [14, с. 25]. "На Палессі выпечка каравая – адзін з абавязковых і цэнтральных момантаў вяселля" [6, с. 16]. Вясельны пірог, які называецца ў нашым рэгіёне к*аравай, пірог, вясельны пірог, хлеб,* з'яўляецца галоўным хлеба-булачным вырабам на вяселлі. Выпечка каравая, якой заўсёды надавалася асаблівае значэнне, была строга рэгламентавана. Было вызначана, хто павінен выпякаць, у чыёй прысутнасці, калі, з чаго, што пры гэтым гаварыць, як даставаць каравай з печы, куды пакласці, дзе захоўваць да вяселля. Выпякалі каравай за дзень да вяселля: *Пякуць яго лепшыя пекары вёскі. Пячэцца два караваі: адзін у доме жаніха – каравай хлопца, другі – у хаце нявесты – каравай дзеўчыны* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 10). Сімвалічнае значэнне каравая падкрэслівалася ўдзельнікамі вясельнай цырымоніі: *Хлеб лічыўся цэнтральнай стараной усяго вяселля, таму, калі яго выпякалі, у песнях пелася, што хлеб выпякаўся на багацце* (в. Саланое, Жлоб. – ВнГ, с. 201). Каравай выпякалі спецыяльна запрошаныя жанчыны, абавязкова няцотнай колькасці – тры або пяць. Іх называлі *каравайніцы, караваіхі, каравайніхі* і хросная маці, сярод іх была *старшая каравайніца,* найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вопытная і спрытная. Каравайніцы абавязкова былі замужнімі жанчынамі, мелі дзяцей і былі шчаслівымі ў шлюбе. Адной з каравайніц павінна быць жанчына, якая нядаўна выйшла замуж. Лічылася, што каравайніцы праз каравай перадаюць маладым лад і шчаслівае сямейнае жыццё (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с.10).

Садзіць каравай у печ павінен быў мужчына як сімвал актыўнага пачатку ў інтымным жыцці. Пасля выпечкі каравай заносілі ў камору і выносілі з яе таксама жанатыя мужчыны і жанчыны, каб маладыя заўсёды жылі ў пары. Калі каравай быў вялікі, яго ўносілі ў хату некалькі мужчын, якіх называлі *каравайшчыкі*: *У склад каравайшчыкаў уваходзіў той, хто багачы* (в. Новае жыццё, Гом. – ВТГ, с. 93).

Як адзначаюць даследчыкі, у ранейшыя часы для выпечкі каравая нарыхтоўвалі спецыяльную муку і спецыяльнае паліва, часцей – каліну, явар, радзей – ліпу, сасну. Працэс прыгатавання каравая быў калектыўнай абрадавай цырымоніяй. Калі малолі зерне на муку для каравая, выконвалі абрад яго “замаўлення” [7, с. 200-204].

Каравайніцай у асобных рэгіёнух называлі таксама дзень, калі выпякалі яго: *А субота ето ўжэ коровайніца. Коровай пякуць* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 160).

Круглая форма каравая – сімвалічная, у яе аснове вобраз сонца, якому пакланяліся старажытныя славяне. У дадзеным выпадку сонца выступала як абярэг для маладых. Інфарматары тлумачылі форму каравая наступным чынам: *Каравай рабілі круглым, каб жыццё гладка шло і не разыходзілася, выпякалі на ім звяроў, каб скаціна ў маладых добра вялася, калачы былі, каб хлеб у хаце быў* (в. Насовічы, Добр. – ЗЧД, с. 207). Касмічныя матывы і салярную сімволіку мелі і іншыя атрыбуты каравайнага абраду. Так, каравай у нявесты выпякаўся *ў форме сонца,* а ў жаніха – *ў выглядзе месяца*: *Каравай у нявесты ў форме сонца, а ў жаніха – ў форме месяца .. Апрача асноўнага каравая, пякуць яшчэ дадатковыя караваі, булачкі, сырнікі* (в. Елянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 63); *Саджаюць яшчэ .. булку без упрыгожванняў, плоскую – каб хутчэй спяклася. Яе потым дзеляць паміж сабой каравайніцы і ўсе прысутныя* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 223). Маленькія булачкі, спечаныя з каравайнага цеста, прызначаліся для пачастунку дзяцей і называліся *каравайчыкі*: *Дзецям аддавалі каравайчыкі* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с.6).

Калі каравай вымалі з печы, абвязвалі ручніком, лажылі на вечка ад дзяжы, засланае абрусам, на які насыпалі зерне аўса або пшаніцы, гаспадар браў каравай разам з вечкам і павольна *па ходу сонца* ішоў да каморы (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 225); Дзялілі каравай звычайна ад маладой рукі, г. зн. *па ходу сонца* (в. Вулкан, Лоеўск. –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Лоеўшч., с. 234). Пасля дазволу завесці маладую за стол, брат падводзіў яе к маладому толькі *па сонцу* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 40).

Каравай сімвалізаваў багацце, шчасце і дабрабыт будучай сям'і. "Прысутнасць каравая на вяселлі азначала пажаданне гэтага шчасця і дабрабыту маладой сям'і" [15, с. 21]. Кожны чалавек мог мець каравай толькі адзін раз на вяселлі. Калі ў шлюб уступалі ўдавец або ўдава, каравай не выпякаўся.

Асаблівая ўвага ўдзялялася ўпрыгожванню і аздабленню каравая: *А каравай быў красівы, перавязаны накрыж краснымі лентамі* (г. Рэчыца, Гом. – ВнГ, с. 96); *На каравай пяклі розачкі з цеста, вулепвалі верабейкі на ім* (в. Грабаў, Петр. – ВТГ, с. 367); *Гатовы каравай украшалі хресцікамі, кружкамі і фігуркамі з таго ж самага замеса каравая* (в. Новы Мір, Ветк. – В., с. 227); *З цеста робяць упрыгожванні для каравая – шышачкі, птушачкі, лісцікі* (в. Елянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 63). Разнастайныя элементы дэкору каравая – *шышкі, фігуркі, хресцікі, кружкі, птушкі, месяцы, кветкі, лісцікі, пляцёнкі, васьмёркі* – мелі глыбокі сімвалічны сэнс, які ў поўнай меры сучаснымі носьбітамі традыцыйнай культуры ўжо не ўсведамляецца. Так, напрыклад, *птушкі* (галубкі, верабейчыкі), дзякуючы наяўнасці крылаў і здольнасці лятаць, сувязі з паветранай стыхіяй, увасабляюць душу чалавека, а таксама сімвалізуюць адраджэнне, вясну і свабоду. *Кветкі*, як і *лісточкі*, – сімвал маладосці, прыгажосці і жыццёвай сілы. *Ружа* да таго ж сімвалізуе дзявочую прыгажосць і цнатлівасць. *Каласкі* – сімвал урадлівасці, дастатку і дабрабыту. *Крыж* указвае на сувязь з Богам, а таксама адлюстроўвае старажытнае ўяўленне пра перасячэнне зямнога і нябеснага свету, бачнага і нябачнага, перакрыжаванне на жыццёвай дарозе чалавека, яго лёс. *Круг* увасабляе бесперапыннасць развіцця, вечнасць існавання, *пляцёнка* – сімвал бясконцага цыклу адраджэння, узнаўлення і даўгалецця, *васьмёрка* – аб'яднанне мужчынскага і жаночага пачатку. Асабліва папулярныя ў каравайным абрадзе *шышкі*, якія выпякаліся як на караваі, так і асобна з каравайнага цеста. Яны былі сімвалам урадлівасці і пладавітасці [16]. Калі вымаюць каравай з печы, яго "*ложаць на абрус, на які сыплюць зерне аўса або пшаніцы. А сам каравай абвязваюць ручніком*" (в. Вязок, Браг. – ВнГ, с. 30). *Ручнік* сімвалізаваў яднанне двух сем'яў і сувязь маладых з іх родам [17].

Прысутнічала ў каравайным абрадзе Гомельшчыны і лічбавая сімволіка. Гэта была пераважна магія лічбы 3. Так, гэта лічба ўлічвалася пры выпечцы і ўпрыгожванні каравая: *Зрабіўшы рошчыну, яны закрываюць дзяжу, а мужчыны перакручваюць яе* <u>*тры*</u> *разы і ставяць на крыж супраць печы* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 223);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Выпякалі часта тры караваі: *Адзін каравай робяць у выглядзе паўмесяца, другі ў форме вялікай булкі, невялікая булачка – трэці каравай. Гэтыя тры булкі ўпрыгожваюць рознымі фігуркамі* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 223); *Робяць упрыгожванні: тры птушкі, тры месяцы, тры кветкі..* (в. Вязок, Браг. – ВнГ, с. 30). *Раздача каравая маладой пачыналася за трэццім сталом* (в. Данілавічы, Ветк. – ВнГ, с. 106).

Рытуальны хлеб, якім з'яўляецца каравай, ва ўсходніх славян асэнсоўваўся як Божы дар. Рэлікты такога ўяўлення захаваліся ў вясельных песнях Гомельшчыны, якія спяваюць пры выпечцы каравая. Дарэчы, на Гомельшчыне надзвычай развіта каравайная песенная традыцыя: *Сам Бог каравай месіць, а Прэчыстая свеціць. Ангелы воду носяць, а прарокі Бога просяць. Хрыстос подлівае, хусткою накрывае*; *Тройца по цэркві ходзіла, Спаса за руку водзіла. Прэчыста маці, прыйдзі к нашай хаці Коровай рашчыняці, вяселле почынаці* (в. Запясочча, Жытк. – ВТГ, с. 201). Асаблівая роля гэтага кулінарнага вырабу ў вясельнай абраднасці падкрэслівалася ў песні, дзе пералічваліся састаўныя кампаненты каравая: *Ніхто не ўгадае, Шо ў нашом да короваі: З трох нівок пшаніца, З трох бочок мучыца, З трох рэчок водзіца І дзве кваскі масла, А трэця – доля шчасна* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 160). Значэнне каравая ў шлюбным абрадзе ўзмацнялася частым зваротам да Бога ў каравайных песнях, выконваемых у час яго выпечкі: *Наш каравай на веку, на веку, Дай жа, Божа, да веку, да веку, Наш каравай на жыце, на жыце, Дай жа, Божа, спажыці, спажыці* (в. Запясочча, Жытк. –ВТГ, с. 200). Адносіны да каравая як да Божага дара праяўляліся і ў асаблівых, набожных паводзінах прысутных пры яго выпечцы: *Жанчына, якая меся каравай, сыпле ў дзяжу муку, але перад етым яе хрэсціць тры разы* (в. Саланое, Жлоб. – ВнГ, с. 199); *Калі ўжо замясілі цеста і сабіраюцца яго паставіць у печ, кажуць: "Благаславіце каравай і каравайніц, бацька і матка, людзі добрыя"* (3 разы) (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с.24); *Хросна маці бярэ лопату. Сцены ею хрысціць. Да ўсадзіць хросна ў печ* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 161–162); *Калі пеклі каравай, то бабуля над ім чытала малітву, але так, каб ніхто не чуў і не бачыў* (в. Раманавічы, Гом. – НДС, с. 223); Калі каравай вымалі з печы, *"кожная з каравайніц павінна была пацалаваць яго"* (в. Саланое, Жлоб. –ВнГ, с. 205).

Працэдура падрыхтоўкі цеста, выпечкі каравая і яго раздача на вяселлі складае свайго роду алгарытм, які ўключае сукупнасць паслядоўных, абумоўленых шлюбным рытуалум, дзеянняў. Так, працэс падрыхтоўкі каравая ўключае некалькі этапуў, якія маюць адпаведныя назвы. Акрамя намінацый, якія выкарыстоўваюцца ў прамым значэнні і абазначаюць этапы выпякання каравая тыпу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рашчыняць (учыняць) каравай, замешваць цеста, садзіць у печ, пячы, выпякаць, упрыгожваць, у гаворках Гомельшчыны функцыянуюць метафарычныя назвы дзеяння, што ўжываюцца ў пераносным сэнсе: “*мачыць*”, “*паліць*”, “*замочваць*”: *Пірог замешвалі ў дзежцы ў хаце жаніха і нявесты. Учынялі цеста ў суботу ўвечары* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с.5); *Рашчыняюць каравай – спяюць, замесяць – спяюць. А тагда саджаюць у печ* (в. Дуброўнае, Браг. – ВТГ, с. 27); *Як каравай вынімалі, так яго і “мачылі”, г.зн. пакрывалі стол, пілі гарэлку* (в. Малыя Аўцюкі, Калінк. – ВнГ, с. 264); *Каравай садзяць у печ, а каравайніцы ідуць за стол, каб “паліць” каравай. “Наліваюць” каравай такім чынам – п’юць гарэлку, закусваюць, спяваюць* (в. Гажын, Нараўл. – ВнГ, с. 351); *Потым (пасля дарэння) каравай замочваюць, а маладую ў гэты час замотваюць* (в. Бывалькі, Лоеўск. – Лоеўшч. , с. 231). Тое, што назвы некаторых дзеянняў, звязаных з выпечкай вясельнага пірага і яго раздачай, мелі сімвалічнае значэнне, адлюстроўвае адухаўленне, апатрапеічны падыход да вясельнага пірага, які асэнсоўваўся як самастойная жывая істота: яго не ставілі ў печ, а *садзілі*, у песнях звярталіся да яго, як да адушаўлёнай істоты, персаніфікавалі яго.

Важным кульмінацыйным момантам шлюбнай цырымоніі была працэдура разразання і раздачы каравая. Вясельны пірог выносілі ўрачыста, пад музыку, ставілі на стол на прыгожым падносе перад маладымі, гарманісты іграли марш. Каравай рэзалі звычайна хросны або родны бацька. Перш чым пачаць разразаць каравай, ён тройчы пытаў благаславення ў бацькоў маладых: *Сват гаворыць: “Хто ў гэтай хаце айцец і маці, разрашыце каравай благаслаўляці”. Пачынае дзяліць каравай* (в Лескі, Акц. – ВнГ, с. 7). Адказнасць гэтай працэдуры падкрэслівала спецыяльная падрыхтоўка да яе раздачы: *Для гэтага абнаўляюць сталы, наводзяць чысціню. Маладых садзяць на кажух або шубу. Рукі накрываюць ручніком. Калі прыносяць каравай, бацька хросны ўстае з-за стала, мые рукі і прося ручнік. Маці нявесты перавязвае яго ручніком праз правае плячо, праз левую руку. Потым бацька хросны выразае вярхушку каравая і дае маладым, а астатні каравай рэжа на часткі* (в. Елянец, Б.-Каш. – ЖПР, с. 204).

Раздача каравая суправаджалася віншаваннямі і падарункамі маладым ад родных і гасцей. Пачцівыя адносіны да каравая праяўляліся і ў тым, што калі дзялілі каравай, маладыя стаялі: *Выносілі каравай пад музыку .. Маладыя ўстаюць із кута, становяцца .. Рэзалі каравай родны бацька ці хросны*; каравай бралі толькі насоўкай: *Голымі рукамі нельзя было браць, гэта, каб маладыя бедна не жылі* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 49).

Лексіка, якая называе рытуал раздачы каравая, складае своеасаблівую парадыгму, што ўключае, па-першае, слоўнае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абазначэнне дзеянняў распарадчыкаў на вяселлі, звязаных з раздачай каравая: *уносіць каравай, склікаць, выклікаць (вызываць) на каравай, дзяліць каравай, гуляць каравай*: *Бацька хросны маладога дзеліць каравай* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с.8); *Убіралі стол, ставілі гарэлку, пакрытую насавым платком, і хросны бацька вызываў на каравай* (в. Касакоўка, Жлоб. – ВнГ, с. 198); *Радня маладога адзяляе маладую і яе радню грашымі. Гэта называецца "склікаюць на каравай", гэта значыць, што ўсе адораныя павінны дарыць падарункі і грошы маладым у час раздзелу каравая* (в. Даўляды, Нараўл. – ВнГ, с.346); *Каравай ужэ гуляюць* (в. Пакалюбічы, Гом. – НДС, с. 215) і, па-другое, назвы адпаведных дзеянняў гасцей у адказ на запрашэнне на каравай: *прыбыць на каравай, лажыць на каравай, купляць каравай*: *Яго дзяліў галоўны сват са словамі:"Ласкавы былі, на каравай прыбылі"* (г. Калінкавічы – ВнГ, с. 271); *"Купляць" каравай прыходзілі: спачатку бацькі з боку маладой, затым хросная з хросным, сёстры, браты, а затым астатнія родзічы* (г.п. Церахоўка, Добр. – ВнГ, с. 175); *Гулялі свадзьбу ў маладой, значыць, яна дае падаркі ўсёй радне. Тыя тожа "ложаць" на каравай* (в. Перадавец, Ветк. – ВнГ, с. 123).

З караваем на Гомельшчыне, як і ў іншых рэгіёнух, было звязана шмат народных павер'яў і прыкмет: *Цеста мясілі не кулакамі, а далонямі, каб малады не біў жонку*; *Калі каравай ужо быў у печке, жанкі мылі рукі, і тую воду аддавалі маладой. А яна вылівала яе пад вішню: Каб вішанькі развіваліся, а маладыя красаваліся...* (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 360); *Калі хто ўкрадзе на вяселлі кусок каравая – у маладых можа не быць дзяцей* (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 362); *Каравай у хмурныя дні рашчыняюць тады, калі выгляне сонца з-за хмары, бо верылі, што маладых чакаюць сумныя дні* (в. Касакоўка, Жлоб. – ВнГ, с. 199); *І яшчэ гаварылі, што каравай трэба змазаць яічным бялком, каб маладыя жылі ладком* (в. Саланое, Жлоб. – ВнГ, с. 205); *Калі дзеляць каравай, то спачатку першыя яго кавалкі даюць маладым і назіраюць за тым, "хто з іх, адкусіўшы каравай, будзе верхаводзіць у сям'і"* (в. Данілавічы, Ветк. – ВТГ, с. 13); "*Каравай нельга было браць голымі рукамі",* каб жыццё маладых было заможным, не бедным (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 361); *Ваду, у якой каравайніцы мылі рукі, вылівалі пад дрэвы, у хлеў, каб быў добры ўраджай і ў хлеве было поўна жыўнасці* (в. Данілавічы, Ветк. – ВнГ, с. 105).

Каравай меў таксама прадказальную функцыю. Як адзначаюць інфарматары розных населеных пунктаў Гомельскай вобласці, па гатовым караваі прадказвалі, якое жыццё будзе ў маладых: *Калі каравай не выпечацца добра, то не бяда, кажуць, што нявеста будзе добрая, гладкая, ды здаровая. А калі каравай, бывае, расколецца, то*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўжо прыкмета, што маладыя не будуць разам. Канешне, жанчыны стараюцца, каб госці не бачылі гэтага (в. Галоўчыцы, Нараўл. – ВнГ, с. 337); *Калі пірог падымаўся высока, то лічылі гэта добрай прыкметай* (в. Валосавічы, Акц. – ВТГ, с. 24); *Калі каравай удаваўся, лічылі, што гэта на шчасце. Асабліва лічылася добрай прыкметай, калі каравай падымаўся настолькі, што яго нельга было выцягнуць з печы, трэба было вымаць некалькі цаглін* (в. Кругавец, Добр. – ВнГ, с. 177); *Лічылася, калі каравай будзе мяккім, будзе рассыпацца, то такой жа недаўгавечнай і рассыпчатай будзе іх каханне. Калі каравай цверды (але не зусім чэрствы), то і каханне будзе назаўсёды, і маладыя будуць жыць разам усю жызнь* (в. Янова, Гом. – ВТГ, с. 78); *Абавязкова даглядалі, каб каравай не перапёкся, каб не трэснула корачка, бо лічылі, што жыццё маладых будзе таксама расколаным* (в. Саланое, Жлоб. – ВнГ, с. 203); *Калі ж каравай у печы хаця б троху прыгарэў, то тады жыцця ў маладых не будзе, доўга разам жыць не будуць, так лічылася* (в. Бацунь, Б.-Каш. – ВнГ, с. 83).

Назвы, вытворныя ад лексемы *каравай*, складаюць своеасаблівую словаўтваральную парадыгму. Гэта, як правіла, суфіксальныя субстантыўныя дэрываты – назвы дзеючых асоб: *каравайніца, караваіха, каравайніха, каравайшчыкі,* памяншальная назва вясельнай булачкі: *каравайчыкі,* метанімічная тэмпаральная назва: *коровайніца* ‘субота, калі выпякаецца каравай’, ад’ектыўная намінацыя *каравайны*, якая выкарыстоўваецца ў складзе словазлучэнняў атрыбутыўнага тыпу *каравайнае цеста, каравайная гарэлка, каравайныя песні*.

Каравайны абрад суправаджаўся некаторымі дадатковымі рытуальнамі дзеяннямі: пасадам маладых, іх “біццём”, стуканнем лапатай, на якую садзілі каравай: *Да ўсадзіць хросна ў печ. Да ўжэ молоду по голове лопатою тоею б’е, тры разы білі. І молодого білі. Б’е й прыказвае: “Дай Бог шчасця”. А ека прыказвала: “Ето на сына, ето на дочку”*; *На лопату жыто сыплюць, шоб жытка ў молодых добра була, хмель, шоб дзеці вяліса* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 161–162); *Каравай скончыўся. Хросны бацька разбівае талерку на шчасце* (в. Елянец, Б.-Каш. – ЖПР, с. 204). Сімвалічнае “біццё” маладых, як і біццё посуду, мела пэўнае магічнае значэнне – адганяць злых духаў .

Некаторыя абрадавыя дзеянні, звязаныя з караваем, маюць засцерагальны і прадуцыравальны характар. Так, каравай рашчынялі ў дзяжы, якую ставілі на кажух: *Уносілі дзяжу бацькі і абавязкова ставілі на кажух, на шчасце, таму што поўсць .. адпугвала нячысцікаў, якія .. хацелі зрабіць шкоду, і ў той жа час мясілі хлеб, хлеб на шчасце* (в. Саланое, Жлоб. – ВнГ, с. 201); *Дзяжу для цеста ставілі пасярод хаты на вывернутым кажусе, сыпалі ў яе муку і лілі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ваду за адзін прысест (в. Данілавічы, Ветк. – ВнГ, с. 105). Такі своеасаблівы “пасад каравая” быў абярэгам ад суроку або шкоднага ўздзеяння варожай субстанцыі. Выкарыстанне вывернутага мехам наверх кажуха характэрна для многіх вясельных эпізодаў. Як адзначаюць даследчыкі, гэты звычай “паходзіць ад татэмічнай абраднасці і звязанымі з ёю павер’ямі .. Шкуры татэма прыпісваецца гаючая сіла – выганяць з чалавека хваробы” [7, с. 107]. Вывернуты мехам наверх кажух з’яўляўся, такім чынам, своеасаблівым апатрапеем. Дзяжа ж асэнсоўвалася як праекцыя на сямейнае жыццё, сімвал пладавітасці: *Пасадзілі каравай, дзеўкі хватаюць дзяжу, хто першая схопіць, тая пойдзе ўперад замуж* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с. 6); *Калі ў бацькоў ё яшчэ дочкі на выданні, сват пасля таго, як рашчыняць каравай, прыпадымае ўгару дзяжу ў чатырох супрацьлеглых месцах. Гэта для таго, каб і яны на месцы не сядзелі* (в. Касакоўка, Жлоб. – ВнГ, с. 199).

Каравайны абрад характэрны таксама для шлюбнай абраднасці іншых славянскіх народаў. Лексіка каравайнага абраду з’яўляецца ў большасці сваёй агульнай для ўсходнеславянскіх моў. Так, у розных рэгіёнах Украіны актыўна выкарыстоўваюцца наступныя намінацыі рытуальнага хлеба: *коровай, лежень* ‘разнавіднасць караваю’, *весільний калач, голуби* ‘каравай для маладых, упрыгожаны птушкамі’, *праник, борона* ‘печыва для адорвання бацькоў маладой’, *шишки* ‘печыва для адорвання каравайніц і гасцей’, адпаведныя рытуальныя дзеянні з караваем называліся *д’ілити короваї, продавати короваї, р’ізати короваї.* Жанчын, якія выпякалі каравай, іменавалі *коровайниці,* хлеб для адорвання дружак або гасцей – *коровайчик, коровайчики* , выкарыстоўвалася таксама лексема *калач* ‘каравай маладога’, ‘хлеб для абмену паміж сем’ямі маладых’, *калачик* ‘хлеб для маладых’ [11, с. 95–101; 12].

Да перадшлюбнай цырымоніі адносіцца *расплятанне* касы нявесты: *Самы меншы брат расплятаў касу. Яму даюць дзесятку дзенег і канхвет. Нявеста ў гэты час сядзіць пад ёлкай. А запляталі дзеўкі. Запляталі маладую ў адну касу, ленты ўпляталі* (в. Рэчкі, Ветк. – ВнГ, с. 103).

Назвы сімвалічных дзеянняў і актаў шлюбнага этапу

Шлюбны этап з’яўляўся самым насычаным і развітым. У ім выдзяляліся тры перыяды: пачатковы (адзяванне жаніха і нявесты, расчэсванне касы нявесты, бласлаўленне маладых, паездка жаніха за

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нявестай, выкуп нявесты) цэнтральны (вянчанне, пярэймы, застолле ў доме нявесты, пасад маладых, адорванне маладых з караваем, зборы нявесты да ад'езду з дому бацькоў, провады нявесты, вясельны поезд, прыезд у дом жаніха, прывоз пасцелі нявесты, застолле ў доме жаніха, завіванне маладой (пасвячэнне ў сан замужняй жанчыны) і заключны (шлюбная ноч, заканчэнне вяселля) [4, с. 126–127] .

Абавязковым момантам вясельнай абраднасці, які захаваў сваю актуальнасць да нашых дзён, з'яўляецца **благаславенне маладых** бацькамі: *У суботу .. раніцай у доме нявесты збіраліся яе падружкі і пачыналі прыбіраць нявесту, .. маці і бацька давалі ёй благаслаўленне* (в. Зашчоб'е, Рэч. – Р., с. 161); *Пасля гулянкі малады забірае маладую к сабе дамой. Бацька і матка благаслаўляюць.. З іконай бацькі маладых водзяць вакруг стала тры разы і благаслаўляюць іх у дальнюю дарогу* (в. Свяцілавічы, Ветк. – В., с. 229).

Наступнай важнай падзеяй у вясельна-абрадавым рытуале з'яўляецца **вянчанне ў царкве**, якое было неабходным актам у мінулым і актыўна адраджаецца ў наш час. Як вядома, абавязкова перад вянчаннем маладыя павінны наведаць царкву: *Перад свадзьбай маладыя даўжны іці ў цэркаў, адстаяць там службу, іспаведацца і прачасціцца* (в. Церуха, Гом.); *Вянчацца ездзілі да свадзьбы* (в. Кацуры, Петр. – ВТГ, с. 370); *Перад вянчаннем маладыя не павінны есці* (в. Пціч, Петр. – ВТГ, с. 372); *Венчаў бацюшка у цэркаві, эта было ат бога. Тая пара жыла без разводаў* (в. Барталамееўка, Ветк.). Вянчанне адбывалася наступным чынам: *Расцілалі рушнік тканы, вышываны, па баках клалі капейкі, сведкам у рукі давалі венчыкі, і яны іх трымалі над галавамі маладых усю службу. Затым маладым бацюшка з адной кружкі даваў па тры разы выпіць віна царкоўнага, а затым абменьваў пярсцёнкамі таксама тры разы* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Калі ў царкве вянчаліся, дак на рушнік станавіліся. Для шчасця так было. Дружок з дружкай дяржаць вянкі ззаді, а тады ўжо ходяць па рушніку туды-сюды. Рушнікі льняныя былі, іх нявесціна матка давала і засцілала іх сама. А маладыя шлі, узяўшыся за рукі, па ім удоўж іканастаса. А хто первы ўстане на рушнік, дак той глаўны ў сям'і буде* (г. Ветка). Рушнік, на які станавіліся маладыя ў час вянчання, сімвалізаваў дарогу, будучы жыццёвы шлях, які яны павінны прайсці разам.

Традыцыйным і абавязковым на вяселлі з'яўляецца **"абсяванне" маладых**. Так, пасля вянчання або роспісі, калі маладых сустракалі хлебам-соллю, іх абавязкова абсыпалі зернем, макам, канфетамі, манетамі, што выражала пажаданне багатага, шчаслівага жыцця, сімвалізавала і праецыравала іх будучы дастатак і здароўе: *Када жаніх за маладой прыходзіў, нявесту бацька зярном пасыпае, а*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жаніху ўжо ў карман насыпаюць, штоб багаты былі. І хрэсцят іконай (в. Старое Сяло, Ветк.); *Абсыпалі маладых пшаніцай, што б добра жылі* (в. Хальч, Ветк.); А*бсыпаюць маладых жытам, каб яны жылі багата* (г. Ветка).

Скразным рытуалум шлюбнага этапу вяселля, які займаў важнае месца ў абрадзе, быў **выкуп** і адпаведнае дзеянне *выкуплівацъ, выкупваць, вукупляць, делаць выкуп, скупляваць, купляць, "лавіць зайца"* (руск. *выкуп, магарыч, поклаж*; укр. *викуп, викуповувати*). Гэты абрад адносіцца да архаічнага звычаю, што паходзіць ад старажытнай абрадавай формы "купля – продаж" нявесты як плата за дзяўчыну-працаўніцу. Як адзначаецца ў навуковай літаратуры, вядомы дзве старажытнейшыя формы заключэння шлюбу: першая – выкраданне нявесты і больш позняя – "купля-продаж" нявесты [7, с. 51–52]. Рэшткі першай формы заключэння шлюбу на Гомельшчыне сустракаюцца вельмі рэдка. Выкуп як перажытак другой формы заключэння шлюбу ("купля-продаж" нявесты) ужываецца паўсямесна. Старажытнае абрадавае значэнне выкупу ўжо значна аслаблена, таму ён выкарыстоўваецца некалькі разоў на вяселлі і яго асноўная функцыя – матэрыяльная дапамога сям'і нявесты, кампенсацыя за выдаткі на вяселле. Выкуп плацілі не толькі за нявесту, але і за вясельную ёлку, пасцель і пасаг маладой, праезд на шляху вясельнага поезда і інш.: *Жаніх сам заязджаў за маладой. Сразу шчэ нада было яе купляць у падружак. Нявесту хавалі, а жаніх з друззямі шукаў, ну, не знайшоўшшы, нада плаціць. Патом ужэ прадавалі яму нявесту* (Старое Сяло, Ветк – В., с. 225); *Як маладых вязуць, дак дарогу перагароджваюць людзі – выкуп так просяць за невесту. Ім ужэ вынясуць бутылку, закусі, што папросяць людзі* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Прыданае везлі ўжо к маладой .. Ну, прывязуць еты сундук. Во, едзе сват, выкупляе .. Бутылку пастанове. Там па чарцы нальe. Выкупіць* (в. Рэчкі, Ветк. – ВНГ, с. 100); Нявесту *"ужо вядуць з-пад ёлкі к маладому падругі за руку і там яе содзяць. І вот маладзёж ёлку ету прадала, ім далі грошы на рукі, гасцінцы далі на рукі"* (ВнГ, 102).

Абавязковым элементам вясельнай абраднасці было **адорванне** маладых гасцямі і падарункі радні з боку маладых, што мелі назву *адорванне, дары, падаркі, "лажыць"на каравай, дарыць* (руск. *одаривание, золочение, подарки, каравайные дары, отдарки;* укр. *обдаровування, дарунки, падаркі*): *Палаценцы дарылі, пелі, гулялі так свадзьбу маю. Шчэ і пасуду маглі дарыць* (в. Гарошкаў, Рэч.); *У першы дзень свадзьбы падаркі дарылі маладой. Дарылі ў каго што было: хто грошы, хто хустку, хто курыцу. На другі дзень свадзьбы маладая дарыла падаркі радне маладога* (д. Івакі, Добр.); *Папам і*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мамам давалі падарункі: рубашкі, мацерыял. Сваты прыносілі хлебушак, бутылку (в. Жмураўка, Рэч.); *Каравай раздзялілі, і нявеста давала падаркі бацьку і матке хрёснай, бацьку хрёснаму свайму і жаніха. А патом нявесце давалі падаркі матка і бацька хрёсныя і ўсе, каму нявеста давала падаркі* (Новы мір, Ветк – В., с. 227); *А ўжо на свадзьбе матка платкоў накупляла – залоўкам па платку ўжо дарылі, братам на рубаху якога сітцу дарылі* (в. Рэчкі, Ветк. – ВнГ, с. 98); *На каравай дарылі, прыказкі ўсякія гаварылі .. Вызывалі па вочарадзі. Каждый падходзіў, каждый дарыў. І грошы дарылі, ну. Хто што. Хто курэй дарыў, хто парасёнка, хто карову дарыў* (в. Новыя Галоўчыцы, Петр. – ВТГ, с. 369). Адорванне звычайна суправаджалася жартаўлівымі пажаданнямі. Яно, як і выкуп, мела на мэце матэрыяльную падтрымку маладых і іх сем'яў, а таксама было зручным момантам для выказвання віншаванняў і пажаданняў.

Важным вясельным абрадам на Гомельшчыне быў **пасад маладых** паасобку або разам на дзяжу, у якім выражаліся матывы ініцыяцыі, сімвалізавалася полаўзроставая спеласць маладых, а таксама праецыравалася будучае дзетанараджэнне. Маладых на вяселлі садзілі *на кажух, аўчыну, на шубу, на падушку: Маладых садзілі на кажух або на падушку, каб усё добра было* (г. Ветка); *На пасад кладуць на кут кажух вывернуты, калматы, содзюць маладых* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 232); *Пасад быў. Вывараччвалі шубу назнанак. Садзілі нявесту. І садзілі жэніха радам. Нельзя было ставіць возле іх гарэлку, патаму што ў іх первая ноч, очань важна быць цвярозым. Ну і сядзелі на том пасаду, штоб у іх ўсё добра было* (в. Хальч, Ветк.). На пасад маладую вёў яе брат. На пасадзе маладой расплятали касу, што сімвалізавала пераход яе ў іншы сямейны статус: *Калі на пасад содзюць, касу маладой расплятаюць. Расплятае брат, калі ёсць, калі не – то пляменнік, а жаніх ужо яму плоціць грошы, што касу расплялі, завязвае нявесце платок* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 232).

Гэты рытуал суправаджаўся спецыяльнымі песнямі: *Падругі садзяцца за стол, як ужо забіраць маладую, пяюць ёй пасад* (г. п. Церахоўка, Добр.); *З каморы брат родны ці дваюрадны вёў маладуху ў хату. Калі заходзілі, то ўсе ўставалі .. Брат вёў маладую да вобраза. Му ўжо пяем песню "Брат сястру на пасад вядзе"* (в. Ванюжычы, Петр. – ВнГ, с. 354).

Цікава, што абрад пасаду мог суправаджацца дадатковымі рытуальнымі дзеяннямі: *Брат вёў маладую на пасад. Далей за ёй ішлі дружкі. Іх было 5-7. Паследняй ішла дзеўка, якую называлі хвастом.. Хлопцы стараліся біць папругамі дзяўчат. Больш за ўсё пападала дзеўцы-хвасту* (в. Ванюжычы, Петр. ВнГ, с. 354). Як адзначаецца ў літаратуры, гэта вельмі архаічны абрадавы рытуал, які адносіцца да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

патрыярхальнай эпохі: “Маханне і шчоўканне бізуном падчас магічных абрадаў было шырока распаўсюджана і мае абсалютна пэўнае значэнне – адганяць злых духаў” [7, с. 124].

Магічныя функцыі аховы, засцерагання і пажадання поспеху прыпісваліся ў вясельнай абраднасці і **разбіванню посуду**. Як лічыцца, гэты звычай, распаўсюджаны ў славян, меў асацыяцыю з дэфларацыяй і родамі [18]. У наш час гэтаму звычаю прыпісваюцца засцерагальная і прадуцыравальная функцыі. Кажуць, што посуд б’ецца на шчасце. Мноства асколкаў і чарапкоў ад разбітага посуду сімвалізуе прымнажэнне і набытак у сям’і і гаспадарцы. Перш за ўсё разбівалі чаркі, з якімі маладых сустракалі бацькі або з якімі яны сядзелі на вяселлі: *Як прыходзілі маладыя з роспісі, сцялілі палаценца, падносілі, налівалі чаркі, яны не далжны былі піць тых чарак, а далжны былі так выліць чэрэз себе і разбіць іх, штоб багатыя былі* (в. Хальч, Ветк.); *На свадзьбу уже пасля каравая прынята была разбіваць румкі, каторыя выпівалі маладыя. Калі не разбіваліся, гаварылі, што ета плоха* (г. Ветка); *Бацькі сустракалі маладых на ўваходзе, ставілі стол, на ім – хлеб, вікона, канфеты, бутылка .. Маладыя цалавалі вікону, выпівалі чарку не усю, цераз сябе кідалі і разбівалі чарку, кусалі хлеб, канфеты кідалі цераз галаву, а дзеці збіралі* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Біццём посуду суправаджаліся і іншыя эпізоды вясельнай цырымоніі: *Калі маладыя жаніліся, ішлі па вуліцах, па сялу, то над маладой білі кушыны, банкі. Гэта, каб крэпкі быў жывот, каб радзіць здаровага дзіцёнка* (в. Старое Сяло. Ветк.); *Ужо банкет як ідзе, так глядзяць, ідзе тут вісяць на коллі кушыны, бяруць палкі і б’юць. Гавораць: дзе твае кушыны. Потым нявесту за рукі, за ногі распластаюць, дзержуць, і кушыны кала жывата і лупяць палкай, штоб вынасіла крэпкага моладца* (в. Хальч, Ветк.). Біццё посуду магло сігналізаваць аб заканчэнні вяселля: *На трэці дзень, вечарам сабіраліся ўжэ ў госці .. У канцы вечара на жываце бацькі маладога білі гаршчок з попелам, што сімвалізавала канец вяселля* (в. Ліпнякі, Лоеўск. – Лоеўшч., с. 252).

Галоўнай ідэяй шлюбнага абраду з’яўляецца **яднанне жаніха** і нявесты. М. М. Нікольскі называе рытуал “злучэння маладых” “асноўным абрадам вясельнага рытуалу ўсіх часоў і народаў” [7, с. 109]. Аб’яднанне маладых, іх сувязь, шлюбны саюз, стварэнне сям’і сімвалізавалі стужкі, рушнік, пояс, якімі перавязвалі маладых, пярсцёнкі, якімі яны абменьваліся, і іншыя прадметы. Гэты рытуал сімвалізаваў стварэнне адзінай сям’і, непарыўную сувязь маладых. Сімвалам шлюбнага саюза з’яўляюцца заручальныя пярсцёнкі, якімі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маладыя абменьваюцца ў царкве пры вянчанні і ў загсе пры рэгістрацыі: *Бацюшка абменьвае пярсцёнкамі тры разы, у апошні раз маладыя забіраюць і надзяваюць сваі пярсцёнкі* (в. Заспа, Рэч.); *Поп чытае малітвы. Патом поп знімае з іх персні, каторые жаніх і нявеста далжны купіць сабе самі* (в. Новы мір, Ветк. – В., с. 227). Маладых на пасадзе маглі звязваць каляровым поясам або наміткай, што сімвалізавала іх з'яднанне, заключэнне шлюбнага саюза. *Маладых садзяць на кажух або шубу. Рукі накрываюць ручніком* (в. Елянец, Б.-Кашал. – ВНГ, с. 65); *Баба абвязвала саматканым поясам маладых, каб булі неразлучнымі* (в. Ванюжычы, Петр. – ВнГ, с. 355); *Калі толькі маладую пачынаюць выводзіць з хаты, бацька знімае ікону, і дае ёй у рукі, а жаніху – кулітку хлеба. Перавязвае рушніком рукі, тры разы вакол таго стала абвядзе і прывядзе да самых калёс. Вядзе к возу і там знімае рушнікі* (в. Заспа, Рэч.); *Пасля завівання маладой яе з молодым рушніком перав'язваюць і, значыць, наліваюць ім у стопачкі гарэлку і кідаюць копейкі, яны ўжэ манеты адзін аднаму за пазуху кідаюць, гарэлку ўбок выліваюць і цалуюцца* (в. Клімаўка, Гом.).

Рушніком або лентай звязвалі не толькі маладых, але і асобныя прадметы, якія выкарыстоўваліся ў вясельным рытуале: *Калі вяселле заканчывалася, свякруха брала рушнік, складвала ў яго выцертыя талеркі, вілкі, ложкі, стаканы, абвязвала рушнік лентай васьмёркай, як младзенца, і клала яго ў сундук. Гэты рушнік ніколі не развязваўся. Толькі тады, калі праз тры гады ў маладых не было рабёнка, муж мог аддаць рушнік жонцы і адправіць яе дамоў* (в. Баршчоўка, Добр. – ЗЧД, с. 250); *Бацька ўручае маладым дзве драўляныя лыжкі, звязаныя краснай лентай, а маці перавязвае маладым рукі платком і ўводзіць у хату* (в. Пціч, Петр. – ВТГ, с. 373); *Бацькі жаніха, родныя і хросныя ішлі ў сваты, пры етым вязалі вілкі і качэргі, штоб маладыя жылі ўмесці* (в. Шырокае, Б.-Каш. – С., с. 45); *У час заручын .. абвязвалі качарэжнік платком, каб маладыя ўсё жыццё былі разам* (в. Стрэшын, Жлоб. – С., с. 76).

Ідэю злучэння маладых выражалі таксама такім сімвалічным дзеяннем, як замыканне замка: *Калі маладыя пераступілі парог, то маці замукае замок, які ляжаў пад парогам, а ключ кідае на дно калодца, каб ніколі не разлучаліся* (в. Пціч, Петр. – ВТГ, с. 373). Да гэтага часу існуе павер'е, што маладыя ў час вяселля павінны быць увесь час побач, трымацца за рукі, каб ніхто паміж імі не прайшоў, каб у будучым сямейным жыцці ніхто не змог іх разлучыць: *Нада на свадзьбе сільна строга, штоб цябе не разбілі. Еслі ўзяў малады за руку, штоб пакуль спаць не леглі, не выпусціў* (в. Гарошкаў, Рэч.). Як відаць з прыкладаў, гэта быў скразны абрад, які выконваўся на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

розных этапах вяселля: у час сватання, пасаду, вянчання, ад'езду маладой з дому і інш. Невыпадкова ў гэтым абрадзе злучэння маладых фігурыруе стужка чырвонага колеру, які з'яўляецца сімвалам паўнакроўнага, здаровага, прыгожага жыцця.

Кульмінацыйным момантам вяселля было дзяленне *каравая*, аб чым гаварылася вышэй.

Пасля раздачы каравая былі *провады* (руск. *проводы*, укр. *проводи*) нявесты да жаніха і застолле ў яго доме: *Гуляюць спачатку ў маладое, а патом маладую забіраюць* (в. Новыя Галоўчыцы, Петр. – ВТГ, с. 369).

Наступным вясельным актам было "**завіванне**" (руск. *повивание, повязывание,* укр. *повивання*) маладой: *Пасля каравая "завіваюць" нявесту: Заводзяць маладых, садзяць іх на лаўку, расплятаюць маладой касу, спяваюць завівальныя песні, робяць ёй куксу, завязваюць хустку, а ленту аддаюць свяцілцы* (14, с. 253). Гэты абрад найчасцей выконвала маці маладога, калі малады прывозіў нявесту ў свой дом: *Свякруха здымае вянок, расплятае косу і завязвае хустку .. Усе дзеўкі мераюць вянок, каб хутчэй выйсці замуж* (в. Ванюжычы, Петр. – ВнГ, с. 355), хаця маглі рабіць і іншыя жанчыны: *Пасля таго, як падзялілі каравай і раздалі, тады ад маладое рукі і ад маладога дзве жанчыны ішлі на прыстол і снімалі вянок і адзявалі платок. Вянок лажылі за ікону, там, дзе сядзелі маладыя* (в. Кацуры, Петр. – ВТГ, с. 371). Выконвалі гэты рытуальны акт жанчыны з поўных, добрых сем'яў: *Свякруха дае маладой сваю хустку. Падбіраюць жанок з благапалучных сем'яў, каб былі ў пары: дзве жанчыны ад маладой, дзве – ад маладога. Яны знімаюць фату з маладой і вешаюць на ікону. Яе рашчосваюць і плятуць косу. Завівальнай хусткай махаюць тры разы, потым тры разы стукаюць галовамі маладых, абсыпаюць іх жытам. Два разы маладая не саглашаецца завязываць хустку, а на трэці саглашаецца* (в. Чырвоны бераг, Жлоб. – ВнГ, с. 192). Хустка, якую завязвалі маладой, называлася *завівальнай*. Яна, як і новая прычоска, сімвалізавалі пераход маладой у новы сямейны статус, статус замужняй жанчыны.

Даволі часта на вяселлі выкарыстоўваўся **абрад пераапранання**, якім суправаджаліся розныя эпізоды шлюбнай цырымоніі: *Парадзяюцца бабы, і старэйшыя, і ўсякія ў шуткі вывараччуюць, і штаны бабы надзяюць, як мужчыны, і картузы. Гармоні іграюць, песні пяюць, танцуюць. Людзі ўжо: "Ладна. Банкеты ж водзяць!"* (в. Старое Сяло, Ветк.) *Пераапраналіся ў цыган. Мужыкі пераапраналіся ў жаночую вопрадку, а жанчыны – у мужчынску, .. хадзілі па хатах, кралі курэй, збіралі яду. А было і такое, што залязалі на стол, кралі ў нявесты туфелькі* (в. Бацунь, Б.-Каш. – ЖПР, с. 192). Пераапрананне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мела першапачатковую функцыю замяшчэння, “замены” жаніха і нявесты, іх абароны ад “шкодных вачэй”, ад суроку, а затым стала спосабам выражэння жартаў, смеху і вяселля.

У вясельным абрадзе на Гомельшчыне шырока выкарыстоўваецца **сімволіка агню і вады**. Як вядома, агонь і вада ў старажытнасці асэнсоўваліся як дзве асноўныя прыродныя стыхіі, якім надавалася магічнае абарончае, ачышчальнае і прадуцыравальнае значэнне [19, с. 78]. З ачышчальнай і апатрапейнай (абарончай ад шкоднага ўздзеяння нячыстай сілы) функцыяй агню звязаны абрад праезду вясельнага поезда праз агонь, які ўзгадваецца ў многіх мясцовасцях нашага рэгіёну: *Калі малады з маладэй ехалі поездам, трэба було праз агонь праехаць. С саломы такую арку рабілі, з галінак і падпальвалі. Абсыпалі аўсом і просам, жадалі ўсяго харошага* (в. Гадзічава, Гом.); *Каб з маладымі ў дарозе ўсё было добра, то яшчэ, як яны выязджаюць з двара, у варотах кладуць салому, запальваюць яе і пераязджаюць праз той агонь* (в. Аравічы, Хойн. – ХСД, с.132); *Клалі агонь, і штоб цераз агонь пераехаў конь, каб ачысціць маладых ад усякай нечысці* (в. Жгунь, Добр. – ЗЧД, с. 207). Засцерагальная функцыя агню распаўсюджвалася і на іншых удзельнікаў вяселля: *У нас агонь раскладвалі, .. прыгалі чераз агонь, .. штоб не балела ў жэншчын унутры ўсё* (в. Глыбоцкае, Гом. – НДС, с. 182). Сімволіка агню характэрна для многіх народаў і мае глыбокія карані. Яшчэ ў глыбокай старажытнасці агню надавалася не толькі ачышчальная, але і медыятыўная функцыя (параўн. пахавальны касцёр як форма пераходу ў іншы свет).

Як адзначаюць даследчыкі, “на вяселлі касцёр мае ачышчальнае і абарончае ад вядзьмарства значэнне”, абараняе маладых ад шкоднага ўздзеяння нагавораў злых людзей [20]. Гэта старажытны звычай, зафіксаваны ў розных славянскіх народаў. Як адзначаецца ў “Славянских древностях”, “у балгар перад маладымі высыпалі распаленае вуголле або попел з печы, праз які яны павінны былі перайсці”. У Расіі, Аланецкай губерні, “хлопчыкі з вёскі жаніха пры сустрэчы вясельнага поезда, як і пры провадах, запальвалі *маякі* – пучкі запаленай саломы”. Украінцы у Чарнігаўскай, Ровенскай і іншых абласцях “перавозілі маладых праз запаленую ў варотах салому [21]. “У некаторых рэгіёнух Расіі .. госці, заходзячы ў дом нявесты “на бліны”, павінны былі скакаць праз касцёр, раскладзены у варотах. [22]. На Украіне ў Луганскай вобласці ў варотах у двор маладога распальвалі *огнище* з мэтай спыніць вясельны поезд жаніха і атрымаць выкуп [12 с. 61]; распальвалі *вогонь* у варотах у двор маладога, каб праверыць, ці змогуць коні пераадолець перашкоду

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[12 с. 34]. У варотах двара маладога распальвалі *костьор*, праз які ён пераносіў маладую. У некаторых мясцовасцях Луганшчыны, калі маладая была цнатлівай, таксама распальвалі касцёр і скакалі праз яго [12, с. 48].

Выразнае сімвалічнае значэнне на розных этапах вяселля мела **запальванне свячы**, якая лічылася асаблівым атрыбутам шлюбнага рытуалу. Свяча сімвалічна "асвятляла" будучы жыццёвы шлях маладых. Запаленая свечка, акрамя таго, мела засцерагальную функцыю, адганяла ад маладых цёмную сілу. Для вяселля рыхтавалі самі асаблівыя вясельныя свечкі. Іх суканню ўдзялялася ўвага не меншая, чым выпечцы каравая: *Каравай і свечку павінны рабіць жанчыны, у якіх па першаму чалавеку, а не ўдовы. Гэта каб маладыя жылі ў пары да старасці* (в. Галоўчыцы,Нараўл. – ВнГ, с. 337). Рабілася свяча наступным чынам: *Бяруць воск, акунаюць у цёплую ваду і яго мякка-мякка размінаюць. Раскатваюць, і на раскатаны блін ложаць скручаную з лёну нітку, скатваюць так, каб нітка была ў сярэдзіне. Гэту свечку ўпрыгожваюць кветкамі, і атрымліваецца маленькі букецік, а ў сярэдзіне свечка (потым гэтыя свечкі будуць запальваць маладыя на парозе хаты ў нявесты, калі прыязджае малады)* (в. Галоўчыцы, Нараўл. – ВнГ, с. 337); *Свечачкі дзяўчыны ўбіралі калінаю, а хлопцаву барвінкам* (в. Карані, Светл. – ВнГ, с. 411). "Вянчальныя і вясельныя свечкі могуць служыць абярэгам сям'і і пасля вяселля. Лічыцца, што іх запальванне ў цяжкі для сям'і перыяд можа ачысціць дом ад непрыемнасцей. Таму іх прынята было захоўваць" [23]. Абрадавае значэнне свячы надавалася таксама і ў іншых славянскіх народаў. Як адзначаюць даследчыкі ўкраінскага вяселля, неабходным атрыбутам на вяселлі на Адэшчыне былі дзве васковыя свечкі таўшчынёй 3–4 см і вышынёй не менш 50 см. Свечкі гарэлі на працягу ўсіх вясельных дзеянняў, пачынаючы з вянчання. Свяцілка ўносіла іх у дом і ўстаўляла ў вясельны каравай. Вясельны агонь павінен быў гарэць, пакуль не дагаралі свечкі [11, с. 205–206].

У час прыезду маладога або пасаду выконвалася асаблівае рытуальнае дзеянне – **звіванне вясельных свечак**, якое сімвалізавала адзінства маладых: *Молоды ідзе по молодую. На парозе з боку маладой хросная дзержыць свечку і хросная жаніха таксама дзержыць свечку. Гэтыя свечкі на парозе злучаюць і абматваюць платочкам, іх аддаюць свяцёлцы* (в. Грабяні, Лельч. – ВнГ, с. 309). На пасадзе маці маладой "*брала хлеб са свечкамі і звівала перад імі, хрысціла іх для таго, каб яны былі неразлучныя*" (в. Старыя Галоўчыцы, Петр. – ВнГ, с. 363).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Свечку запальвалі пры раздачы каравая: *Каравай дзеляць, свечкі гараць* (в. Грабаўка, Гом. – НДС, с. 184); з імі сустракалі маладых: *Цёшча выходзіла сустракаць маладых з вельцам і свечкай* (в. Брылёва, Гом. – НДС, с. 180); *Каля хаты маладога стаіць стол ля ўвахода ў двор. Сваха і другая са свечкамі* (в. Алексічы, Хойн. – ХСД, с. 129); абносілі імі вакол галавы пры завіванні маладой: *Потым хросная маці .. прыступае да спавівання маладой .. Затым тройчы абносіць галовы маладых запаленымі свечкамі* (в. Любавічы, Калінк. – ВнГ, с. 231) і інш.

Вясельныя свечы, акрамя таго, выконвалі прадказальную функцыю, указвалі на лёс будучай сям'і: *У царкве, калі поп іх вянчал, трэба было маладым глянуць на свечкі, каб даведацца аб сваім будучым. Ярка гарэлі свечкі – шчаслівае будушчае, патухне – няшчасце* (в. Свержань, Раг. – ВнГ, с. 373–374); *Поп запальвае свечкі. Калі яны гараць добра, то і жыццё ў маладых будзе шчаслівым, а калі свечкі "плачуць" – жыццё іх будзе дрэнным, яшчэ горш будзе, калі свечка патухне* (в. Малажын, Браг. – ВнГ, с. 34); *Калі свечкі, што дзержыць сястра маладога, гараць добра і ярка, то жыццё маладых будзе добрым; калі свечка плача – яны ўсё жыццё будуць плакаць. Калі свечка будзе дрэнна гарэць, ці зусім патухне, то маладыя хутка разойдуцца* (г. Мазыр – ВнГ, с. 391).

Пэўны цыкл абрадавых дзеянняў з агнём быў звязаны з **падпальваннем валасоў** маладых. Іх сімвалічнае падпальванне свечкай у час "завівання" маладой было абумоўлена звяртаннем да магічнай ачышчальнай сілы агня, якая павінна была даць абнаўленне, моц і здароўе ў сувязі з пераходам у іншы сямейны статус: *Увечары праходзіць абрад "завіванне маладой" .. Жанчыны знімаюць з маладой вянок, свечкай трохі падпальваюць косы маладой і маладому* (г. Мазыр – ВнГ, с. 391–392); *Хлопчык, які заводзіў маладых за стол, доўжэн быў расплесці касу нявесце. Потым бралі косы жаніха і нявесты, вынімалі з круглага хлеба дзве гарашчых свечкі і імі падпальвалі косы* (в. Зашчоб'е, Рэч. – ВнГ, с. 401).

У вясельным рытуале ачышчэння маладых выкарыстоўвалася таксама **абліванне вадой**. Вадою аблівалі маладых, вясельны поезд, гасцей, коней: *Першы раз, калі жаніх і нявеста выходзілі са стала, нужна было іх абліць вадой. Гэта, каб у іх было доброе і вясёлое жыццё* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Як улетку свадзьба, дык маладых вядуць да калодзежа, вадой паабліваюць. А зімой каталі на санках* (г. Ветка – В., с. 286); *Як толькі маладыя ўязджалі ў вёску, ім перавязвалі дарогу, ставілі вядро вады на перадок. Калі жаніх даваў гарэлку і закуску, каню давалі напіцца вады, жадалі маладым усяго добрага і прапускалі. Калі малады частаваць адказваўся, вясельны*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

поезд аблівалі вадой (в. Страдубка, Лоеўск. – ВнГ, с. 321); *Дзядзька абліваў коней вадою, а пасля ехалі ў царкву, дзе вянчаліся* (г. Калінкавічы – ВнГ, с. 270); *Хросная маці вядзе маладых да машыны. Родная маці бярэ вядро вады і абходзіць машыну тры разы, выліваючы ваду пад машыну з розных бакоў тры разы, садзіцца ў машыну і, праехаўшы 50 метраў, вяртаецца* (в. Гажын, Нараўл. – ВнГ, с. 353). Абліванне маладых сімвалізавала жыватворчую сілу вады, якая, "напаіўшы" зямлю, спрыяе добраму ўраджаю, дае прыбытак і плён. Такія рытуальныя дзеянні выражалі праекцыю на здароўе, дабрабыт і дастатак будучай сям'і.

Такім чынам, разнастайным рытуальным абрадам, якія праводзіліся ў час вяселля, надавалася магічнае дзеянне і прыпісваліся функцыі замяшчэння, абароны, аховы або пажадання маладым багатага, заможнага і шчаслівага сямейнага жыцця, дабра і дабрабыту ў іх гаспадырцы. Назвы абрадаў, рытуальных дзеянняў і актаў, якія выкарыстоўваліся ў працэсе шлюбнай цырымоніі на Гомельшчыне, утвараюць шматлікую групу разнастайных паводле семантыкі, тэматычнай прыналежнасці і стылістычнай афарбоўцы намінацый, якія маюць пэўныя лексічныя адпаведнікі ва ўкраінскай мове.

Назвы паслявясельнага этапу шлюбнай абраднасці ў гаворках Гомельшчыны

Заключнаму этапу вясельнай абраднасці надавалася вялікае значэнне, аб чым сведчаць разнастайныя акты і дзеянні, якія ў гэты час адбываліся. Гэтыя дзеянні мелі, як правіла, гумарыстычны, забаўляльны характар, яны здымалі напружанне пасля асноўнай часткі вяселля, уносілі асаблівы, гульнёвы кампанент.

Для намінацыі пасляшлюбнай часткі вяселля на Гомельшчыне выкарыстоўваліся не толькі аднаслоўныя найменні, але і словазлучэнні, як свабодныя, так і устойлівыя.

Пасляшлюбны этап быў звязаны з аглядам пасагу маладой, цырымоніяй раніцы пасляшлюбнай ночы, наведваннем бацькоў нявесты ў доме жаніха і сваякоў. Паслявясельны цыкл абрадаў накіраваны, галоўным чынам, на збліжэнне сем'яў маладога і маладой. У першую нядзелю пасля вяселля ў дом маладога прыходзіць радня яго жонкі.

Да заключнай часткі вясельнай абраднасці на Гомельшчыне адносіцца ў большасці населеных пунктаў трэці дзень вяселля: *Трэці дзень вяселля – апошні дзень вяселля, звычайна аўторак* (в. Крупейкі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Лоеўск. – Лоеўшч., с. 247). У некаторых вёсках гулянне працягвалася і на чацвёрты, пяты дзень: Ц*япер свадзьбы у растаране гуляюць і ў нядзелю. А раней – о, былі свадзьбы. Па недзелі гулялі!* (в. Старое Сяло); *А на трэці дзень ужэ, на чацвёрты, на пяты з мае стараны (напрымер, я – нявеста) ўжэ сабіраюцца* (в. Старое Сяло).

Трэці дзень вяселля меў розныя назвы. Абавязковым элементам заключнай часткі вясельнага абраду было прыгатаванне і ўжыванне курыцы або пеўня, таму часта гэты этап называўся *курэй (кур) драць (лавіць, збіраць, сбіраць, круціць); гуляць пятухі; карэнне драць* ‘абскубваць курыцу’*, папялішча дуць: Трэці дзень называўся “драць куру”. У гэты дзень .. збіраліся радня маладога і маладой і паасобку хадзілі да сваёй радні з хаты ў хаты. Бралі курыцу і няслі яе ў край сяла, з песнямі.Там гэту курыцу скублі, смалілі* (в. Івакі, Добр.); *На трэці дзень дралі курэй. Перапраналіся хто ў што і шлі па вёсцы. Чыю курыцу забяць, забівалі. Шлі дамоў і варылі яе* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Старых надзяюць маладой. І ідуць ужэ, пяюць, курэй круцяць, што толькі не выдумляюць* (в. Гарошкаў, Рэч.); *На трэці дзень вяселля ў маладога збіраецца свая радня, а ў маладой – свая радня і гуляюць “пятухі”* (в. Чырвоны бераг, Жлоб. – ВнГ, с. 193); *А на трэці дзень гуляюць петухоў – запрагаюць у цялегу моладзь. Граюць у гармошку і едуць уздоўж вуліц. Едзяць к тым, хто былі на свадзьбе. Заязжалі ва двор і бралі петуха, курыцу і прывязвалі да воза на вяровачку* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Канчаецца свадьба – карэнне драць. Надзяю штаны, надзяю лапці, дзелаю сабе горб на плячах, бараду прышчаплю, шапку выварочваю і пайшла курэй лавіць* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 234); *Казалі: “Папялішча пойдзем дуць .. Свадзьба ж то ўчора была, а сёння пойдзем папялішча дуць, курэй збіраць. смаліць”*(в. Васільеўка, Добр. – ЗЧД, с. 207).

Выкарыстоўваліся для назвы трэцяга дня вяселля таксама метанімізаваныя лексемы *куры, петухі, пеўні, папялішча, разгрэбіны, галоўні*: *Трэці дзень – “куры”: “Куры” таму, што звычайна падстаўныя маладыя пераапранаюцца, бяруць з сабой “цыган”, ходзяць па дварах – крадуць курэй. Увечары з гэтых курэй вараць суп* (г.п. Камарын, Браг. – НДК, с. 122); *Збіраліся на трэці дзень вяселля – петухі* (в. Карані, Светл. – ВнГ, с. 421); *У нас называлось ето “пеўні”, ужэ на трэці дзень свадзьбы* (в. Судкова, Хойн. – ХСД, с. 153); *Напрымер, паймаюць пеўня, а не, так і два. У нявесты адно есці і ў жаніха. Яшчэ й гарэлкай паілі етага пятуха. Красны бант сюды на ікшыцы завяжуць. Убяруць ужо пятуха тога. І за аборачку ўжо зачэпіш* (в. Стаўбун, Ветк. – В., с. 242); *Разгрэбіны гуляюць на пяты дзень. Кладуць вогнішча на дарозе, каля двара. Бяруць з седала*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

курыцу і смаляць яе на вогнішчы (в. Рудня Марымонава, Гом. – ВнГ, с. 162); *Трэці дзень. "Галоўні". Збіраюць курэй у тых людзей, хто ўчаставаў у вяселлі"* (в. Каўпень, Лоеўск. – Лоеўшч., с. 243).

Калі лавілі курыцу, скублі яе і варылі ў чыгуне, то гаварылі, што нявеста пакідае "радзіцельскае кубло" і пераходзіць у сям'ю жаніха. У некаторых мясцовасцях у дом жаніха разам з пасагам маладой прывозілі ўпрыгожаную стужкамі курыцу як сімвал замужняй жанчыны і выпускалі яе: *Апошні дзень вяселля – карэнне. Усе госці збіраліся ў маладой. Пасярод двору ў маладой раскладвалі вогнішча, ставілі чугун. Пераапранутыя госці лавілі курыцу, абдзіралі яе ў чугуне. Пер'е жанчыны кідалі на галавы мужчынам* (в. Данілавічы, Ветк – ВнГ, 107).

Курыца, як адзначаецца ў літаратуры, у вясельным абрадзе выконвала значную рытуальную нагрузку. Курыца-наседка была сімвалам замужняй жанчыны, замяшчала нявесту ў вясельным поездзе. Яе знішчэнне і паяданне сімвалізавала ахвярапрынашэнне і пераход у іншы статус [8, с. 124–125]. З пеўнем была звязана сімволіка адраджэння жыцця. На вяселлі ён сімвалізаваў мужчынскую сілу, сексуальную патэнцыю, пладлівасць і будучы дабрабыт маладых [24]. Як адзначаюць некаторыя інфарматары, "куру дралі", калі нявеста была цнатлівая: *На пярэзвы смаляць курэй і носяць іх на палках, што нявеста чэсная* (в. Рудзянец, Б.-Каш. – ЖПР, с. 247).

Паколькі рытуал "куру драць" меў шумны, жартаўлівы характар, ён часта называўся метанімізаванай назвай "цыганы": *Цыганамі заканчваецца трэці дзень вяселля. "Цыганы" – гэта цэлае прадстаўленне .. "Цыганоў" чутно здалёк па крыку, смеху, песнях* (в. Елянец, Б.-Каш. – ЖПР, с. 67) або словазлучэннем *хадзіць у цыганы, гуляць у цыганей*: *На трэці дзень "хадзілі ў цыганы". Жэншчыны паадзяюцца ў мужское, а мужчыны – у жэнскае, паўмазваюцца, паўкрасваюцца. І вот, ідуць па дзярэўне. Ідуць, дзе бяжыць курыца, яны тую курыцу "хлоп!", да ўб'юць яе, да ў торбу. Прыташчылі етае к маладому ці к маладой. І гэтае зноў гатавалі* (в. Дуброўнае, Браг. –НДК, с. 121); *Пасля свадзьбы ўжо ў панядзельнік гулялі ў цыганей. Свадзьбу маглі гуляць .. дажа цэлую нядзелю* (в. Лексічы, Хойн. – ХСД, с. 151).

Пераапрананне, якое мела месца ў вясельным рытуале, таксама не было выпадковым. Калі малады прыязджаў па маладую, яму выводзілі "падманную" нявесту, а калі ён адмаўляўся ад яе, патрабавалі выкуп. Такі звычай хаваць нявесту, выстаўляць падманных, несапраўдных нявест быў вядомы ўсім усходнеславянскім народам. Як мяркуюць даследчыкі, пераапрананне ў "нявесту" паходзіць ад старажытнага абраду ахоўвання нявесты ад злых духаў, імкнення падмануць іх,

увесці ў зман [25]. У паслявясельнай частцы, на заключным этапе вяселля, калі гулялі ў “цыганоў”, мужчыны пераапраналіся ў жанчын, а жанчыны ў мужчын. Гэта пераапрананне гасцей мела на мэце павесяліць прысутных, хаця вытокі такога звычаю – у імкненні адцягнуць ад маладых увагу злых духаў [26]. “Цыганы” паводзілі сябе вельмі шумна: крычалі, смяяліся, спявалі, хадзілі па хатах, кралі посуд і г. д. Сажа, якою “цыганы” мазалі твар, замяняла маску. Паводле меркавання Я. Г. Кагарава, абмазванне пераапранутых сажай, якую бралі з печы ў хаце, мела карпаганічнае значэнне, акрамя таго, сімвалізавала далучэнне да дамашняга ачага [26]. Пераапрананне, якое называюць травесцізмам, як адзначаюць даследчыкі, было характэрна для многіх абрадаў і мела сімволіка-міфалагічны характар, выконвала апатрапеічную і карпаганічную функцыі. У вясельнай абраднасці пераапрананне мужчын у жанчын, а жанчын у мужчын было накіравана на стварэнне камічнага эфекту [27].

Для абазначэння заключнага этапу вясельнай абраднасці на Гомельшчыне актыўна выкарыстоўваліся таксама лексемы *банкет*: *Адзін сват маладых, к сабе прыглашае і гуляюць. А другі сват бярэ к сабе старых. Гэта называецца банкет* (в. Ворнаўка, Карм. – ВнГ, с. 278); *банкеты*: *Пасля свадзьбы былі “банкеты”* (в. Хальч); словазлучэнні *вадзіць* (*дзелаць, сабіраць, збіраць*) *банкеты, браць абеды, вадзіць бяседы: Жаніховы раство банкеты водзяць, і нявесціны банкеты. От адні атводзяць нядзелю, а тады тыя нядзелю* (д. Старое Село); *Сколькі ў каго была родзічаў, яны дзелалі банкеты, так называліся, пасля свадзьбы* (в. Хальч); *Родственнікі ў канцы свадзьбы дагаворваюцца, калі банкеты сабіраць.. У гэта васкрасенне мы вас пасадзілі за стол, ў наступнае васкрасенне – вы нас* (Казацкія Балсуны, Ветк. – ВнГ, 134); *На трэцці дзень збіраюць банкеты, родзічы водзяць, сразу нівесціны, патом жаніховы* (в. Старое Сяло); *Должэн кажды старшы сват і стары сват браць “абеды”.. Гэта называецца банкет* (в. Ворнаўка, Карм.) [ВнГ, с. 278]; *Калі два дні пагулялі, то пасля цэлую нядзелю вадзілі бяседы.. Кожны дзень у рознай хаце гулялі* (в. Калініна, Гом. – НДС, с. 198). У в. Багданавічы Кармянскага раёна гэта мерапрыемства называлі экспрэсіўна афарбаванай лексемай *разгуліны*: *На трэці дзень гулялі “разгуліны”. Гэта значыць, госці маладой прыходзілі да яе дому, а госці маладога да яго* (в. Багданавічы, Карм. – ВнГ, с. 281).

У большасці мясцовасцей рытуалы *правядзення банкета*, *драць куру* і *гуляць у цыганы* сумяшчаліся ў адзін, трэці дзень, у іншых – расцягваліся на некалькі дзен: *На другі дзень у кросных банкеты, трэці – куру драць, чацвёрты – цыганы* (Баршчоўка, Добр. – ЗЧД, с. 251).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сустракаюцца на Гомельшчыне і метафарычныя назвы трэцяга дня вяселля: *пята*: *На трэці дзень была пята. Малады і маладая даюць петуха. На вуліцы скубуць яго і вараць суп* (в. Стаўбун, Ветк. – ВнГ, с. 118); *хвост*: *У понедельнік наступае хвост. Прыходзяць усе людзі. Молодого людзі сядзяць у молодого, а молодой – у молодой* (в. Валаўск, Ельск. – ВнГ, с. 189); *Хвост звычайна рабілі ў панядзелак. На ім прысутнічалі самыя блізкія і родныя* (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 363); *крошкі: На трэці дзень у хаце маладой спраўлялі крошкі. Лічылася, што гэта ўжо маладая хазяйка частуе гасцей* (г. Жлобін – ВнГ, с. 194); *Трэці дзень называюць "на крошкі". Гатовілі, гулялі, даядалі, што засталося* (в. Клівы, Хойн. – ХСД, с. 150). Такія метафарызаваныя назвы падкрэслівалі фінальны, завяршальны характар гэтага этапу.

У некаторых мясцовасцях для абазначэння трэцяга дня вяселля выкарыстоўваліся назвы *пакрышнік, замеціны*: *Трэці дзень вяселля называўся "пакрышнік". Збіраліся маладыя, хадзілі паліць вогнішчы, вадзіць карагоды* (в. Рудня Гарбавіцкая, Калінк. – ВТГ, с. 253); *На трэці дзень свадзьбы пераадзяваліся, калі прыглашалі на замеціны. Радзіцелі пераадзяваліся ў маладых, а маладыя былі гасцямі* (в. Сырод, Калінк.)

На заключным этапе вясельнага рытуалу маглі "гуляць зайца": *У панядзелак вечарам гуляюць "зайца" ў хаце маладога. Госці без дружак. Адзяюцца некалькі чалавек ва ўсё рванае .. Гэта цыгане. Бегаюць у розныя хаты, хватаюць хто што .. Адзін чалавек перадзяваецца ў кажух – гэта заяц .. Заяц уцякае, хто-небудзь страляе ў зайца, ён падае. Зайца кладуць на стол. Абліваюць гарэлкай, мо жывы? Потым лупяць, скідаюць кажух, шапку (аблупліваюць). Заяц ускоквае і танцуе на століку. Госці ідуць у хату "есці зайчаціну". . "Зайца" гуляюць і ў хаце маладой* (в. Алексічы, Хойн. – ХСД, с. 129). Вобраз зайца таксама невыпадковы на вяселлі. Заяц у народных уяўленнях надзяляўся мужчынскай эратычнай сімволікай. "Як жывёла, вядомая сваёй пладавітасцю, заяц увасабляе пладаносную сілу" [28]. Калі вясельны поезд перапынялі з мэтай атрымаць выкуп (пачастунак), гэта называлася "лавіць зайца". У славянскай вясельнай абраднасці заяц з'яўляецца сімвалам жаніха [29].

Асобным рытуалум паслявясельнай часткі, які праводзіўся ў некаторых мясцовасцях, быў *перэпой*: *А шчэ ж перэпой буў .. Молодому ў ее хаці перэпівалі боярые.. Хто рубля, хто копейкі. Квасом перэпівалі, компотом ці з груш, ці з яблук. Молоды седзіць. Екі мужчына поўз столы йдзе з чаркою. Становіцца. Кажэ: "Перэпівае сусед". А той кажэ: "Перапіваю шчасце,долю і век доўгі". Перэпьюць да ўжэ кончаюць* (г. п. Тураў – ВнГ, с. 253).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Абавязковым эпізодам паслявясельнай абраднасці было наведванне маладой яе бацькамі ў хаце маладога, якое звычайна адбывалася праз тыдзень пасля вяселля. Візіт бацькоў да дачкі называўся *пярэзавы, пярэзвы, перазоў, пярэзвіны, госці, пірагі*: *Даждаўшы наступнай суботы пасля вяселля бацькі маладой звалі дачку з зяцем і са сватамі к сабе ў госці.. А яшчэ цераз нядзелю, таксама ў суботу, ужо бацькі маладога рабілі пярэзавы. І на гэтым ужо вяселле заканчваецца* (в. Міхнаўка, Браг. – ВнГ, с. 43); *Праз тыдзень, у нядзелю, большасць удзельнікаў вяселля збіраецца зноў на пярэзвы, галоўная мэта іх – праведаць маладых* (в. Гажын, Нараўл. – ВнГ, с. 353); *Вяселле лічыцца незакончаным, пакуль родзічы жаніха і нявесты не сходзяць адны да другіх у госці. Гэты абрад называецца "Госці" або "Пірагі"* (в. Елянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 67); *Пірагі або госці – ўзаемнае наведванне бацькоў маладых, робіцца гэта праз тыдзень пасля вяселля* – в. (Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 236); *Праз тыдзень пасля вяселля назначаліся "госці", дзе збіраліся самыя родныя з стараны жаніха і нявесты* (в. Сямурадцы, Жытк. – ВнГ, с. 220).

Такім чынам, паслявясельная частка мела розныя назвы. Некаторыя з іх – аднаслоўныя найменні, як адзіночналікавыя *перэпой, пята, хвост*, так і, у большасці сваёй, множналікавыя *пярэзвы, разгрэбіны, разгуліны, пірагі, пятухі, куры, крошкі, госці*. У складзе аналізумых назваў нярэдка сустракаюцца словазлучэнні, як свабодныя, так і ўстойлівыя: *провады свадзьбы, на бліны зваць, куру драць, карэнне драць, у цыганы хадзіць, банкеты вадзіць, вадзіць бяседы, гуляць зайца*. Асобныя назвы маюць празрыстую ўнутраную форму, з'яўляюцца аддзеяслоўнымі дэрыватамі, матываванымі выконваемым дзеяннем: *пярэзвы* (утворана ад *перазываць* 'запрашаць і хадзіць адзін да аднаго ў госці'), *разгрэбіны* (*разгрэбці* 'расчысціць, раскідаць што-н.', перан. 'завяршыць'), *разгуліны* (*разгуляцца* 'даць сабе волю, разысціся'), *перэпой* (*перапіваць* 'піць па чарзе'), *адводзіны* (*адвесці* 'закончыць'), *пакрышнік* (*пакрываць* 'завяршаць'), *замеціны* (*замятаць* 'заканчваць'). Некаторыя лексемы ўзніклі ў выніку метафарызацыі агульнаўжывальных слоў – *пята, хвост, крошкі*, у семантычнай структуры якіх актуалізуецца сема 'апошняя, канцавая частка чаго-н.' Як вынік метанімічнага пераносу часткі на цэлае ўтварыліся назвы *куры, петухі, пірагі, галоўні, цыганы, госці*. У адных словах семантычная дэрывацыя адбылася на аснове пераносу аб'екта, на які накіравана дзеянне (*куры, петухі, пірагі*) або суб'екта, які яго ўтварае (*госці, цыганы*) на само дзеянне – паслявясельнае гулянне. У другіх – перанос адбыўся на аснове лагічнай сумежнасці, ускоснай сувязі працэсу дзеяння з яго вынікам: *папялішча, галоўні* – тое, што застаецца ад вогнішча, на якім смаляць курыцу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У складзе разгледжаных назваў паслявясельнай часткі сустракаюцца разнастайныя варыянты рознага тыпу: фанетычныя: *пярэзавы, пярэзвы;* фанетыка-словаўтваральныя: *пярэзвы, пярэзвіны; петухі, пеўні; кура, курыца;* фанетыка-марфалагічныя: *пярэзвы, перазоў.* Варыянтнымі з'яўляюцца многія словазлучэнні тыпу: *драць куру*, *круціць курэй*; *дзелаць банкеты*, *вадзіць банкеты*. У сінанімічныя адносіны ўступаюць такія лексемы, як *пята, хвост, крошкі, куры, петухі, цыганы, пірагі* інш., якія называюць паслявясельны этап.

Большасць разгледжаных назваў з'яўляюцца стылістычна нейтральнымі, іх асноўная функцыя – намінатыўная, для некаторых з іх характэрна дадатковая эмацыянальна-ацэначная канатацыя, якая змяшчае іранічна-жартаўлівае адценне: *разгуліны, разгрэбіны, перэпой.* Усе назвы, за выключэннем лексемы *банкет*, запазычанай з французскай мовы, з'яўляюцца сваямоўнымі.

1.1.1.2 Лексічная парадыгма агентыўных намінацый у вясельнай абраднасці Гомельшчыны

Як ужо адзначалася, парадыгма вясельнай лексікі адлюстроўвае найбольш значныя ў функцыянальным плане моманты шлюбнага абраду, якія засноўваюцца на ўзаемазвязанай трыядзе "дзеянне – асоба – прадмет". Усе рытуальныя акты шлюбнага абраду строга рэгламентаваны і маюць у вясельнай тэрміналогіі адпаведныя найменні. Дыферэнцыраванай з'яўляецца і сістэма намінацый асоб-выканаўцаў гэтых дзеянняў. Лексічная парадыгма асабовых вясельных назваў адлюстроўвае калектыўны характар вясельнай цырымоніі і паказвае пэўную іерархію вясельных чыноў, іх дакладную рытуальную рэгламентацыю.

Адметнай асаблівасцю лексічнай сістэмы асабовых намінацый вясельнай тэрміналогіі Гомельшчыны з'яўляецца разнастайнасць спосабаў яе намінацыі, актыўнае выкарыстанне сінанімічных і варыянтных форм. Агенсная парадыгма вясельна-абрадавай тэрміналогіі ўключае некалькі тэматычных груп назваў паводле іх ролі і значнасці ў шлюбнай цырымоніі: персанажы, якія выконваюць спецыяльную функцыю, ажыццяўляюць пэўны рытуал на вяселлі і асобы, што прысутнічаюць там у якасці гасцей. У складзе першай групы – галоўныя ўдзельнікі вяселля – жаніх і нявеста; іх памочнікі – дружкі; распарадчыкі на вяселлі – сваты, хросныя бацькі; бацькі маладых; дапаможныя персанажы вясельнай цырымоніі; у другой – госці маладога і маладой. Як адзначаюць даследчыкі, "усе ўдзельнікі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вяселля з'яўляюцца адначасова і героямі, персанажамі гэтага своеасаблівага мастацкага твора" [30, с. 30].

Лексіка-тэматычная група 'галоўныя дзеючыя асобы – жаніх і нявеста' уключае сістэму намінацый, якія адлюстроўваюць паступовую змену іх сямейнага і ўзроставага статусу ў працэсе шлюбнай цырымоніі: ***нявеста*** *– суджаная – засватаная – заручаная – нявестухна – маладая – маладзіца – маладуха – малодка, малотка*; ***жаніх*** *– суджаны – заручоны – малады*: *Вёў маладую на пасад брат маладой. Малады з маршалкамі прызнавалі сваю суджаную* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 229); *Заручаная зазывала да сябе сяброўак ёлку віць* (Данілавічы, Ветк – ВнГ, 105); *Нявеста называлася маладая. У яе фата доўгая і вяночкі былі* (в. Гарошкаў, Рэч.); *А як ужо прыедуць свахі, то з дзеўкі вянок знімалі .. Яна была дзеўка. А цяпер ужо – маладзіца* (в. Бацунь, Б.-Каш. – ВнГ, с. 84); *Маладой звалі нявесту пакуль не родзіць* (в. Колбаўка, Ветк.); *У нас малоткай называюць пасля шлюбу тры гады* (в. Неглюбка, Ветк.).

Назвы маладога і маладой з'яўляюцца неадназначнымі ў стылістычных адносінах. Так, акрамя нейтральных назваў *жаніх, жаніхна, малады, малод, заручоны, муж, маладая, заручона, нявеста, нявестка* выкарыстоўваліся эмацыянальна афарбаваныя ласкальныя формы *заручоначка, маладзёна, нявестачка, нявестухна, нявестанька, нявестунька*: *Заручоначка-дзевачка, Перайдзі ў новыя сені Падай свекару вадзіцы А з халоднае крыніцы* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 12); паэтычныя (у песнях): *галубок, сокал, саколік, лябёдзік, дзяцінка, зязюля, галубка, лябёдка: Лябедзік, лябедзік Ванечка, Лебедзінка, лебедзінка Манечка* (14, с. 221); У хату дзяўчыны заходзілі сваты. *Яны казалі: "Ёсць саколік, па табе скучае"* (в. Рудзянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 67); фальклорныя, узнёсла-велічальныя *князь, кароль, каралеўна, княгіня*: *А кароль, кароль – малады Іванка, А каралеўна, каралеўна – маладая Валечка; А што мы табе прывезлі. Прывязлі пярыну І маладую княгіню* (в. Раманаў лес, Ветк. – ВнГ, с. 117); *Пярыну будзеш падсцілаць, Княгіну на работу адпраўляць* (в. Пірэвічы, Жлоб. – ВТГ, с. 132); алегарычныя *звёздачка, канапелька*: "*Мы глядзелі: з нашага двара выляцела звёздачка.. Мы бачылі: яна ў гэты двор упала, папытайце жаніха*" (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с.26); *Ну, стаяла-буяла канапелька ў агародзе, Не даў ёй ветрык яшчэ болей пастаяці, Веццейкам памахаці* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с. 7); метафарычныя (у рытуале сватаўства): *бык, бычок, охотнік, купец, цяліца, цёлачка, цялушка, цёлка, тавар, куніца: Кагда прыязжаюць у сваты, то сразу не гавораць, чаго прыехалі. А гавораць, што хацяць купіць цялушку. Тагда гавораць: "вам тавар –*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нам купец” (в. Церуха, Гом.); *Зашлі к молодой, а тут ужо з юмором говораць, што цёлка зашла во двор, а хто говорыць, што куніца зашла ў двор, а ў нас охотнік* (в. Валаўск, Ельск.); гіпербалізаваныя іранічна-пеяратыўныя: *нягадзяй, чапуруга, нежачка, нявехна, няўдала, негадзя-нявехна: Ой, каго ты, Людачка, ўпадабала, Што такога нягадзяя спадабала* (в. Міхнаўка, Браг. – ВнГ, с. 39); *Выйдзі, мамачка, паглядзі, Што мы табе прывязлі .. Прывязлі табе нежачку, Ці замеся яна дзежачку?* (в. Данілавічы, Ветк. – ВТГ, с. 71); *Негадзя-нявехна, негадзя, Па ваду пайшла – забурылася, Па дровы пайшла – завалілася* (в. Стаўбун, Ветк. – ВнГ, с. 114).

Як паказваюць прыклады, тэматычная група намінацый з ядзерным кампанентам “нявеста” больш значная ў колькасных адносінах у параўнанні з намінатыўным радам лексем, якія называюць жаніха.

Важнае месца ў іерархіі вясельных чыноў займае *сват*. Сватам выбіралі паважанага мужчыну, які ведае народныя традыцыі і звычаі, умее добра гаварыць. Гэты абавязак найчасцей выконваў хросны бацька або дзядзька па мацярынскай лініі, калі іх не было – старшы жанаты брат маладога: *Сваты вядуць свадьбу, вызываюць на каравай* (г. Ветка); *Сватам бралі аўтарытэтнага чалавека, што ўмеў гаварыць* (в. Неглюбка, Ветк.). У свата быў *памагаты*: *Калі дзялілі каравай, дзяліў хросны. Хроснага павязвалі рушніком, у яго быў памагаты* (в. Гарошкаў, Рэч.). Калі сватоў некалькі, сярод іх вызначаецца *старшы сват,* якога імянуюць *стараста*. Малодшага свата ў такім выпадку называлі *падстараста: Старшым сватам .. з’яўляецца звычайна хросны бацька маладога. Завуць .. яго старастам, а другога – падстарастам* (в. Дарашэвічы, Петр. – ФСГ, с. 215). Жанчына, якая ўдзельнічала ў сватаўстве і вяселлі з боку нявесты, называлася *сваха, свашка, свацця: Сват і свацця хваляць жаніха* (в. Кашалёў, Б.-Каш. – ВнГ, с. 73); *Калі падыходзяць да стала, свашкі пяюць* (в. Старое Сяло, Ветк. – ВнГ, с. 116).

Важную ролю на вяселлі выконвалі хросныя бацькі маладых, якіх называлі *хросная, кросная, хросная маці, кума, хрышчоная маці; кросны, бацька хросны, хросны, хрышчоны бацька, кум: Свацця́й і сватам бралі кросных* (Покаць, Чач.); *Каравай пяклі ў хаце нявесты .. Хрышчоная маці кіравала выпечкай*; *Дзеліць каравай сват або бацька хросны* (в. Кашалёў, Б.-Каш. – ВнГ, с. 77).

Да асоб, якім адводзіцца важная роля на працягу ўсяго вяселля і якія выконваюць рытуальныя функцыі ў многіх эпізодах вясельнай абраднасці, адносяцца сябры і сяброўкі маладых. Дружыну маладога складалі яго аднагодкі ці блізкія па ўзросту хлопцы – родны або стрыечны брат, сын хроснага, сябры. Назвы іх шматлікія і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разнастайныя: *друг, дружок, шафер, шахвяр, княжы, князёк, баярка, баярык, паджанішак, паджанішнік, паджаніх, паддружын, маршалак, дружкі-баярэ, дружкі-княжныя, княжныя-дружкі, дружка-князёк, дружбакі, княжыя, баяры, баярэ, боярые, таварышы: Ад жаніха быў друг, і ад нявесты была дружка* (в, Хальч, Ветк.); *За стол садзіліся малады з маладой, а патом радзіцелі свае, родныя, другі, падругі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Княжыя з маладым ехалі на конях да маладой* (в. Малажын, Браг. – НДК, с. 128); *Жаніх з паджанішнікам пріяжджае за нявестай* (г. Ветка); *Шафер садзіцца з правага боку, шаферка – з левага боку ля нявесты* (в. Гарошкаў, Рэч.). У групе сяброў быў *галоўны шафер, першыя дружкі.*

Сукупнасць сяброў маладога называлася *дружына, світа, хеўра: На першы дзень вяселля дружына жаніха, пасядзеўшы за сталом, збіраецца да маладой* (в. Карані, Светл. – ВнГ, с. 412); *Малады са сваёй світай ідуць да маладой* (в. Грабяні. Лельч. – ВнГ, с. 308); *Матка і бацька встрэчалі хеўру маладога з хлебам і соллю* (в. Малажын, Браг. – НДК, с. 128). *Світай* называлі таксама асоб, якія ішлі сватаць дзяўчыну: *У сваты маглі ісці браты, сёстры, цёткі, бабулі – світа* (в. Неглюбка, Ветк.).

З боку нявесты адпаведныя вясельныя чыны называліся *шаферкі, шахверкі, шахвіркі, падружкі-шаферкі, дзеўкі-шаферкі, таварышкі, паднявесніца, бальшуха-падружка*: *Дружка з дружком трымалі вянец над маладымі ў царкве* (в. Неглюбка, Ветк.); *Маладую прыбіралі шахвіркі. Адзявалі хвату, а вянок з лентамі і марлечку цаплялі ззаду* (в. Малейкі, Браг. – НДК, с. 130); *У царкве .. паднявесніца дзяржыць над нявестай такі залаты вяночак* (Новы мір, Ветк. – В., с. 227). У іх ліку таксама была *першая дружка.* Сукупнасць сяброўак маладой называлася *дзявочая дружына*: *Дзявочая дружына затайвалася, хавалася так, каб хлопцы не адразу знайшлі іх* (г. Рэчыца – ВнГ, с. 95).

У многіх эпізодах вясельнай абраднасці ўдзельнічала *свяцілка, свяцёлка, свецёлка, свяцельніца.* Гэта цікавы персанаж вясельнай абраднасці, ролю якога выконвала малодшая сястра жаніха, дзяўчынка гадоў дзесяці – трынаццаці. Яна трымала свячу ў найбольш адказныя моманты вяселля: у час вянчання, перад вясельным поездам, калі дзялілі каравай, “завівалі” маладую і інш.: *Свяцілка трымала ў руках свечку, пастаўленую ў слоік, напоўнены зернем* (в. Неглюбка, Ветк.); *Свяцёлка – эта тры свечкі станавілі і ўжо за маладой едуць і свяцёлку тую вязуць на кані* (в. Хальч, Ветк.); *Хросны бацька свецёлцы свечку сучэ веліку* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 161–162); *Расплятаюць маладой касу. Робяць куксу, а ленту аддаюць свяцілцы* (в. Жгунь, Добр. – ЗЧД, с. 253); *І як каравай дзеляць, яна на куту сядзіць, ёй свечкі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аддаюць (в. Грабаўка, Гом. – НДС, с. 184); *Побач са свяцельніцаю ляжыць каравай князя* (в. Дарашэвічы, Маз. – ФСГ, с. 279). У некаторых выпадках адзначалі ўдзел у вяселлі *свяціла*: *Назначаюць дзень вяселля. Нявеста абірае першую свяцілачку, хлапец – першага свяціла* (в. Рудзянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 68).

Пастаяннымі ўдзельнікамі вяселля былі таксама сведкі маладых, якія звычайна выбіраліся з ліку дружыны жаніха і нявесты і называліся *свідзецель, свідзецельніца*: *На свадзьбе свідзецелей выбіралі маладыя. Но вот свідзецельніца далжна была быць незамужняй дзевушкай. А свідзецель мог быць жанаты* (г. Ветка).

Даволі шматлікімі і цікавымі паводле тыпаў структурна-семантычнай матывацыі, разнастайнымі ў плане асаблівасцей дэрывацыі з'яўляюцца назвы другарадных персанажаў вясельнай абраднасці, якія выкарыстоўваюцца ў гаворках Гомельшчыны. Яны ўдзельнічалі ў якім-небудзь адным эпізодзе шлюбнай цырымоніі. Іх назвы матывуюцца як характарам выконваемага абрадавага дзеяння, так і рытуальным прадметам, да якога яны маюць дачыненне. Гэта ў першую чаргу жанчыны, якія ўдзельнічаюць у выпечцы каравая: *каравайніцы, караваіхі, каравайніхі*: *Каравай пячэ каравайніца, штобы с багатай сям'і, многа дзяцей было, а маладому пячэ другая каравайніца* (в. Хальч, Ветк.); *Калі ў сваёй вёсцы не было каравайніц, то іх запрашалі з суседніх вёсак* (в. Колбаўка, Ветк.); *Як пасадзіла каравайніха каравай у печ, то лапатай па галаве ўсім мужчынам стукала* (в. Лескі, Акц. – ВнГ, с. 6).

Вясельны поезд ладзілі *ездавыя*, якія кіравалі коньмі. Удзельнікаў вясельнага поезда называлі *паязджане, вясельны поезд: Прыехаўшы да хаты жаніха, вясельны поезд спыняецца каля варот* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 232). Госці маладога, якія ехалі па маладую, іменаваліся *бяседнікі, падарожнікі*: .. *Едуць да маладой.. Прыехаўшыя кажуць: "Пусціце нас, падарожнікаў, хочам у вас у гасцях пабыць"* (в. Затон, Жлоб. – ВнГ, с. 56). Калі дружына маладога прыязджала па маладую, ім паказвалі жанчыну або мужчыну, пераапранутых у нявесту – *падстаўная, ложная нявеста: Выводзяць падстаўную нявесту (перадзетага хлопца ці старую жанчыну)* (в. Даўляды, Нараўл. – ВнГ, с. 346); *У гэты час жанчыны ў доме падстаўлялі другую, ложную нявесту* (в. Баршчоўка, Добр. – ЗЧД, с. 250). Мужчын, якія ўдзельнічалі ў выкупе маладой, называлі *скупшчыкі*: *Маладую скупляюць .. і ўжо ходзяць ад жаніха скупшчыкі .. і тады ўжо дзеўкі пяюць пасад* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Жанчын з ліку радні маладой, якіх забірала з сабой нявеста, калі ад'язджала да жаніха, іменавалі *закасяне, закосянкі, закасянкі,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

касянкі: *Маладая бярэ з сабой трох закасянак (дзевак), забірае сваё прыданае* (в. Маркоўскае, Лельч. – ВнГ, с. 316); *Пагуляўшы, малады забірае да сябе маладую. Жанкі (касянкі)забіраюць і добро маладой* (в. Карані, Светл. – ВнГ, с. 418). Жанчын, якія перавозілі пасаг маладой, маглі таксама называць *прыданы, прыданкі, прыданне, прыданшчыкі, прыданые, прыданыя, скрынавозы*, за раскладванне пасагу нявесты ў хаце жаніха адказвалі *пасцельнікі, посцельніцы*: *Прыходзяць прыданні да маладога* (г. Гомель – ВнГ, с. 340); .. *Едуць госцікі прыданыя, іх вазы маляваныя, конікі ўбраныя* (в. Махнавічы, Маз. – ФСГ, с. 250); *З маладой ехалі тры жэншчыны (“посцельніцы”), которые должны былі повесіць прыданое па сваім местам в хаце маладога* (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 362). Гасцей маладой, якія ехалі з ёй да маладога, называлі таксама *бяседай*: *Маладых сустракалі бацькі жаніха. Бяседа спявала па дарозе* (в. Ляскавічы, Петр. – ВнГ, с. 362). Лексема *бяседа* ўжывалася на Гомельшчыне таксама ў абагуленым значэнні ‘госці’: *Падзеляць ужэ каравай, пагуляюць, а потым ходзяць па бяседах. Сколькі двароў у свадзьбы, усе хадзілі ў тыя двары па бяседах* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 50).

На заключным этапе вясельнай абраднасці маладую “завівала” спецыяльная жанчына або некалькі жанчын – *завівальнічка, завівальніца*: *Тады ўжэ завівальніцы просяць дружак, каб тыя заплацілі за тое, што яны завілі маладую* (в. Тульгавічы, Хойн. – ВнГ, с. 428); *Было такое павер’е: завівальнічкі павінны былі памяняцца месцамі, і хто хутчэй перабяжыць, у тых первыя дзеўкі будуць ісці замуж* (в. Карані, Светл. – ВнГ, с. 421).

Удзельнікаў заключнага этапу вяселля, якія на другі або трэці дзень вяселля пераапраналіся ў цыганоў або маладых і гулялі па хатах, іменавалі *цыганы, ражаныя*: *Як падзеляць каравай, шчэ трохі пагуляюць, паспяваюць. Патом некаторыя перадзяваюцца цыганамі і ідуць па сялу. Ох, што ўжэ яны выдзелуюць* (в. Тульгавічы, Хойн. – ВнГ, с. 429); *На другі дзень на вяселле могуць прыйсці ражаныя, людзі, якія перапранаюцца ў маладых* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 11).

Асобамі, якія забяспечвалі музычнае суправаджэнне на вяселлі, з’яўляліся *пявунні, музыкі, кіеўцы-музыкі*: *Да ўжэ музыкі будуць. Була гармонь, смук, барабан* (г. п. Тураў – ВнГ, с. 253); *Спецыяльна наймалі кіеўцаў-музыкаў, якія вельмі хораша іграли* (г. Калінкавічы – ВнГ, с. 271).

Акрамя адзначаных вышэй персанажаў, на вяселлі прысутнічалі запрошаныя асобы – *госці, вясельнікі, вясельныя госці, прыглашоныя, жаніховы госці, нявесціны госці, госці маладога, госці маладой*:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Потым усім вясельнікам даюць па чарцы выпіўкі (в. Пухавічы, Жытк. – ВнГ, с.232); *У нядзелю ішлі на свадзьбу. Збіраліся жаніховы госці ў жаніха, а нявесціны ў нявесты* (г. Гомель – ВнГ, с. 108). Людей, якіх не запрашалі на вяселле, называлі *пастароннія, запарожцы*: *Пад свадзьбу прыходзяць запарожцы – людзі, якіх не прыгласілі. Іх содзяць за аддзельны стол* (в. Гарадзец, Раг. – ВнГ, с. 372).

Зборнымі назвамі абазначалі радню маладых: *радня, родзічы, раство, родство, сваякі, радзіначка, дзеўкін род, жаніхоў род*: *Каравай замешывала хросная матка і другія сваякі* (в. Епіфань, Гом.); *Сколькі ў каго было родзічаў, яны дзелалі банкеты пасля свадзьбы* (в. Хальч, Ветк.); *Жаніховы раство банкеты водзяць, і нявесціны банкеты* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Словаўтваральная парадыгма агентыўных намінацый уключае назвы асоб, утвораных разнастайнымі спосабамі дэрывацыі. У іх ліку значная колькасць суфіксальных аддзеяслоўных (*завівальніцы, свяцілка, скупшчыкі, паязджане*) і адыменных (*каравайніцы, пасцельніцы, маладуха, родзічы, вясельнікі, дружкі, таварышкі, князёк*) дэрыватаў; асобныя лексемы, утвораныя прыставачным (*паджаніх, паддружын, падстараста*), прыставачна-суфіксальным спосабам (*паджанішнік, паджанішак, паднявесніца, незамужніцы*); шляхам асновескладання і словаскладання (*скрынавозы, паслявясельныя госці*); састаўныя намінацыі (*падружкі-шаферкі, дружкі-баярэ, княжныя-дружкі*); субстантываваныя назвы (*маладая, малады, засватаная, суджаная, кросная, ражаныя*), метафарычныя найменні (*цыганы, запарожцы*). Актыўна ў складзе агентыўных назваў вясельнай абраднасці Гомельшчыны выкарыстоўваюцца словазлучэнні тыпу *хросная маці, хрышчоны бацька, першая дружка, дзявочая дружына, вясельны поезд, жаніховы госці* і інш.

У сістэме намінацый дзеючых асоб шлюбнага рытуалу на Гомельшчыне даволі высокая ступень вар'іравання іх знешняй формы, абумоўленая лакальнай замацаванасцю намінатыўных адзінак і вуснай формай існавання народна-дыялектнай мовы. У складзе варыянтных агентыўных намінацый большасць складаюць словаўтваральныя варыянты з рознымі суфіксальнымі элементамі: *прыданы – прыданкі, закасяне – закасянкі, завівальнічкі – завівальніцы, каравайніцы – каравайніхі , малодка – маладуха, княжыя – княжныя* і інш. Некалькі радзей сустракаюцца фанетычныя варыянты: *хросны – кросны, шафер – шахвер, закасяне – закосяне, свяцілка – свяцёлка, радство – раство*, марфалагічныя варыянты: *баяры – баярэ – боярые, прыданы – прыданыя* і інш. Вар'іраванне знешняй формы агентыўных назваў суправаджаецца іх лексічнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дублетнасцю, што абумоўлена тэрытарыяльнай замацаванасцю лексічнай сістэмы народнай мовы: *дружына – бяседа – світа*; *сват – стараста*; міждыялектнымі і міжмоўнымі кантактамі: *падружкі – шаферкі, дружкі – шаферы, баяры – маршалкі*; рознымі тыпамі матывацыі аналізуемых адзінак: *родзічы – сваякі*, *прыданыя – скрынавозы*, *ложная – падстаўная*, *закасяне – пасцельнікі*, *засватаная – заручаная*, *дружок – паджаніх* і інш.

Такім чынам, назвы дзеючых асоб вясельнага абраду на Гомельшчыне складаюць шматлікую групу намінацый, якія маюць дакладную дыферэнцыяцыю семантычнага аб'ёму, з'яўляюцца разнастайнымі паводле тыпаў структурна-семантычнай матывацыі і спосабаў дэрывацыі, вызначаюцца актыўным вар'іраваннем знешняй формы і функцыянаваннем значнай колькасці сінанімічных лексічных адзінак.

1.1.1.3 Прадметны код вясельнай абраднасці і яго моўнае выражэнне ў гаворках Гомельшчыны

Назвы прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў вясельнай абраднасці, складаюць рэчыўны код як састаўную частку рытуалу. Гэта намінацыі розных матэрыяльных кампанентаў вясельнага рытуалу. Яны абазначаюць прадметы паўсядзённага ўжытку – вянок, стужка, дрэўца, хлеб, сцяг, дзяжа, кажух, пояс, ручнікі, пярсцёнкі і інш., за якімі замацоўваецца пэўная абрадавая сімволіка, канкрэтныя станоўчыя якасці, звязваецца засцерагальная, ахоўная, абарончая або ачышчальная, а таксама пажадальная функцыі, якім прыпісваецца асаблівы, магічны сэнс.

Так, яшчэ да вяселля, у час сватання, выкарыстоўвалі такія атрыбуты, як *гарбуз, лапаць, платок*. Гарбуз сімвалічна абазначаў нязгоду дзяўчыны выйсці замуж за хлопца: *У нас раньшэ было так. Ідуць па дагаворы, бяруць самы бальшы гарбуз і як пусцяць у хату, а з той стараны нявеставы радзіцелі стаяць. І ежалі гарбуз схвацяць і паставяць на стол, то госці заходзяць, а калі назад пусцяць, то ўсе расходзяцца і пара не састаіцца* (Старое Сяло, Ветк – В., с. 224); *Гарбуз давала дзеўка, калі не хацела выхадзіць замуж* (в. Азершчына, Рэч.). Такую ж ролю мог выконваць і лапаць: *Колісь казалі: малады адчыніць дзверы да лапці кіне; як возьме яна тыя лапці, прыме значыць, пойдзе замуж, а як вукіне назад за дзверы, значыць, к другой ідзі* (в. Малыя Зімовішчы, Маз. – ВНГ, с. 325). Сімвалічнае значэнне згоды мела хустачка (*платок*): *У нас раньше ходзілі сваты. Када жаніху платок дадуць, гавораць, ідзём к надзёжнай, ну. Она ўжэ за*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цебя пайдзёт, а то іще можа гарбуз катануць, што не пайду за цібе. А еслі платок, то ўжэ пайдзёць (г. Ветка).

Сімвалічнымі былі асобныя традыцыйныя элементы вясельнага ўбору нявесты. Так, вясельны *вянок, венчык, вяночак* з'яўляўся асноўным сімвалам дзявоцтва, маладосці і прыгажосці нявесты. Як замкнутае кола вянок выражае ідэю бясконцасці і магічнай абароны няаесты ад ад злога духа. Сяброўкі маладой перад вяселлем плялі ёй вянок і спявалі вясельныя песні: *Мы спявалі вясельныя песні перад свадзьбай у маладой, калі плялі вянок* (в. Радуга, Ветк. – В., с. 230); *Ужо ў жаніха свякрова снімае з нявесты вянок і фату і кладзець іх за іконай, а нявесці на галаву адзявае свой платок* (г. Ветка); *Вяночкі дзелалі самі з красівых такіх бумажак* (в. Дуброўнае, Браг. – Б., с. 119); *Першы вянок адзявалі на лоб. Потым рабіўся брыжык, затым вянок, потым зноў брыжык. Затым шлі ленты разнацветныя, атласныя ленты* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Цяпер відна, што нявеста, а тады ж не: плацце проста купіць, тутака як венчык на галаву зделаюць. Ну і ўсё – і нявеста* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Стужка (*лента*), заплеценая ў касу нявесты, таксама сімвалізавала яе дзявоцтва, дзявочую прыгажосць, маладосць, цнатлівасць (яна звязвала, "замыкала" дзявочую касу): *Самы меншы брат расплятаў касу. Яму даюць дзесятку дзенег і канхвет. Нявеста ў гэты час сядзіць пад ёлкай. А запляталі дзеўкі. Запляталі маладую ў адну касу, ленты ўпляталі* (в. Рэчкі, Ветк. – ВНГ, с. 103); *Такі вяночак – сплятуць яго аб галаве, а ззадзі нада штоб многа-многа була лентаў* (в. Дуброўнае, Браг. – НДК., с. 119).

Асаблівае значэнне меў і галаўны ўбор нявесты – *вэлюм, фата*, белізна якога сімвалізавала яе нявіннасць, цнатлівасць: *Фату на вяселлі рабілі з марлі і плялі вяночак. Назаўтра фату не адзявалі* (в. Івакі, Добр.); *Заканчвалася всё тым, што свякруха снімала фату з нявесту, як бы гаворачы, што яна прасцілася з маладым жыццем. У канцэ вечара свякруха снімае з нявесты фату і мерае яе ўсім незамужнім, дзеўкам. Эта штоб дзеўкі скарэй замуж павыходзілі* (в. Церуха, Гом.); *У зборную суботу сяброўкі маладой збіраюцца ў яе хаце і рыхтуюць нявесту да замужжа. Яны робяць кветкі, вэлюм. Сяброўкі адзяваюць нявесту* (в. Карані, Светл. – ВНГ, с. 410). Такім чынам, як бачна з прыкладаў, фата – сімвал дзявоцтва, і, развітваючыся з ёю на шлюбнай цырымоніі, нявеста падкрэслівае змену свайго сямейнага статусу.

Абавязковым атрыбутам вясельнай абраднасці з'яўлялася *вясельнае дрэўца*, якое ўпрыгожвалі перад вяселлем. Яно, як ужо ўпаміналася вышэй, адлюстроўвала раслінны код абраду. сімвалізавала маладосць і прыгажосць, здароўе і ўрадлівасць, пладавітасць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вясельнае дрэўца ў гаворках Гомельскай вобласці мела розныя назвы: *велка, велца, вельцэ, вельца, велечка, елец, ельца, ёлка, елка, ёўка, ёлачка, яліца*. Рытуал прыгатавання і ўпрыгожвання вясельнага дрэўца ў розных раёнах Гомельшчыны мае як агульныя, так і адметныя ўласцівасці. Адрозненні звязаны з выбарам дрэва, характарам яго упрыгожвання, месцам размяшчэння, умовамі выкарыстання.

Найчасцей у ролі вясельнага дрэўца ў даследуемым рэгіёне выступала *ёлка*: *На вяселле ёлку стаўлялі* (в. Хальч, Ветк.); *На свадзьбу ставілі і ўкрашалі ёлку* (в. Старое Сяло, Ветк.). Ёлка, паводле меркаванняў інфарматараў, сімвалізавала нявесту, яе маладосць і прыгажосць: *Ёлка – ета нявеста* (в Барталамееўка, Ветк.). Як правіла, у населеных пунктах Веткаўскага і Добрушскага раёнаў ёлку прыносілі з лесу сяброўкі нявесты: *Дзеўкі ідуць у суботу, адсякаюць ёлку* (Рэчкі, Ветк.); *Вот у падругі свадзьба. Ана збірае нас, вырубліваем у лесе ёлку* (в. Барталамееўка, Ветк.); *У суботу перад свадзьбай збіраліся дружкі нявесты і нявеста, хадзілі па ёлку. Прыходзілі ў лес.. і выбіралі ёлку, каб была добрая, не крывая, пушыстая* (Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с. 108). Цікава, што ў Нараўлянскім раёне ўдзел у гэтым рытуале прымаў і малады са сваімі сябрамі: *Свідзецель з маладым ідуць шукаць гарну ёлку. Вырубаюць, робяць крэст, пратыкаюць і замацоўваюць* (в. Белая Сарока, Нараўл. – С., с. 102).

Акрамя ёлкі, у якасці вясельнага дрэўца выкарыстоўвалі таксама вярбу, якую называлі *велка, велца, вельца, велечка*: *Свадьбу гулялі красіва. Яшчэ на свадьбу ставілі такую, як называюць велца, велечка з вярбы, кучаравую такую* (г.п. Церахоўка, Добр.); У некаторых вёсках вясельнае дрэва замяняла галінка або букет, кветкі: *Ельца – цвяты, прыдзеланыя к палцы з рагуліны. Ельца стаяла ўсю свадзьбу* (в. Насовічы, Добр.); *Сяброўкі дзелалі букецікі з яліцы. Кветкі адзявалі на яловую ветку* (в. Жгунь, Добр. – ЗЧД, с. 252); *Вясельнае вельца ў нас было такое – булку хлеба должен прінесці дружок, у цэнтры ставілі цветы* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Упрыгожвалі вясельнае дрэўца ў асноўным свечкамі, стужкамі, папяровымі кветкамі, у некаторых выпадках – і цацкамі: *Мы прыходзім к нівесце, ставім на стол, дзелаем кіціцы з бумагі, упрыгожваем ёлку* (в. Барталамееўка, Ветк.); *Ёлку ўюць. На бумаге выразаюць усякія ігрушкі. І на ёлку вешаюць, ёлка настояшчая* (в. Барталамееўка, Ветк.); *На свадзьбу раней гаварылі прынята было ёлку ўкрашаць. Лентачкамі всякімі разнацветнымі* (г. Ветка); *Дажэ еслі і летам свадзьба – всё равно, ілі вербу, ілі ёлку украшалі банцікамі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *На свадзьбу ставілі і ўкрашалі ёлку разнымі фігуркамі з бумагі* (в. Старое Сяло); *Ёлку ўпрыгожвалі разнымі такімі ігрушкамі, хлапушкамі* (г. Ветка.).

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

Сам працэс упрыгожвання дрэўца называўся найчасцей *віць ёлку (вельца, велечка)*: *Ёлку ўюць настаяшчую, вешаюць розныя бумажкі, цацкі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *З самога рання дзяўчаты прыходзілі і нараджалі нявесту, вілі велечка і пелі песні* (в. Баршчоўка, Добр. – ЗЧД, с. 249); *ставіць (стаўляць) ёлку*: *На вяселле ёлку стаўлялі* (в. Хальч, Ветк.); *украшаць ёлку*: *Дружкі ўкрашалі ёлку, красілі бумагу і з ёй рабілі кветкі і імі ўкрашалі* (в. Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с. 108). Упрыгожванню дрэўца надавалася такая ўвага, таму што яно таксама мела сімвалічны характар, у ім перадавалася пажаданне добрага, шчаслівага жыцця: *Калі маладую на пасад заводзілі, сват ельца дзержаў. Яно нада, штоб маладыя, сям'я іх цвяла. Яно, штоб мір быў у сям'і* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Важным было і месца, куды стаўлялі вясельнае дрэўца: <u>*на кут*</u> – *Ёлку, якую вілі дзеўкі .. становяць на кут. Маладая стаіць пад ёлкай* (Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с.105); <u>*на стол*</u>: *Стаўляюць на стол ёлку, куды маладую садзяць* (в. Хальч, Ветк.); *Дрэўца ў хаце на стол стаўлялі* (г. Ветка); <u>*у хлеб*</u>: *Прыносілі нявесце ў хату ёлку, станавілі на стол у булку хлеба, каб не абярнулася* (в. Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с. 108). *Кветкі адзявалі на яловую ветку. Саму гэту кветку тыркалі ў хлеб, які ставілі на стол* (в. Жгунь, Добр. – ЗЧД с. 252). У гэтым таксама праяўляўся сімвалічны сэнс – праекцыя на дабрабыт, багацце, ураджайнасць і пладавітасць.

Вызначана было месца, дзе сядзела маладая ў гэты час: <u>*пад ёлкай*</u> : *На свадзьбе маладая сядзіць пад ёлкай* (в. Рэчкі, Ветк. – ВнГ, с. 100); <u>*за ёлкай*</u>: *Дрэўца ў хаце на стол стаўлялі, нявеста за ёлкай сядзіць* (г. Ветка); <u>*перад ёлкай*</u>: *Касу распляталі нявесце, калі яна сядзела перад ёлкай* (в. Хальч, Ветк.). Вакол ёлкі вадзілі карагод, спявалі вясельныя песні: *На свадзьбу ставілі вельца з вярбы .., кругом хадзілі, песні пелі, штоб красіва жылі маладыя* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Час, калі "вілі ёлку", таксама быў рэгламентаваны. Гэта найчасцей зборная субота перад вяселлем: *Вельца вілі ў зборную суботу* (г. п. Церахоўка, Добр.), перад пасадам: *Ёлку ставяць падчас пасаду на вяселлі* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Такім чынам, вясельнае дрэўца, як і нявеста, было цэнтрам шлюбных падзей. Перад выездам на вянчанне дружка або жаніх, у некаторых маясцовасцях сват павінны былі *выкупіць дрэўца, даць за яго выкуп: Дзяўчаты хочуць, штоб за ёлку ім далі пірог ды больш грошай* (в. Жгунь, Добр., с. 252); *На вяселле ёлку стаўлялі .. Сваты прыходзяць, выкуплююць* (в. Барталамееўка, Ветк.); *І вот маладзёж ёлку ету прадала, ім далі грошы на рукі, гасцінцы далі на рукі* (в. Рэчкі, Ветк.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Заключным этапам ёлачнага рытуалу было ламанне ёлкі: *Дружок прыходзе ўжо выкупляе нас .. і мы ўжо з-за стала выходзім, ёлку тую бурым, госці садзяцца за стол і гуляюць свадзьбу* (в. Барталамееўка, Ветк.). Пры гэтым жаніх імкнуўся зламаць вярхушачку ёлкі, сяброўкі нявесты не давалі яму гэта зрабіць. Тое ж рабілі і дружкі маладога або сваты, калі нявеста спрабавала зламаць вярхушку: *Ёлку, як нявеста зламае, то будзе верх імець над мужыком. Дык сваты стараюцца, каб маладая не зламала верх, а яна тады стараецца, штоб зламіць верх* (в. Казацкія Балсуны, Ветк. – В., с. 233).

Некаторыя даследчыкі ўказваюць на сувязь двух асноўных вясельных атрыбутаў – каравая і вясельнага дрэўца: каравай упрыгожваўся галінкамі пладовых дрэў, на ім выпякаліся шышкі і лісточкі. Нярэдка выкарыстоўваліся лясныя шышкі, якія абмазвалі цестам і выпякалі з караваем. У наш час ролю вясельнага дрэўца ў некаторай ступені выконвае "букет нявесты", які спецыяльна падбіраюць, упрыгожваюць да вяселля, які захоўвае нявеста ў час вянчання або роспісі ў загсе, а пасля кідае сваім незамужнім сяброўкам. Якая з іх падхопіць букет, тая ў хуткім часе замуж выйдзе.

Асобнай увагі заслугоўваюць *рытуальныя кулінарныя вырабы*, якія выкарыстоўваюцца ў вясельнай абраднасці. Гэта ў першую чаргу хлеба-булачныя вырабы. Важнае месца ў шлюбных абрадах займаў такі кампанент, як хлеб-соль, які быў неад'емным атрыбутам сустрэчы сватоў або маладых на вяселлі: *На стол, падрыхтаваны для гасцей, сваты кладуць хлеб-соль на рушніку, ставяць гарэлку, закуску* (в. Елянец, Б.-Каш., ВнГ, с. 62)

Асаблівае значэнне, надаваемае хлебу ў гэтым рытуале, відаць з таго, што яго заварочвалі ў ручнік: *Хлеб уматвалі ў палаценца, а соль у стакан ілі ў блюдка клалі* (в. Рэчкі, Ветк. – ВнГ, с. 98). Для сватання маглі выпякаць і спецыяльны пірог: *Ну, пікуць пірог, учыняюць цеста і пікуць не просты хлеб, а такі прадаўгаваценькі* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 43). Прыняцце хлеба нявестай у час сватаўства было сімвалам яе згоды на шлюб: *Калі чаркі з гарэлкай не брала і до яго родных не подходзіла – то не згодна нявеста. А потым возврашчае той хлеб, што жаніх прынёс* (в. Бацунь, Б.-Каш. – ВнГ, с. 82).

Пачастунак, які прыносілі з сабою сваты, мела зборную назву *магарыч, ласіна*, метафарычную *Боскія дары*: *Сваты вязуць з сабой "ласіну" (кусок сала, хлеб, соль). Абменьваюцца ласінай, калі панравіліся* (в. Рудзянок, Б.-Каш. – ВнГ, с. 68); *Калі ўсе збіраюцца, то госці бяруцца за пастаўленыя на стол "Боскія дары", частуюцца, хваляць сватоў і гаспадароў* (в. Ляскавічы, Акц. – ВТГ, с. 18).

Пірог, які называлі *лепень*, фігурыраваў і ў заключным этапе вяселля: *На трэці дзень свадзьбы выносілі на стол непачаты лепень* ..

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– *вялікі пірог, упрыгожаны вітушкамі, розачкамі, са сладкай начынкай, якім угашчалі гасцей у панядзелак* (в. Пціч, Петр. – ВТГ, с. 372). Застолле ў доме маладога праз тыдзень пасля вяселля, акрамя асноўных назваў *отведкі, пярэзвы*, мела жартаўлівую назву *гарэлыя пірагі, пірагі*: *Чэраз нядзелю после свадзьбы едуць .. на гарэлыя пірагі* (в. Глыбоцкае, Гом. – ВТГ, с.8).

Калі адбываецца застолле ў хаце маладой, *"свякруха дае вузел падаркаў, а маладая развязвае і глядзіць, што ж яна тамака паклала: пірага на ўсіх дружак паклала, канфет, семечак насыпала. Ета шчыталася – іскупошвалі дружак"* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 47).

Хлеб і соль, акрамя таго, былі абавязковым атрыбутам благаславення, сустрэчы і провадаў маладых іх бацькамі: *Пасля вянца маладых .. сустракалі бацькі хлебам-соллю і мёдам* (в. Ляскавічы, Акц. – ВТГ, с. 18); М*аладых сустракала маці. Вуносілі стол і ставілі яго каля вугла хаты. На стол клалі хлеб, соль і мёд* (в. Ванюжычы, Петр. – ВнГ, с. 355). *Маці жаніха падносіла маладым хлеб-соль, і яны павінны былі яго па разу адкусіць. Лічылася, хто больш адкусіць, той і будзе галавой сям'і* (в. Міхнаўка, Браг. – ВнГ, с. 39). *Маладых сустракаюць салодкім, каб ім салодка жылось. Бацькі жаніха дзержаць хлеб, а маладыя кусаюць, хочуць адкусіць большы кусок, каб быць у доме хазяінам* (в. Рудзянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 70)/

У сістэме рытуальных прадметных элементаў вясельнай абраднасці паўсямесна сустракаюцца зерневыя культуры – жыта, пшаніца, авёс, пшано і інш. Імі звычайна абсыпалі ("абсявалі") маладых, іх вясельны поезд, адпраўляючы іх на вянчанне або сустракаючы пасля вянца: *Калі адпраўлялі вянчацца, абсыпалі жытам .. Прыязджалі ўжо з вянчання, устрачалі маладых з хлебам і соллю, з караваем. Абсыпалі жытам, грашыма, канфетамі* (в. Кацуры, Петр. – ВТГ, с. 370); *Перад ад'ездам .. маці абсыпае павозку жытам* (в. Ляскавічы, Акц. – ВТГ, с. 18.). Гэта сімвалізавала будучае шчаслівае сямейнае жыццё маладых: *Сустракаюць маладых хлебам-соллю, гарэлкай, абсыпаюць жытам, каб маладым шчасліва жылося* (в. Губічы, Б.-Каш. – ВТГ, с. 55).

Зерне маглі насыпаць у кішэню жаніху, жадаючы яму такім чынам дастатку і багацця: *Ад вянца маладых сустракаюць бацькі маладой. Спачатку абсыпаюць іх збожжам, збожжа кладуць у карманы маладому, каб грошай шмат было* (в. Рудня Марымонава, Гом. – ВТГ, с. 84).

Зернем пасыпалі абрус, на які клалі карай: *Каравай ложаць на абрус, на які сыплюць зерне аўса або пшаніцы* (в. Вязок, Браг. – ВнГ, с. 30).

Стол, за які садзяцца госці, – сімвал згоды, сяброўства, гасціннасці гаспадароў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рытуальнымі прадметамі ў вясельным абрадзе былі *вырабы з футра або пер'я.* У вясельным абрадзе пасаду, калі маладых у час вяселля ўсаджвалі на вывернуты *кажух, шубу, падушку, шкуру з цялёнка*, выражаліся матывы ініцыяцыі. Як сцвярджаюць інфарматары, сэнс абрадавых дзеянняў, звязаных з вышэй названымі рытуальнымі прадметамі, – у пажаданні маладым багацця, шчасця, прыгажосці: *У доме маладых садзілі на шубу. Эта штобы дзеці кучаравы былі* (в. Залаты Рог, Ветк – В., с. 223); *Абязацельна садзілі нявесту з жаніхом на вывернуты кажух, штоб жызнь харошая была, добрая, багатая* (в. Хальч)*; Маладых садзілі на шубу пад іконай, каб яны былі багатымі* (г. п. Церахоўка, Добр.)*; Пасля цэркві маладыя прыязджаюць і іх садзяць на падушку, кажуць, дзеці будуць кудравыя* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Сакральнае ж значэнне гэтага абраду – сімвалізацыя дарасласці, полаўзроставай спеласці і пладавітасці, а таксама апатрапея. Як адзначаюць даследчыкі беларускага вяселля, абрад выкарыстання кажуха, вывернутага мехам наверх, вельмі старажытны. Вывернуты кажух (футра, пер'е падушкі, шкура) – рэха татэмістычнага культу мядзведзя, мех сімвалічна замяняў былую мядзведжую шкуру. У старажытнасці такі ўбор абазначаў, што чалавек, які яго апрануў, пераўтвараўся ў мядзведзя. Шкуры татэма прыпісвалася лекавая сіла – выганяць з чалавека хваробы, а таксама магічная здольнасць прыцягваць духі [7, с. 105–108].

Вывернуты мехам наверх кажух прысутнічаў і ў іншых рытуалух вясельнага абраду: *Дзяжу для цеста ставілі пасярод хаты на вывернутым кажусе, сыпалі ў яе муку і лілі ваду за адзін прысест* (в. Данілавічы, Ветк. – ВНГ, с. 105). У хаце жаніха маладых на парозе сустракала свякроў або хросная ў вывернутым кажусе: *Калі маладыя прыедуць да дома жаніха, на парозе іх сустракаюць свекар і свякруха з хлебам і соллю. Сустракае іх і кросна матка маладога ў кажухе. Кажух вывернуты, каб былі маладыя багаты* (в. Белая Сарока, Нараўл. – С., с. 108).

Рытуальнымі ў вясельным абрадзе з'яўляліся такія прадметы, як ручнік, стужкі, пояс, якімі перавязвалі маладых або пэўныя рэчы, пярсцёнкі, якімі яны абменьваліся, аб чым гаварылася вышэй. Яны сімвалізавалі шлюбны саюз, стварэнне адзінай сям'і, сувязь маладых.

Абавязковым атрыбутам вясельнага абраду быў *рушнік, ручнік, палаценцэ, набожнікі*. На яго клалі хлеб-соль, якім сустракалі маладых: *Бацька, матка, маладых сустракаюць. Хлеб-соль на палатенцы нясуць* (г. п. Церахоўка, Добр.), станавіліся ў царкве ў час вянчання: *Вянчанне праводзілася пасля службы ў царкве. Расцілалі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рушнік тканы, вышываны, па баках клалі капейкі, сведкам у рукі давалі венчыкі, і яны іх трымалі над галавамі маладых усю службу (в. Гарошкоў, Рэч.); *Свадьба – калі ў царкве вянчаліся, дак на рушнік станавіліся* (г. Ветка); *Бацюшка рушніком связвае рукі маладых і вядзе іх вакол ямвона тры разы. А сведкі ў гэты час нагамі цягнуць рушнік за імі (гэта каб дзеўкі выходзілі замуж), а служка царквы адбірае гэты рушнік тры разы і расцілае пад ногі маладых рушнік на месца* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Знаю, што кагда венчают, гаварят: Станавісь быстрей сама, первай ногу ставь. Палаценцэ падстелена. Вот, будзеш сама хадзяйкай у нево, а еслі он первы станет, то ты будзеш падчыняцца всю жызнь* (г. Ветка); звязвалі рукі маладых: *Бацюшка рушніком связвае рукі маладых і вядзе іх вакол ямвона тры разы*(в. Гарошкаў, Рэч.); ручніком абвязвалі каравай: *Каравай ложаць на абрус, на які сыплюць зерне аўса або пшаніцы. А сам каравай абвязваюць ручніком* (в. Вязок, Браг. – ВНГ, с. 30); *Каравайніцы ўпрыгожаныя галінкі ўтыкаюць у каравай. Сам каравай абвязваюць рушніком* (в. Любавічы, Жытк. – ВНГ, с. 224); ручніком накрывалі талерку на грошы: *Грошы кладуць на талерку, накрытую ручніком .., а дружка нявесты забірае іх у мяшочак або сумачку* (в. Елянец, Б.-Кашал. – ВНГ, с. 65); ім упрыгожвалі абразы ў хаце: *Старшая дружка абвешвала вышываныя палаценцы* (г. Ветка). Ручніком перавязвалі сватоў, падкрэсліваючы іх асаблівыя паўнамоцтвы на вяселлі: *Абвязвалі усіх сватоў ручнікамі. Папам і мамам давалі падарункі: рубашкі, мацерыял* (в. Жмураўка, Рэч.). Да вяселля нявеста павінна была пашыць новыя ручнікі, якімі ўпрыгожвала абразы ў сваёй хаце і ў хаце свайго жаніха пасля прыезду туды вясельнага поезду: *На іконы вешалі набожнік і хвіранкі на вокны. Яны далжны былі ўжо прывесці і сваё павесіць* (п. Сямёнаўскі, Добр.). Гэта павінна было паказаць заможнасць нявесты і яе здольнасць да рукадзелля, хаця архаічная функцыя гэтага рытуалу, як адзначаюць даследчыкі, была абарончай і выклікана імкненнем задобрыць духаў-продкаў, стварыць добразычлівы мікраклімат у доме мужа [8, с. 121]. Рушнік, які ўпрыгожваўся традыцыйным арнаментам (як вышывалі маці і бабулі) паказваў таксама прыналежнасць маладой да свайго роду, ён, акрамя таго, сімвалізаваў жыццёвы шлях, дарогу.

Рытуальнае значэнне мела ў вясельным абрадзе *дзяжа*, якая сімвалізавала, з аднаго боку, чыстату, цнатлівасць нявесты, з другога боку – давала праекцыю на прыбытак і пладавітасць. У дзяжы расчынялі каравай, на дзяжу, накрытую вывернутым кажухом, садзілі нявесту, калі яна была цнатлівая: *Пасад – ета дзяжа, якую накрывалі вывернутай шубай, і на яе садзілі нявесту. Калі нявеста чэсная, то*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

садзілася, а калі не – то садзіцца нільзя было, грех бальшэй (г. Ветка). Лічылася, што калі нявеста, якая страціла сваю нявіннасць, сядзе на дзяжу, яна абразіць каравай і ў жыцці ёй ніколі не будзе шчасця [7, с. 128].

Абавязковымі атрыбутамі вясельнай абраднасці былі *пасаг, (прыданае), пасцель* маладой*: Пасах – эта абавязкова. Мае радзіцелі карову падарылі. Парасёнка дораць. Цялёнка дораць. Коз, пчол дораць* (в. Грабаўка, Гом.); *У прыданае нявесце давалі две падушкі. Посцілкі, радны – тканыя, настольнікі, набожнікі на іконы, фіранкі з марлі ці з гардзін* (п. Сямёнаўскі, Добр.); *Прыданае нявесты – клункі. Было шмат дабра, але калі быў шкаф, то яна лічылася багатай нявестай* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Абрад перавозу *пасцелі* маладой і яе *пасагу* ўзмацняў сімвалічнае значэнне пераходу нявесты ў іншы статус, звязаны з яе пераездам у дом жаніха: *Пасля поўначы нявесту з пасцеллю вязуць у дом жаніха, дзе яна будзе жыць, а назаўтра прывозяць адзежу* (Залаты Рог, Ветк – В., с. 223). *Пасцель* маладой магла быць асобным рытуальным прадметам, а магла і з'яўляцца састаўной часткай *пасагу*.

Маладых праважалі з хаты і сустракалі бацькі з іконай*: Ікона была абязацельна. Мая мамка стол пасярод хаты паставіла і ікону зняла, і міне вакол стала абвяла. І дарогу паказала на дзверы* (в. Хальч, Ветк.); *Сустракалі маладых з царквы з віконаю* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Пасля вянчання, калі маладыя прыехалі дамой, яны сначала даўжны пацалаваць ікону, патом радзіцелей, а потам – хлеб-соль* (в. Церуха, Гом.). *Свечкі*, якія маладыя трымаюць у царкве, сімвалічна асвятляюць іх будучы жыццёвы сумесны шлях.

Рытуальным дзеяннем было абсыпанне маладых пры іх сустрэчы зернем, макам, цукеркамі, манетамі, што сімвалізавала пажаданне дастатку, дабрабыту, заможнасці і здароўя: *Абсыпалі маладых макам і зярном. Зярно – эта жызнь. І мак сыпалі і гаварылі: "Сыплю мак, штоб было всё так"* (г.п. Церахоўка, Добр.); *Абсыпалі маладых пшаніцай, штоб багата жылі* (в. Хальч, Ветк.); *Абсыпалі аўсом і просам, жадалі ўсяго харошага* (в. Гадзічава, Гом.*); І кагда в церковь атправляюцца, тожэ зернем асыпают* (г. Рэчыца). Абавязковым быў таксама рытуал сустрэчы маладых хлебам з соллю: *Маладых устречалі бацькі. У маці ў руках хлеб-соль. Она посыпала зерном іх, і конешно ж благословіла на ўсю жызнь. Маці молодого давала мёд (чтоб жызнь была сладкая)* (в. Маркавічы, Гом.).

Неад'емным элементам вяселля з'яўляюцца *падаркі, дары* ўдзельнікам вясельнага абраду – маладым і членам іх сямей, аб чым гаварылася вышэй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сэнс выкарыстання большасці апісаных вышэй рытуальных прадметаў у працэсе вясельнага абраду інфарматары звязваюць з пажаданнем маладым здароўя, дастатку, дабрабыту, дружнай, шчаслівай сям'і, здаровых дзетак, заможнай гаспадаркі. Многія вясельныя атрыбуты сімвалізавалі маладосць, прыгажосць, нявіннасць нявесты, мужнасць, сілу і моц жаніха, адлюстроўвалі іх дарослaсць, полаўзроставую спеласць, праецыравалі на дзетароднасць.

Такім чынам, рэчыўныя атрыбуты, якія выкарыстоўваліся ў вясельных абрадах, мелі сімвалічнае значэнне і складалі своеасаблівую семіятычную сістэму. Іх знакавы характар мае старажытныя вытокі і звязаны з выражэннем розных магічных функцый.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Умоўныя скарачэнні

В. – Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / аўт. уклад.: І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – 362 с.

ВнГ – Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.

ВТГ – Вясельная традыцыя Гомельшчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / Укладанне В. С. Новак. – Мінск: Права і эканоміка. 2011. – 485 с.

ЖРП – Жаўруковая песня радзімы: Народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю: манаграфія / ГДУ імя Ф. Скарыны; пад агульнай рэдакцыяй В.С. Новак. – Гомель: Сож, 2008. – 424 с.

ЗЧД – Зямля чароўная дабра: Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць / пад аг. рэд. А. А. Станкевіч. – Гомель: ААТ "Полеспечать", 2008. – 280 с.

Лоеўшч. – Лоеўшчына... Бэзавы рай, песенны край. Сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца В. С. Новак. – Гомель: Сож, 2007. – 472 с. : іл.

НДК – Народная духоўная культура Брагіншчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / Склад. В. С.Новак, У. І. Коваль. – Гомель: Белдрук, 2007. – 240 с.

НДС – Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца і рэдагаванне В. С. Новак. – Гомель: ААТ "Полеспечать", 2007. – 456 с. : іл.

Р – Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / Аўт. уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ "Нёман", 2002. – 383 с.

С – Спрадвечнае: Фальклорны зборнік ліквідаваных у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС населеных пунктаў / Аўт. укл.: І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2005. – 230 с.

ФСГ – Фальклорны слоўнік Гомельшчыны / Уклад. У. В. Анічэнка, У. А. Бобрык, Л. П. Кузьміч, Дз. Дз. Паўлавец. – Гомель: УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”, 2003. – 346 с.

ХСД – Хойнікшчыны спеўная душа: народная духоўная культура Хойніцкага краю: фальклорна-этнаграфічны зборнік / пад агул. рэд. В. С. Новак. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 303 с.: іл.

Літаратура

1.Традиции материальной и духовной культуры Восточного Полесья: проблемы изучения, сохранения и развития в постчернобыльское время: Монография / Науч. ред. Д. Г. Лин. – Гомель: УО “ГГУ им. Ф. Скорины”, 2003. – 167 с.

2. Толстой, Н. И. Из “грамматики” обрядов // Труды по знаковым системам. 15. – Тарту, 1980.

3. Чижикова, Л. Н. Свадебная обрядность сельского населения русско-украинского пограничья в начале XX в. / Полевые исследования Института этнографии. 1978. – М.: Изд-во «Наука», 1980.

4. Вяселле // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.); Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

5. Толстая, С. М. Терминология обрядов и верований как источник реконструкции древней духовной культуры / Славянский и балканский фольклор: Реконструкция древней славянской культуры: источники и методы. – М.: Наука, 1989.

6. Варфоломеева, Т. Б. Северобелорусская свадьба: обряд, песенно-мелодические типы / Ред. З. Я. Можейко / Т. Б. Варфоломеева. – Минск: “Наука и техника”, 1988. – 156 с.

7. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. М. Никольский.– Изд-во АН БССР.– Минск, 1956. – 273 с.

8. Зорин, Н. В. Русский свадебный ритуал / Н. В. Зорин.– Институт этнологии и антропологии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. – М.: Наука, 2004. – 248 с.

9. Гура, А. В. Терминология севернорусского свадебного обряда (на общеславянском фоне) / А.В. Гура. Автореф. канд. фил. наук по спец. 10.02.01 – русский язык. – М: Изд-во МГУ, 1978. – 18 с.

10. Ларина, Л. И. Терминология свадебного обряда курского региона в этнолингвистическом аспекте. Автореф. дис. канд. филол. наук по спец. 10.02.01 – русский язык. – Воронеж, 1990, – 19 с.

11. Кушнір, В. Г. Традиційна весільна обрядовість українців Одещини (20–80-ті рр. XX ст.) / В. Г. Кушнір, Н. О. Петрова – Одеса: Гермес, 2008. – 256 с.

12. Магрицька, І. Словник весільної лексики українських східнослобожанських говірок (Луганська область) / І. Магрицька. – Луганськ, 2003 – 107 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

13. Зямля чароўная дабра: Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць / Пад аг. рэд. А.А. Станкевіч. – Гомель: ААТ “Полеспечать”, 2008. – 280 с.

14. Палескае вяселле / Уклад. і рэд. В. А. Захаравай. – Мінск: Выд.ва “Універсітэцкае”, 1984. – 303 с.;

15. Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі, Муз. дадат. З. Я. Мажэйка / Рэд. тома В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 683 с.

16. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http//mir-svadbi.ru/svadebnyj-karavaj. – Дата доступа: 20.01.2014.

17. Мархель-Кокашинская, М. Белорусская свадьба: от сватов до каравая [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.prazdnik.by; http://meditation-portal.com/simvolika-svadebnogo-rushnika. – Дата доступа: 02.02.2014.

18. [Єлектронний ресурс]. – Режим доступа: http://chudo-prazdnik.dp.ua/articles/new-link-02120548/. – Дата доступа: 29.10.2014.

19. Сумцов, Н. Ф. Символика славянских обрядов: Избр. Труды / Н. Ф. Сумцов. – М.: Изд. фирма “Восточ. лит.”, 1996. – 296 с.

20. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://semmostov.ru/ traditions/obrjad/predmety. – Дата доступа: 29.10.2014.

21. Славянские древности. Этнолингвистический словарь в 5 томах. Т.1У. М.: Изд.-во “Международные отношения”, 2009. – 656 с.

22. Шарабарина, Т. Г. Мотивы огня и воды в свадебных песнях / [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vkoem.kz/index.php – Дата доступа: 29.10.2014

23. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://spb.lamoursk.ru/132-svechi-na-svadbe.html – Дата доступа: 29.10.2014

24. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://mar4586.narod.ru/ animals/birds/hen.html – Дата доступа: 29.10.2014.

25. Народная одежда в обрядах и обычаях восточных славян [Электронный ресурс] – Режим доступа: http//judis.ru. – Дата доступа: 29.10.2014.

26. Виноградова, Л. Н. Ритуалы типа «вождения ряженого» // Philologia Slavica: К 70-летию академика Н. И. Толстого. – М., 1993. – С. 24–30.

27. Глухова, Г.А. Символика ряженья в традиционной культуре удмуртов. Автореф. дисс. канд. наук по спец. 10.01.09 “Фольклористика”. – Ижевск, 2002. – 21 с.

28. Гура, А. В. Символика животных в славянской народной традиции. М.: Изд-во «Индрик», 1997. – С. 177 –199.

29. Жарникова, С. В. Нить времени: Обряды и праздники / Культура и искусство [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.cultandart.ru. – Дата доступа: 29.10.2014.

30. Вяселле: Абрад / Уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі, Муз. дадат. З.Я. Мажэйка / Рэд. тома В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 683 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

К. Л. Хазанава

1.1.2 Лексіка вясельнай абраднасці ва ўсходнеславянскім кантэксце

Мова з'яўляецца састаўной часткай духоўнай культуры народа, бо захоўвае і пераносіць з пакалення ў пакаленне скарб народных традыцый. У лексічнай сістэме нацыянальнай мовы гэта скарбніца ўяўляе сабой абрадавыя назвы, якія адлюстроўваюць важныя падзеі ў грамадскім і сямейным жыцці народа, абазначаюць самыя значныя змены і падзеі ў жыцці чалавека – нараджэнне, хрышчэнне, сватаўство, заручыны, вяселле, пахаванне.

У сямейна-абрадавай лексіцы найбольш колькаснай з'яўляецца лексіка вясельнага абраду як аднаго з найбольш важных комплексаў сямейнай абраднасці, які мае даўнія развітыя традыцыі бытавой культуры, уяўляе значную цікавасць і з'яўляецца актуальным. Даследчыкі этнаграфіі параўноўваюць усходнеславянскае вяселле нават не са спектаклем з вялікай колькасцю дзеючых асоб, а з "вясельнай містэрыяй", з шэрагам мімічных дзеянняў, аб'яднаных у адно цэлае. "У вясельнай містэрыі пануе хор, прынцып двух хароў, якім адпавядаюць два роды – род жаніха і род нявесты. Гэта спаборніцтва двух радоў складае старажытны, яшчэ паганскі экзагамны пласт вясельнага абраду", – сцвярджае вядомы этнограф Д. К. Зяленін [1, с. 134].

Значнасць вяселля ў жыцці асобы абумоўлена змяненнем пасля шлюбу жыццёвага ўкладу, а таксама індывідуальных і сацыяльных звычак. З гэтай прычыны спрадвеку ў фальклоры ўсіх народаў захаваліся паслядоўныя і грунтоўныя, са шматлікімі складнікамі, вясельныя цырымоніі, а ў слоўніку ўтрымліваецца вялікая колькасць адпаведных абрадавых лексем.

Вяселле ў жыцці чалавека адыгрывае значную ролю, поўнасцю перамяняючы жыццёвы ўклад і змяняючы індывідуальныя і сацыяльныя звычкі асобы. Духоўна, матэрыяльна і фізічна пасля вяселля людзі спрадвеку мянялі свой стан і жыццё. Юнацтва змянялася сталасцю, гарэзлівасць – адказнасцю, летуценнасць – мудрасцю. Відавочна, з гэтай прычыны вяселле ў кожнага народа суправаджалася разнастайнымі рытуаламі, дзеяннямі і працэсамі, як ніводная іншая падзея каляндарнага ці абрадавага цыклу. У фальклоры захаваліся паслядоўныя і грунтоўныя, са шматлікімі складнікамі, вясельныя цырымоніі, а ў слоўніку ўтрымліваецца вялікая колькасць адпаведных абрадавых лексем.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Не сталі выключэннем у гэтых адносінах і славяне. Ва ўсходніх славян вяселле заўжды было своеасаблівым. У беларускім, рускім і ўкраінскім вяселлі можна вызначыць агульныя і адметныя рысы, большасць з якіх мае старажытнае магічна-рытуальнае паходжанне, абумоўлена даўнімі язычніцкімі і пазнейшымі хрысціянскімі вераваннямі ўсходніх славян і так ці інакш фарміравалася і мянялася пад уплывам розных аб'ектыўных гістарычна-сацыяльных абставін.

На Беларусі вяселле – шматдзённы (а часам і шматтыднёвы) цырыманіял, які мае свае адмысловыя этапы і цікавыя звычаі і прыкметы. Вясельная лексіка беларускіх народных гаворак уяўляе сабой непаўторную моўную спадчыну, якая прыйшла са старажытнасці і перадае нам духоўныя памкненні і маральныя скарбы продкаў. Гэта частка беларускага народнага слоўніка з'яўляецца састаўной адзінкай усходнеславянскай лексікі і – больш шырока – велізарнай славянскай культуры.

1.1.2.1 *Вянок* і *вянец* у беларускім вяселлі

Цікавымі ў лінгвістычных адносінах з'яўляюцца лексемы *вянок* і *вянец*. Іх этымалогія, семантыка і функцыянальнае прызначэнне заслугоўваюць асобнага моўнага аналізу.

Вянок спрадвеку сімвалізаваў у народнай свядомасці дзявоцкую прыгажосць і некранутасць. Гэтым абумоўлена абавязковая прысутнасць гэтага прадмета на ўсходнеславянскім вяселлі: *Мы спявалі вясельныя песні перад свадзьбай у маладой, калі плялі* ***вянок*** [2, с. 230]; *Як маладую прыбіралі,* ***вяночкі дзелалі*** *і дзевачкі сабіраліся багата, спявалі ўсякі разны песні; косу запляталі.* ***Вяночкі дзелалі*** *самі з красівых такіх бумажак. Такі* ***вяночак – сплятуць*** *яго аб галаве, а ззадзі нада штоб многа-многа була лентаў* (в. Івакі, Добр.) [3]; *О, вяселле. Этот празнік, самый цікавы, хорошій. Молодая была самая красівая у этот дзень. На галаве быў* ***венок*** *з цветкоў, плаце ці сарочка, смотра, какое положеніе было, былі і бедные, і богатые. Когда не было нічего, адзевалі. Што ў кого было.. Гулялі, гарэлку пілі* (в. Маркавічы, Гом.).

Рабіць вянкі, як вынікае з прыведзеных прыкладаў, было таксама цэлым рытуалам, аб чым сведчаць шматлікія фіксацыі дадзенай лексемы ў дыялекталагічнай скарбніцы Гомельшчыны. Часта вянкі звязаны з пасадам і адпаведна ўзгадваюцца пры аповедзе пра пасад: *Пасад – прыходзілі дружкі да маладой,* ***рабілі вянкі****, прыбіралі маладую, цвяточкі хлопцам прышпільвалі. Пелі песні. Бацькі благаслаўляюць на пасад. Дружкі садзяць маладу на ўслон, падложаны кажухом,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вывернутым шэрщю наверх, падушачкамі не пакрывалі. Маладая павінна быць ня еўшы [4, с. 6].

Звычайна *вянок в'юць*: *Хлопцы сабіраліся атдзельна і гулялі з маладым. А дзеўкі з маладой атдзельна. Потым першы дружок шоў да маладой і пачыналі* ***вянок віць.*** *Зімой іспользавалі кветкі любісціка, летам жывыя кветкі* (в. Гадзічава, Ветк.). Можна пачуць ад інфарматараў, што *вянкі дзелалі і спляталі*: *Як маладую прыбіралі,* ***вяночкі дзелалі*** *і дзевачкі сабіраліся багата, спявалі ўсякі разны песні; косу запляталі.* ***Вяночкі дзелалі*** *самі з красівых такіх бумажак. Такі* ***вяночак – сплятуць*** *яго аб галаве, а ззадзі нада штоб многа-многа була лентаў"* (в. Івакі, Добр.). Прыклады фіксуюць, што ў гаворках Гомельскага рэгіёна часта ўжываецца дзеяслоў *дзелаць* 'рабіць'. Гэта выклікана міжмоўным узаемадзеяннем, уласцівым Гомельшчыне і абумоўленым яе геаграфічным становішчам.

Вянок выкарыстоўваўся падчас вяселля не толькі ў якасці сімвала маладой. Часам сімвалічнасць вянку пераносілася ў вясельным абрадзе на ўпрыгожанне іншых персанажаў і рэалій: *Абрадавага вясельнага дрэўца ў нас не было.* ***Вянкамі****, лентамі, кветкамі ўпрыгожвалі каня, дугу, воз – у цэркву ехалі. Маладую убіралі ў вянкі, ленты, пазней яшчэ у фату* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Вянок з'яўляецца сімвалам дзявоцкасці маладой, у сувязі з чым пасля вянчання нявеста павінна пазбаўляцца гэтага прадмета адзення, на што ўказваюць дадзеныя гаворак, якія фіксуюць для наймення гэтай падзеі словазлучэнне *здымаць (знімаць, снімаць) вянок.* Адзначым русізм, што паходзіць ад слова рускай мовы *снимать* і з'яўляецца яго беларускай агаласоўкай: *Калі нявесту прывезлі к жаніху, яе страчае свякруха. Яна* ***знімае*** *нявесцін* ***вянок*** *і свой платок ёй завязуе* [2, с. 227]; *Перш чым аддаць маладую жаніху, брат маладой (нежанаты) пазбаўляе яе дзявоцкай красы.* ***Здымае вянок*** *з галавы і расплятае касу* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Патом едуць к жаніху. Ужо ў жаніха свякрова* ***снімае*** *з нявесты* ***вянок*** *і фату і кладзець іх за іконай, а нявесці на галаву адзявае свой платок. Послі госці гуляюць, пьюць, песні пяюць, танцуюць* (г. Ветка).

Ілюстрацыйныя прыклады сведчаць аб тым, што з часам на змену вянку прыходзіць *фата*. Па паходжанні лексема з'яўляецца цюркізмам. У беларускія гаворкі слова трапіла праз рускую мову з цюркскіх моў, дзе мела значэнне 'лёгкае жаночае белае пакрывала ці накідка з кісеі ці карункаў'. Ва ўсходнеславянскіх мовах лексема ўжываецца з семантыкай 'галаўны ўбор нявесты'.

На такія змяненні беларускай народнай абраднасці, безумоўна, паўплывала інтэнсіўнае развіццё міжнароднага ўзаемадзеяння ў 20

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(і пазней – у 21) ст. і ўплывы на вясельную абраднасць, як і на іншыя з'явы і рэаліі нашага жыцця і існавання, культуры іншых народаў і краін. З гэтай прычыны часам сустракаецца фіксацыя ў адзенні нявесты і вянку, і фаты: *Патом едуць к жаніху. Ужо ў жаніха свякрова снімае з нявесты* ***вянок*** *і* ***фату*** *і кладзець іх за іконай, а нявесці на галаву адзявае свой платок. Послі госці гуляюць, пьюць, песні пяюць, танцуюць* (г. Ветка); *Нявеста называлася маладая. У яе* ***фата*** *доўгая і* ***вяночкі*** *былі. Першы* ***вянок*** *адзявалі на лоб. Потым рабіўся брыжык, затым вянок, потым зноў брыжык. Затым шлі ленты разнацветныя, атласныя ленты* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Вянок – прадмет вясельнай абраднасці, які сімвалізуе святыя для ўсходніх славян паняцці. Паважлівыя адносіны да дзявоцкасці і як вынік да сімвалізуючага яе наймення абумовілі ўжыванне лексемы ў выглядзе ўтварэння з суфіксам суб'ектыўнай ацэнкі: *Нявеста называлася маладая. У яе фата доўгая і* ***вяночкі*** *былі* (в. Гарошкаў, Рэч.). Памяншальна-ласкальны суфікс -*очк*- выразіў замілаванасць, перадаў ухваленне гэтага прадмета суб'ектам маўлення.

У лексіцы вясельнай абраднасці адзначаецца аднакарэннае з *вянок* утварэнне з суфіксам -*чык*-: *Ну нявеста ж тады не надзівалася, як цяпер. Цяпер відна, што нявеста, а тады ж не: плацце проста купіць, тутака як* ***венчык*** *на галаву зделаюць. Ну і ўсё – і нявеста. Ну вот і свадьбы праходзяць* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Суфікс -*чык*- фіксаваўся яшчэ ў старажытнай беларускай мове і меў значэнне 'найменне асобы'. Спачатку ў такіх выпадках утварэнні набывалі стылістычную афарбоўку памяншальнасці і некаторай іранічнасці. У старабеларускай мове лексемы такога тыпу звычайна ўтвараліся ад назваў асоб паводле імені, прафесіі, сацыяльнага стану, нацыянальнасці. З часам падобныя найменні страцілі стылістычную афарбоўку, а некаторыя з іх сталі пашыранымі на Беларусі прозвішчамі: *Гардзейчык, Кавальчык, Купрэйчык, Сілівончык*.

Часта найменне *венчык* ужываецца пры аповедзе аб вянчанні ў царкве: *У царкве стаяць на ручніку, над галавамі маладых дзержаць* ***венчыкі*** [5, с. 204]; *Вянчанне праводзілася пасля службы ў царкве. Расцілалі рушнік тканы, вышываны, па баках клалі капейкі, сведкам у рукі давалі* ***венчыкі****, і яны іх трымалі над галавамі маладых усю службу* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Для прадметаў царкоўнага ўжытку, што ўжываюцца ў беларускай вясельнай лексіцы, выкарыстоўваецца не толькі назва *венчык*. Часта сустракаецца і лексема са стараславянскімі і старажытнарускімі каранямі *вянец*: *Сястра маладога дзяржала дзве свечкі. Первая дружка і первы княжы дзяржалі над маладымі* ***вянец****. Поп запальвае*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свечкі. Калі яны гараць добра, то і жыццё ў маладых будзе шчаслівым, а калі свечкі "плачуць" – жыццё іх будзе дрэнным, яшчэ горш будзе, калі свечка патухне. Поп абводзіць маладых тры разы кругом стала [2, с. 34]; *Потым сабіраюцца ехаць к* ***вянцу*** *у царкву. Маладая бярэ ікону з дому, усе едуць у царкву. Ад маладой едзе сваха* [6, с. 240].

Найменне *вянец* паводле этымалогіі з'яўляецца роднасным найменню *вянок*. Словы паходзяць з аднаго праславянскага кораня **vĕn-*. Дзякуючы трэцяй палаталізацыі, у выніку пераходнага памякчэння, пасля галоснага пярэдняга рада *ь* праславянскі заднеязычны **k* змяніўся на [ц']. Вынікі гэтага змянення захаваліся ва ўсіх старажытнарускіх (і пазней і ўсходнеславянскіх) утварэннях з суфіксам *-ьц-ь* (прыгадаем старажытнарускія словы *коньць, купьць, молодьць*). У старажытнарускім слове *вѣнъкъ* на праславянскім гістарычным узроўні заднеязычны **k* знаходзіўся перад рэдукаваным галосным *ъ*, што стала прычынай захавання заднеязычнага і адсутнасці пераходу ў свісцячы. Падобная варыянтнасць даволі распаўсюджана ва ўсходнеславянскіх мовах: беларускае *вяроўка* – рускае ўстарэлае *веревица*, *палка* – рускае ўстарэлае *палица*.

У вясельнай лексіцы гаворак Гомельшчыны прысутнічае і форма множнага ліку назоўніка, памянёнага вышэй: *Вянчанне ў царкве праходзіла так: У царкве прысутнічала хросная. Яна слала рушнік пад ногі і капейкі клала,* ***вянцы*** *над галовамі трымалі шафер і шаферка. Нельга было пераходзіць дарогу з вядром пустым, не выкідваць смецце пад ногі* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Садзілі на пасад,* ***венца*** *вілі з цвятоў. Песні пелі. Касу расплятае сястра ці хто-небудзь свой* [7, с. 205].

Як сведчаць прыклады, лексемы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

форме як адзіночнага, так і множнага лікаў (

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

называлася (в. Хальч, Ветк.); *Выбіраюць* ***сватоў****. Жаніх бярэ хроснага, свідзецеля і свайго бацьку і едуць да нявесты* [2, с. 223]; *На выкупе таргавалі* ***сваты****, дружок жа быў у яго* (г. Ветка); *У нас толькі прыежжалі* ***сваты****, дагаварыліся на счот свадьбы* (в. Клімаўка, Гом.); ***Сватамі*** *могут быць родственнікі; бацька ж прыходзіць у сваты* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Указаныя лексемы сустракаюцца і ў рускіх вясельных песнях: *Как у* ***свата*** *на дворе, У Михаила Афанасьевича, В трое колокол ударили* [9, с. 221]; *Дурны* ***сваты****, дурны: Заехали в гумны* [10, с. 165]; *А завтра мою косоньку* ***сваха*** *расплетет* [10, с. 154].

І ў беларускай, і ў рускай вясельнай лексіцы традыцыйна формы суб'ектыўнай ацэнкі перадаюць павагу, пашану і значнасць адпаведных асоб: *Адчыняй дзверы,* ***сваток****, Адчыняй,* ***сваток****, вароты* (в. Івакі, Добр.); ***Сватушка-сват*** *хорошенький,* ***Сват*** *хорошенький –* ***сват*** *пригоженький!* [10, с. 164]; ***Сватушка****, падари-ка нам, сватушка, не рублем, полтиною,* ***Сватушка****, золотою гривною!* [10, с. 164]; ***Сватьюшка*** *хмелем осыпает* [10, с. 222]; *Исполать тебе,* ***свахонька*** [10, с. 164].

У параўнанні з найменнямі *сват, сваха, сваты* словы *свёкар, свякроў* менш пашыраныя: *На свадзьбе нада была, штоб каля маладых сядзелі свідзецелі, а радам радзіцелі маладой і маладога:* ***свякроў*** *і* ***свёкар****, цесць і цёшча* (г. Ветка); *Уж как мне назвать люта свекра, Уж как мне назвать люту свекровь* [10, с. 155].

З асобай свякрові звязана на вяселлі некалькі абрадавых дзеянняў. На Гомельшчыне існуюць варыянтныя назвы *свякроў, свякруха, свякрова*: ***Свякроў*** *устрачала і з хлебам і з соллю* (в. Хальч, Ветк.); *У канцэ вечара* ***свякруха*** *снімае з нявесты фату і мерае яе ўсім незамужнім, дзеўкам* (в. Церуха, Гом.); *Ну тады ўжо як за сталом, маладая далжна назваць* ***свякруху*** *мамаю* (в. Азершчына, Рэч.); *Пасля сватоў* ***свякруха*** *прыносіць нявесце сняданак некалько разоў да свадзьбы* [2, с. 278]; *Ужо ў жаніха* ***свякрова*** *снімае з нявесты вянок і фату і кладзець іх за іконай, а нявесці на галаву адзявае свой платок* (г. Ветка).

Часам лексемы, агульныя для беларускай і рускай вясельнай традыцыі, называюць маладое пакаленне:

дружок (дружка): ***Дружка*** *і* ***дружок*** *– сведкі жаніха і нявесты на вяселлі.* ***Дружка*** *стаіць і* ***дружок*** *стаіць. Вянок дзержыць* ***дружок*** *на вянчанні* (г. Ветка); ***Дружок*** *у нево, і ў нівесты – падруга. У мене сын старшы, што сейчас у Мінску жывёт, был на свадьбе. Он* ***дружок****, а ана –* ***дружка*** (в. Старое Сяло, Ветк.); *Як* ***дружка*** *ў нявесты, то так, это дружок у маладога* (в. Хальч. Ветк.); ***Дружок*** *нясе каравай, бласлаўляе.* ***Дружок*** *– ета прымерна свідзецель. Вядзе свадзьбу*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(г. Ветка);

княжы: *Уваходзяць маладыя ў хату, садзяцца за стол, у нявесты – дружкі, а ў жаніха –* ***княжыя****, дзве свяцілкі* [4, с. 2].

Рускі фальклорны матэрыял выяўляе адпаведныя лексемы: *Ели* ***дружки****, ели – Да целого воробья съели!* [10, с. 165]; *На* ***друженьке*** *шапочка коломенковая, На* ***друженьке*** *кушак шелковый* [10, с. 165]; ***Княжой*** *тысяцкой, не скупися, золотой казной расступися!* [9, с. 21]

Беларускія адметнасці (на ўсіх моўных узроўнях) паўплывалі на наяўнасць адметных назваў удзельнікаў абраду. Агульным найменнем з'яўляецца *вясельнікі*: *Сват уносіў каравай і абвяшчаў аб гэтай важнай падзеі, запрашаючы* ***вясельнікаў*** *на каравай* (г. Ветка).

Для наймення сябровак нявесты на Гомельшчыне ўжываюцца:

баярка: *Стой, зяцко, за вароцьмі, у чырвоным у боцці. З залатымі падкоўкамі, з маладымі* ***баяркамі*** [11, с. 35];

бяседа: *Маладую павезлі, а дзявочая* ***бяседа*** *(прыданыя) ідзе к хлопцу па другі дзень, я сама прыданкаю хадзіла* [11, с. 249];

паднявесніца: *А нявеста к сабе са сваім* ***паднявесніцамі***" [2, с. 8];

прыдана: *Назаўтра малады едзе па* ***прыданых****, забірае іх і вядзе к сабе* [4, с. 8];

прыданка: *Маладую павезлі, а дзявочая бяседа (прыданыя) ідзе к хлопцу па другі дзень, - я сама* ***прыданкаю*** *хадзіла* [11, с. 249].

З боку жаніху на вяселлі былі:

баярык: *А малады з* ***баярыкамі*** *(так звалі яго дружкоў) сядзеў на лаўке з краю* [2, с. 237];

паджанішнік: *Цяпер жаніх сеў з* ***паджанішнікамі*** *на каня і паехалі дамоў* [2, с. 227];

свяцілка: *Уваходзяць маладыя ў хату, садзяцца за стол, у нявесты – дружкі, а ў жаніха – княжыя, дзве* ***свяцілкі. Свяцілкі*** *стаўлялі свецкі на стале* [4, с. 29].

Уласныя найменні захаваліся на Гомельшчыне для ўдзельніц асобных вясельных абрадаў:

перазвяначка 'ўдзельніца пярэзваў': *А вы, сятрыцы-цяліцы, а вы,* ***перазвяначкі****, рукавічкі, тонкія, бяленькія, як папера, святленькія* [11, с . 234];

свашка 'ўдзельніца сватання': ***Свашка*** *– гэта калі ад жаніха ідзе суседка, ну такія людзі на ёлку цветы вешалі* (в. Хальч, Ветк.).

Супастаўленне найменняў асоб у вясельнай лексіцы гомельскіх гаворак і адпаведных рускамоўных лексем паказвае, што большасць лексем, што называюць удзельнікаў вяселля на Гомельшчыне, захоўваюцца са старажытнарускіх часоў і таму з'яўляюцца агульнымі для беларускай і рускай моў: *дружка, княжыя, сват, сваха, свёкар,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свякроў. Акрамя старажытнарускай слоўнікавай асновы і абрадавых традыцый, трывалае выкарыстанне гэтай лексікі падтрымліваецца беларуска-рускім білінгвізмам грамадства. Натуральна пры гэтым, што беларускія моўныя адметнасці паўплывалі на наяўнасць варыянтных назваў і спецыфічных адметных утварэнняў: *баярка, баярык, бяседа, вясельнік, паджанішнік, паднявесніца, перазвяначка, прыдана, прыданка, свяцілка.*

Узаемаўплыў суседніх блізкароднасных моў у народнай лексіцы асабліва яскрава выяўляецца пры даследаванні лексікі памежных гаворак. Гомельскаму рэгіёну ў гэтых адносінах пашанцавала размясціцца на памежжы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх тэрыторый. Такая лакалізацыя спрыяла цесным міжмоўным кантактам. Вынікі ўказанага кантактавання адзначаюцца ў вясельнай лексіцы гомельскіх гаворак.

У першую чаргу вясельная лексіка Гомельшчыны адлюстроўвае доўгатэрміновыя і трывалыя сувязі беларускай і рускай моў, абумоўленыя і падмацаваныя наяўным у штодзённым маўленні жыхароў рэгіёна беларуска-рускага білінгвізмам.

Двухмоўе выразна праяўляецца ўжо ў найменні вясельнага абраду. У беларускай літаратурнай мове для шлюбнай цырымоніі адзначаецца лексема *вяселле*, якая сустракаецца ў гомельскіх гаворак даволі часта: *На* ***вяселле*** *ёлку стаўлялі* (в. Хальч, Ветк.); *Потым намячалі дзень* ***вяселля*** (в. Гарошкаў, Рэч.); *Гаваркі сваяк ужо вёў вяселле* (в. Гарошкаў, Рэч.); ***Вяселле*** *звычайна намячалі на суботу* [8, с. 119]; ***Вяселле*** *первы день гулялі ў маладой, втары – у маладога. На трэці дзень кажды ў себе* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Этымалогія наймення выразна звязваецца з прыметнікам *вясёлы* і яскрава матывуецца адпаведным характарам як самога абраду, так і яго ўдзельнікаў і іх паводзін падчас абраду. Лексему *веселіе* (*веселье, весельство*) фіксуе У. Даль з асноўнай семантыкай ‘радасць, задавальненне, пацеха’ і разам з тым у значэнні ‘сватьба и празднество сватебное’ з паметамі *старое* і *паўднёвае* [12, т. 1, с. 186]. Слова *свадьба* расійскі лінгвіст узводзіць да дзеясловаў *свадить, сводить* і *сватать*: *Свадьба* ‘обрученье, совершенье брака, женітьба і замужество, повѣнчанье, со всѣми брачными обрядами и пирушками’ [12, т. 4, с. 145].

Непасрэдны ўплыў рускіх гаворак на вясельную лексіку Гомельскай вобласці выявіўся ў пашыранасці наймення *свадзьба* ў рэгіёне: ***Свадзьба*** *часта была на Каляды зімой* [2, с. 223]; *Пасля таго, як нівеста пакаталася, дружок прыходзе ўжо выкупляе нас: дае нам*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ужо грошы, напіткі ўсякія, і мы ўжо з-за стала выходзім, ёлку тую бурым, госці садзяцца за стол і гуляюць ***свадьбу****. О такія былі інцірэсныя* ***свадьбы*** (в. Барталамееўка, Ветк.); *Вот як толькі начынаецца* ***свадзьба*** *сразу выкупаюць. Жаніх выкупае нявесту. Ні жаніх, а яго там друзья ўжо выкупаюць* (в. Хальч, Ветк.); *У нас* ***свадзьба*** *называецца. Нявесту выкупалі, давалі грошы. Потым ужо гулялі дома* (в. Маркавічы, Гом.).

Пры выкарыстанні лексемы ў жывым маўленні жыхароў Гомельскай вобласці свой уплыў аказваюць адметнасці мясцовага кансанантызму, што дае падставы існаванню фанетычных варыянтаў наймення: ***Свадьба*** *прабуді два дні* (в. Старое Сяло, Ветк.); ***Свацьба*** *была как не на пост. Дзяцей засыпаюць канфетамі* (в. Хальч, Ветк.).

Вышэйпрыведзеныя прыклады сведчаць аб раўнапраўным выкарыстанні ў гомельскіх гаворках абедзвюх лексем для наймення шлюбнага абраду. Гамяльчане ў штодзённым маўленні карыстаюцца як словам *вяселле* ў розных фанетычных варыянтах, так і словам *свадзьба* з фанетычнымі варыянтамі. Можна назіраць паралельнае ўжыванне лексем *вяселле* і *свадзьба* ў межах аднаго сказа: *А на вечар ужо дагулююць* ***свадзьбу****. І цыганкі прыходзяць, і чаго толькі няма. Вот так у нас* ***свадзьбу*** *гулялі. У нас сільно красіво* ***свадзьбу*** *гулялі. Аж два ці тры дні гулялі, гулялі, колькі гарэлкі хватала. Тады ж па стопачцы вып'юць, а болей не п'юць. Бутэлі гарэлкі на вечар хапала, каб весялосць падняць. Потым песні за столом разныя спявалі. Весела было. Вот так у нас* ***свадзьбу*** *гулялі, вот такое* ***вяселле*** *было* (в. Клімаўка, Гом.).

Падобныя варыянты найменняў у вясельнай лексіцы не з'яўляюцца адзінкавымі. І "па-беларуску", і "па-руску" гучаць на вяселлі найменні асобных прадметаў і прылад цырымоніі.

Ніводнае сапраўднае вяселле ва ўсходніх славян не абыходзілася і не абыходзіцца без *ручніка*: *Калі вакруг стала ходзяць, маладая* ***ручнік*** *дзёргае, каб дзеўкі замуж ішлі. А шаферы стараюцца памяшаць, падшучваюць, дзержуць* ***рушнік****. І так яны тры разы абыходзяць* (в. Азершчына, Рэч.); *Прышла мама, папа з жаніхом, хросныя пабылі. Абвязвалі усіх сватоў* ***ручнікамі****. Папам і мамам давалі падарункі: рубашкі, мацерыял. Сваты прыносілі хлебушак, бутылку… Нявесту і жаніха садзілі на* ***ручнікі****. З левай – нявеста, з правай – мужык, з яго стараны – дружок, са стараны нявесты – дружка* (в. Жмураўка, Рэч.); *Калі толькі маладую пачынаюць выводзіць з хаты, бацька знімае ікону і дае ёй у рукі, а яму (жаніху) – кулітку хлеба. Перавязвае* ***рушніком*** *рукі, тры разы вакол таго стала абвядзе і прывядзе да самых калёс. Вядзе к возу і там знімае* ***рушнікі*** (в. Заспа, Гом.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ручнік звычайна рыхтаваўся спецыяльна да вяселля. Пры гэтым маладая або яе дружкі (сяброўкі) вышывалі яго: *Да вяселля павінны былі пашыць новы* ***ручнік****. Вось гэтым* ***ручніком****, чырвонай лентай і кветкамі ўпрыгожваўся абразок* [2, с. 232]; *Дружкі даўжны* ***рушнік*** *вышыць, вянец дзержаць у цэркві* (в. Хальч, Ветк.); *Прыбіралі хату маладой тым, што яна зрабіла сваімі рукамі:* ***рушнікамі****, на іконе быў новы вышываны набожнік* [11, с. 193].

На вяселле ручнікі ўпрыгожвалі хаты маладых: *Цёткі маладого й дапамагаюць вешаць у хаце маладога* ***ручнікі*** *на ўсе іконы і рамкі, на стол засцілалі абрус* [4, с. 106].

Ручнік станавіўся абавязковым атрыбутам сватання і заручын: *Звычайна прыходзяць вечарам. Хазяева частуюць гасцей хлебам-соллю. Сватоў перавязваюць* ***ручніком*** [2, с. 265]; *Сваты гавораць: у нас іе бычок, а ў вас – целічка. Дагаварваюцца пра свадьбу. Радзіцелі невесты после трэцяй чаркі завязваюць* ***рушнікі*** *сватам і даюць падаркі* (г. Ветка); *Сватоў перавязваць* ***рушнікамы****, но не бацьку з маткай, а чужых бяруць там дзядзькоў ілі братоў, хто каго, сядзяць там, выпіваюць, дагаварівaюцца* (в. Хальч, Ветк.); *За тыдзень да вяселля прыходзілі к маладой блізкія сваякі. Бацькі абменьваліся хлебам, соллю. Хросная маці нявесты перавязвала сватоў і жаніха* ***ручнікамі****. А дзяўчына дарыла ўсім сваякам маладога падарункі. Дамаўляліся, калі будзе свадзьба* [4, с. 259].

Часта ручнік выступаў у ролі падарунка: *Нявеста дарыла мацерыал,* ***ручнікі*** (в. Гарошкаў, Рэч.).

Ручнік быў неабходны ў час падзелу каравая: *Калі дзялілі каравай, дзяліў хросны. Бралі сіта, пакрывалі палаценцам. Хроснага павязвалі* ***рушніком****, у яго быў памагаты* (в. Гарошкаў, Рэч.); *Каравай ложаць на абрус, на які сыпляць зерне аўса або пшаніцы, а сам каравай абвязваюць* ***ручніком****. Каравай трэба было выкупляць* [4, с. 30]; *Пачынаюць дзеліць каравай.. Хросны ацец мые рукі, выцірае* ***рушніком****, якім быў абвязаны каравай* [4, с. 25].

Без ручніка немагчыма ўявіць сабе вянчання: *Свадьба – калі ў царкве вянчаліся, дак на* ***рушнік*** *станавіліся. Для шчасця так было. Павянчаюцца. Дружок з дружкай дяржаць вянкі ззаді, а тады ўжо ходяць па рушніку туды-сюды.* ***Рушнікі*** *льняныя былі, іх нявесціна матка давала і засцілала іх сама. А маладыя шлі, узяўшыся за рукі, па ім удоўж іканастаса. А хто первы ўстане на* ***рушнік****, дак той глаўны ў сям'і буде* (г. Ветка); *У час царкоўнага абраду першы шафер і шаферка расцілаюць перад аналаем кавалак палатна або* ***ручнік****. Жаніх становіцца з правага боку, а нявеста – з левага* (в. Хальч, Ветк.); *У царкве стаяць на* ***ручніку****, над галавамі маладых дзержаць*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

венчыкі [5, с. 204]; *Кагда вянчаюцца перад бацюшкай, яны становяцца на* ***рушнік*** *умесце. Шчытаецца, што на* ***рушнік*** *умесце стаць, век разам ісці* (в. Церуха, Гом.); *Вянчанне праводзілася пасля службы ў царкве. Расцілалі* ***рушнік*** *тканы, вышываны, па баках клалі капейкі, сведкам у рукі давалі венчыкі, і яны іх трымалі над галавамі маладых усю службу...Бацюшка* ***рушніком*** *связвае рукі маладых і вядзе іх вакол ямвона тры разы. А сведкі ў гэты час нагамі цягнуць* ***рушнік*** *за імі (гэта каб дзеўкі выходзілі замуж), а служка царквы адбірае гэты* ***рушнік*** *тры разы і расцілае пад ногі маладых* ***рушнік*** *на месца. А бацюшка затым вядзе маладых да алтара* (в. Гарошкоў, Рэч.).

У гомельскіх гаворках ужываюцца варыянты з дысіміляцыяй (*рушнік*) і без яе (*ручнік*). Лексема захавалася са старажытнарускіх часоў і мае відавочную этымалагічную сувязь са словам *рука*. Слова ўжываецца і ва ўкраінскай мове.

У рускай мове часцей фіксуецца найменне *полотенце*, звязанае паходжаннем са словам *полотно*. У гомельскіх гаворках назіраецца ўжыванне лексемы з фанетычнай адаптацыяй да асаблівасцей беларускага вымаўлення: *Кагда венчают, гаварят: "Станавісь быстрей сама, первай ногу ставь". **Палаценцэ** падстелена. Вот, будзеш сама хадзяйкай у нево, а еслі он первы станет, то ты будзеш падчыняцца всю жызнь* (г. Ветка); *Старшая дружка абвешвала вышываныя* ***палаценцы*** (г. Рэчыца); *Сабіраюцца і ідуць у сваты: бацька, матка, дзед, баба.. Хлеб-соль на* ***палатенцы*** *нясуць* (г. п. Церахоўка, Гом.); *І вон, пасядуць етыя дружкі вакол, а буў ад маладога такі дружка,* ***палаценцам*** *перавязаны, браў кнут* [8, с. 119]; *Прыходзяць сваты, перавязваюць іх* ***палаценцамі*** (в. Хальч, Ветк.); *Як дружка ў нявесты, то так, это дружок у маладога. У сваты з ім ходя. На свадьбе он перавязаны ўжэ* ***палаценцем****, калі каравай нісуць* (в. Хальч, Ветк.). Лексема *палаценца* ў вясельнай лексіцы Гомельшчыны выяўляецца з тымі самымі семантыкай і кантэкстам, што і *ручнік*. Часам абедзве лексемы раўнапраўна ўжываюцца пры аповедзе аб вясельным абрадзе: *Калі дзялілі каравай, дзяліў хросны. Бралі сіта, пакрывалі* ***палаценцам****. Хроснага павязвалі* ***рушніком****, у яго быў памагаты. Абход пачынаў з кута, з бацькоў* (в. Гарошкаў, Рэч.).

Такое функцыянаванне найменняў здаўна характэрна для ўсходнеславянскіх гаворак, аб чым сведчыў У. Даль, прыводзячы слова *ручникъ* разам з іншымі (*рукотерникъ, утиральникъ, утирникъ, полка*) як мясцовыя варыянты лексемы *полотенце* або *полотенецъ* [12, т. 3, с. 264].

Прыведзены фактычны матэрыял указвае на цеснае перапляценне беларускіх і рускіх моўных традыцый у вясельнай лексіцы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомельскага рэгіёна. Беларуска-рускае ўзаемадзеянне ў гаворак вобласці мае даўнюю гісторыю. У аснове моўных кантактаў – геаграфічнае становішча і шматвяковае існаванне з прадстаўнікамі рускіх гаворак у межах адной дзяржавы. У наш час беларуска-рускае моўнае ўзаемадзеянне ў гаворках падтрымліваецца непасрэднымі кантактамі, а таксама трывалым двухмоўем, уласцівым не толькі жыхарам Гомельшчыны, але і ўсёй Беларусі.

1.1.2.3 Усходнеславянскія моўныя паралелі беларускай вясельнай лексікі

Агульныя ўсходнеславянскія карані беларускай, рускай і ўкраінскай лексікі выяўляюць моўныя паралелі найменняў абраду.

Пашыраная ў беларускай моўнай традыцыі лексема агульна-славянскага паходжання *вяселле* ва ўкраінскіх фальклорных тэкстах набыла адметную агаласоўку і ўжываюцца ў фанетычных варыянтах *весілля, весільє*: *Нікого не шліте й сами не йдіте просити на* ***весілле*** [13, с. 226]; *Пречистая маці, Приступи к нашуй хаці* ***весільє*** *зачинаці* [13, с. 233–234]; *У кого не стрепенеться серце від привабливого запашного слова «****весілля****»?* [14].

У беларускіх гаворках, як ужо адзначалася, даволі частым з'яўляюцца і найменне *свадьба* (з варыянтамі). У адносінах да вясельнай абраднасці найменне са старажытнасці з'яўляецца мнагазначным. Беларускія і рускія гаворкі часцей выкарыстоўваюць значэнне 'вяселле' ў той час, як ва ўкраінскіх вясельных песнях слова ўжываецца, акрамя таго, у значэнні 'ўсе удзельнікі вясельнай цырымоніі': *Коли* ***свадьба*** *стоїть перед хатою, а молодий виїжджає на дорогу* [15]; *Коли* ***свадьба*** *заїде з церкви до хати молодої и позасідають за столи, а не несуть довго снідання, тоді співають* [15].

У беларускай літаратурнай мове для вяселля замацавалася таксама лексема *шлюб*. Запазычанне ўжываецца і ў гаворках, хаця неабходна заўважыць, што ў гаворках усходняй часткі Беларусі, напрыклад, на Гомельшчыне слова *шлюб* не вельмі папулярнае: *"Ой, мамачка мая, цяпер я не твая – ой, таго пана – падмана, з я кім я* ***шлюбу*** *брала....* [11, с. 340]. Захоўваецца назва і ўкраінскім фальклорам: *А чи того ж пана, З ким на* ***шлюбі*** *стояла?* [13, с. 215]; *Там Женєчка да росу брала, А росою умуваласа, До* ***шлюбу*** *побіраласа* [13, с. 217].

Запазычаная са старанямецкіх гаворак лексема трапіла да ўсходніх славян праз польскае пасрэдніцтва і трывала ўвайшла ў слоўнік беларускай і ўкраінскай моў, на што ўказвае наяўнасць беларускіх і

ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўкраінскіх утварэнняў ад назоўніка *шлюб*: *цэркаўка дрыжала, як я* ***шлюбавала*** [11, с. 340]; *новий* ***шлюбний*** *сезон* [15], *форма* ***передшлюбних*** *оглядин* [15], *професийних* ***шлюбних*** *маклерів та агентів* [15].

Усходнеславянскія моўныя паралелі наяўныя таксама сярод найменняў удзельнікаў вясельнай цырымоніі. Зафіксаваныя лексемы з'яўляюцца агульнымі або падобнымі ў беларускай, рускай і ўкраінскай мовах.

У вясельнай лексіцы беларускіх гаворках назвы *сват* і *сваха* адзначаюцца ў розных граматычных формах. Ужо ўпаміналіся *сваты* ў рускіх вясельных песнях. У вясельнай лексіцы традыцыйнымі з'яўляюцца формы суб'ектыўнай ацэнкі для перадачы павагі, пашаны і значнасці адпаведных асоб.

Ва ўсходнеславянскім вяселлі ў сваты звычайна запрашалі значных, паважаных асоб. У Беларусі: *Жаніх бярэ хроснага, свідзецеля і свайго бацьку і едуць да нявесты* (в. Залаты Рог, Ветк.). Ва Украіне: *сватати дівчину молодий ішов зі сватами*: *батьком і близькими родичами – шанованими одруженими чоловіками* [16].

Сярод сватоў звычайна абіраўся больш важны, які называўся, паводле беларускіх дыялектных звестак, *старшы сват*, а ва Украіне – *старшы стараста*: *Сваты прыходзяць вечарам, калі цёмна.. Адзін* ***старшы****, а яшчэ нескалькі мужыкоў з ім* (в. Новы мір, Ветк.); *На любом перакростке перагаражываюць дарогу вяроўкай, і* ***старшы сват*** *абязан дать бутыльку і закусь, і патом паехалі дальше* (в. Клімаўка, Гом.) – *За* ***старшого старосту****, як правило, вибирали гострого на язик і дотепного чоловіка* [16]. Гэты мужчына, па звестках украінскіх фалькларыстаў, умеў артыстычна вымаўляць традыцыйную на сватанні прамову.

Сярод сватоў адзначаюцца такія пасады, як *падстараста*: *З ім* ***старшым (старшы сват)*** *з'яўляецца звычайна хросны бацька маладога. Завуць яго таксама, асабліва ў песнях,* ***старастам****, а другога –* ***падстарастам*** [6, с. 215] і *пасол*: *Паколькі быў жа малады Міхайла да конікаў напаваў. Ён да сваёй Хадосачкі да трох* ***паслоў*** *паслаў* [6, с. 226].

На вяселлі ганаровымі гасцямі, безумоўна, станавіліся *сваты, бацькі, хросныя*. Аднак весялосць, гульні і жартаўлівасць народнай традыцыі стваралася перш за ўсё моладдзю. Відаць, таму захаваліся настолькі разнастайныя найменні сяброўак жаніха і нявесты, якія прымалі ўдзел у вяселлі. Самыя частотныя сярод іх – *дружок*, *дружка*, *падруга*.

Рускі фальклорны матэрыял выяўляе лексічныя адпаведнікі *дружок, дружки, друженька*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тэндэнцыі і павевы сучаснага грамадства не маглі не адбіцца на “класічнай” вясельнай традыцыі. У дыялектным фактычным матэрыяле беларускіх гаворак можна сустрэць парнае найменне з афіцыйнага цырыманіялу *свідзецель – свідзецельніца*: *На свадзьбе* ***свідзецелей*** *выбіралі маладыя. Но вот* ***свідзецельніца*** *далжна была быць незамужняй дзевушкай. А* ***свідзецель*** *мог быць жанаты* (г. Ветка). І бясспрэчна, нельга не адзначыць, што ў беларускім вяселлі ў адносінах да сяброў маладых часам ужывалася і пара запазычаных найменняў *шафер – шаферка*, якія ў выніку нехарактэрнасці для ўсходнеславянскіх гаворак зычнага [ф] набылі своеасаблівае гучанне ў фанетычных варыянтах *шахвер – шахверка*: *Сваты сватаюцца, прыносілі хлеб, соль, закуску, выпіць. Былі дружка, друг,* ***шафер, шаферка*** (в. Насовічы, Добр.); *Дзеўкі вілі ёлку, якую* ***шахвяры*** *жаніха прынеслі* [2, с. 296]; *Маладая і* ***шаферка*** *прыносяць вэлюм, ніткі, іголку* (в. Хальч, Ветк.)

Пад уплывам украінскай мовы у беларускіх гаворках, памежных з украінскімі, захаваўся варыянт наймення *шахвірка*: *Маладую прыбіралі* ***шахвіркі****. Адзявалі хвату, а вянок з лентамі і марлечку цаплялі ззаду* [8, с. 130].

Паколькі ўказаныя запазычанні, пэўна, не былі зразумелыя ўсім гасцям, паступова да іх далучылася тлумачэнне беларускай лексемай, якое замацавалася ў вясельнай традыцыі як складаная назва: *Прыходзілі ў сваты бацька і маці, жаніх,* ***хлопцы-шаферы****. Маладая звала дзевак-шаферак* [17, с. 250].

Сярод шафераў і шаферак на беларускім вяселлі часта абіраліся *галоўны* і *галоўная*, або *старшы* і *старшая*: *Зранку маладя з* ***першай шаферкай*** *выпраўляецца запрашаць сваякоў і суседзяў на вяселле* (г. Ветка); *Да дзяўчыны прыходзілі яе* ***падружкі-шаферкі****. Тая ўжо назначала сярод іх* ***галоўную****, хто пойдзе з ёй пад вянец* [17, с. 228].

Шматвяковая гісторыя ўсходнеславянскіх народаў адбілася ў найменні сяброўак маладых *баярык – баярка*: *А малады з* ***баярыкамі*** *(так звалі яго дружкоў) сядзеў на лаўке з краю* [4, с. 237].

Ва ўкраінскім вяселлі таксама дзейнічаюць адметныя “персанажы”. Найменні адных падобныя на сваіх беларускіх “калег”. Тут неабходна ўспомніць пра такія лексемы, як *баяры, дружка, каравайніца, сват, сваха, свяцілка, староста*: *це була подія масштабна, надзвичайно відповідальна, в якій брало участь чимало людей (за висловом Ф. Колесси, розігрувало драму власного життя) у ролі старост, сватів, коровайниць, свах, світилок, дружок, боярів, музик, кухарок, запрошених родичів, сусідів і просто "запорожців"* [14].

Як і ў беларускім вяселлі, ва ўкраінскім прымаюць удзел *друзі* і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падругі (*подружки*) нявесты, *старшы баярын* і *старшы дружка: Розступайцеся, подружки, Да й упаду бацюхну на ножки* [13, с. 217]; *У неділю ввечері молода при роздачі подругам стрічок зсуне віночки з косами, – то скоро повіддаються* [15]; *Все частіше замість* ***старшого боярина*** *весіллям керує найманий за гроші* [16]; З*апрошувати на весілля гостей ходили окремо наречений зі* ***старшим боярином*** *і наречена з* ***старшою дружкою*** [16]**.**

Нязменным атрыбутам вяселля Украіны і Беларусі быў і ёсць *каравай*. З караваем, яго выпяканнем, падзелам падчас вяселля звязаны многія традыцыі і замацаваныя правілы: ***Каравай*** *на вяселле пячэ матка. Нявесцін – нявеста дзеліць каравай, а жаніхоў – жаніх. Каравай на процвіне пякуць. Была пудра. Мажуць яго пудрай. Ну, і во, хвігуркамі выкладаюць, ну вот, розачка, а тады во так вот васьмёркі выпісвалі* [4, с. 102]; ***Каравай пяклі*** *ў хаце нявесты. Ну, у мяне пякла сама мамка. Каравай рэзалі бацька ці маці і давалі ўсім па кусочку. А маладыя караваю не елі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Быў і* ***каравай. Пекла*** *яго маці. Пекла і пра сябе жэлала маладым добрай долі, шчасця, любві, каб каравай вялікі, харошы палучыўся* (в. Залаты Рог, Ветк.).

Падчас украінскага вяселля частаванне караваем успрымалася як грамадскае ўхваленне шлюбу: *Да путаў* ***коровай перепечи*** [13, с. 217]; *Ой чия то жона* ***коровай*** *мєсіла* [13, с. 219]; *Да гіче ж* ***коровай****, гіче* [13, с. 228].

Як і беларускі каравай, каравай ва ўкраінскім вяселлі патрабаваў папярэдняй падрыхтоўкі: ***коровай*** *– обрядовий хліб, який випікали легкі на руку жінки, які щасливо живуть у першому шлюбі. В залежності від краю, коровай "бгали" і у молодого, і у молодої або тільки у молодого (Лемківщина) чи тільки у молодої (Слобожанщина)* [17].

Супастаўленне асобных найменняў беларускай вясельнай лексікі з адпаведнымі рускімі і ўкраінскімі лексемамі паказвае, што вясельная лексіка ўсходніх славян захоўваецца з агульнаўсходнеславянскіх часоў і таму ў большасці з’яўляецца агульнай для беларускай, рускай і ўкраінскай моў. Гэта абумоўлена агульнай старажытнарускай слоўнікавай асновай і ў наш час падтрымліваецца беларуска-рускім білінгвізмам грамадства, хаця і не абазначае адсутнасці спецыфічных адметных беларускіх утварэнняў (*паджанішнік, паднявесніца, перазвяначка, прыдана, прыданка, свяцілка*).

1.1.2.4 Вяселле ў прыказках і прыказках усходніх славян

У трыадзіным цыкле сямейнай абраднасці паводле працягласці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вылучаецца вяселле, на святкаванне якога народная традыцыя адводзіла тры дні, часам вяселле зацягвалася на тыдзень і больш. Калі ўлічыць доўгатэрміновую падрыхтоўку – сватанне, заручыны, запоіны, змовіны – увесь абрад мог займаць да некалькіх месяцаў. Шматтыднёвы, а ў некаторых выпадках – і шматмесячны, беларускі вясельны абрад, як і вясельныя традыцыі рускага і ўкраінскага народаў, выяўляючы імкненне людзей да велізарных відовішчаў і захоўваючы рэшткі старажытнейшых славянскіх магічных вераванняў, з'яўляецца разам з тым агромністай скарбонкай адзінак вуснай народнай творчасці. Абавязковыя на ўсіх вясельных мерапрыемствах песні, эмацыянальныя і надта пранікнёныя, шчымлівыя і лірычныя, маюць разнастайную сэнсавую напоўненасць і разгалінаваную вобразна-сімвальную структуру. Усё вяселле суправаджаюць цікавыя і ў рознай ступені верагодныя прыкметы і прадказанні. А на заключных этапах вясельнай традыцыі не абыходзіцца без гульняў і жартаў, якія займаюць сваё заканамернае месца ў фальклоры ўсходніх славян.

У вялікай колькасці выяўляюцца ў традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў, рускіх і ўкраінцаў прыказкі і прымаўкі. Парэмічныя адзінкі складаюць цікавую і адмысловую групу моўных адзінак, якая патрабуе лінгвістычнага даследавання.

У адзначанай скарбонцы народнай мудрасці выдзяляюцца некалькі лексіка-семантычных груп. Перш за ўсё многія прыказкі і прымаўкі ўтрымліваюць парады наконт вяселля ўвогуле. Народная свядомасць за шмат стагоддзяў адабрала праверaныя самім жыццём рэцэпты будучага шчаслівага лёсу нованароджанай сям'і і захавала іх для нашчадкаў у шматлікіх парэміях.

Паводле народнай мудрасці, адзначаць вяселле трэба працяглы час. Прыгадаем беларускую прыказку: *Вяселлю казала і качарга гуляць ад нядзелі да чацвярга* [18, с. 115]. У іншым выслоўі нават называюцца найлепш прыдатныя і прымеркаваныя для вяселля дні: *На тое і нядзелі, каб спраўлялі вяселлі* [18, с. 125].

Грамадская думка старажытнасці праз прыказкі раіць не спяшацца з жаніцьбай, бо гэта справа адказная, і абіраць пару неабходна на ўсё далейшае жыццё. У беларусаў захоўваюцца прыказкі: *Ажаніцца – не напасць, каб жаніўшыся не прапасць*; *Ажаніцца – не ўпасці: не ўстанеш, не атрасешся*; *Ажэнішся скора – набярэшся гора* [18, с. 113].

Пра адказнасць жаніцьбы кажуць украінскія: *Оженитись – не напасть, та щоб оженившись — не пропасть*; *Хто рано одружиться, той вік не натужиться* [19]; і рускія прыказкі: *Женишься раз, а плачешься век*; *Жениться недолго, да Бог накажет: долго жить прикажет*; *Женитьба есть, а разженитьбы нет*; *На*

резом коне жениться не езди!; Жениться – не лапоть надеть;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

с. 134]. Блізкі адпаведнік апошняга беларускага выслоўя мае ўкраінская мова: *Тоді дівка пишна, як заміж вийшла* [19]. Бацькі дачок павінны паклапаціцца і падумаць загадзя пра будучае свайго дзіця: *Дачку аддаваць – плакаць і гадаць* [18, с. 117]; *Дочачку аддаць – ночачкі не спаць* [18, с. 119]; *Маеш дачку – май і гарэлачку ў глячку* [18, с. 124].

У прыказках гучыць заклік для дзяўчат не зацягваць з вяселлем: *Жні пшанічку прызеляненькую, аддавай дачку маладзенькую* [18, с. 119]. Хаця некаторыя прыказкі нагадваюць, што шчасце ў замужжы не гарантавана: *Заміж іти – не дощову годину перестоять* [22]; *Сиди до сивої коси, а за ледащо заміж не йди!* [19]; *Выйти замуж – не напасть, каб за мужем не пропасть* [21].

Застацца незамужняй – *застацца ў дзеўках* – усходнеславянская народная традыцыя лічыць ненатуральным і ганебным. Нездарма ў беларусаў захоўваюцца выразы: *Не ўсё ж у дзеўках хадзіць* [18, с. 128]; *Хоць за старца, абы ў дзеўках не астацца*; *Хоць за вала, абы дома не была*; *Хоць за быка, калі няма маладзіка*; *Хоць за казла, абы запаўзла*; *Хоць бы на пенюшка, калі няма добрага жанішка* [18, с. 137]. Блізкія да беларускіх парэміі фіксуюцца ва ўкраінскім фальклоры: *Хоч за вола, аби дома не була; Хоч за старця, аби не остаться* [19]. Украінская фальклорная спадчына мае і больш адметныя варыянты: *Одказлива дівка до сивих волос додівує* [22]; *Стара пані і старе вино все добре, але не стара дівка* [19]. Пра неабходнасць замужжа рускія прыказкі: *В девках сижено – горе мыкано, замуж выдано – вдвое прибыло* [20].

Народныя выслоўі разважаюць, які жаніх лепшы – малады ці стары: беларускія: *Жыць за старым – быць у павазе, а за маладым – у знявазе* [18, с. 119]; украінскія: *За старого піду – соломкою накрию, а молодого – сама нагрію* [22]; *За молодим жити весело, а за старим – затишно* [19].

Каханню, любові і ладу ў сямейным жыцці прыказкі адводзяць пэўнае месца: беларускія: *Лепей чэмер піць, як з нялюбым жыць*; *Лепш згніць, як з ліхою бабаю жыць* [18, с. 123]; *З добрым мужам нажывешся, а з ліхім гора набярэшся* [18, с. 121]; украінскія: *Краще в ставку потопати, як з нелюбом шлюб узяти!*; *Краще полин їсти, ніж з нелюбом за стіл сісти!* [22].

У прыказках захаваліся заўвагі і меркаванні, адрасаваныя асобам, якія ажаніліся некалькі разоў. Часцей ухваляецца першая жонка, а наступныя –крытыкуюцца: *Першая жоначка – як на небе зорачка, а другая жоначка – як у садзе пчолачка, а трэцяя жанішча – як у лесе савішча*; *Першая жонка – аб Бога, другая – ад людзей, а трэцяя – ад чорта прынесена*; *Першая жонка дзяцей гадавала, а другая, шэльма,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разагнала [18, с. 130]; *Калі мілая другая жонка, не мілыя першыя дзеці* [18, с. 123].

Асобы падыход старажытная народная свядомасць праз мову прыказак дэманструе да прыгажосці і жаніхоў, і нявест. Украінскія прыказкі нагадваюць: *На красиву жінку гарно дивиться, а з розумною гарно жить; На красивого чоловіка дивитись гарно, а з умним жити легко* [19]; *Не шукай красоти, а шукай доброти* [22]. Мудрасць праяўляецца ў рускім варыянце: *Не ищи красоты, ищи доброты (досужества)* [20]; і ў беларускім адпаведніку: *Жонку выбірай і вачыма, і вушыма* [18, с. 119]. Рускі варыянт апошняй прыказкі большую ўвагу раіць адвесці не прыгажосці дзяўчыны (якую бачыш), а яе якасцям, аб якіх і трэба слухаць: *Жену выбирай не глазами, а ушами* [20].

Пры выбары сваёй пары прыказкі ўсходніх славян выяўляюць асцярожныя адносіны да ўдоў і ўдаўцоў. Такія матывы гучаць у беларускіх прыказках: *Вантробы – не мяса, а ўдава – не дзеўка* [18, с. 115]; *Зялёная рута, ялавец, лепей кавалер, чым удавец* [18, с. 121]; ва ўкраінскіх: *Буду сива, як вівця, а не піду за вдівця*; *Парубок жениться – любу бере, вдовець жениться – хто за нього йде* [20].

У рускай вусна-народнай творчасці можна адшукаць прыказкі, паводле якіх пры выбары нявесты не мэтазгодна звяртаць увагі на дачок удоў: *Не купи у попа лошади, не бери у вдовы дочери!*; *От попа кляча не ко двору, от вдовы дочь не по нутру* [20]. Тлумачэнне такой, на першы погляд, дзіўнай парады знаходзім у варыянтах папярэдніх выразаў: *Не покупай у ямщика лошади, а у вдовы не бери дочери: у ямщика лошадь изломана, у вдовы дочь избалована*; *У ямщика лошадь надсажена, у вдовы дочка наважена* [20].

Удзяляюць прыказкі ўвагу няроўным шлюбам: *Пажаніліся, як малады конь і стары вол спрэгліся* [18, с. 129]; *Муж стары, а жонка маладая – то агонь ды вада* [18, с. 25]; *У старого мужа молодая жена – чужая корысть*; *Видима беда, что у старого жена молода* [20]; *Коли молодий зі старою жениться, то так, якби молоді неуки-коні, до старого воза запряг*; *Де муж старий, а жінка молода, там рідка згода* [19]. Указаныя парэміі праяўляюць негатыўныя адносіны да старых мужоў з маладымі жонкамі. Адмоўнае стаўленне ў прыказках назіраецца ўвогуле да старых па ўзросце жаніхоў: *Ненадолго старый женится* [20] (украінскі варыянт: *Ненадовго старий жениться: як не вмре, то жінка покине* [22]); *На старость жениться – не себе корысть*; *Старый муж да упрямый муж поперек постели лежит* [20].

Адметныя парэмічныя адзінкі ўжываюцца падчас сватання ў

вясельных абрадах усходніх славян. Вядомы абрад, калі сваты прыходзяць у хату да абранай дзяўчыны і адбываецца рытуал своеасаблівага “гандлю-продажу”, не абыходзіцца без трапных выслоўяў. Нездарма беларускія прыказкі сведчаць: *Як сваха хваліць – цаны няма, як жаніх убачыць – цаны няма* [18, с. 141]; *Як не бачаць, дзеўка – золата, як убачаць – волава* [18, с. 140]; *Як хваляць дзеўку – шчасця гара, а як убачаць – не прыходзіцца да двара* [18, с. 141]. Паводле рускага фальклору: *Не выбирай невесту, выбирай сваху! Супротив свахи не схвастать; а и схвастать, так не схрястать. Сваха видела, как батрак теленка родил* [20]. Менавіта таму ўкраінская мова мяркуе: *Свасі перша чарка й перша палка*; *Кожній свашці по ковбасці* [19]. Пра адказнасць асоб, што абіраюцца на ролю свахі і свата, сведчыць беларуская прыказка: *Хлопца за свата не пасылаюць* [18, с. 137].

На “смачныя” народныя слоўцы заўсёды знаходзіліся майстры і майстрыхі ў беларускіх, рускіх і ўкраінскіх вёсках. У працэсе сватання пад іх востры язычок трапляюць усе ўдзельнікі мерапрыемства.

Перш за ўсё – увага жаніху: *Удаўся сыночак у бацьку – волас у волас, голас у голас* [18, с. 134]; *Адзін ды ладны* [18, с. 112]; *Конь под ним полтораста рублев, убор на коне в пятьсот рублев, молодец-то сидит, и цены ему нет* [23]. Ухваляюцца розум і гаспадарлівасць будучага мужа: *Хараство прыгледзіцца, а розум згодзіцца (спатрэбіцца)* [18, с. 136]; *За добрым мужыком і свіння гаспадыня* [18, с. 120].

Цікава, але заканамерна і натуральна, што фальклор захоўвае ў прымаўках на сватанне апраўдальныя характарыстыкі для розных жаніхоў. Апяваюцца і не надта прыгожыя: *Хоць кульгавы, хоць насаты, абы хітры і багаты* [18, с. 137]; *Хоць мужык з лапаць, абы з ім не плакаць* [18, с. 138]; *На красивого глядеть хорошо, а с умным жить легко* [21]; *Хоть собой не казист, да на миру речист* [21]; і не вельмі маёмасныя: *Хоць небагаты, але зухаваты* [18, с. 138]; *Хоць і небагаты, але не апрануты ў латы* [18, с. 137]. Гэта і зразумела, бо, як кажуць беларусы, *не з прыданым жыць, а з чалавекам* [18, с. 126]; і пацвярджаюць украінцы: *Не з багатством жить, а з людиною!* [22].

“Гандаль-перамовы” працягваюцца, і далейшая чарга – ухваленне нявесты. Рускі вясельны абрад на гэты конт прапануе традыцыйныя словы свата: *Торгую не лисицами, не куницами, не атласом, не бархатом, а торгую девичьей красотой* [23]. У беларусаў захоўваюцца прыказкі: *Адно дзіця роджана , другое суджана* [18, с. 112]; *Хлеб не нявеста – які ўдасца, такі і з’есца* [18, с. 137]. І тут галоўнае – гаспадарлівасць, дабрыня, разумнасць, працавітасць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзяўчыны, якая ацэньваецца прымаўкамі даражэйшай за багацце і прыгажосць: *Багацце нявесты на шчасце не пераробіш* [18, с. 113]; *Вазьмі сабе жонку хоць валынку, абы была ў хаце гаспадынька* [18, с. 115]; *Сцеражыся ў цыгана купляць каня, а ў пана браць дачку за жонку* [18, с. 113]; *На хорошую глядеть хорошо, а с умною (женой) жить хорошо* [20]; *Добрая жена дом сбережет, а плохая рукавом разнесет (растрясет)* [20].

Не забываюцца ў сватанні і на бацькоў маладых. Шматлікія выразы нагадваюць, што дзеці – гэта люстэрка бацькоў і ў многіх сваіх рысах дзеці, падобныя на бацькоў, паўтараюць іх лёс. Беларускі фальклор сведчыць: *З харошай кушачкі харошыя і птушачкі* [18, с. 121]. У рускай вуснай народнай творчасці лічыцца: *От яблоньки яблочко, а от ели шишка*; *От доброго дерева добрый и плод*; *Орел орла плодит, а сова сову родит* [20].

Адносіны да бацькоў маладых у парэміях, звязаных з вясельнай абраднасцю, не заўсёды адназначныя. Некаторыя прыказкі вітаюць будучых родзічаў: *Ад добрага таты добрыя парады* [18, с. 112]. Іншыя адносяцца да бацькоў больш стрымана: *Матка дачку хваліла, пакуль з рук зваліла* [18, с. 124]. У некаторых выслоўях гучыць напамін пра тое, што маладыя ў сваім сямейным жыцці павінны быць самастойнымі і арыентавацца больш на сябе: *Не тое багацце, што цесць з цешчаю далі, а што маладыя самі нажылі* [18, с. 127].

Ва ўсходнеславянскіх прымаўках і прыказках, прысвечаных вясельнаму абраду, згадваюцца не толькі маладыя і іх бацькі, але і іншыя родзічы. Аднак часцей гэтыя найменні асоб паводле роднасці і сваяцтва ў парэміях, звязаных з вяселлем, маюць адмоўную канатацыю, што адлюстроўвае адносіны, замацаваныя ў народнай традыцыі да адпаведных родзічаў. Народнае ўяўленне часта выказвае ў прыказках заслужаную і не вельмі крытыку свякрухам і цёшчам: *Як я была ў баценька, то я была чубаценька, дасталася да свякрухі, то аб'елі чубок мухі* [18, с. 141]; *Яшчэ цешча добра плешча* [18, с. 141]. Украінская парэміі сведчыць: *Як була я у батенька, то була чубатенька; а як пішла до свекрухи, то об'іли чуба мухи* [20]. Хаця сустракаюцца прыклады іншых адносін да маці свайго абранніка і абранніцы. Паводле беларускіх прыказак: *Не тая радзіна, што мяне радзіла, а тая радзіна, што жонку радзіла* [18, с. 127]; *Як добрая свякроў, то добрая і нявестка* [18, с. 140].

Не застаюцца без адказу і цешчы, якія, безумоўна, садзейнічалі ўзнікненню ў фальклоры прыказак: *Хто чым, а няўдалец цесцем хваліцца* [18, с. 138]; *Праваліся такі зяць, што толькі глядзіць як узяць* [18, с. 130]; *Пусці зяця, калі няма чорта ў хаце* [18, с. 130].

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

У многіх выразах упамінаюцца сёстры жаніха і нявесты. Да гэтых асоб выказваюцца адмоўныя адносіны ў беларускіх прыказках: *Залоўка злая, як свякроўка ліхая* [18, с. 120]; *Злая ятроўка – горш за воўка* [18, с. 121]. У рускім фальклоры фіксуецца прыказка, якая прызнае за лепшае мець вялікую колькасць братоў мужа ў параўнанні з адной яго сястрой: *Лучше восемь деверьёв, чем одна золовушка.* Яшчэ горшая, лічыць народная мудрасць, сітуацыя, калі сястра жаніха не мае ўласнай сям'і: *Незамужняя залоўка – другая свякроўка* [18, с. 126].

Трапныя народныя выслоўі, прымаўкі і прыказкі адлюстроўваюць шматвяковы духоўны вопыт народа, прыгажосць і вобразнасць яго мыслення, прыроджаны розум і гумар. Узгаданы фактычны матэрыял паказвае, што значная частка парэмій сваімі вытокамі мае ўсходнеславянскую традыцыйную вясельную абраднасць. Захаванне са старажытнасці ў народнай свядомасці, а таксама трывалае выкарыстанне выразаў у цяперашні час паўплывае на частае выкарыстанне памянёных парэмій у мове мастацкай літаратуры.

Прыгадваецца слаўная "Палеская хроніка" Івана Мележа. Амаль кожны з герояў твора ведае многія прыказкі і прымаўкі і слушна карыстаецца імі ў маўленні. Вялікая колькасць з адлюстраваных Іванам Мележам парэмічных выразаў узыходзіць да вясельнай абраднасці, хаця і ўжываецца ў абставінах, не заўсёды звязаных з вяселлем.

Бясспрэчна, самая "пладавітая" па прыказках і прымаўках у першым з раманаў "Палескай хронікі" цётка Сарока. Аўтар заўважае, што яна "забівала сваёй гаворкай астатніх чатырох [жанчын], якія нямелі ад патоку дасціпных прымавак і жартаў" [24, с. 143–144]. Лёгка і імгненна Сарока дае характарыстыку ўсім. Пра Ганну яна кажа: *"Картоплю з гуркамі топча, а ўжэ не хоча якога хлопца! Давай караля з заморскага карабля*!" [24, с. 144]. Зайчыку на жартоўнае заляцанне яна адказвае: "*Трэба ты нам, стары пень, як учарашні дзень! .. Дзяцей поўны хорам, а сам, як малы – і не сорам!*" [24, с. 144]. У час будоўлі грэблі, калі Міканора абралі за старшага, жанчына рэагуе: "*Кеб не выбраць халеру – гарачы не ў меру*!" [24, с. 158].

Гаваркія здольнасці зрабілі Сароку лепшай у вёсцы свахай. З яе вуснаў гучаць адметныя прыказкі і прымаўкі падчас абраду сватання: *Даждаўся гусачок малады – час залаты!.. А яна* [гусачка] *от, паявілася – хата засвяцілася!.. Прыйшоў малады хлапец – добры купец!.. Сам малады, чуб залаты, дабра поўныя клеці – лепшы на ўсім свеце* [24, с. 255]; *Самы час, самы лепшы квас!.. Жаніх бо які: што ўродай, што славай, што красой, што справай* [24, с. 256].

Ужытыя Іванам Мележам прымаўкі характарызуецца адмысловай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускай, а дакладней палескай, афарбоўкай і ілюструюць сакавітасць беларускіх прыказак, звязаных з вяселлем. Аднак стылістычна адэкватныя парэміі маюцца і ў іншых усходнеславянскіх мовах, што пацвярджае тэкст перакладу рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” на рускую мову. Перакладчык не захаваў нацыяльна-культурны кампанент мовы рамана ў сцэне сватання, але падаў прыклад рускіх парэмічных адпаведнікаў, якія выкарыстоўваюцца падчас сватання: *Дождался гусачок молодой поры золотой... А она вот, появилась – хата засветилась!*; *Пришел молодой удалец, добрый купец!*; *Сам молодой, чуб золотой, добра полны клети – лучший на свете!*; *В самый раз, самый лучший квас!.. Жених вон какой: что родом, что телом, что красой, что делом* [25].

Разгледжаныя парэмічныя адзінкі беларускай, рускай і ўкраінскай мовы паказваюць, што ўжыванне прыказак і прымавак падчас сватання як аднаго з пачатковых этапных абрадаў усходнеславянскага вяселля – устойлівая і трывала замацаваная традыцыя. Парэміі вобразна і экспрэсіўна выяўляюць адносіны ўдзельнікаў абраду да галоўных яго герояў: жаніха, нявесты, іх бацькоў. Многія даследаваныя выразы з’яўляюцца рыфмаванымі, што спрыяе іх запамінанню і такім чынам лепшаму захаванню ў народнай свядомасці і павялічвае эмацыянальнасць выказванняў. Прыказкі і прымаўкі падчас сватання маюць дастатковае семантычнае разгалінаванне і праз іншасказ перадаюць розныя сэнсавыя адценні. Наяўнасць адпаведнікаў і падобных, а часам нават даволі блізкіх, парэмічных адзінак у беларускай, рускай і ўкраінскай мовах паказвае на старажытнасць паходжання выразаў.

Усходнеславянскія парэмічныя адзінкі, звязаныя з вясельнай абраднасцю, выяўляюць лексіка-семантычную разнастайнасць. Прыказкі і прыказкі акумулюць і алегарычна перадаюць сфарміраваныя шматвяковай гісторыяй народныя меркаванні адносна вяселля, шлюбу і сямейнага жыцця. Супастаўленне беларускіх, рускіх і ўкраінскіх парэмій выяўляе розныя па ступені блізкасці адпаведнікі, найбольш старажытнымі з якіх парэміі з амаль поўным супадзеннем лексічнага складу. У прыказках, якія ўзніклі ўжо ў часы самастойнага існавання беларускай, рускай, украінскай моў, адзначаецца супадзенне значэння і стылістычнай характарыстыкі.

Літаратура

1 Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. – 511 с.

2 Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна /

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2003. – 362 с.

3 Прыводзіцца фактычны матэрыял картатэкі (тут і далей) лінгвістычнай лабараторыі кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» з указаннем лакалізацыі – населеных пунктаў раёнаў Брэсцкай (Іван. – Іванаўскі, Стол. – Столінскі) і Гомельскай (Браг. – Брагінскі, Буда-Каш. – Буда-Кашалёўскі, Ветк. – Веткаўскі, Гом. – Гомельскі, Добр. – Добрушскі, Жлоб. – Жлобінскі, Нараўл. – Нараўлянскі, Рэч. – Рэчыцкі, Чач. – Чачэрскі) абласцей і захаваннем фанетычных і граматычных адметнасцей мясцовага вымаўлення.

4 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / рэд. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

5 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2002. – 384 с.

6 Лоеўшчына.. Бэзавы рай, песенны край: сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны / уклад. В. С. Новак. – Гомель: Сож, 2007. – 472 с.

7 Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / уклад. В. С. Новак. – Гомель: ААТ “Полеспечать”, 2007. – 456 с.

8 Народная духоўная культура Брагіншчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / склад. В. С. Новак, У. І. Коваль. – Гомель: Белдрук, 2007. – 240 с.

9 Круглов, Ю. Г. Русские обрядовые песни: Учеб. Пособие для пед. Ин-тов по спец. «Рус. яз. и лит.» / Ю. Г. Круглов. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Высш. шк., 1989. – 320 с.

10 Русский фольклор / сост. и примеч. В. Аникина. – М.: Худож. лит., 1985. – 367 с.

11 Фальклорны слоўнік Гомельшчыны / У. В. Анічэнка [і інш.]. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2003. – 346 с.

12 Даль, Владимир. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / Владимир Даль. - М.: Русский язык, 1978 – 1980. Т. 1: А – З. – 699 с. Т. 2: И – О. – 779 с. Т. 3: П. – 555 с. Т. 4: Р – Я. – 683 с.

13 Музичний фольклор з Полісся у запісах Ф. Колесси та К. Мошинського / Упоряд., вступ. ст. прим., пер. з пол. С. Й. Грици. – К.: Муз. Україна, 1995. – 432 с.

14 [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http: www. paramoloda.ua. – Дата доступу: 29.09.2011.

15 [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http: www.sviato.in.ua. – Дата доступу: 29.09.2011.

16 [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http: www.musart.org.ua. – Дата доступу: 29.09.2011.

17 Жаўруковая песня Радзімы: народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю / пад аг. рэд. В. С. Новак. – Гомель: Сож, 2008. – 424 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

18 Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

19 Весільні прислів’я. Приказки про весілля та сім’ю [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://www.paramoloda.ua/sayings. – Дата доступу: 16.04.2014.

20 Пословицы о свадьбе [Электронный ресурс]. – Режім доступу: http://www.vseposlovici.ru/poslovicy-o-svadbe. – Дата доступу: 15.04.2014.

21 Пословицы и поговорки о женихе и о муже [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.forum.agriya.info. – Дата доступа: 15.04.2014.

22 Приказки та прислів'я: про сім'ю [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://www.sprite.org.ua/publ. – Дата доступу: 15.04.2014.

23 Пословицы и поговорки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.aphorisms.su/poslovicy. – Дата доступа: 16.04.2014.

24 Мележ, І. Людзі на балоце: Раман з “Палес. хронікі” / І. Мележ. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 400 с.

25 Мележ, Иван. Люди на болоте (Полесская хроника – 1); авторизованный перевод с белорусского Мих. Горбачева / Иван Мележ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://modernlib.ru/books/melezh_ivan/lyudi_na_bolote_polesskaya_hronika_1. – Дата доступа: 17.04.2014.

А. А. Станкевіч

1.1.3 Паэтыка вясельна-абрадавай песні

Народныя песні, як адзначае вядомы беларускі даследчык народна-паэтычнай творчасці Н. С. Гілевіч, “прыгожыя сваім натуральным, прыродным хараством, якое тоіцца ў сіле пачуцця і глыбіні думкі. Высакародны, чалавечы змест заўсёды знаходзіў і высакародную, ясную, дасканалую форму” [1, с. 8].

Мова народна-паэтычнай творчасці, якая адрозніваецца мастацкай канкрэтнасцю, выразнасцю вершаванага слова, вобразнай формай адлюстравання аб’ектыўнай рэчаіснасці, з’яўляецца вышэйшым узроўнем развіцця вуснага славеснага мастацтва.

“У кожнай песні мы ўбачым выкарыстанне розных прыёмаў і сродкаў мастацкага адлюстравання і мастацкай выразнасці. Народнапесенная паэтыка выпрацавала за доўгія стагоддзі вельмі многа спосабаў выяўлення чалавечых дум і пачуццяў у слове” [1, с. 13]. Найбольш поўна адзначаныя якасці праяўляюцца ў вясельных песнях, якія суправаджаюць адзін з галоўных этапаў у жыцці чалавека

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– уступленне ў шлюб.

1.1.3.1 Моўны механізм стварэння эмацыянальна-ацэначнай канатацыі ў вясельных песнях Гомельшчыны

Адметнай асаблівасцю народна-песеннай творчасці з'яўляецца яе прыўзнята-лірычны настрой, глыбокая эмацыянальнасць і яскравая выяўленчая выразнасць. Знешне нескладаная, простая, звычайная мова народнай песні дакладна перадае задушэўныя перажыванні галоўных герояў, іх шчымлівае пачуццё, сардэчнасць і непасрэднасць. Простыя і шчырыя словы песні ідуць ад сэрца і моцна кранаюць за душу. Невыпадкова песенную народную творчасць называюць вышэйшым узроўнем развіцця вуснага слоўнага мастацтва. Як слушна адзначыў Н. С. Гілевіч, для народнай песні характэрна "незвычайна высокае паэтычнае майстэрства народных песнятворцаў, іх зайздроснае ўменне карыстацца сэнсавымі, вобразна-выяўленчымі і інтанацыйна-эўфанічнымі магчымасцямі роднай мовы" [1, с. 3].

Істотнай адметнасцю вясельных песень у параўнанні з іншымі песеннымі жанрамі вуснай народна-паэтычнай творчасці з'яўляецца яркая эмацыянальная афарбоўка. Паняцце "*эмацыянальнасці*" звязана з перадачай суб'ектыўна-ацэначных значэнняў. Як вядома, асноўным моўным механізмам стварэння эмацыянальнасці з'яўляецца канатацыя – дадатковыя семантычныя або стылістычныя адценні, якія накладваюцца на асноўнае значэнне [2, с. 236]. Канатацыя як кампанент лексічнага значэння ўключае эмацыянальна-ацэначныя і стылістычна маркіраваныя адносіны суб'екта да рэчаіснасці, якія ствараюць эмацыянальную афарбоўку або суб'ектыўна-ацэначнае адценне семантыкі слова.

Семантычны спектр шкалы ацэначнасці ў маўленні з'яўляецца даволі шырокім, палярнымі палюсамі яго выступаюць адценні ўзвелічэння, захаплення, з аднаго боку, і абурэння, непрыняцця чаго-небудзь, з другога. Паміж імі знаходзяцца такія адценні суб'ектыўнай ацэнкі, як павага, пашана, замілаванне, пяшчота, ласкальнасць, адабрэнне на пазітыўным спектры, іронія як пераходнае адценне і неадабрэнне, непавага, непашана, асуджэнне, агіда, знявага і іншыя на негатыўным полюсе. Неабходна адзначыць, што шкала ацэначнасці і эмацыянальнай афарбоўкі ў вясельна-песеннай традыцыі Гомельшчыны, як і іншых рэгіёнах Беларусі, не з'яўляецца такой шматграннай, і гэта ў значнай ступені абумоўлена як жанравымі асаблівасцямі, пазітыўным агульным настроем, імкненнем да ўзвелічэння, усхвалення галоўных персанажаў песні.

Эмацыянальная афарбоўка як дадатковыя сэнсавыя кампаненты ў семантычнай структуры слова, якія перадаюць пачуцці і настрой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гаворачага, яго суб′ектыўныя адносіны да прадмета размовы, ствараецца рознымі моўнымі (лексічнымі, лексіка-семантычнымі і словаўтваральнымі) сродкамі і адыгрывае вялікую ролю ў наданні маўленню выяўленчай выразнасці.

Важнейшым лексічным сродкам стварэння суб’ектыўнай ацэначнасці ў вясельных песнях з’яўляецца эмацыянальная лексіка – словы, якія маюць дадатковае адценне значэння і выражаюць пачуцці, настрой, адносіны гаворачага.

Як адзначаецца ў навуковай літаратуры, эмацыянальная афарбоўка можа быць інгерэнтнай і адгерэнтнай. Інгерэнтная эмацыянальная афарбоўка – эмацыянальнае адценне, якое выражаецца ўнутраным зместам моўных адзінак, іх семантыкай і з′яўляецца узуальным [3, с. 438]. Такое значэнне называюць таксама імпліцытным. У агульнанацыянальнай мове словы з інгерэнтнай эмацыянальнай афарбоўкай, якая выражаецца ўнутраным зместам моўных адзінак, найчасцей адносяцца да пеяратыўнай лексікі – слоў з адмоўнай канатацыяй, якія перадаюць аўтарскае асуджэнне, абурэнне, непавагу, нязгоду і пратэст супраць негатыўных з’яў грамадскага жыцця. У вясельных песнях такія словы амаль не сустракаюцца, з’яўляюцца рэдкім выключэннем і выконваюць спецыфічную, засцерагальную функцыю. Традыцыя іх выкарыстання паходзіць ад глыбокай старажытнасці, калі чалавек асцерагаўся шкоднага ўздзеяння варожых сіл прыроды і ўжываў “непрываблівыя” назвы-характарыстыкі асоб з мэтай “адцягнуць” увагу непрыязных да яго сіл. Так, напрыклад, у некаторых песнях нявесту называюць такімі іранічна-пеяратыўнымі словамі, як *чапуруга, нявехна, няўдала, негадзя-нявехна, нежачка, санлівая, драмлівая, нялюбая: Негадзя-нявехна, негадзя, Па ваду пайшла – забурылася, Па дровы пайшла – завалілася, Абедаць села – удавілася* (в. Стаўбун, Ветк. – ВнГ, с. 114); *Паехалі пацярухаю, За сваёю чапуругаю* (в. Нудзічы, Браг. – ВнГ, с. 54); *Няўдала, нявестка, няўдала, Раннюю зорачку праспала* (в. Пратасы, Акц. – ВнГ, с. 18); *Санлівая, драмлівая нявестка мая* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 44); *– Выйдзі, мамачка, паглядзі, Што к табе баяры прывязлі. Прывязлі к табе нежачку, Ці замесе яна дзежачку* ? (в. Данілавічы, Ветк. – с. 106]; *Ай, жэніць, жэніць Мяне татка, маладога. Ай, бярэць, бярэць Нялюбую мне жонку* (г.п. Брагін – ВТГ, с. 52); характарызуюць зніжанымі параўнаннямі з негатыўнай ацэнкай: *Паглядзі, свякруха, у куток, сядзіць нявестка, як мяшок* (в. Ратміравічы, Акц. – с. 20); *Паглядзі, свякруха, на паліцу, Сядзіць нявестка з рукавіцу* (в. Міхнаўка, Браг. – с. 41); *Наш малады, як сыр наліты, Ваша маладая так, як чарцяня* (в. Нудзічы, Браг. – ВнГ, с. 54); *Вынесь, вынесь, свякруха,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нову дзяжу – Вязём табе нявехну, як дзеразу (в. Пухавічы, Жытк. – ВнГ, с. 241); жаніха называюць *нягадзяй, жаніхна, лупаты, паганы*: *Ой, каго ты .. ўпадабала, Што такога нягадзяя спадабала* (в. Міхнаўка, Браг. – с. 39); *Ой, што ж табе да, Валечка, случылася, Што ты з такім нігадзяям злюбілася*? (в. Нудзічы, Браг. – ВнГ, с. 54); *А наш малады лупаты Пабег кругом хаты* (в. Хракавічы, Браг. – ВТГ, с. 48); *Іду дадому, ды баюся, Паганага мужа маю, Будзе біці – добра знаю* (в. Кашалеў, Б.-Каш. – ВнГ, с. 73).

Выключную перавагу ў колькасных адносінах у складзе эмацыянальнай лексікі маюць словы з імпліцытным значэннем і пазітыўнай эмацыянальнай афарбоўкай, т. зв. меліяратыўная лексіка, якая выражае станоўчыя адносіны да персанажаў вясельнай песні – павагу, пашану, сімпатыю, пяшчоту, замілаванне, узвелічэнне, адабрэнне. Гэта фальклорныя, узвышана-велічальныя назвы галоўных вясельных персанажаў (маладых і іх сяброў): *князь, княжы, кароль, казак, каралеўна, княгіня, любачка, краса-дзявіца*: *Адчыняй дзверы, сваток, Едзе дружына да цябе, Паглядзець красу-дзявіцу* (г. п. Церахоўка, Добр. – ВнГ, с. 174); *Выйдзі, мамачка, на парог паглядай А што мы цябе прывезлі. Прывязлі пярыну І маладую княгіню* (в. Стаўбун, Ветк. – ВнГ, с. 117); *Расцялі, мамачка, трубачку, Прывезлі нявесту-любачку* (в. Кашалёў, Б.-Каш. – ВнГ, с. 79).

У вясельных песнях Гомельшчыны ўжываецца вялікая колькасць узнёсла-паэтычных назваў галоўных дзеючых асоб вясельнай цырымоніі. Яны маюць, як правіла, метафарычны характар і арганічна ўпісваюцца ў сімволіка-алегарычную вобразную сістэму народна-паэтычнай песні: *галубок, сокал, лябедзік* (пра маладога), *зязюля, галубка, лебедзінка, лябёдка, звёздачка* (у дачыненні да маладой): *Ой, што ета сына-сокала доўга няма* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 14); *Лябедзік, лябедзік – Ванечка, Лебедзінка, лебедзінка Манечка* (14, с. 221); *Заручаеш мяне, мамка, маладую, Ой, дай зязюлю лугавую* (в. Вязок, Браг. – ВнГ, с. 29). Метафарычны сэнс названых найменняў, іх зааморфны характар, заснаваны на персаніфікацыі, дазваляе аднесці іх да лексіка-семантычных сродкаў стварэння эмацыянальнай афарбоўкі маўлення.

Пазітыўна-ацэначную ролю ў песнях выконваюць таксама ўзнёслыя параўнанні, надзеленыя выразнай эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай: *Адчыні, маці, аконца – Едзе дочка, як сонца* (в. Пянчын, Б.-Каш. – ВнГ, с. 88); *Будзь жа ты, нявестка, Здарова, як зіма. Будзь жа ты, нявестка, Вясёла, як вясна. Будзь жа ты, нявестка, Ціхая, як лета. Будзь жа ты, нявестка, Багатая, як восень* (в. Пянчын, Б.-Каш. – ВнГ, с. 88); *Да мая дзевачка як лебедзь бялее* (в. Ратміравічы, Акц. –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ВнГ, с. 20).

У адрозненне ад імпліцытнага, экспліцытнае суб′ектыўна-ацэначнае значэнне выражаецца праз знешнія, фармальныя паказчыкі, найчасцей суфіксы суб′ектыўнай ацэнкі. Такі спосаб стварэння эмацыянальнай афарбоўкі надзвычай пашыраны як у звычайным, так і мастацкім маўленні.

Суфіксы суб′ектыўнай ацэнкі могуць выражаць станоўчую (меліяратыўную) ацэнку прадметаў, з′яў, асоб, іх якасцей і ўласцівасцей (замілаванне, пяшчоту, ласкальнасць, спагаду, спачуванне) або адмоўныя (пеяратыўныя) адносіны (знявагу, пагарду, насмешку, іронію і інш.) з рознымі экспрэсіўнымі адценнямі. У вясельных песнях Гомельшчыны формы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі, за вельмі рэдкім выключэннем, маюць пазітыўнае ацэначнае значэнне: *Заручоначка-дзевачка, Перайдзі новыя сені* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 12); *Будзе дочачка твая добра спаць, Калі будзе яна працаваць* (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с.22); *Пусці, татачка, У сад пагуляці* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 40); *Ой, цёшчанька, мая маценька, Учора мы заручаліся, А сягодня павянчаліся* (в. Кабанаўка, Жлоб. – ВнГ, с. 208); *Да на табе, міленькая, вяночак, Да панасі ты яго дзянёчак .. А вечарам дружачкам аддасі* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 15); *Музычэнькі йграюць, І свахны спяваюць* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 232).

Даволі часта эмацыянальнасць вясельнай песні з’яўляецца мінорнай, мае сумнае адценне, што звязана з развітаннем нявесты з бацькамі, блізкімі і сяброўкамі. Пакідаючы родны дом, развітваючыся з дзявочай вольніцай, пераязджаючы ў чужую сям’ю, нявеста адчувае страх перад новым жыццём, зменай сямейнага статусу. Пачуццё глыбокага смутку выражаецца таксама ў так званых *сірочых песнях*, калі нявеста сумуе аб памерлых раней бацьках: *Пашлю сокала На Украіначку, На сваю радзіначку, А зязюлечку, а зязюлечку На той свет па мамачку* (в. Барталамееўка, Ветк. – В., с. 237).

Словаўтваральная парадыгма суб’ектыўна-ацэначных назваў у песнях надзвычай развітая. Так, значэнне памяншальнасці і/або ласкальнасці перадаецца ў вясельна-песеннай традыцыі Гомельшчыны суфіксамі *-к-, -ак, -ок, -ёк, -ік, -ык -ец-, -ц-, -ейк-, -аньк-, -еньк-, -эньк-, -уньк-, -ухн-,-ушк-, -оўк-, -очк-, -ул-, -ечк-, -ачк-, -ічк-, -інк-, -ынк-* і інш. У агульнаўжывальным маўленні памяншальнае значэнне звычайна ўказвае на малы аб’ём або памер прадмета, нязначную ступень праяўлення якасці або акалічнасці, ласкальнае адценне выражае пяшчотныя адносіны да аб’екта або з’явы. Памяншальна-ласкальнае значэнне адзначае малы аб′ём, памер прадмета і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адначасова выражае дадатковае адценне пяшчотнасці, ласкальнасці, замілавання. Як правіла, у тэксце вясельнай песні сумяшчаюцца адценні памяншальнасці і ласкальнасці.

Лексіка-тэматычны і граматычны спектр эмацыянальна-ацэначных назваў у вясельных песнях надзвычай шырокі. Так, самая значная колькасць субстантыўных форм з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі ў аналізуемых тэкстах адносіцца да асабовых намінацый. Большая іх частка называе непасрэдных удзельнікаў шлюбнай цырымоніі. Жаніха і нявесту найчасцей у песнях называюць па імені: *Танечка, Леначка, Манечка, Ганначка, Колечка, Ванечка* і т. п., хаця сустракаюцца і іх апелятыўныя найменні: *заручоначка, нявестачка, нявестухна, нявестунька, нявестанька, дзевачка, дзяўчыненька, дачушка, дочачка, донячка, дзіцятка, баярачка*; *жанішок, хлапчынка, дзяцінка, сыночак*, шматлікімі і разнастайнымі з'яўляюцца суб'ектыўна-ацэначныя назвы бацькоў маладых: *мамачка, матачка, матулька, маценька, мамонька, татачка, татулька, баценька, свёкарка, свёкарочак, свякратачка, свякратунька, свякроўка, свякрованька, свякрушанька, свякровачка, свякровухна, свякрухначка, свякровушка, свякрутунька, цёшчанька гаспадынька, гаспадарык;* родных: *братачка, брацейка, дзядзюхна, цётухна, сястрыца, радзіначка, дзевярочкі, заловачка*; іншых удзельнікаў вяселля*: сваточак, сваточкі, сватачкі, свацейка, суседачка, дружачкі, падружачка, падружанькі, госцікі, госцейкі, каравайнычкі, каравайнечкі, музычэнькі: Заручоначка-дзевачка, Перайдзі новыя сені* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 12); *Будзе дочачка твая добра спаць, Калі будзе яна працаваць* (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с. 22); *Хмурыцца на двары, хмурыцца, Татулька і матулька журацца* (в. Рагінь, Б.-Каш., – ВТГ, с.60); *Пусці, татачка, У сад пагуляці* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 40); *Ой, цёшчанька, мая маценька, Учора мы заручаліся, А сягодня павянчаліся* (в. Кабанаўка, Жлоб. – ВнГ, с. 208); *Да на табе, міленькая, вяночак, Да панасі ты яго дзянёчак .. А вечарам дружачкам аддасі* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 15); *Музычэнькі йграюць, І свахны спяваюць* (в. Любавічы, Жытк. – ВнГ, с. 232).

У асобную групу лексікі, звязанай з назвай вясельных чыноў, можна выдзеліць саматычныя эмацыянальна-ацэначныя намінацыі: *ручкі, ручачкі, ручанькі, ножкі, ножанькі, ножачкі, галоўка, галовачка, вочкі, шчочка, губкі, сардэнька, валоскі, косанька: Галоўка мая ў вяночку* (г.п. Акцябрск, –ВТГ, с. 19); *А ў нас сёння заручынкі, .. Залаты песцень на ручанькі* (в. Ратміравічы, Акц. – ВнГ, с. 18); *Растапчы ножкамі траўку-мураўку* (в. Грабаўка, Гом. – ВТГ, с. 65).

Даволі значнай у колькасных адносінах з'яўляюцца эмацыянальна-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ацэначныя найменні канкрэтных прадметаў. Гэта назвы бялізны, адзення, абутку, галаўных убораў і ўпрыгожванняў: *жупанікі, вяночак, хустачка, хустанька, сукеначка, плацечка, касыначка, лентачкі, шапачка, паясочак, трапачкі, уплётачкі, пярсцёначкі, калечка, каралечкі, чаравічкі, каблучкі, пасцелечка, рушнічок, палаценейка;* хатніх рэчаў, мэблі, посуду: *кубачак, вядзерца, лыжачка, дзежачка, лавачкі, грабенчык;* назвы транспартных сродкаў: *саначкі, калясачка;* прыстасаванняў для шыцця і ткання: *бердзечка, голачка, кудзелька;* назвы пабудоў і іх частак: *каморачка, каморанька, сенечкі, хатачка, куточак, паветачка, вакенца, акенечка, дзвяраткі, варотачкі, ганочак, плоцік, печанька, мосцік: Зялёная сукеначка, дай да долу, Шаўковенькі паясочак з трапачкамі, Казловыя чаравічкі з каблучкамі* (в. Барталамееўка, Ветк. – ВнГ, с.110); *Там нам каморка прыбрана, Там нам пасцелечка паслана* (в. Дуброва, Акц. – ВнГ, с. 25); *Табе, матка, ніт і бердзечка, А мне, мамка, палаценейка* (в. Вязок, Браг. – ВнГ, с. 30).

У складзе форм з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі – назвы рэалій жывёльнага свету: *пчолачкі, конікі, зязюленька, салавейка, галачкі, зязюліначка, галубяткі, каровонька, гусонькі, варабейка*; з'яў расліннага свету: *каліначка, кветачкі, зейлечка, траўка, мураўка, ракітнічак, бярозка, яблынька, вішанька, грушачка, ялінка, яліначка, гурочкі, травінка, яварыначка, цыбулька, часначок, пшоначка, жалудочкі, канапелечка;* прыродных з'яў: *дожджык, рэчанька, зорачка, месячка: А каля новага двара Ці не пчолачка гула?* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 11); *Да паехалі, госцейкі, дадому, Да паелі конікі салому* (в. Ратміравічы, Акц. – ВнГ, с. 18); *Стаіць грушачка, распусціўшыся, некаму падрэзаць* (в. Цярэнічы, Гом. – ВТГ, с. 87); *Паглядзі, Танечка, у акенца, Ці харош месячка на небе* (в. Казацкія Балсуны, Ветк. – ВнГ, с. 130).

Экспліцытнае суб'ектыўна-ацэначнае значэнне ў вясельных песнях набываюць таксама такія лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў, як зборныя: *карэннейка, каменнейка, радзіначка, радзіненька*; адцягненыя тэмпаральныя: *ранейка, ночачка, врэмечка, часочак, суботанька, нядзелечка, дзянёчак, вечарочак;* працэсуальныя: *заручынкі, свадзебка, здзелачка, парадачка, вяселлечка, гулянейка,*; абстрактныя: *праўдачка, думачка, жыццечка, доленька: Ой, хадзілі сватове Сем міль па дуброве, Да па лесу, па карэннейку, Да па полі, па каменнейку* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 16); *Зборная нядзелечка, зборны дзянёчак, Сабрала Танечка ўсіх дзевачак* (г. п. Акцябрск, – ВТГ, с. 19); *Дзявоцкае гулянейка ў вішнёвым саду* (в. Рудзянец, Б.-Каш. – ВнГ, с. 71).

Неабходна адзначыць, што многія субстантыўныя адцягненыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі з'яўляюцца ў вясельных песнях аказіянальнымі, кантэкстуальна абумоўленымі, не характэрнымі для агульнанароднай мовы: *дзвяраткі* "дзверы", *шлюбанёк* "шлюб", *застолейка* "застолле", *куковайнейко* "кукаванне", *полетайнейко* "лятанне", *дзеваванейко* "вольнае дзявочае жыццё", *часанейко* "расчэсванне", *уцешанька* "уцяшэнне", *дзелечка* "справа", *пасаданька* "пасад": *Летняя зяўзюленько, Ужо табе мінаецца Летняе куковайнейко, Высокае полетайнейко, .. Маладая .. ужо табе да мінаецца Дзявочае дзеваванейко, Русо косо да часанейко* (в. Хількавічы, Жытк. – ВТГ, с. 229). Такія арыгінальныя, незвычайныя формы надзвычай упрыгожваюць паэтычны кантэкст вясельнай песні.

Ад'ектыўныя формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі адлюстроўваюць пачуцці пяшчоты і замілавання да пэўных якасцей або ўласцівасцей: *новенькія, бяленькія, весяленькія, саладзенькія, маладзенькая, вараненькі, беленькія, добранькая, чорненькія, чырвоненькія, маладзенька, міласцівенькі, залаценькія, ясненькія: Гасцінчыкі саладзенькія Для мяне, маладзенькае* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 12); *Зоры мае ясненькія, Не стухайце вы рана* (в. Грабаўка, Гом. – ВнГ, с. 66).

Адвербіяльныя формы называюць эмацыянальнае стаўленне да інтэнсіўнасці, ступені праяўлення або акалічнасці таго ці іншага дзеяння: *сільненька, нізенька, блізенька, раненька, ранюсенька, пакорненька*: *Чужая сямейка п'е да скача, А твая мамачка сільненька плача* (в. Кашалёў, Б.-Каш. – ВнГ, с. 78); *Ой, па рэчцы, па Дняпры Там плавалі два бабры. Рана, раненька, ранюсенька Між сабою размаўлялі* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб. – ВнГ, с. 191).

Назвы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (*-ін-, -ішч-, -іск-, -эч-, -уч-, -ізн-*), якія надаюць значэнне павелічальнасці і/або зневажальнасці, неадабрэння ў тэкстах вясельна-песеннай абраднасці амаль не сустракаюцца.

Актыўнае выкарыстанне форм з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, іх максімальная насычанасць у песенным тэксце надаюць яму меладычнасць, напеўнасць, лірычнасць і ўзнёсласць. Яны не толькі перадаюць адносіны ласкальнасці і пяшчоты, але і ўзмацняюць гукавую інструментоўку паэтычнага кантэксту.

Даволі часта ў адным кантэксце спалучаюцца лексічныя і словаўтваральныя сродкі стварэння ацэначнай канатацыі, што значна павышае эмацыянальнае гучанне паэтычнага радка.

Шчырая і задушэўная інтанацыя вясельна-абрадавай песні нярэдка спалучаецца з мінорным настроем, які суправаджае сумнае расставанне маладой з родным домам, бацькамі, дзявочай вольніцай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У гэтых радках чуваць страх перад новым жыццём, боязь змены жыццёвага ўкладу, няўпэўненасць у будучым. Ці не будзе ліхой свякроўка, лютым свёкар, суровым муж? Мінорная танальнасць стварае асаблівую шчымлівую інтанацыю, адметную эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку вясельнай песні. Жаласлівая інтанацыя ў значнай ступені характэрна для так званых "сірочых" вясельных песень.

Эмацыянальная лексіка і формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, акрамя выразнай экспрэсіўнай афарбоўкі, надаюць мове песень асаблівую мілагучнасць, меладычнасць і напеўнасць.

1.1.3.2 Метафарызацыя паэтычнага кантэксту вясельнай песні Гомельшчыны

Як слушна і прыгожа адзначыў Н. С. Гілевіч, "нашы народныя песні таму і валодаюць магічнымі чарамі эмацыянальнага ўздзеяння, што яны .. нясуць у сабе самае дарагое і запаветнае з таго, што гэтую [народную – А.С.] душу напаўняла, чым яна жыла і жывілася, чым яна пакутавала і цешылася, да чаго імкнулася і што адмаўляла" [1, с. 8]. Гэтым якасцям максімальна поўна адпавядаюць і вясельныя песні, якія суправаджаюць усе этапы шлюбнай абраднасці чалавека.

Важнейшым сродкам мастацкага пазнання свету, актыўнай формай вобразнага адлюстравання аб'ектыўнай рэчаіснасці з'яўляецца *метафара*, заснаваная на выкарыстанні слоў і выразаў у пераносным сэнсе на аснове падабенства або аналогіі называемых імі прадметаў і з'яў. У сістэме тропаў метафарычнага тыпу, якія выкарыстоўваюцца ў вясельных песнях, можна ў першую чаргу вылучыць персаніфікацыю, адухаўленне – перанос дзеянняў і ўласцівасцей чалавека на рэаліі прыроднага свету, а таксама наданне неадушаўлёным прадметам і з'явам стану і паводзін жывых істот. Персаніфікацыя заснавана на метафарычным выкарыстанні дзеясловаў, калі з'явам прыроды або прадметам прыпісваецца разумовая або псіхічная дзейнасць чалавека. Такі прыём надзвычай ажыўляе песенны тэкст, надае яму ліра-эпічны характар, стварае казачную манеру апавядання.

Вясельна-песенная лірыка Гомельшчыны надзвычай насычана метафарычнымі формамі пераносу, калі ўласцівасці і дзеянні чалавека (найчасцей яго маўленчая здольнасць) прыпісваюцца разнастайным прадстаўнікам жывёльнага свету: птушкам: *Ой, ляцелі гускі з раю, Пыталіся ды караваю: – Ці ўжэ ды пасаджалі? Чаму нас не*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падаждалі? Мы б жа вам да пасаджалі, Крыльцамі да папісалі (г. п. Акцябрск, ВТГ, – с. 19–20); *Ой, ляцелі гусачкі через сад Ды крыкнулі, крыкнулі на ўвесь сад: Пара табе, Манічка, сесці на пасад* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВТГ, с. 21); *Прыляцеў верабейка, чэ-чэ-чэ, Сеў на акенечка, шчэбячэ. Скажу табе, дзевачка, надзею, Што прыедзе Іванка ў нядзелю* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВТГ, с. 21); *Ой, у полі два дубочка, А там сядзелі, ой, два галубочка .. Гаварылі самі між сабою: – Худа жыці хлопцу халастому, Ой-да, ой-да, хлопцу халастому* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 42); жывёлам: *Лес, за лесам ды мядзведзь рыкае: – Будзе, табе дзеванька, свякроўка ліхая* (в. Лескі, Акц. – ВТГ, с. 23); *Ой, па рэчцы, па Дняпры Там плавалі два бабры .. Яны плылі, выплывалі, Між сабою размаўлялі* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб. – ВТГ, с. 133).

Працэсу персаніфікацыі ў вясельных песнях падвяргаюцца таксама рэаліі расліннага свету: *Зялёная ліпа да ўсю восень шумела,Усё з лісцейкам да гаварыла* (г. Гомель – ВнГ, с. 103); *Ой, ёлочка борова, Ты ў боры расла, шумела, Дорогаю йшла, звінела. На столе стала, заззяла* (в. Бацунь, Б.-Каш. – ВнГ, с. 82).

Паводле характару аб’ектаў, на аснове якіх адбываецца перанос, у аснове персаніфікацыі ў вясельных песнях сустракаецца таксама тып метафары “нежывому – жывое” – перанос уласцівасцей чалавека на пэўныя канкрэтныя прадметы. Найчасцей гэта рэаліі паўсядзённага побыту, а таксама рытуальныя прадметы – печ, каравай : *Каравай гіча, гіча, Каравай гіча, гіча, Каравайнічак кліча: – Дзе ж вы так забарыліся, Што да мяне не з’явіліся?* (в. Валосавічы, Акц. – ВТГ, с. 24); *Печ наша рагоча, Печ наша рагоча, Печ наша рагоча, Чаго яна хоча?* (в. Роза-Люксембург, Ельск. – ВТГ, с. 117); *Наша печ крокочэ, Коровая хочэ, А прыпечак коловаецца, Коровая спадзеваецца. А коровай ножкі гібле, Да до печанькі дыбле* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 161).

У некаторых выпадках адбываецца персаніфікацыя астранамічных з’яў, якая суправаджаецца анімізацыяй адцягненыя паняццяў: *Дзень канчаецца, вечарэецца. Сонейка знікае, Дзявочы век убягае* (г. Жлобін – ВТГ, с. 156).

Метафарызацыі вершаванага кантэксту вясельнай песні ў значнай ступені садзейнічае актыўнае выкарыстанне народна-паэтычнай сімволікі. *Сімвал* – адзін з відаў іншасказання, умоўнае абазначэнне сутнасці якой-небудзь з’явы, паняцця пэўным прадметам ці словавобразным знакам. Ролю сімвалаў звычайна выконваюць канкрэтныя назоўнікі, якія абазначаюць рэаліі жывёльнага або расліннага свету: *Му ў цэркві бувалі, Трое зеллё ўвідалі: Однэ зелле – рута, А другее – м’ята, А трэйцяя – кветкі, Звенчоные дзеткі* (г. п. Тураў – ВнГ, с. 246); *Наляцелі арлы да калодзежа, Чулі яны,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што вада халодна (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 150).

Сімволіку вясельнай песні арганічна дапаўняе вобразны паралелізм, заснаваны на супастаўленні асобы, пэўнага дзеяння, стану або ўласцівасцей чалавека са з'явамі прыроды, рэаліямі жывёльнага або расліннага свету, які адлюстроўвае арганічную сувязь чалавека з прыродай, адухаўленне ім усіх яе праяў. Як адзначаюць даследчыкі, вобразны паралелізм можа быць псіхалагічным, калі ён дапамагае раскрыць унутраны, душэўны стан персанажа песні, і фармальным, музычна-рытмічным, не звязаным з унутраным зместам верша [1, с. 42–44].

У вясельных песнях Гомельшчыны вобразны паралелізм найчасцей бывае псіхалагічным, калі знешняя прыгажосць, маладосць нявесты, яе вясёлае, бесклапотнае жыццё ў родным доме, а таксама статнасць, мужнасць і фізічная моц жаніха супастаўляюцца з пэўнымі рэаліямі расліннага свету, тыповымі для народна-паэтычнай сімволікі. Тут часта сустракаюцца так званыя жаночыя вобразы: каліны: *Чырвона, чырвона да каліна ў лузе, А Алесечка ў бацькі найпрыгажэйшая* (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 151); бярозы: *Вязем табе бярозачку, харошую ды смялявую, Цёмную да багатую* (в. Валосавічы, Акц. – ВТГ, с. 25); грушы: *Стаіць грушачка, распусціўшыся, некаму падрэзаць, Стаіць Надзечка, расплакаўшыся, некаму сунімаць. Сядзіць ля её Ванечка яе, ён яе сунімець* (в. Цярэнічы, Гом. – ВТГ, с. 87); вішні: *Да будом ручкі муці Да на вішанькі ліці, Шоб вішэнькі розвіваліса, Шоб молодые красоваліса* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 162); руты-мяты: *Ой, рута мая, дробна зелена, Некаму падабраць* (в. Шарсцін, Ветк. – ВТГ, с.75); чарнабрыўцаў: *Расціце, чарнабрыўцы, ды не буяйце, А не ідзіце, дзеўкі, замуж, а гуляйце* (в. Хракавічы, Браг. – ВТГ, с. 47); ружы: *Напрасна я розу садзіла, Напрасна яе зберагла, А роза мая прызавяла, Любоў наша прашла* (в. Лубенікі, Браг. – ВТГ, с. 36); вінаграду: *Ішла Машанька на пасад Да ўступіла ў вінаград* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 59); канапелькі: *Да стаяла, буяла, да стаяла, буяла Канапелька ў агародзе, .. Гуляла, красавалася, Гуляла, красавалася. Манечка ў сваёй матачкі* (в. Лескі, Акц. – ВТГ, с. 23); значна менш прадстаўлены мужчынскія вобразы: дуба: *За туманам нічога не відна, Толькі відна дуба зеляного. Пад тым дубам крыніца стаяла, Там дзяўчына воду набірала. Да ўтапіла залато вядзерца .. А хто ж тое вядзерца дастане, Той са мною на ручніку стане. Хлопец тое вядзерца дастане, Ён з табою на ручніку стане* (в. Камарын, Браг. – ВТГ, с. 54); явара: *А ў барку, барку, На жоўтым пяску, Там стаяў явар тонкі, высокі, Ай, тудой ішоў мальчышак з руж'ём* (в. Рудня Стаўбунская, Ветк. – ВТГ, с. 72). Супастаўленне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маладых з рэаліямі прыроднага свету (асабліва ў спалучэнні з эпітэтам зялёны, які падкрэслівае вечнае абнаўленне прыроды, яе сілу і хараство) паказвае ўрачыстасць, значнасць чакаемай падзеі, яе пераломную важнасць у будучым жыцці галоўных персанажаў шлюбнай цырымоніі.

Дзеянні, пачуцці, перажыванні маладых або іх родных нярэдка параўноўваюцца з паводзінамі птушак, што ўзмацняе ступень праяўлення эмоцый і ўчынкаў персанажаў песні, надае ім сімвалічны характар. У вясельных песнях часта сустракаюцца вобразы зязюлі: *То не зязюлечка сіва кувала, Ганначка харошы песні спявала* (в. Дуброўнае, Браг. – ВТГ, с. 26); *Да прыляцела шэрая зязюля з ялаўца, Да прыехала маладая Ганначка з-пад вянца* (в. Буразь, Жытк. – ВАТГ, с. 180); сарокі: *Скакала сарока па страсе, Плакала Ніначка й па касе* (в. Бераставец, Карм. – ВнГ, с. 275); вуткі: *Ці не заляцела Наша вутачка к вам? Ой, заляцела Да на шасток села, Мы рады вам* (в. Глыбоцкае, Гом. – ВТГ, с. 81); салаўя: *Салавейка рана будзе ўлятаці, Будзе мяне, маладзеньку, пабуджаці* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 44); арла: *Наляцелі арлы да калодзежа, Чулі яны, што вада халодна. Наехалі сваты да Алесі, Чулі яны, што работніца ды красавіца* (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 150); ворана*: Воран крача, крача, Да і з луга не ўлетае. А Валечка плача, плача, Да і на воз не сядае* (в. Пухавічы, Жытк. – ВнГ, с.241); *На каліне чорны воран крача, А на чужбіне сіраціна плача: – Не даўно я сіраціной стала, За тры года ўсё гора ўзнала* (в. Лубенікі, Браг. – ВТГ, с. 35). Часта сустракаецца вобраз пчалы, якая сімвалізуе працалюбства, пладавітасць і дастатак: *А каля новага двара Ці не пчолачка гула?* (в. Чырвоная Слабада, Акц. – ВнГ, с. 11); *Нашы пчолкі параіліся. Дай ім, Божа, сад добры. Нашы маладыя пажаніліся, Дай ім, Божа, век доўгі* (в. Кашалёў, Б.-Каш. – ВнГ, с.80). Дзеянні персанажаў вясельнай песні супастаўляюцца таксама з важнейшымі з'явамі прыроды: *Мамка Васіля родзіла, По двору ходзіць. Месяцам обгородзіла Да зарою подперазала* (в. Сяменча, Жытк. – ВнГ, с. 256).

У вясельных песнях нярэдка выкарыстоўваюцца і хрысціянскія сімвалы: *Бог, Хрыстос, Прэчыста, ангелы, прарокі* і інш., якія падкрэсліваюць асаблівую велічнасць і ўрачыстасць шлюбнай падзеі, яе значнасць у асабістым жыцці чалавека: *Тройца по цэркві ходзіла, Спаса за руку водзіла. Прэчыста маці, прыйдзі к нашай хаці Коровай рашчыняці, вяселле почынаці* (в. Запясочча, Жытк. – ВТГ, с. 201); *Сам Бог коровай месіць, а Прэчыстая свеціць. Ангелы воду носяць, а пророкі Бога просяць. Хрыстос подлівае, хусткою накрывае* (в. Запясочча, Жытк. – ВТГ, с. 201).

Сімволіку народнай вясельнай песні арганічна дапаўняе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

алегарычнае значэнне многіх назваў. У алегарычным сэнсе, калі адцягненае паняцце або ідэя перадаюцца праз канкрэтны прадмет, мастацкі вобраз, малюнак, выкарыстоўваюцца як субстантыўныя намінацыі з канкрэтна-прадметным значэннем, так і дзеяслоўныя назвы, якія абазначаюць фізічнае дзеянне: выраз *рыбка да гаці* мае значэнне ‘госці ў хату’; *кветка цвіцець зімой і ўлетку* – ‘прыгожая маладая дзяўчына, нявеста’; *асыпаецца сад* – ‘прыходзіць пара сталасці, пара выходзіць замуж’; *новы двор* – ‘хата жаніха’; *прыехаць па кветку* – ‘прыехаць у сваты’ і г. д.

Алегарычнае апісанне, як і песенная сімволіка, актыўна суправаджаецца вобразным паралелізмам, які падкрэслівае, узмацняе, а ў некаторых выпадках тлумачыць алегарычны сэнс апісваемых падзей або дзеянняў: *Жыта ў полі людзі засявалі. Ну, а маці з сваім сынам Ціха размаўлялі* (в. Востранка, Жытк. – ВнГ, с. 261) (*засяваць жыта* – ‘рыхтавацца да вяселля, выбіраць нявесту’); *Жыта ў полі, жыта ў полі, Жыта ўсе пажалі, А ў нашым у сяле Вяселле гулялі* (в. Людзяневічы, Жытк. – ВТГ, с. 216) – (*пажаць жыта* – ‘завяршыць вяселле’); *Сейся, авёс ранні, Прыбывай, родзе слаўны* (в. Пянчын, Б.-Каш. – ВнГ, с.88) (*выспяванне аўсу* – ‘павелічэнне сям’і, працяг роду’); *Наш хлеб – ваша вадзіца, Наш хлопец – ваша дзявіца* (в. Агароднікі, Калінк. – ВнГ, с. 265) (*хлеб ды вада* – ‘саюз, злучэнне’); *Не наступай, Літва, Бо будзе ў нас бітва, Будом біці да воёваці, Да свое Галонькі не оддаваці* (г.п. Тураў – ВнГ, с. 250) (*бітва* – ‘патрабаванне выкупу за нявесту’). Як паказваюць прыклады, у якасці алегарычных выкарыстоўваюцца назвы паўсядзённых, агульнаўжывальных рэалій тыпу *хлеб, вада* або спрадвечных дзеянняў хлебароба: *засяваць, жаць* і да т. п. Сумяшчэнне алегарычнага і прамога выказванняў, асабліва пры вобразным паралелізме, узмацняе выяўленча-выразныя магчымасці алегорыі.

У кантэксце вясельнай песні даволі часта сустракаюцца алегарычныя назвы маладых, галоўных персанажаў вясельнай цырымоніі: *сокал, саколка, баярачка, голуб, галубка, лебедзь, лебядзінка, князь, княгіня, кароль, каралеўна,* якія надаюць галоўным персанажам вясельнай цырымоніі велічны, узнёслы характар: *Ляціць сокал з саколкаю. А то не сокал, то Ванечка, А соколочка – Ганночка* (в. Барталамееўка, Ветк. – ВнГ, с. 108); *Выйдзі, мамачка, на парог паглядай, А што мы цябе прывезлі. Прывязлі пярыну І маладую княгіню* (в. Раманаў лес, Ветк. – ВнГ, с. 117); *Молодзенькі Колечка Прывёз сабе дай баярочку, Да паставіў на ганочку* (в. Пухавічы, Жытк. – ВнГ, с. 239).

Узмацняе метафарычнае гучанне паэтычнага кантэксту вясельнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

песні Гомельшчыны гіпербала – наўмыснае перабольшванне пэўных уласцівасцей чалавека, прадмета ці з'явы з мэтай узмацнення выразнасці выказвання. Пры гэтым значна перабольшваюцца аб'ём рэаліі: *Расці, каравай, расці Вышэй стаўба медзянога, Вышэй жаніха маладога* (в. Сямурадцы, Жытк. – ВнГ, с. 217); памер прадмета: *А ў нашай печы – шырокія плечы: Учатырох можна легці – каравай сцярэгці* (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 45); яго састаўныя часткі: *А ў нашым караваі Ад сарака кароў масла Да яец паўтараста* (в. Рэчкі, Ветк. – ВнГ, с. 102); колькасць асоб: *Не багато нас наехало: Семсот сватоў, акрамя братоў* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 172); фізіялагічныя ўласцівасці асоб: *Коровайніцы едкі Да цэлого да вола з'елі, До столу да качаючы, Да ў солі да мочаюць. На столе да ні крошачкі, Под столом да ні косточкі* (в. Рычоў, Жытк. – ВТГ, с. 176); або іх стан: *Хвартушок тоненькі, Слёзак поўненькі* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с.167); *Я крынічку знайшла, Зачарпнула поўвядра, Пакуль да хаты прыйшла, Той слязьмі даліла* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 167); *Коскамі зямельку ўсцялю, Слёзкамі ножачкі абаллю* (в. Жгунь, Добр. – ВТГ, с. 98).

Як відаць з прыкладаў, гіпербалізуюцца назвы рытуальных прадметаў і рэалій: *каравай, печ*, а таксама дзеянні важных ўдзельнікаў вясельнай абраднасці: *свата, свахі, жаніха, нявесты* і інш.

У гіпербалічных вясельных формулах даволі часта галоўным удзельнікам шлюбнай цырымоніі прыпісваюцца пэўныя негатыўныя, заганныя якасці і рысы, наўмыснае перабольшванне якіх стварае камічны эфект і павышае жартаўлівы характар апісання. У такіх радках высмейваюцца сваты: *У нашага свата Цёмная хата, Ні вокан, ні дзвярэй І жыве небагата* (в. Барталамееўка, Ветк. – ВнГ, с. 111); *А ў нашага свата Галава кашлата, Ні дроў, ні палена, Гразі па калена* (в. Дуброўскае, Браг. – ВТГ, с. 26); *У нашага свата З лазы, вярбы хата, Ані клеці, ні павеці, Недзе скрыні дзеці* (в. Лубенікі, Браг. – ВТГ, с. 34); *Нашы сваткі горды, казіныя морды, Сядзяць па застоллю – як совы па коллю* (г. Добруш – ВнГ, с. 173); распарадчык на вяселлі: *А ў маршалка барада, як лапата, Шапка цяляча, шубка свіняча, А чаботы ды авечыя. Шапка рыкнула, шубка віскнула, А чаботы ды бекалі* (в. Малешаў, Жытк. – ВТГ, с. 221); малады: *А нашы княжа лупаты Да пабег круга хаты, З вялікаю да ламакаю, За чорнаю да сабакаю* (в. Шкураты, Браг. – ВнГ, с. 47); маладая: *Паглядзі, свякруха, у куток, сядзіць нявестка, як мяшок* (в. Ратміравічы, Акц. – ВнГ, с. 20); *Паглядзі, свякруха, на паліцу, Сядзіць нявестка з рукавіцу* (в. Міхнаўка, Браг. – ВнГ, с. 41); дружкі: *Галодзен, дзядзя, галодзен, З галоднай стараны, За сабою нося сухары, У памыйніцу макае І*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нежваныя глатае (в. Барталамееўка, Ветк. – ВнГ, с. 110); госці: *Хваліліся нудзічаня, Што коняй багата. Яны самі пяшком ішлі, Маладога ў мяшку няслі. Вох, ногі тырчалі, Сабакі гырчалі* (в. Нудзічы, Браг. – ВнГ, с. 53) і інш.

Такім чынам, паэтычны кантэкст вясельна-абрадавай песні Гомельшчыны, у якім актыўна выкарыстоўваецца вобразна-пераноснае словаўжыванне, вызначаецца асаблівым, метафарычным адлюстраваннем важнейшых падзей шлюбнай цырымоніі, што ў значнай ступені ўзмацняе выяўленча-выразныя магчымасці народнага слова і павышае яго вобразны патэнцыял.

1.1.3.3 Моўныя сродкі наглядна-вобразнай канкрэтызацыі: эпітэт і параўнанне ў вясельных песнях Гомельшчыны

Адметнай асаблівасцю народна-песеннай творчасці з'яўляецца яе прыўзнята-лірычны настрой, глыбокая эмацыянальнасць і яскравая выяўленчая выразнасць. Знешне нескладаная, простая, звычайная мова народнай песні дакладна перадае задушэўныя перажыванні галоўных герояў, іх шчымлівае пачуццё, сардэчнасць і непасрэднасць. Простыя і шчырыя словы песні ідуць ад сэрца і моцна кранаюць за душу. Невыпадкова песенную народную творчасць называюць вышэйшым узроўнем развіцця вуснага слоўнага мастацтва, які характарызуе "незвычайна высокае паэтычнае майстэрства народных песнятворцаў, іх зайздроснае ўменне карыстацца сэнсавымі, вобразна-выяўленчымі і інтанацыйна-эўфанічнымі магчымасцямі роднай мовы" [1, с. 3].

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляецца вясельна-абрадавая песенная творчасць Гомельшчыны, мэтай – апісанне эпітэта як моўнага сродку мастацка-вобразнай канкрэтызацыі паэтычнага кантэксту.

Выяўленчая выразнасць вясельна-песеннай традыцыі ў значнай ступені абумоўлена нагляднасцю адлюстравання аб'ектыўнай рэчаіснасці і яе вобразнай канкрэтызацыяй.

Адным з самых пашыраных сродкаў мастацка-вобразнай канкрэтызацыі ў вясельных песнях Гомельшчыны з'яўляецца *эпітэт* – вобразнае азначэнне прадмета або з'явы, якое можна аднесці да ўстойлівых моўных формул вуснай народнай творчасці. Як адзначаюць даследчыкі вуснай народна-паэтычнай творчасці, "у традыцыйнай народнай лірыцы, асабліва ў абрадавай як найбольш старажытнай, бадай што кожны прадмет ці з'ява характарызуецца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якім-небудзь эпітэтам. У гэтым трэба бачыць праяўленне адной з важных асаблівасцей народнай эстэтыкі – імкненне да канкрэтнасці пачуццёвага ўспрыняцця, да пэўнасці і дакладнасці вызначэнняў” [1, с. 14–15].

Эпітэты паводле сваіх лексіка-семантычных, структурна-граматычных і стылістычных асаблівасцей утвараюць розныя групы. Адной з найбольш вядомых класіфікацый фальклорных эпітэтаў з’яўляецца падзел іх А. М. Весялоўскім на таўталагічныя, паясняльныя і метафарычныя [4, с. 59]. Адзначаныя тыпы эпітэтаў сустракаюцца і ў вясельных песнях Гомельшчыны.

Таўталагічныя эпітэты называюць якасць або ўласцівасць прадмета, якая не патрабуе дадатковай характарыстыкі, паколькі яе сэнс вынікае з семантыкі азначаемага слова: *салодкі мядочак, горкая гарэлка, цёмная ночэнька, ясны месяц, белы дзень*: *Прапіў бацька дачку. На* <u>*салодкім мядочку*</u>*, На* <u>*горкай гарэлцы*</u>*, На белай паперцы* (ВТГ, с. 157); *Штобы не стояло* <u>*цёмное ночэнькі*</u> *под окном* (ВТГ, 178); *Адкрый акенца і паглядзі, Ці* <u>*ясны месяц*</u> *на зары* (ВТГ, с. 104); *А ўжо на двары* <u>*белы дзень*</u>*, Ды свякруха цябе ўжо даўно ждзе* (ВТГ, с. 120).

Асаблівую выразнасць набываюць таўталагічныя эпітэты, выражаныя аднакаранёвымі словамі: *Прыйдзі, мой татка, У госцейкі ка мне, А як мне прывыкаці У* <u>*чужой чужыне*</u> (ВТГ, с. 95); <u>*Маладзіцы маладыя*</u>*,* <u>*маладзіцы маладыя*</u>*, Ці добрыя мужыкі, ці ліхія?* (ВТГ, с. 263); *Ой, будзем ехаць* <u>*борам баравым*</u>*,* <u>*Борам баравым*</u>*, чарнабыллем самым* (ВТГ, с. 272). Плеанастычны характар падобных эпітэтаў не стварае моўную збыткоўнасць, а садзейнічае ўзмацненню семантыкі каранёвай марфемы і павышэнню выяўленчай выразнасці.

Выключная большасць эпітэтаў у вясельных песнях Гомельшчыны з’яўляюцца паясняльнымі, якія называюць істотную, найбольш характэрную, адметную якасць прадмета: *чорны воран, быстрая рэчка, зялёная рошча, шэрыя волкі, торная дарожка, жоўты пясочак*: *На каліне* <u>*чорны воран*</u> *крача, крача, А на чужбіне сіраціна плача* (ВТГ, с. 35); *Цячэ* <u>*рэчка*</u>*, цячэ* <u>*быстрая*</u>*, скочу, пераскочу* (ВТГ, с. 38); *Не пайшла я дамоў, Да сустрэла трох ваўкоў. Ой, вы волкі, мае* <u>*волкі шэрыя*</u> (ВТГ, с. 82); *Расступіцеся, падружкі, З мае* <u>*торныя дарожкі*</u> (ВТГ, с. 95); *Абарваў ёй лісточак, Да на* <u>*жоўты пясочак*</u> (ВТГ, с. 23) або характарызуюць аб’ект атрыбутызацыі паводле пажаданага ідэалу [4, с. 59]: *залато вядзерца, пазалочаны крылушкі, залатая грыва, шаўковыя ручнікі*: *Там дзяўчына воду набірала, Ды ўтапіла* <u>*залато вядзерца*</u> (ВТГ, с. 54); *В нашай чырачке* <u>*Пазалочэны крылушкі*</u> (ВТГ, с. 128); <u>*Шаўковыя*</u> <u>(ручнікі)</u> *наляжаліся* (ВТГ, с. 138)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і інш. Таўталагічныя і паясняльныя эпітэты, якія з'яўляюцца ў народна-паэтычнай творчасці традыцыйнымі, называюць таксама сталымі або ўстойлівымі [1, с. 23–24]. Да такіх эпітэтаў у вясельных песнях Гомельшчыны можна аднесці *сіне мора, красна дзявіца, русая каса, вараны конь, серы селезень, дробны дождж, шэрая зязюля* і інш.: *Цераз сіне мора ляжыць кладачка ялова* (ВТГ, с. 75); *Сам паеду да краснай дзявіцы* (ВТГ, с. 79); *І з кім мая нявеста гуляе, Русаю касою махае* (ВТГ, с. 43); *Што з гары, гары крутыя Беглі конікі вараныя* (ВТГ, с. 70); *Із-пад новага млына Сера вутайка плыла. А за ёю серы селезень* (ВТГ, с. 199); *Под явором дробны дождж ідзе* (ВТГ, с. 185); *Да прыляцела шэрая зязюля з ялаўца* (ВТГ, с.180). Пастаянныя эпітэты абагульняюць, такім чынам, неабходную або пажаданую прыкмету прадмета, паўтараючы яе і набываючы характар прэцэдэнтнасці выкарыстання, па гэтай прычыне іх можна назваць формуламі-прэцэдэнтамі. Як вобразна адзначыў А. М. Весялоўскі, "эпітэты халадзеюць", г.зн. з часам страчваюць сваю вобразнасць і становяцца звыклымі, устойлівымі моўнымі адзінкамі.

Метафарычныя эпітэты абазначаюць якасць прадмета, перанесеную з іншага прадмета на аснове знешняга або ўнутранага падабенства: *кучаравы дуб, госценькі сярэбраныя, залатыя ручкі, галосныя званы, маладое адзенне*: *Ой, у полі пры даліне кучаравы дуб стаяў* (ВТГ, с. 22); *Госценькі дарагія, Сярэбраныя, залатыя ..* (ВТГ, с. 140); *А ў нашае дружкі залатыя ручкі* (ВТГ, с. 221); *Ужо тваё дзіцятка звянчалі Пад галоснымі званамі, Пад яснымі свячамі* (ВТГ, с. 251); *А ўжо новая мамка з векам ідзе, Маладое адзенне на веку нясе* (ВТГ, с. 85). Эпітэт-метафара прадугледжвае паралелізм уражанняў, вызначаецца фізіялагічным сінкрэтызмам, асацыяцыяй пачуццёвых успрыняццяў [4, с. 62].

Некаторыя эпітэты, якія надаюць вобразную характарыстыку прадмету, заснаваны, на наш погляд, на метанімічным пераносе паводле прасторавай або лагічнай сумежнасці: *мядовая чарачка* 'чарачка з мёдам' (змесціва → посуд), *шчаслівае месца* (якасць → рэалія), *чара залатая* (рэчыва → выраб з яго): *Сцяліце кажух – я сяду У шчаслівым месце на куце* (ВТГ, с. 39); *Аддае цябе мамачка, Бярэ чару залатую* (ВТГ, с. 214); *зязюля баравая, ёлка баравая* (месца → істота, якая там абітае або расліна, што там расце): *Баравая зязюленька раненька куе* (ВТГ, с. 244); *Ёлка, ёлка барава, Ты ў бары расла* (ВТГ, с. 104) .

Устойлівымі вобразнымі азначэннямі ў вясельных песнях надзяляюцца амаль усе з'явы аб'ектыўнай рэчаіснасці, якія акаляюць чалавека: прырода, асобы, прадметы, таму эпітэты надзвычай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разнастайныя паводле сваёй лексіка-тэматычнай прыналежнасці. Паэтызуючы ўсё, што ўспрымалася стваральнікамі народных песен, яны адлюстроўвалі светасузіранне народа, яго адносіны да прыроды і грамадства. Найчасцей эпітэты вобразна характарызуюць разнастайныя прыродныя з'явы, у тым ліку нябесныя целы: *Адкрый акенца і паглядзі, Ці ясны месяц на зары* (ВТГ, с. 104); *Зоры мае, ясненькія, Не стухайце вы рана* (ВТГ, с. 66); зямную паверхню: *Зямліца сырая, сырая, За што маю мамачку забрала?* (ВТГ, с. 25); *А ў барку, барку, На жоўтым пяску, Там стаяў явар тонкі, высокі* (ВТГ, с. 72); водныя прасторы: *А дзева там плачет Над быстрой рэкой* (ВТГ, с. 131); *Сіне морачка глыбока, Дай не відна в море дна* (ВТГ, с. 252); поры года: *Да к сцюдзёнай зіме плацце прасці* (ВТГ, с. 211); кліматычныя ўмовы: *Маё дзіця ў дарозе, Дай на лютым марозе* (ВТГ, с. 61); адрэзкі сутак: *А ўжо на двары белы дзень* (ВТГ, с. 120); *Вон не боіцца цёмное ночы* (ВТГ, с. 205); ападкі: *Под явором дробны дождж ідзе* (ВТГ, с. 185); аб'екты рэльефу: *Каля цесцева двара Там вялікая гара* (ВТГ, с. 219); *І ў чыстым полі таполяю стала* (ВТГ, с. 292).

Даволі часта эпітэты ў вясельных песнях вобразна характарызуюць рэаліі расліннага свету, і гэта звязана з выражэннем расліннага коду шлюбнай абраднасці, адлюстраваннем вясельнай сімволікі. Аб'ектамі вобразнага азначэння становяцца намінацыі дрэў: *явар, каліна, ёлка, хвоя, дуб, бяроза, вішня, яблыня, груша*: *Пад тым дубам зеляненькім хлопец з дзеўкаю гуляў* (ВТГ, с. 22); *Чырвона, чырвона да каліна ў лузе* (ВТГ, с. 151); *У садзе вішня чырвона* (ВТГ, с. 152); травяністых раслін і кветак: *рута, мята, ружа, чарнабрыўцы*: *Ой, рута мая, дробна зелена* (ВТГ, с. 75); зборных сукупнасцей дрэў: *бор, барок, рошча, сад, дуброва, лес, бярэзнік, гай*: *Ехалі сваты міма гая зялёнага* (ВТГ, с. 22); *Ай, не шум шуміць, А зялёная дуброўка* (ВТГ, с. 52); *Абазваўся да Ванечка з зялёнага саду* (ВТГ, с. 85); *Годзі каліне, годзі маліне, у цёмным лесе стаяці* (ВТГ, с. 87); *З-под белага да бярэзнічку Сівы конік да выбягае* (ВТГ, с. 184).

Эпітэты характарызуюць таксама прадстаўнікоў жывёльнага свету: *Заседлаю каня варанога* (ВТГ, с. 79); *Сівых коней на двор вярні* (ВТГ, с. 169); птушак: *Заручае мяне мамка, маладую, Ой, да зязюлю лугавую* (ВТГ, с. 61); *Чаму, салавейка, смуцён, невясёл*? (ВТГ, с. 64); *Пойце вы, птушкі пеўчыя, У садзе і вадзе* (ВТГ, с. 139); *Сівыя сокалы паляцелі, За столом поселі* (ВТГ, с. 168); *Накажу на радзіну сізым галубочкам* (ВТГ, с. 248). Як правіла, устойлівыя песенныя формулы з эпітэтам, у складзе якіх назвы рэалій прыроднага, жывёльнага і расліннага свету, выкарыстоўваюцца як вобразны паралелізм пры абмалёўцы галоўных дзеючых персанажаў вясельнай абраднасці,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выконваючы ролю як мужчынскіх (*месяц, явар, дуб, сокал, салавей, галубок*), так і жаночых (*зорка, вішня, таполя, ружа, зязюля, вутка*) вобразаў.

Эпітэты ў вясельных песнях характарызуюць таксама асоб, адзначаючы іх знешні выгляд: *У нашого молодого чорные очы* (ВТГ, с. 205); *А мой мілы чарнабрывы* (ВТГ, с. 213); *Да ў дарожку шчаслівую Па Танечку красівую* (ВТГ, с. 251); узрост: *Маладыя сватачкі заспявалі* (ВТГ, с. 50); паводзіны: *Цэловаў мое лічэнько Бравы козачыку* (ВТГ, с. 261); *Нізкія паклоны ў цэркаўцы* (ВТГ, с. 128); характар: *Первое гора – дзеціна малая, А другое – свякруха ліхая* (ВТГ, с. 249); эмоцыі: *Ой, молодая дзевонько, Да чаму ж ты не весёлая?* (ВТГ, с. 208); фізіялагічны стан: *Сасніўся мне сон дзіўненькі* (ВТГ, с. 168); *Санлівая, драмлівая нявестка мая* (ВТГ, с. 44).

Суправаджаюцца вобразнай характарыстыкай ў вясельных песнях і канкрэтныя прадметы: назвы пабудоў і іх частак: *Сені мае новенькія на памосце* (ВТГ, с. 39) ; *Сваха з свахаю цалуюцца, Да на сенечным парозі* (ВТГ, с. 114); *А ў нашага свата Да харошая хата* (ВТГ, с. 147); прылады працы: *Ох, дзе ж тыя кавалі, Што стальныя тапары!* (ВТГ, с. 105); назвы адзення і галаўных убораў: *Там пасціла Ганночка гусі .. ў белым кажусі* (ВТГ, с. 68); *Завяжу галовачку сінім платочкам* (ВТГ, с. 248); пасцельных прыналежнасцей: *Што табе баяры прывязлі: І адыяло, і белую пярыну, І яшчэ маладую дзяўчыну* (ВТГ, с. 122); ежы і прадуктаў харчавання: *Там нас чостовалі Куркамі печонымі, Гускамі смажонымі* (ВТГ, с. 165); *Заехаў зяць на цесцеў двор, .. Разліў віно зялёнае* (ВТГ, с. 172); мэблі: *Ды стаіць столік дубовы .. А што на тым століку?* (ВТГ, с. 124); *Дай посадзім, посадзім на новой кроваці* (ВТГ, с. 205).

Семантычны спектр атрыбутыўна-вобразнай характарыстыкі асоб і прадметаў ў вясельных песнях Гомельшчыны даволі шырокі. Найчасцей эпітэты называюць колер прадмета або рэаліі, масць жывёлы: *зялёны гай, зялёная дуброўка, белы кажух, жоўты пясок, зялёная рошча, воўкі шэрыя, бела пасцеля, чорны конь, белая пярына, белы лён, сівы сокал, шэрая зязюля, сіне мора, сіні платочак, чырвона каліна.* Перавага ў гэтай колеравай гаме зялёнага, белага і чырвонага колераў тлумачыцца вясельнай сімволікай: зялёны колер сімвалізуе маладосць, жыццёвую моц, росквіт фізічнай і духоўнай сілы, белы – адлюстроўвае нявіннасць і чысціню, чырвоны (красны) паказвае прыгажосць, знешняе хараство.

Унутраную якасць прадмета або з'явы называюць метафарычныя эпітэты тыпу *снеданне дарагое* 'якое мае асаблівае, рытуальнае значэнне', *залатыя рукі* 'умелыя, спрытныя рукі', *маладое адзенне*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

‘новае адзенне’, *святы дзень* ‘урачысты дзень’.

Адносіны да асобы або пэўнай з’явы і іх ацэнку характарызуюць наступныя эпітэты: *вернаму другу*; *госценькі дарагія*, *сярэбраныя, залатыя*; *людзі добрыя*; *чужая старонка.* Даволі часта эпітэты называюць матэрыял, з якога выраблены прадмет: *кладачка цясова*, *пуховы падушкі*, *мосты жалезныя*, *ручнікі шаўковыя*, *хата дубова*, *тапары стальныя, вежа муравана,* месца абітання рэаліі: *салавейка садовы*, *баравая зязюленька*, *баравая ёлка*.

Асаблівай частотнасцю ў вясельных песнях Гомельшчыны вызначаецца эпітэт *залаты*, які характарызуе прадметы або асобы паводле іх дасканаласці ці мастацкай ідэалізацыі: *залато вядзерка*, *ножык залаценькі*, *золотыя тарэлкі*, *залато вядзерца*, *золотые стоўпы*, *чара залатая*, *залатая грыва*, *залатая клетка*, *золоты нож*; *золотые госці*, *золотые ручкі.*

Эпітэт у вясельных песнях, як правіла, выражаецца прыметнікамі – якаснымі: *красная паненка*, *гара крутая*, *явар тонкі*, *торная дарожка*, *вада халадна*, адноснымі: *сярэбраныя госці*, *калінавы вяночак*, *бярозавы сенечкі*, зрэдку прыналежнымі: *дзявоцкія прыборы*, *дзявочы век*, *цесцеў двор*, формамі ступеней параўнання*: Алесечка найпрыгажэйшая, сірата сірацее, паўнесенькая хата.* Выступаюць ў ролі эпітэта і дзеепрыметнікі, як правіла, ад’ектываваныя: *печ пабялёная*, *печ малёваная*, *чэсць пахвалёная*, *крылушкі пазалочэны*, *куркі печоныя*, *гускі смажоныя*, *вежа муравана*, *таптаная сцежачка*. Эпітэты ў вясельных песнях Гомельшчыны найчасцей з’яўляюцца простымі: *каліна чырвоная, далёкая старонушка, зялёны явор* і мн. інш., зрэдку сустракаюцца састаўныя эпітэты: *Ой, рута мая, дробна зелена* (ВТГ, с. 75); *Чаму, салавейка, смуцён, невясёл*? (ВТГ, с. 64); *Санлівая*, *драмлівая нявестка мая* (ВТГ, с. 44).

Ролю вобразнага азначэння прадметаў у вясельных песнях выконваюць таксама назоўнікі-прыдаткі, якія выражаюць гіпера-гіпанімічныя адносіны з паясняльнымі словамі: *ружа-кветка, шчука-рыба* або іх атрыбутыўную характарыстыку: *дарога-таптанка, траўка-мураўка, краса-дзявіца*.

Даволі значная колькасць эпітэтаў у вясельных песнях Гомельшчыны выражана кароткімі формамі прыметнікаў, якія надаюць азначэнню лаканічнасць і асаблівую выразнасць: *салавейка невясёл*, *кладачка ялова*, *рута зелена*, *бел пасцеля*, *хвоя зелена*, *чэсць кахана*, *вішня чырвона*, *сера вутайка*, *бела цела*, *дзеўка чарнаброва*.

Экспрэсіўны патэнцыял вобразнага азначэння ў вясельных песнях узмацняюць формы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі, якія надаюць паэтычнаму маўленню асаблівую напеўнасць, ласкальнасць і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

замілаванне: *пад дубам зеляненькім, сені новенькія, зоры ясненькія, ножык залаценькі, у чысценьком полі, госценькі дарагія, на салодкім мядочку, сон дзіўненькі, белая берёзонька, сіне морачка, бітая дарожачка, маршалочкі молодые*. Павышэнню выразнасці ўстойлівых моўных формул з эпітэтам у вясельных песнях садзейнічае таксама інверсійны парадак слоў у атрыбутыўных словазлучэннях, які акцэнтуе ўвагу на інверсаваным азначэнні: *Ехалі сваты міма гая зялёнага* (ВТГ, с. 22); *Пад тым дубам зеляненькім хлопец з дзеўкаю гуляў* (ВТГ, с. 22); *Зямліца сырая, сырая, За што маю мамачку забрала?* (ВТГ, с. 25); *На каліне чорны воран крача, крача* (ВТГ, с. 35); *Што з гары, гары крутыя Беглі конікі вараныя* (ВТГ, с. 70).

Такім чынам, эпітэт ў вясельных песнях Гомельшчыны дазваляе дакладна і ўсебакова ахарактарызаваць прадмет, з'яву або чалавека, стварае бачнасць і жывасць выяўлення, надае апісваемым прадметам і з'явам канкрэтнасць, індывідуалізуе іх, адзначае істотныя індывідуальныя якасці і ўласцівасці і такім чынам узбагачае выяўленча-выразныя магчымасці паэтычнага апісання.

Значна радзей у аналізуемых песнях сустракаюцца параўнанні, якія прыпадабняюць адзін прадмет да другога на аснове іх агульнай прыкметы з мэтай узмацнення выразнасці яго характарыстыкі. Параўнанні часцей за ўсё падкрэсліваюць якасці дзеючых асоб, супастаўляючы іх з прыроднымі з'явамі або прадстаўнікамі жывёльнага свету: *Стаяць хлопцы, як сонца* (в. Радуга, Ветк. – В., с. 231); *Хадзіла яна, як пава, Хадзіла яна, як пава, Радзіла й Ванечку, як пана* (в. Казацкія Балсуны, Ветк. – В., с. 271); праводзяць аналогію з канкрэтнымі рэаліямі: *Першая дружка – стужка, Другая дружка – каробочка, Трэцяя – скалазубка* (в. Лескі, Акц. – ВТГ, с. 23); *У цябе ж сядзяць* (хлопцы) *пад бокам, Так, як порах у воку* (в. Радуга, Ветк. – В., с. 231); *Жыцечка, як дроб, Слёзы, як боб, Горка мая доля* (в. Свяцілавічы, Ветк. – В., с. 229).

Выкарыстоўваюцца ў вясельных песнях і адмоўныя параўнанні, якія выразна характарызуюць перажыванні нявесты ў сувязі з ад'ездам з роднага дому: *Чужадальняя старонка Не мядом паліта, Не сахарам пасыпана, Слязамі заліта* (в. Шарсцін, Ветк. – В., с. 252).

Даволі часта ў вясельных песнях сустракаюцца разгорнутыя мастацкія параўнанні, т.зв. вобразны, псіхалагічны паралелізм, заснаваны на супастаўленні пэўнага дзеяння, стану або якасці чалавека са з'явамі прыроды, рэаліямі жывёльнага і расліннага свету. Вобразны паралелізм дапамагае больш поўна і дакладна перадаць унутраны стан галоўных герояў, характар іх перажыванняў, пачуццяў і эмоцый: *Зялёны садочак красуе, Маладой браточак бядуе: – Аддаю*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сястрычку, аддаю, Хто маю кароўку папасе, Ды хто ж мне вадзіцы прынясе (в. Радуга, Ветк. – В., с. 230); *Ляцелі галачкі ў тры радочкі, Зязюля папяроду .. Ай, шлі дзевачкі ў тры радочкі, Манечка паперад* (в. Стаўбун, Ветк. – В., с. 240); *Твая вада не смачная, Пайду да крыніцы, Твая дачка няўдалая, Пайду да ўдавіцы* (в. Барталамееўка, Ветк. – В., с. 239); *Стаіць ябланька Ды раскапусціўшы, Ды і некаму зазірнуці. Сядзіць Манечка, Ды расплакаўшы, Ды і некаму яе ўняці* (г. Ветка – В., с. 256).

Актыўна ўдзельнічаюць у стварэнні экспрэсіўнасці вясельнай песні і сінтаксічныя сродкі слоўнай вобразнасці. Так, асаблівы, напеўна-размоўны характар надаюць вясельным песням шматлікія звароты да дзеючых асоб: *Збярыцеся, дзевачкі, у суботачку* (в. Радуга, Ветк. – В., с. 230); *Выйдзі, мамачка, паглядзі, Што мы табе прывязлі* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 234); *Давай, донька, павячэраем* (в. Барталамееўка, Ветк. – В., с. 239); прадметаў: *Лучына, лучына бярозавая! Што ж ты, лучына, Не ясна гарыш?* (в. Шарсцін, Ветк. – В., с. 249); *З-пад вас, мае сені, З-пад вас, мае сені, Ручай працякае* (г. Ветка – В., с. 254), прадстаўнікоў жывёльнага свету: *Ой, коні мае, коні вараные* ; *Ой, гыля, гыля, вы, серыя гусі* (в. Неглюбка, Ветк. – В., с. 277); *Гуляй, гуляй, белая рыба Па сіняму мору* (в. Свяцілавічы, Ветк. – В., с. 229).

Выразную дынаміку, непасрэдны характар жывой размовы надаюць вясельнай песні дыялогі і простая мова персанажаў, умела ўплеценыя ў канву паэтычнага апавядання: *Стукнулі-грукнулі ва дварэ: – Паглядзі, мая мамачка, ці не па мяне. – Па цябе, мая донечка, па цябе* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 234); *– Што ты, Ніначка, Не заплачаш? Сваю мамачку не разжаліш? – Я ж плакала й галасіла, Сваю мамку не разжаліла* (в. Перадавец, Ветк. – В., с. 266); *Вячэру варыла і ўсё гаварыла: Няма маёй дочкі, Вячэра не трэба* (в. Перадавец, Ветк. – В., с. 268); *Падыйшоў да яе Іванка: – Чаго ты плачаш? Ці табе жалка маткі старэя, Ці бацькава падвор'е? – Не жалка мне бацькі старога, Толькі жалка мне русае касы Да дзявоцкае красы* (в. Акшынка, Ветк. – В., с. 283).

1.1.3.4 Паўторная намінацыя і яе стылістычная функцыя ў вясельных песнях Гомельшчыны

Выразную экспрэсіўную ролю ў вясельна-песеннай традыцыі выконваюць разнастайныя паўторы. Даследчыкі вуснай народнай творчасці адзначаюць: "Паўтор – гэта адзін з найбольш шырока

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

распаўсюджаных прыёмаў у фальклорнай традыцыі. Ён сустракаецца ў розных жанрах, разнастайных творах і самых розных тэкстах, выконваючы пры гэтым разнародныя функцыі” [5, с. 5].

Паўторы ў фальклорных тэкстах выконваюць дзве функцыі – структурную, *тэкстаўтваральную*, калі яны фарміруюць кампазіцыю твора, выконваюць ролю структурнай арганізацыі тэксту, з’яўляюцца важнейшым моўным сродкам звязнасці яго асобных фрагментаў, і *выяўленча-выразную*, вобразную функцыю, калі садзейнічаюць актуалізацыі значэння паўтораных моўных элементаў, лагічнаму выдзяленню і ўзмацненню іх сэнсу, семантычнаму разгортванню канцэптуальнага зместу тэксту, з аднаго боку, і рыфма- і рытміка-інтанацыйнага афармлення маўлення, стварэнню напеўнасці і меладычнасці і, як вынік, – павышэнню яго эўфаніі. Першая функцыя больш поўна рэалізуецца ў празаічных фальклорных жанрах, такіх, як казкі, замовы, паданні, легенды, другая – больш характэрная для народнапесеннай, паэтычнай традыцыі.

Высокую ступень экспрэсіўнасці і выяўленчай выразнасці ў песнях маюць шматлікія паўторы, якія садзейнічаюць лагічнаму выдзяленню, падкрэсліванню значэння паўтораных слоў, семантычнаму разгортванню канцэптуальнага зместу тэксту, сувязі яго асобных фрагментаў. Паўтарацца могуць асобныя словы: *Выкацілі, выкацілі Дубовую бочку, Выманілі, выманілі Ў свата-пана дочку* (в. Стаўбун, Ветк. – В., с. 242); *Прыйдзе, прыйдзе мой міленькі На пуховыя падушкі* (в. Стаўбун, Ветк. – В., с. 243); і словазлучэнні: *На том і ручаёчку, На том і ручаёчку Манячка гуляе, Манячка гуляе, Манячка гуляе, Бацюшку клікае* (г. Ветка – В., с. 254); *Мая рута-мята, Мая рута-мята, Пер’я ў падушкі, Пер’я ў падушкі, А Манячка ў служкі* (г. Ветка – В., с. 255).

Шырока выкарыстоўваецца ў вясельных песнях Гомельшчыны лексічны, або тоесны, поўны паўтор – паўтор адной і той жа намінатыўнай адзінкі, які садзейнічае лагічнаму выдзяленню асобных слоў, узмацненню іх сэнсавага напаўнення, падкрэсліванню значэння.

Кантактны лексічны паўтор стварае фігуру *падваення*. Часцей за ўсё ён выражаецца дзеясловамі і перадае працягласць дзеяння: *Ох, мы едам, едам Чорнага каня следам, І дзе ж мы пастанам, Там сваіх пазнаем* (в. Насовічы, Добр – ВТГ, с. 104); *Ехалі, ехалі, Загледзелі ў поле колоду. Там узялі посталі* (в. Сяменча, Жытк. – ВТГ, с. 357);

яго інтэнсіўнасць: *Той, хто хустачку дараваў, дараваў, Той яе і запіваў, запіваў* (в. Рэкта, Жлаб. – ВТГ, с. 152); *Выкоцілі, выкоцілі бочку медочку, Высваталі, высваталі ў пана-свата дочку* (в. Запясочча, Жытк. – ВТГ, с. 205);

паўтаральнасць: *Сватко гнецца, гнецца, Як лісіца ў лесе* (в. Санюкі,

Ельск. – ВТГ, с. 122);

рытуальную значнасць і важнасць: *Вечар цэлы касу дзеўкі плялі, плялі, Патом вілі. Вілі, вілі золатцэм, Жэмчуг утыкалі* (в. Насовічы, Добр. – ВАТГ, с. 107); *Запрагайце, запрагайце валы да цяліцы, Ой, уносьце, ой, уносьце каравай з святліцы* (в. Санюкі, Ельск. – ВТГ, с. 121); *Ідзе, ідзе Манечка на пасад, Крыкнулі, гікнулі на ўвесь сад* (в. Махнавічы, Маз. – ВТГ, с. 343); *Плыві, плыві, мая русая каса, Прайшла ўся мая дзявочая краса* (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 152).

Лексічны паўтор лагічна выдзяляе і актуалізуе семантыку акалічнаснага дэтэрмінанту – падкрэслівае час дзеяння: *Рано да рано, Штось у лесі говорыло .. Рано да рано У нашым дварэ вяселле* (в. Скароднае, Ельск. – ВТГ, с. 124);

месца дзеяння: *Полем, полем, краменцам, Звязалі свацейка палаценцам* (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 153); *З гары, з гары, з даліны Беглі конікі чатыры* (в. Бярозаўка, Карм. – ВТГ, с. 255);

ступень яго праяўлення: *А паднімем каравай Высока, высока, А паднясём яго далёка-далёка* (в. Антонаўка, Жлоб – ВТГ, с. 140).

Падваенне, выражанае прыметнікам, узмацняе пэўную знешнюю або ўнутраную якасць асобы або прадмета: *Наш князёк харошы, харошы, Дайце яму грошы* (в. Б Лельчыцкая, Лельч. – ВТГ, с. 267); *Чырвона, чырвона да каліна ў лузе, А Алесечка ў бацькі найпрыгажэйшая* (в. Рэкта, Жлоб. – ВТГ, с. 151); *Мое вочы чорные, чорные, чорные* (в. Лужок, Карм. – ВТГ, с. 262); *Зямліца* сырая, сырая, *За што маю мамачку забрала*? (в. Валосавічы, Акц. – ВТГ, с. 25).

Кантактны паўтор назоўніка акцэнтуе ўвагу на суб'екце або аб'екце дзеяння: *Чобаты, чобаты вы мае, Нарабілі клопату для мяне* (в. Насовічы, Добр. – ВТГ, с. 105).

Дыстантны лексічны паўтор не толькі лагічна выдзяляе, падкрэслівае значэнне паўтараемай лексемы, але і звязвае асобныя фрагметы тэксту: *Дымна ў полі, дымна Ды й нікого не відно* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 169); *Зялёны садочак, зялёны, Вакол рутай аплецёны* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 171).

Цікавым і даволі распаўсюджаным у вясельна-песеннай традыцыі Гомельшчыны відам паўтору з'яўляецца частковы, каранёвы, або *дэрывацыйны паўтор*, які садзейнічае сутыкненню ў тэксце аднакаранёвых слоў як адной, так і рознай часцінамоўнай прыналежнасці. Гэты паўтор называюць таксама таўталогіяй. Выкарыстанне ў агульным кантэксце аднакаранёвых лексічных адзінак актуалізуе іх значэнне, узмацняе сэнс, а таксама ажыўляе ўнутраную форму слова, што ў значнай ступені садзейнічае экспрэсівізацыі народна-паэтычнага маўлення. Часцей за ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паўтараюцца аднакаранёвыя словы, якія належаць да розных часцін мовы. Кантактнае размяшчэнне аднакаранёвых назоўніка і дзеяслова ўзмацняе характар названага дзеяння: *Ай, не шум шуміць, А зялёная дуброўка. Ай, баліць, баліць У мяне галоўка* (г.п. Брагін – ВТГ, с. 52); *Месяц узыходзіць, А зара зарыцца. Молода Волечка Ды й на воз садзіцца* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 169); *І дзе ж ты, хмелю, Зіму зімаваў, Што ж ні развіваўся? І дзе ж ты, сынку, Ночку начаваў, Што ж ні разуваўся?* (в. Рудня Барталамееўская, Чач. – ВТГ, с. 477); *Ехалі купцы ўсе не знатныя, Божа мой, Божа, Масцілі масты ўсе цярновыя, Божа мой, Божа* (в. Вадовічы, Калінк. – ВТГ, с. 243); *Падружкі мае, расступіцесь, Будзе мяне мая мамачка дарам дарыць* (в. Данілавічы, Ветк. – В., с. 233); *: Кукушечка, кукушечка кукавала, В саду на памосце* (в. Барталамееўка, Ветк. – В., с. 238).

Дыстантная пазіцыя аднакаранёвых назоўніка і дзеяслова падкрэслівае ўнутраную форму гэтых намінатыўных адзінак: *Мір з мірам да міруецца, Мір з мірам да міруецца. Сваха з свахаю цалуюцца, Да на лютым марозі, Да на сонечным парозі* (в. Падгалле, Ветк. – ВТГ, с. 114); *А паставім* (каравай) *на жыце, Каб добра жыць, Дай, Бог, маладым Добра жыццё пражыць* (в. Антонаўка, Жлоб. – ВТГ, 140); *Сястрыца-парадніца, Дый парадзь ты мне: Як цесця зваці, ваяваці, Як сабе Волечку ўзяці?* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 169); *Мы,сваты, з дарогі Памарозілі ногі. Па марозу хадзілі, Галасок загубілі* (в. Ніжні Млынок, Нараўл. – ВТГ, с. 361); *Некаму плацця праці. Пранічкам махнеш, Цяжэнька ўздыхнеш* (в. Азершчына, Рэч. – ВТГ, с. 382); *Жальніца, жальніца Танечка, Не разжаліла мамачку* (в. Шарсцін, Ветк. – В., с. 246).

Радзей назіраецца сутыкненне ў тэксце аднакаранёвых назоўніка і прыметніка: *Зборная суббота, Нядзельная нядзеля* (г. Ветка – В., с. 286); *Прыйдзі, мой татка, У госцейкі ка мне, А як мне прывыкаці У чужой чужыне* (в. Баршчоўка, Добр. – ВТГ, с. 95); *Маладзіцы маладыя, маладзіцы маладыя, Ці добрыя мужыкі, ці ліхія?* (в. Лужок, Карм. – ВТГ, с. 263); *Сірата я, сірата, сірацее меня нет, Якое плацце ні надзену, Ад таскі ліняет цвет* (в. Пабядзіцель, Ветк. – ВТГ, с. 305); *– Ой, будзем ехаць борам баравым, Борам баравым, чарнабыллем самым* (в. Шарсцін, Ветк. – В., с. 272);

назоўніка і назоўніка: *Выпляту я ўплёт з русых кос, Павешу я ўплёт на прыплёт* (в. Дуброўка, Браг. – ВТГ, с. 85); *Невялікая птушка-пташачка Шмат што знала, многа бачыла* (в. Шарсцін, Ветк. – В., с. 249).

Арыгінальнасць каранёвага паўтору праяўляецца і ў тым, што тут нярэдка прысутнічае аказіянальнае словаўтварэнне, якое ўзмацняе

ўнутраную форму слоў і надае ім асаблівую выяўленчую выразнасць: *міравацца* ‘мірыцца’, *зарыцца* ‘разгарацца (пра зару)’; *парадніца* ‘саветніца’; *чужына* ‘чужы край’; *сірацее* (параўнальная ступень ад сірочы) ‘круглая сірата’ і інш.

Частковы паўтор узмацняе гучанне паўтораных слоў, садзейніічае іх больш поўнаму сэнсаваму напаўненню.

Даволі часта ў вясельных песнях Гомельшчыны сустракаецца *анафара* – паўтор слова або групы слоў у пачатку некалькіх сумежных сказаў. Яна з’яўляецца важным сродкам інтэнсіфікацыі маўлення, павышае ступень экспрэсіўнасці моўных адзінак і прыводзіць звычайна да сінтаксічнага паралелізму.

Ёсць розныя віды анафары: гукавая, лексічная, строфная. У аналізуемых песнях найбольш распаўсюджанай з’яўляецца лексічная анафара – паўтор асобнай лексемы ў пачатку суседніх сказаў. Паўтораная лексічная адзінка можа адносіцца да любой часціны мовы:

дзеяслоўная метафара паказвае высокую ступень значнасці дзеяння або працэсу, перадае інтэнсіўнасць яго праяўлення: *Будзь багата, як зямля, Будзь бягуча, як вада, Будзь шчасліва, як зара* (Насовічы, Добр. – ВТГ, с. 106); *Стаіць грушачка, распусціўшыся, некаму падрэзаць. Стаіць Надзечка, расплакаўшыся, некаму сунімаць* (в. Цярэнічы, Гом. – ВТГ, с. 87);

субстантыўная анафара звяртае ўвагу на суб’ект або аб’ект дзеяння, які можа абазначацца як канкрэтным, так і адцягненым назоўнікам: *Печ наша рагоча, Печ наша рагоча, Печ наша рагоча, Чаго яна хоча ?* (в. Роза-Люксембург, Ельск. – ВТГ, с. 117);

займеннікавая анафара ўказвае на суб’ект дзеяння, яго асабістыя адносіны да падзей, можа выражаць абагуленае значэнне асобы: *Мой жа татачка, Мой жа родненькі, Што мне там гаварыць?* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб. – ВТГ, с. 137); *На парог ступаю І слова права маю. Мая рэч, мая печ, Мая лава, мая слава, Маё акно і мне відно* (в. Марозавічы, Б.-Каш. – ВТГ, с. 39);

адвербіяльная анафара ўзмацняе акалічнасны дэтэрмінант пры дзеяслове: *Родны ты мой брацік! Куды ты мяне абуваеш? Куды ты мяне адзяваеш?* (г. Жлобін – ВТГ, с. 156); *Каравай, расці, расці Вышай беленькай пячы, Вышай нашага забора, Вышай друга дарагога* (в. Кругавец, Добр. – ВнГ, с. 177); *Напрасна я розу садзіла, Напрасна яе зберагла* (в. Лубенікі, Браг.).

Даволі часта ў вясельных песнях анафаруюцца лексічныя адзінкі, выражаныя службовымі часцінамі мовы:

злучнікам: *І слышан чачот нагайкі, І гукаюць марша, І музычэнькі граюць, І самі спяваюць* (в. Рычоў, Жытк. – ВТГ, с. 175);

ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыназоўнікам: *Ой, што мы хацелі, Тое мы і зрабілі: З цеста – пеляніцу, З дзеўкі – маладзіцу, З добрага цеста – добра пеляніца, З добрае дзеўкі – добра маладзіца* (в. Насовічы, Добр. – ВТГ, с. 106);

часціцай: *Добры дзень, сястрыца, Ці жыва, здарова? Ці жыва, здарова, Ці добрая доля?* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 167);

выклічнікам: *Да й у чужом сяле, там людзі чутлівы, Асудзяці ўсю маю паходачку: Ой, як робіш, Ой, як ходзіш, Ой, як з людзьмі ты гаворыш* (в. Цярэнічы, Гом. – ВТГ, с. 86).

Нярэдка ў анафары спалучаюцца самастойныя і службовыя часціны мовы, што прыводзіць да поўнага структурнага паралелізму, які праяўляецца ў аднолькавай пабудове суседніх сказаў:

Вы, сваточкі-галубочкі, просім вас, Каб не было нашай дзевачке плоха ў вас, Каб не была на качарэжніку пасцеля, Каб не была ў дарожанькі вячэра .. Ай, каб была ў краватачкі пасцеля, Ай, каб была за столікам вячэра. Ай, каб была ваша комнатка хаткаю, Ай, каб была свякровачка маткаю (в. Сялец, Браг. – ВТГ, с. 41);

Дзякуй Богу, сына ажаніла, Ды й нявестку дачакала. Ды й не буду воду носіці, Ды й не буду хлеба мясіці, Да й не буду хату мясці, А буду парадочок весці (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 165).

Строфная, сінтаксічная анафара, пры якой у пачатку строф паўтараюцца аднолькавыя або раўназначныя сінтаксічныя канструкцыі, таксама даволі часта сустракаецца ў вясельных песнях Гомельшчыны. Яна выконвае ў паэтычным кантэксце выразную структурна-семантычную і экспрэсіўную функцыі – садзейнічае ўпарадкаванню слоўнай пабудовы тэксту, лагічнаму, паслядоўнаму развіццю думкі і ўзмаўненню яго эмацыянальнага гучання.

Строфная анафара прыводзіць да сінтаксічнага паралелізму сказаў, які часта спалучаецца з вобразным паралелізмам, заснаваным на супастаўленні пэўнага дзеяння, стану або характарыстыкі персанажа са з'явамі прыроды, рэаліямі жывёльнага або расліннага свету, што адлюстроўвае арганічную сувязь чалавека з прыродай, адухаўленне ім усіх яе праяў. Так, перажыванні, дзеянні і эмацыянальны стан нявесты часцей за ўсё супастаўляецца з паводзінамі птушак: *Там на возеры плавалі індыкі, Ужо табе, Волечка, мінуцца музыкі. Там на возеры плавалі качоры, Ужо табе, Волечка, мінуцца вячоры* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 173); *Да прыляцела шэрая зязюля з ялаўца, Да прыехала маладая Ганначка з-пад вянца* (в. Буразь, Жытк. – ВТГ, с. 180); *Кукавала зязюлечка ў садочку, Прыкланіўшы галовачку к лісточку..Заплакала малада Мар'я ў святліцы, Паклаўшы галоўку к скамейцы* (в. Барыскавічы, Маз. – ВТГ, с. 321); *Ляцелі галачкі ў тры стадачкі, Адна галачка паперак. Ішлі дзевачкі ў тры радочкі, А наша*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Алачка паперад (в. Чыркавічы, Светл. – ВТГ, с. 411); *Кукавала зязюлечка ў саду на памосце, Прыехалі да дзевачкі тры казакі ў госці* (в. Каўпень, Лоеўск. – ВТГ, с. 288);

з'явамі прыроды: *Под явором вецер не вее, Под явором сонцэ не грэе, Под явором сонцэ не грэе, Под явором дробны дождж ідзе, Моя міла замуж ідзе* (в. Буразь, Жытк. – ВТГ, с. 185);

рэаліямі жывёльнага: *Да як заржалі сівыя коні ў полі, Да кінулася свайму татачку ў ногі* (в. Карпаўка, Лоеўск. – ВТГ, с. 285);

або расліннага свету: *Каціласа ігрушачка із-за гор'я, Прасцілася Манечка із застолля* (в. Ліпнякі, Лоеўск. – ВТГ, с. 294); *Кукавала зязюлечка ў садочку, Прыкланіўшы галовачку к лісточку* (в. Барыскавічы, Маз. – ВТГ, с. 321).

Пры анафарычным паўторы могуць супастаўляцца дзеянні нявесты і паводзіны іншых вясельных чыноў, у першую чаргу свякрыві: *Ужо свякроўка нявестку даўно чакае. Шыла яна шубу да долу, Дый прыбудзь, нявестку, дадому. Шыла яна шубу да зямлі, Дый прыбудзь, нявестка, да сям'і. Шыла яна шубу па пяты, Ды й прыбудзь, нявестка, дахаты* (в. Крэмнае, Жытк. – ВТГ, с. 165–166).

Выдзяляльна-сэнсавае значэнне анафары павышае інфармацыйнасць маўлення, насычанасць зместу і глыбіню раскрыцця ідэі, канцэптуальную значнасць народна-паэтычнага слова. Стылістычная значнасць анафары абумоўлівае ўзбагачэнне паэтычнага кантэксту дадатковымі эмацыянальна-ацэначнымі значэннямі.

Менш распаўсюджана ў вясельных песнях Гомельшчыны *эпіфара* – паўтор слова або групы слоў у канцы сумежных сказаў. Як і анафара, эпіфара адносіцца да лакалізаваных паўтораў. Яна садзейнічае структурнай арганізацыі паэтычнага тэксту, актуалізацыі семантыкі паўтораных элементаў выказвання: *Да стаяла, буяла, да стаяла, буяла Канапелька ў агародзе, Да не даў жа ёй ветрычак, Да не даў жа ёй ветрычак Яшчэ болей да пастаяці, Яшчэ болей да пастаяці* (в. Курын, Акц. – ВТГ, с. 23); *У новым родзе трое варот новых. Первые варота – што сонейка взойдзе, Другіе варота – што месячык взойдзе, Трэціе варота – што хлопчык взойдзе. Як сонейко будзе – цёпленько будзе, Месячык засвеціць – светленько будзе, А хлопчык узыйдзе – веселенько будзе* (в. Глыбаўка, Ветк. – ВТГ, с. 68).

Аналізуючы віды паўтораў у вясельных песнях Гомельшчыны, нельга не адзначыць такія фігуры маўлення, як паўтор злучнікаў і прыназоўнікаў. *Шматзлучнікаваць*, або полісіндэтон – выкарыстанне аднаго і таго ж злучніка перад кожным аднародным членам сказа – дапамагае звязаць асобныя элементы ў сінтаксічнае адзінства і разам з тым выдзеліць, падзяліць іх паміж сабой, што замаруджвае тэмп

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паэтычнага выказвання, надае яму ўзвышанасць і выразнасць: *І жыві гадок, і жыві другі, не ідзі да маці. І жыла гадок, і жыла другі, Трэці не сцярпела, Абярнулася шэраю зязюлькаю, К маці паляцела* (в. Малейкі, Браг. – ВТГ, с. 38). Функцыянальнае значэнне полісіндэтону залежыць ад граматычнай характарыстыкі злучаемых членаў сказа. Так, паўтор злучнікаў перад аднароднымі выказнікамі перадае працягласць дзеяння, яго інтэнсіўнасць або разнастайнасць: *А нашы ж сваты не ведалі Ды ў хлеў заехалі, Ды і казу прывіталі, Ды казе руку далі, Ды каза здзівілася, Са смеху павалілася* (в. Вадовічы, Калінк. – ВТГ, с. 245). Шматзлучнікавасць пры аднародных дапаўненнях надае выказванню інтанацыю пералічэння, паказвае шматлікасць, разнастайнасць з'яў: *Чым я табе надакучыла, Ці ядою,ці хадою, Ці ядою, ці хадою, Ой, ці русаю касою*? (в. Азершчына, Рэч. – ВТГ, с. 380).

Паўтор аднолькавых прыназоўнікаў перад аднароднымі членамі сказа таксама дазваляе выдзеліць асобныя словы, падкрэслівае іх значэнне, акцэнтуе на іх увагу: *За сонцам – не бачу, За ветрам – не чую, За нядобрым мужам – дома не начую* (в. Рудня Гарбавіцкая, Калінк. – ВТГ, с. 248); *Ой, друзья-таварышчы, Развітваюся з вамі, Са сваёй хатай, З роднай мамай і бацькам, І, мілыя, з вамі* (в. Янова, Гом. – ВТГ, с. 78). Шматзлучнікавасць і шматпрыназоўнікавасць садзейнічаюць, акрамя таго, рытмізацыі паэтычнага маўлення і яго сістэмна-структурнай арганізацыі: *Ці стогне дарога Да ці шуміць дуброва? Ці слышан чачот нагайкі, Ці гукаюць марша, Ці музычэнькі граюць, Ці самі спяваюць? І дорожэнька стогне, І дубровонька шуміць, І слышан чачот нагайкі, І гукаюць марша, І музычэнькі граюць, І самі спяваюць* (в. Рычоў, Жытк. – ВТГ, с.175); *З гары, з гары, з даліны Беглі конікі чатыры* (3: 279); *Каля майго церама, Каля майго новага, Бітая дарожачка, Таптаная сцежачка* (в. Каменка, Лоеўск. – ВТГ, с. 283).

Паўтор прыназоўнікаў можа спалучацца з паўторам злучнікаў або часціц, утвараючы такім чынам парны паўтор службовых слоў, які ўзмацняе выдзяляльнае значэнне: *Страла мая, страла, Па што ты прыйшла? Ці па мёд, ці па гарэлку, Ці па нашу дзеўку?* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб. – ВТГ, с. 136).

Такім чынам, народна-паэтычны тэкст вясельнай песні адрозніваецца разнастайнымі моўнымі сродкамі стварэння вобразнасці, экспрэсіўнасці і эмацыянальнасці на ўсіх моўных узроўнях. На лексіка-семантычным узроўні найбольш актыўнымі, адметнымі для вясельнай песні, з'яўляюцца метафара, эпітэт і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

параўнанне, на словаўтваральным – формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, на сінтаксічным – разнастайныя паўторы.

Фігуры маўлення, заснаваныя на паўтаральнасці моўных адзінак, валодаюць у народна-песенным тэксце большым экспрэсіўным патэнцыялам. Дзякуючы падабенству або тоеснасці супастаўляемых кантактна або дыстантна размешчаных моўных адзінак, сінтаксічная структура сказа вясельнай песні становіцца больш сбалансаванай, выразна і эмацыянальна насычанай. Выкарыстанне гэтых фігур дазваляе лагічна выдзеліць суб'ект або аб'ект пэўнага дзеяння, дапамагае паказаць устойлівасць пэўных якасцей, нарастанне, паслядоўнасць, мэтанакіраванасць дзеяння, працяглыя аднатыпныя адрэзкі часу, дае магчымасць выразіць узмацненне эмацыянальнага і псіхічнага стану дзеючых асоб вясельнай цырымоніі.

Літаратура

1 Гілевіч, Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі: Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс: Гукапіс і рыфма / Н. С. Гілевіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1975. – 288 с.

2. Телия, В. Н. Коннотация / Лингвистический энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М.: "Советская энциклопедия", 1990. – 683 с.

3. Степанов, Ю. С. Семантика / Лингвистический энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М.: "Советская энциклопедия", 1990. – 683 с.

4. Веселовский, А. Н. Историческая поэтика / А. Н. Веселовский – М.: Высш. школа, 1989. – 404 с.

5. Амроян, И. Ф. Повтор в структуре фольклорного текста [на материале русских, болгарских и чешских сказочных и заговорных текстов] / И. Ф. Амроян. – М.: Государственный республиканский центр русского фольклора, 2005. – 296 с.

К. Л. Хазанава

1.2 Лексіка радзінна-хрэсьбіннай абраднасці ва ўсходнеславянскім кантэксце

У імклівы і мітуслівы час 21 ст. асабліва важным уяўляецца зварот і трапная ўвага да выпрацаваных многімі пакаленнямі продкаў традыцый, якія прайшлі выпрабаванне на трываласць і даказалі сваё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

права на выкарыстанне. Унікальную скарбніцу духоўнай і матэрыяльнай культуры народа, якая ўтрымлівае інфармацыю аб маральных і матэрыяльных традыцыях продкаў, уяўляе сабой сямейная абраднасць беларусаў.

Сямейныя абрады і традыцыі ўсходніх славян утрымліваюць своеасаблівы код або этыкет паводзін і выжывання, існуючы як духоўны запавет продкаў, які цяперашняе пакаленне мусіць перадаць нашчадкам. У сямейнай абраднасці выдзяляюцца тры асноўныя комплексы традыцый, абумоўленыя асноўнымі вехамі чалавечага жыцця: нараджэнне, вяселле, пахаванне.

У трыадзіным комплексе сямейнай абраднасці адметнае месца займаюць радзінна-хрэсьбінныя традыцыі. Радзінна-хрэсьбінная абраднасць непасрэдна звязана з вясельнай абраднасцю і з'яўляецца яе лагічным жыццёвым працягам. Радзінна-хрэсьбінныя абрады адносяцца да традыцый, што фарміруюць духоўнасць і чалавечнасць грамадства.

Традыцыйная ўсходнеславянская радзінна-хрэсьбінная абраднасць у наш час не толькі захаваная, але трывала функцыянальная. Яшчэ з 80-х гадоў прошлага стагоддзя людзі пачалі вяртацца да царквы, да хрысціянскай веры, што дае надзею на адраджэнне і захаванне духоўнасці, хрысціянскіх і агульначалавечых каштоўнасцей. Немалую ролю ў гэтых працэсах адыгрывае традыцыйны інстытут хросных і кумоў, якія спрадвеку шанаваліся і адзначаліся ўсходнімі славянамі. Аб іх трывалым захаванні і выкарыстанні сведчаць матэрыялы фальклорна-дыялекталагічных экспедыцый, здзейсненых выкладчыкамі і студэнтамі ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны".

1.2.1 Лексіка-тэматычная групоўка лексікі радзінна-хрэсьбінных традыцый

Лексіка-тэматычная групоўка лексікі радзінна-хрэсьбінных традыцый не з'яўляецца надта разгалінаванай. Пры даследаванні сямейнай абраднасці ў радзінна-хрэсьбінным цыкле традыцыйна выдзяляецца тры групы рытуальных дзеянняў, якія адпавядаюць фізіялагічнаму стану жанчыны ў час родаў: дародавы, родавы і пасляродавы цыклы.

Да дародавага цыклу радзінна-хрэсьбіннай лексікі можна аднесці назвы жанчыны, якая носіць дзіця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У лексіцы родавага цыклу выяўляюцца найменні самога працэсу, якія таксама называюць і ўвесь комплекс абрадаў, звязаных з нараджэннем і хрышчэннем.

Усходнеславянскія радзінна-хрэсьбіныя традыцыі захавалі назвы дзіця паводле адметнасцей нараджэння. Асобныя намінацыі народная традыцыя выдзеліла для пазашлюбных дзяцей. Успрыманне пазашлюбных адносін мужчыны і жанчыны як грахоўных вымагала адрознення і часта зневажэння да народжаных такім чынам.

У колькаснай лексіка-семантычнай групе назваў пасляродавага цыклу неабходна звярнуць увагу на найменні радзінна-хрэсьбінных традыцый, што выконваюцца ў першыя дні і тыдні пасля з'яўлення дзіця.

Шматлікія абрады звязаны з ушанаваннем павітухі. Важная дзейнасць бабы-павітухі ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці ўсходніх славян – гэта першае купанне дзіця, якое спрадвеку мела магічнае значэнне і суправаджалася разнастайнымі рытуаламі.

Значнымі дзеючымі асобамі радзінна-хрэсьбіннага абраду з'яўляюцца хросныя. У гаворках яны маюць варыянтныя найменні.

Сярод пасляродавых традыцый радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў адметнае месца займае традыцыя адведак, або наведвання толькі што нарадзіўшай жанчыны іншымі жанчынамі.

Даследаванне адметнасцей лексікі радзінна-хрэсьбіннага абраду беларусаў пацвярджае трыадзіны падзел абраднасці і выяўляе назвы: дародавыя (*цяжарная, грубая*), родавыя (*парадзіха, первенец*), пасляродавыя (*адведкі, кум, кума, хросны*). Таксама выяўляюцца асобныя найменні, якія па аб'ектыўных прычынах могуць уваходзіць у любую з адзначаных трох груп (*баба, бабка*).

1.2.2 Найменні асоб у радзінна-хрэсьбінным абрадзе беларусаў

Хаця радзіны і хрэсьбіны ўсходніх славян не маюць такой вялікай разнастайнасці абрадаў і традыцый, а таксама багатай лексіка-семантычнай варыянтнасці намінацый, як вяселле, аднак у слоўніку ўсходнеславянскай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці выдзяляюцца яскравыя лексіка-тэматычныя групы. Самая першая і, натуральна, самая важная з іх – найменні асоб-удзельнікаў адпаведных дзеянняў.

Калі ўважліва назіраць за асаблівасцямі правядзення беларускага вяселля, то выяўляецца заканамернасць пачатковай падрыхтоўкі да працягу свайго роду ўжо ў час вясельных абрадаў. Падчас сватання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадстаўнікі сям'і жаніха надзвычай уважліва глядзелі на нявесту, на яе сям'ю, вывучаючы, ці ўсе ў сям'і будучай жонкі былі здаровыя і ці можна чакаць здаровых дзетак у будучай сям'і.

На вяселлі маладых саджалі на кажух, на шубу, на дзяжу: *Маладую садзілі на* ***кажух****, каб дзеці былі кучаравыя* (в. Гадзічава, Ветк.) [1]; *Абязацельна садзілі нявесту з жаніхом на вывернуты* ***кажух*** (в. Хальч, Ветк.); *Маладых на вяселлі садзілі толькі пасля ўваходу, садзілі на кут, на* ***кажух*** *(каб дзеці былі кучэравыя і каб былі багатыя)* (в. Гарошкаў, Ветк.); *На* ***кажух*** *маладых садзілі, на лаўку садзілі, на* ***дзежку*** *садзілі* (г. Рэчыца, Ветк.); *На свадзьбе нявеста і жаніх сядзелі за сталом на* ***шубе*** *для таго, каб былі багатымі* (г. Ветка).

Маладых абсыпалі зернем, аўсом, просам, цукеркамі ці манеткамі, што сімвалізавала надзею на будучыя "ўсходы" – новыя пакаленні толькі што створанай сям'і. І большасць пажаданняў на вясельным застоллі адносілася да будучых дзетак маладых: *Дарую вам кусочак медзі, Штоб дзеці былі, як мядзведзі. Сколькі на дварэ калкоў, Штоб столькі было сынкоў* [2, с. 7].

Калі вясельныя пажаданні аб дзетках спраўдзіліся, маладая жанчына пераходзіла ў іншы фізіялагічны і сацыяльны стан. Намінацыі жанчыны, якая носіць дзіця, можна аднесці да дародавага цыклу радзінна-хрэсьбіннай лексікі.

Жанчына, якая чакае дзіця, па-беларуску называецца *цяжарная*. У гаворках лексема ўзгадваецца разам з традыцыйнымі нормамі паводзін будучай маці: *Абычна як сціраць, дык* ***цяжарнай*** *не нада круціць тыя кругі, таму шта тая самая пупавіна закруціцца ў дзіцёначка вакруг шэі* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); ***Цяжарнай*** *стрычся ня нада было, на пароге сядзець ня нада, пінаць катоў, сабак,.. во так вот бабушка гаварыла, еслі пінаеш, дык у рабёнка будзе атмеціна, на пароге – роды зацяжныя будуць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

У беларускіх гаворках для жанчыны, якая чакае дзіця, ёсць назвы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Яшчэ да родаў бацькі будучага нованароджанага клапаціліся пра хросных. У беларускіх гаворках распаўсюджаныя найменні *хросныя, хросная, хросны, хрышчоныя бацька і маці*: ***Хросныя*** *не павінны адказвацца, раз табе выбралі, так ты доўжан. Не паложана ім ажаніцца* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Ну* ***хросныя, хросная маці і хросны бацька****. Так жа ж заўсёды называлі* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Насілі хрысціць дзіця ў царкву* ***хрышчоны бацька і хрышчоная маці*** *— кум і кума, якія падбіраліся з паважаных багатых нестарых людзей і для якіх давер сям'і нованароджанага быў вялікім гонарам. У задачу* ***хрышчоных бацькоў*** *уваходзіла даць імя дзіцяці* [5].

Для беларускай лексікі ўласцівыя намінацыі *кум* і *кума* ‘хросныя ў адносінах адзін да аднаго або адносна родных бацькоў дзіця’: ***Кум*** *не павінен з кумой жаніцца. Павінен быць усё жыццё адказным за хрэшчонае дзіця ўсё жыццё* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Ну* ***кума****, як яна хрэсціць, так і кашу варыць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

Для назвы дзіця ў адносінах да хросных у беларускіх гаворках адзначаюцца фанетычна-словаўтваральныя варыянты *хросніца, хрышчэніца, хроснік, хрэснік* і двухслоўныя найменні *хросная дачка, хросны сын*: ***Хрышчэніца*** *мая Верка раділась увосень* (в. Вулкан) [3, с. 396]; *Мая* ***хрышчэніца*** *– так говораць у нас на* ***хросную дачку*** (в. Чаплін) [3, с. 396]; *У дарогу кум і кума бралі хлеб, соль, іншыя прадукты, каб іх* ***хрэснік*** *заўсёды быў, як гаворыцца, і з хлебам, і з соллю* [6].

Усходнеславянскія радзінна-хрэсьбіныя традыцыі захавалі назвы дзіцяці паводле адметнасцей нараджэння. Першае дзіця ў сям’і – ***первенец***: *Ну нарадзіўся* ***первенец****, дык па ўсёй дзярэўне весць пускаюць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.). Калі выпадкова дзіця нараджалася ў лесе, яго называлі *лесавік*: *Дык такой ужо прыгожы* ***лесавік*** *быў: валасы чорныя, кудравыя* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.). Да хрышчэння дзіця “*называлі “****лялечка****”, “****багданька****”, каб падмануць злыя сілы, якія маглі пашкодзіць немаўляці*” [4].

Асаблівыя адносіны да пазашлюбных дзетак абумовілі выдзяленне ў народнай традыцыі іх асобных намінацый (часам зневажальных): *знайдён, крапіўнік, половинкин сын*: ***Знайдёны*** *ці* ***байструкі*** *– ета усеадно* (в. Крупейкі) [3, с. 138]; *Гавораць ў падоле прынеслі* ***крапіўніка*** (в. Чырвоны Бераг). Пашыраная назва пазашлюбных дзяцей – *байструк*: *У кумы да* ***байструкоў*** *імкнуліся ісці дзяўчаты, якіх доўга не бралі замуж* [4]. Сустракаецца памяншальна-ласкальнае найменне: *Бач, екі* ***байстручок*** *ужэ вурас, да гледіць маткі* (в. Ручаёўка) [3, с. 44].

Жанчына, якая прымала роды, звалася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дак я і пякла кашу на хрэсьбіны (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *От* ***бабка-прыродніца*** *прышла, і ета жэншчына скоранька раділа две дочары* (в. Казярогі) [3, с. 42]; *Бяруць* ***бабку-павітуху****, і ўжо яна прыходзіць мыць дзіцяці* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Ну вось гэтую* ***павітуху*** *і звалі, када нарадзілася* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Сегодні ёй заказалі роды: іді, кажа дачка, гукні бабку-прыродніцу. От тая* ***прыродніца*** *прышла, і ена раділа две дочары* (в. Казярогі) [3, с. 289]; *Пэўныя патрабаванні былі да* ***бабкі-павітухі*** *(або* ***пупарэзніцы****): на яе ролю падбіралі немаладую паважную жанчыну, у якой ёсць свае дзеці* [5]. Матывацыя найменняў арыентуецца на дзеянні пры родах (*пупарэзніца*), указвае на традыцыйны ўзрост гэтых асоб (*бабка*), бо павітухамі былі сталыя жанчыны. Лексема *прыродніца* выяўляе сувязь са словамі *род*, *роды*, а *павітуха* – узыходзіць да старажытнарускага *повити* ‘абвіць, звіваць дзіця’, ‘прымаць роды’ [7, т. 3, с. 143].

Даследаванне назваў асоб радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў дазваляе выявіць значную колькасць старажытных лексем (*бабка, кум, кума, хроснік*). Большасць прааналізаваных намінацый уяўляюць у беларускай мове лексічную спадчыну агульнаўсходне-славянскай мовы і яскрава матывуюцца адпаведнымі дзеясловамі і назоўнікамі (*павітуха, парадзіха*).

1.2.3 Беларуска-рускія лексічныя паралелі ў намінацыі асоб радзінна-хрэсьбіннага абраду

Па-беларуску стан жанчыны, якая чакае дзіця, называецца *цяжарная*. Лексема *цяжарная* з’яўляецца адпаведнікам слова *беременная*, якое замацавалася ў рускай літаратурнай мове. У. Даль спасылаўся на цікавыя народныя выслоўі, якія адлюстроўваюць вераванні, звязаныя з гэтым станам жанчыны: ***Беременная*** *не идетъ въ кумы, крестникъ умретъ. Причудливъ, какъ* ***беременная*** *барыня. Захотѣлось, словно* ***беременной*** [7, т. 1, с. 83]. Расійскі лінгвіст прывёў сінанімічныя найменні ўказанага стану: *бременатая, бременастая, брюхатая, чреватая* [7, т. 1, с. 83], *непорожняя, непраздная, самадруга, сносная, тяжелая* [7, т. 1, с. 134]. Матывацыя назваў відавочная: словы ўказваюць на наяўнасць пэўнага цяжару (стараславянскае *бремя* – старажытнарускае *беремя*) ці вялікага жывата (*брюхо, чрево*) або сведчаць аб уласцівасцях жанчыны ў адпаведным стане.

На памянёных У. Далем назвах адбыліся гістарычныя моўныя змяненні. Стараславянізмы *бременатая, бременастая, непраздная,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чреватая зніклі са слоўніка рускай мовы. На месцы прыметніка *сносная* захаваўся прыназоўнікава-назоўнікавы выраз *на сносях* ‘аб жанчыне, якая хутка павінна нарадзіць’. А слова *брюхатая* захавала старажытную семантыку, але набыло стылістычную афарбоўку і з’яўляецца зараз прастамоўным, грубым, лаянкавым.

У рускай мовы можна адшукаць крыніцы беларускіх апісальна-эўфемічных найменняў цяжарнай *будучая маці, чакаць дзіця (папаўнення)*: *будущая мать, ждать ребенка (пополнения, прибавления), быть в интересном положении*.

Блізкія сувязі паміж беларускімі і рускім гаворкамі прасочваюцца ў найменнях жанчыны падчас родаў. Для літаратурных моў характэрнымі з’яўляюцца лексемы *рожаніца* і *роженица*, якія сустракаюцца і ў гаворках: *Накладаюць вузялкі, наляваюць кампот і ідуць* ***рожаніцу*** *праверыць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *В русской традиции считалось обязательным в течение трех дней справить три бани для* ***роженицы*** [8].

У беларускіх гаворках існуе слова *парадзіха* ‘жанчына, якая радзіла дзіця’. У рускіх гаворках адзначаюцца найменні *женщина-родиха, родильница, родиха*: *Подношение же в виде хлеба, яиц рассматривается как действие ритуальное, передающее* ***женщине-родихе*** *плодовитость, необходимую в дальнейшей жизни* [9]; *В этом случае для облегчения родов они должны были расплести косы, иначе "за каждый волосок будет маяться* ***родильница****"* [10]. Указаныя найменні паходзяць ад дзеяслова *родити.*

Адметнасцю асобных рускіх гаворак з’яўляецца найменні нарадзіўшай жанчыны адпаведна полу нованароджанага. Калі жанчына нараджала першага сына, то, як і з вяселля да нараджэння дзіця, звалася *молодуха*, а калі нараджалася дзяўчынка, то пачынала звацца *баба.* У народнай свядомасці захавалася і тлумачэнне такой намінацыі: *Если девочку родит, она старше становится, а мальчика, так молодой и остается* [11].

Супастаўляльнае даследаванне намінацый асоб беларускай і рускай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці не можа абмінуць назвы жанчыны, якая прымала роды. Часцей за ўсё яна звалася *бабка: Ваша* ***бабка*** *– баба Матруна: усіх нас бабіла* (в. Чаплін) [3, с. 41].

Ад слова *бабка* ў значэнні ‘павітуха, жанчына, што прымае роды’ паходзіць дзеяслоў

*павітухай і прынятымі ў час родаў (“**перабабленымі**”) ёю дзецьмі* [4]. З падобнай семантыкай у рускай мове адзначаюцца найменні *принятый* і *повитый*: *Между повитухой и **принятым** – **повитым** ею младенцем возникает незримая связь и что достоинства повитухи могут перейти к младенцу* [9].

У беларускіх гаворках ужываецца спалучэнне *бабка хросная*, што сведчыць аб значнасці бабкі ў радзінна-хрэсьбінным абрадзе і аб абавязковай яе прысутнасці ў час хрышчэння: *Бабка, умесце с хроснымі выбіралася, **бабка хросная**, вот, і та бабка далжна была варыць кашу із пшана ў гаршку* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

Адпаведныя беларускім *бабка-павітуха, павітуха, прыродніца, пупарэзніца* намінацыі сустракаюцца і ў рускай мове: *В старину первой и главной фигурой на крестинах почиталась **бабушка**, или **повивальная бабка (акушерка, приёмница)**, принимавшая роды.. **Бабки-повитухи** с шутками ломали пироги, пробовали на вкус, ели с борщом за праздничным столом* [12]; *Исполнителями ритуальных действий были **роженица**, по-псковски **родиха**, и **повивальная бабка - баба, повитуха*** [9]. Сустракаецца ў рускай мове і назва *пупорезка*: *В середине XVIII в. по распоряжению Сената в Москве и Петербурге были основаны первые школы "бабичьего дела" для подготовки квалифицированных повитух (обычно их называли по-прежнему **повивальные бабки, повитухи**, иногда, с целью отличить от деревенских **пупорезок**, немецкими бабками)* [10].

Паважлівыя адносіны да павітухі адлюстраваліся ў народных прымаўках і прыказках: *Бог с милостью, а бабка с руками*; *Не бабка, а угадка*; *У всякой бабки свои ухватки*; *Бабка придёт, всякому подсобит*.

У родавым цыкле рускай сямейнай абраднасці адзначаюцца таксама назвы нованароджанага дзіцяці. Адметныя найменні фіксуюцца для пазашлюбных дзяцей: *половинкин сын: В Сибири таких детей называли **половинкин сын**, это объясняется в первую очередь неполнотой родственных связей, так как один родитель и по понятным причинам чаще всего отец неизвестен* [11].

Аднак, безумоўна, больш частая назва пазашлюбных дзяцей у рускіх гаворках

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лексема страціла зніжаную стылістычную афарбоўку, што абумоўлена змяненнем адносін сучаснага грамадства да інстытута шлюбу ўвогуле і да дзяцей, народжаных па-за шлюбам, у прыватнасці.

Сярод лексем пасляродавага цыклу радзінна-хрэсьбіннай абраднасці рускіх гаворак неабходна асобна выдзеліць назвы хросных. Праваслаўная традыцыя прапануе тэрміналагічнае найменне хросных бацькоў *восприемники*: *Главными действующими лицами обряда, помимо священника и новорожденного, были* ***восприемники: крестный отец и крестная мать****. Русские крестьяне осознавали* ***восприемников*** *как людей, вводящих новорожденного, пришельца из иного мира, в человеческую среду, в мир православной деревни* [9].

Паводле праваслаўных кананічных правілаў у хлопчыкаў хросным павінен быць мужчына, а ў дзяўчынак хроснай становіцца жанчына: *"Женщины пусть будут восприемницы детей женского пола, а мужчины восприемниками мужского пола", – гласит 22-е правило 1-го Вселенского Собора* [14]. Аднак звычайным стала запрашаць і хроснага, і хросную незалежна ад пола дзіцяці: ***Крестный отец*** *и* ***крестная мать*** *считались вторыми родителями младенца и несли за него ответственность перед Богом* [9].

Супастаўляльнае даследаванне назваў асоб радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларускіх і рускіх гаворак дазваляе выявіць значную колькасць агульных лексем (*бабка, байструк, кум, кума, хросны*), абумоўленую блізкасцю беларускіх і рускіх гаворак, а таксама падобнымі ці амаль аднолькавымі сацыяльнымі ўмовамі існавання на працягу стагоддзяў. Натуральна, беларускія і рускія адпаведныя найменні маюць фанетычныя і словаўтваральныя адрозненні. Большасць прааналізаваных намінацый уяўляюць у сучасных беларускай і рускай мовах лексічную спадчыну агульнаўсходне-славянскай і агульнаславянскай мовы і яскрава матывуюцца адпаведнымі дзеясловамі і назоўнікамі (*рожаніца*, *павітуха, парадзіха*). Адзінкавыя запазычаныя лексемы (*байструк*) сведчаць аб адноснай адкрытасці гаворак іншамоўнай лексіцы, якая ў гаворках трансфармуюцца і ў лексічных, і ў стылістычных адносінах.

1.2.4 Радзіны і хрэсьбіны ў гаворках беларуска-ўкраінскага памежжа: традыцыі, уплывы, асаблівасці

Разнастайны і цікавы моўны матэрыял для ўсебаковага лінгвістычнага даследавання сямейнай абраднасці прапануюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гаворкі беларуска-ўкраінскага памежжа. Радзінна-хрэсьбінная лексіка гэтых гаворак спрыяе выяўленню спецыфічных і агульных рыс беларускай і ўкраінскай моў, а таксама вызначэнню моўных з'яў, якія зніклі з літаратурных моў усходнеславянскіх народаў і засталіся ў мове абраднасці, што карысна для параўнальнай граматыкі славянскіх моў.

Для даследавання этнакультурных адметнасцей беларуска-ўкраінскага памежжа цікавым уяўляецца зварот да лінгвістычнага аналізу найменняў самога працэсу нараджэння і хрэсьбін, якія таксама называюць увесь комплекс абрадаў, звязаных з нараджэннем і хрышчэннем.

Працэс з'яўлення ў свет чалавека ў гаворках беларуска-ўкраінскага памежжа часцей называецца *радзіны*: ***Радзіны*** *– гэта калі родзіца дзіця* (в. Туры, Стол.); ***Радзіны*** *– нараджэнне дзіцяці* (в. Церахоўка, Добр.). Радзей сустракаецца назва *народзіны* і яе варыянт *нарадзіны*: ***Народзіны*** *– нараджэнне дзіцяці* (в. Церахоўка, Добр.); ***Нарадзіны*** *– абрад нараджэння дзіцяці* (в. Церуха, Гом.). Лексема *роды* ў гаворках практычна не выяўляецца. У гаворках пры неабходнасці абазначыць фізіялагічныя адметнасці нараджэння дзіця выкарыстоўваюцца дзеясловы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

называла радзіны: *пологи, положити, положение, положьница.*

Ва ўкраінскіх гаворках фіксуюцца і іншыя найменні працэсу нараджэння: ***Роди*** *або ж* ***пологи, змоги, народини, родиво*** *– це обрядові дії, які відкривають цикл власне родильних обрядів* [16]. Прыклады ілюструюць існаванне вытворнага прыметніка: ***Родильна*** *обрядовість є складовою сімейної обрядовості* [16].

Фанетычны адпаведнік беларускаму найменню *радзіны* ўласцівы ўкраінскай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці ў значэнні ‘агульная назва абрадаў, звязаных з нараджэннем дзіця’: *На* ***родини*** *приходили тільки жінки* [19]; *Йти на* ***родини****; Справляти* ***родини****; Робити* ***родини*** [20].

Для абраду хрышчэння ў беларускіх гаворках існуюць варыянтныя найменні. З фанетычнымі адрозненнямі захоўваецца ў гаворках характэрная для беларускай літаратурнай мовы намінацыя *хрэсьбіны*: *На* ***хрэсьбіны*** *кашу білі, но я не знаю дзеля чаго так* (в. Камарын, Браг.); ***Хрэсьбіны*** *– абрад хрышчэння дзіцяці* (в. Туры, Стол.); *Гулялі* ***хрэсьбіны****: гатовілі кашу, боршч грыбны* (г. Добруш); *Тады* ***хрэсьбіны*** *дзелаяць, сабіраяць людзей і гуляюць* (г. Лоеў); *На* ***Хрэзбіны****, звалы попа, якы у прорубы акунав дітя 3 разы* (в. Ляхавічы, Іван.); *На* ***крэсьбіны*** *кашу вараць, гасцей завуць* (в. Церахоўка, Добр.); *У нас бабку на* ***крэсьбіны*** *к ёй дамоў вязуць і йна ўгашчае ўсіх* (в. Церуха, Гом.); *На етых* ***крэсьбінах****, значыцца, за сталом куме даюць падарак, куму даюць падарак і бабе* (в. Насовічы, Добр.); ***Хрысбіны*** *– абрад хрышчэння нованароджанага дзіцяці ў царкве* (г. Добруш, перасяленцы з в. Барталамееўка, Ветк.).

Наступная група варыянтаў назвы абраду з’яўляецца беларускай народнай агаласоўкай царкоўнаславянізма кретен¿е: *Ну дак гэтую кашу ў гаршчок ну гэта сімвалічаскае што-та к* ***храшчэнню*** *рабёнка* (в. Шарпілаўка, Гом.); *На* ***крашчэнне*** *рабёнка крысцілі.* (в. Прудоўка, Добр.); *За* ***крэшчэнне*** *плациць кум, а кума нясе торт* (в. Туры, Стол.).

Захоўваюць гаворкі беларуска-ўкраінскага памежжа і абеларушанае слова рускай мовы: ***Крысціны*** *обыкнавенна праводзяць* (в. Церахоўка, Добр.) *У нас называют і* ***хрэсьбіны****, і* ***кресціны****. У цэркве як гуляюць, так* ***хрэсьбіны****, а так –* ***кресціны*** (г. Добруш); *Так і называют* ***кресціны****,* ***крешченіе*** (в. Церуха, Гом.); *На* ***хрэсьціны*** *дзіця ў царкву вазілі, і там яго хрэсьціў бацюшка і хросныя* (в. Кругавец-Калініна, Гом.).

Варыянтнасць назіраецца і сярод дзеяслоўных назваў: ***Храсцілі*** *маленькіх да годзіку* (в. Шарпілаўка, Гом.); *Ну вось я радзіла і гавару: “Хадзі там,* ***пахрэсці*** *мне дзіця, будзьце кумаўём”* (в. Шарпілаўка,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гом.); *Паедуць* ***пахрысцяць*** *яго, кума і кум* (в. Церахоўка, Добр.); ***Пахрысцім*** *дзіця, патом дамой прыяжаем, гуляем, гарэлку п'ём* (в. Ларышчава, Добр.); ***Хрысціць*** *першую дзяўчынку нельга – нешчаслівая будзе тая, што* ***пахрысце*** (в. Камарын, Браг.); *Паедуць* ***пахрысцюць****, як і свадзьбу, сабіраюць людзей і гуляюць, дзед, бабка,* ***хрысцілі*** *дзетак* (в. Шарпілаўка, Гом.); *Кум і кума* ***крэсьцюць*** *у цэркві* (г. Лоеў); ***Крысціць*** *лучше всево на 8 ілі 40 дзень, но в разных местах по-разнаму, і бацюшка в любое время* ***крестіт*** (г. Добруш).

Падобныя варыянтныя адпаведнікі назвы абраду адзначаюцца ва ўкраінскай мове. Аднак зноў тут назіраецца больш дакладная семантычная дыферэнцыяцыя: *хрестини* 'народныя абрады, звязаныя з хрышчэннем', а *хрещення* 'назва царкоўнага абраду': ***Хрестини*** *були великою родинною урочистістю, і починалися із запрошення кумів* [16]; ***Хрестини*** *раніше намагалися зробити у день народження* [21]; *Крім* ***родин****, влаштовували і* ***хрестини****, в яких розрізнялися дві частини: народна і релігійна, церковна* [19]; *Пізнішу форму ім'янаречення, пов'язували з* ***хрещенням*** *– „йти за молитвою"* [16].

Адметнае ўкраінскае найменне *похрестини* 'дзень пасля хрэсьбін': *Наступного дня святкували* ***похрестини****, знову було частування* [19]; *Примовляння з приводу* ***похрестин****: "Ой ми вчора на родинах були, а сьогодні на хрестини прийшли. А ми прийшли з Божого дому, принесли дитину додому"* [21].

Прааналізаваны моўны матэрыял дазваляе выявіць дастатковае лексіка-семантычнае напаўненне назваў *радзіны* і *хрэсьбіны* ў сямейна-абрадавай лексіцы гаворак беларуска-ўкраінскага памежжа. Указаныя гаворкі прапануюць варыянтнасць намінацый, абумоўленую ў большасці выпадкаў іншамоўнымі ўплывамі. Даследаванне паказала, што разгледжаная лексіка ў гаворках беларуска-ўкраінскага памежжа мае спецыфічныя адрозненні ад адпаведнай лексіка-тэматычнай групы і беларускай, і ўкраінскай моў. Прычым асаблівасці назіраюцца як на лексічным, так і на фанетычным моўных узроўнях. На ўказанай тэрыторыі выпрацавалася адметная лексіка, што называе элементы радзінна-хрэсьбіннага абраду. Гаворкі тэрыторыі беларуска-ўкраінскага памежжа Гомельскай і Брэсцкай абласцей з'яўляюцца прыкладам шчыльнага ўзаемадзеяння трох усходнеславянскіх моў. Паколькі абрадавая лексіка непасрэдна называе не толькі народныя, але і рэлігійна-царкоўныя традыцыі, у даследаваных найменнях выяўляюцца адметнасці засваення ўсходнеславянскай жывой народнай мовай царкоўнаславянскіх моўных элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1.2.5 *Бабка* і *бабіна каша* ў беларускіх і ўкраінскіх гаворках

Як адзначалася раней, гаворкі Гомельскай і Брэсцкай абласцей Беларусі ў этналінгвістычных адносінах прапануюць цікавы моўны матэрыял. У ім адзначаецца колькасная лексіка-семантычная група найменняў радзінна-хрэсьбінных абрадаў першых дзён і тыдняў пасля з'яўлення дзіцяці на свет, у прыватнасці, намінацыі радзінна-хрэсьбінных абрадаў, звязаных з бабкай-павітухай, у беларускіх і ўкраінскіх гаворках. Для паўнаты лінгвістычнага даследавання ўказаных абрадаў карысным будзе зварот да вывучэння адпаведных найменняў у беларускіх і ўкраінскіх гаворках.

З ушанаваннем павітухі звязаны шматлікія народныя традыцыі. Яна становіцца галоўнай дзеючай асобай пасляродавага абрадавага цыклу. Нагадаем, што ў гаворках захоўваюцца назвы *бабка, бабка-павітуха, павівіца, павітуха*: ***Бабкі-павітухі*** *былі і прымалі, а хто ж будзе прымаць* (в. Старое Сяло, Ветк.); ***Павівіца*** *– бабка, якая прынімала роды* (в. Прудоўка, Добр.); *Калі хтосьці пачынаў ражаць, дык скарэй* ***павітуху*** *звалі* (в. Вуць, Добр.). Пад уплывам украінскіх гаворак ужываецца варыянт *повытуха*: *У нас гэто була такая баба* ***повытуха*** (в. Ляхавічы, Іван.).

Прымаць роды называлася *хадзіць у бабкі* (в. Вялікі хутар, Добр.). Адказнасць справы, якая патрабуе ведаў, уменняў і вопыту, вымагала асаблівых адносін да бабкі: *Нарадзілася дзіця, значыць,* ***бабка-павітуха*** *брала пупа аднаго дзіцяці і пуп ад маткі, нада яе атрэзаць пупавіну і целцу завязаць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Помню* ***бабка*** *роды ў мяне прымала, рэзала пупчык, памыла яго, а патом мне на рукі паклала* (в. Бабічы, Рэч.). Павітухі заўсёды паважаліся і шанаваліся: ***Павітуху*** *очань уважалі, шчыталі яе за радню* (в. Меркулавічы, Чач.); ***Бабай*** *бралі шаноўную жанчыну з радні* (в. Неглюбка, Ветк.); ***Бабу*** *всегда приглашали на празники* (в. Дземяхі, Рэч.).

Неабходна адзначыць, што найменне *баба (бабка)* прымянялася не толькі да жанчыны, што прымала роды. Такім чынам называлася і ганаровая пасада на хрэсьбінах, якія ўяўлялі сабо цэлае відовішча: *У майго роднага брата, у яго дзевачка і хлопчык радзіліся, мяне за* ***бабу*** *ўзялі. Значыць, бярэш клунак і з яды бярэш: пячэнне, канфеты, вахлі. Гасцінец ужо што-та купляеш* (в. Коззе, Рэч.). Пашырэнне семантычнага напаўнення лексемы звязана з аб'ектыўнымі ўмовамі: у старажытнасці адна і тая самая асоба прымала роды, а пасля –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

займала пачэснае месца ў абрадзе, калі роды сталі адбывацца ў медыцынскіх установах, астатнія хрэсьбінныя традыцыі захоўваліся.

Бацькі рыхтавалі бабе падарунак, што мела назву *даць грошы (матэрыял)*: *Часцей* ***давалі*** *грошы* ***на кохту*** (в. Неглюбка, Ветк.). Гэтаксама рабілася ў адносінах да хросных, кумоў: *Куме* ***на плацця*** *заўсёды* ***давалі*** *прыгожы і дарагі матэрыял* (в. Неглюбка, перасяленцы з в. Стаўбцы, Ветк.); *Куму* ***давалі*** *грошы* ***на рубашку*** (в. Неглюбка, перасяленцы з в. Стаўбцы, Ветк.).

Украінская радзінна-хрэсьбінная абраднасць для жанчыны, што прымала роды, мае падобныя назвы: *Заздалегідь вирішувалося питання про* ***повивальну бабку****, від якої багато в чому залежав успіх пологів. Як правило,* ***повитуху*** *запрошували, коли пологи вже починалися* [15]. Дзеянні падчас родаў сталі матывацыяй найменню *баба-пупорізка*: ***Бабу-пупорізку*** *запрошував чоловік* [16].

Уласцівыя ўкраінскай традыцыі і асаблівыя адносіны да павітухі: ***Повитуха*** *була однією з найшановніших осіб у селі. Вона увособлювала народну мудрість, практичний лікувально-знахарський досвід* [19]. Акрамя таго, паводле ўкраінскіх народных уяўленняў, “***баба-повитуха*** *виступала ще й віщункою долі новонародженої дитини. За її «наукою», коли дитя з'явилося на світ лицем догори – добра прикмета. Як народилося в суботу, буде скупе. Вважали, щаслива доля буде в тієї дитини, що знайшлася у передвечір'я”* [19]. Украінскія этнаграфічныя запісы сведчаць, што павітуха прымала ўдзел і ў царкоўным абрадзе хрышчэння: яна дамаўлялася са святаром пра дату хрэсьбін, а ў прызначаны дзень “*давала дитину кумі (та повинна бути обов'язково «чистою») на праву руку: «Нате вам новонароджене, а нам принесіть ей хрещене», їй відказували: «Йдемо по хреста, по щастя і долю»*” [19].

І беларуская, і ўкраінская радзінна-хрэсьбінная абраднасць захавала традыцыю “*разразання путы*”. Абрад здзяйсняецца, калі дзіця толькі пачынае хадзіць, і мае на мэце спрыяць паскарэнню гэтага працэсу. *Пута* – гэта “нябачныя ніці”, якія “рэзалі”, каб дзіця пачынала было больш спрытным: *Каб ступіў первыя шагі і нада* ***перарэзаць пута*** *ножнічкамі. Вот ступіў шажок ілі два, значыць* ***перарэзаць пута****, можа, рабёнак тада і пайдзёць* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *За давніх часів, як дитина робила перший крок, мати швидко брала ножа і ззаду тричі проводила ним між її ніжками, ніби перерізувала уявну нитку, водночас тричі примовляючи: «****Ріжу*** *тобі* ***пута****». Вважали, що після цього дитина буде скоро й швидко ходити* [19].

Знакамітая традыцыя ўсходнеславянскай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці – *каша*, або *бабіна каша*. Апошняя назва ўжо ўказвае, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў гэтым абрадзе непасрэдны ўдзел прымала баба (бабка-павітуха): *Кашу кума варіт, бабка. Её называют* ***бабіна каша*** (в. Івакі, Добр.); ***Кашу*** *гэта бабка ўжо павітуха варыла* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.). Кашу звычайна гатавала павітуха або кума: *Бабка умесце с хроснымі выбіралася, бабка хросная, і та бабка далжна была варыць кашу із пшана ў гаршку* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

Часцей каша была з пшана: *Кашу гатавалі на хрэсьбіны, у нас была* ***пшоная*** (в. Дземяхі Рэч.). Хаця сустракаюцца і іншыя рэцэпты: ***Бабіна каша – рысавая***. *Здабрывалі маслам сухафруктамі, сахарам і ставілі ў печку ў легкі душок. На малаке яе варылі. Падавалі ў канцы застолля* (в. Меркулавічы, Чач.); *Кума даўжна кашу* ***парыць***. *Каша* ***пярловая*** *і пшонная* (в. Старое Сяло, Ветк.). Звычайна каша падавалася ў гаршку, які ўпрыгожваўся: *Бабка кругом таго* ***гаршка*** *канфеты чапляла* (в. Коззе, Рэч.); *Ну дак гэтую* ***кашу*** *ў гаршчок, і абвязвалі гэты гаршчок, каб прыгожы быў, гэта сімвалічаскае што-та к храшчэнню рабёнка* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.). Часам у гаршчок клалі цукеркі: *У нас на хрэсьбінах каша была – гаршок з канхветамі рознымі* (г. Добруш).

Запрошаныя на кашу госці рыхтавалі падарункі нованароджанаму і маці, якія называліся *на кашу*: *Грошы* ***на кашу*** *клалі з прыгаворамі і пажаданнямі: "Кладу медзь, каб быў дужы як мядзведзь"* (в. Неглюбка, перасяленцы з в. Стаўбцы, Ветк.). Жывёла ў прымаўцы ўзгадваецца не толькі для рыфмоўкі: выраз мае сляды татэмных вераванняў старажытных усходніх славян, якія лічылі сваім продкам і татэмам мядзведзя.

Падарункі выражалі павагу да маладой маці, яе сям'і, да павітухі, якая паспяхова прыняла роды, і разам з тым уяўлялі сабой матэрыяльную дапамогу сям'і ахрышчанага. Аказанне такой дапамогі было цэлым рытуалам, галоўная роля ў якім адводзілася кашы. Бабіна каша станавілася пасрэдніцай у перадачы падараванняў. Называўся гэты абрад у беларускіх гаворках *купляць (купіць, пакупаць, выкупіць, выкупляць, выкупаць) кашу.*

Зрабіць большы падарунак – *перабіць кашу* – у большасці выпадкаў быў абавязак кума: *Трэба было палажыць грошай болей, чым кум, які павінен пакласці найболей. Гэта яго справа гонару –* ***выкупіць кашу***. *Не даць* ***перабіць*** *іншым* (в. Неглюбка, Ветк.); ***Бабіну кашу*** *ету* ***купляем:*** *ці кум, у каго грошай ёсць, но больш стараюцца, штоб кум купіў, а патом ету кашу рэжуць кусочкамі, і штоб усім было па кусочку* (в. Меркулавічы, Чач., перасяленцы з в. Карпавічы, Нараўл.).

Для рытуальных дзеянняў з бабінай кашай беларускія гаворкі захавалі найменні *біць кашу, разбіваць кашу.* Пачынае, як ужо

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адзначалася, кум: ***Біць кашу*** *– гэта калі кум* ***выкупае кашу*** *ў бабкі на хрэсьбінах* (в. Дземяхі, Рэч.); *Кум ужэ* ***б'е****, хто болей грошай паложа. Хто паложыць болей, той і должэн* ***біць кашу****. А кум тады па карманах лазя, ды німа. Пабягіць тады, пазыча, штоб ён. Тады бяруць ужо і* ***разбіваюць****. Тады ўжо кашу па кусочкам дамой. Дзяцей угашчаюць* (в. Хальч, Ветк.); *На хрэсьбінах* ***кашу*** *насілі і* ***білі****, выдурвалі грошы ў кума* (в. Меркулавічы, Чач., перасяленцы з в. Карпавічы, Нараўл.).

Пры гэтым часта гаршчок з кашай разбіваўся насамрэч: ***Разбівалі гаршчок****. Па кусочку елі. За кашу плацілі грошы. Калі* ***разбівалі гаршчок****, чарапкі дарылі* (в. Туры, Стол.). І адбывалася гэта дзеянне па-рознаму ў розных частках рэгіёна: *Кум доўжан заплаціць бабе за гаршчок, ён плоціць ёй за гаршчок, тады, значыць, нада ету кашу падзяліць. Хто больша заплоціць, той будзя біць гэты гаршчок аб вугал стала* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

Наконт разбівання гаршка існуюць прыкметы: *Еслі каша не рассыпалася, не растрэсківалася, то ў дзіценка будзе харошая судзьба, здаровы будзе. Еслі растрэсківалася, будзе балець часта, нелады ў жызні будуць* (в. Меркулавічы, Чач.); *Чем больше кусочкав, тем больше шчасцье* (в. Бабічы, Рэч.).

Паводле народнай традыцыі рэшткі гаршка з бабінай кашай – *аскалепкі, аскалёпкі, аскепкі, чарапкі, черепкі* – захоўваюць доўгі час і выкарыстоўваюць для паляпшэння жыцця чалавека ва ўсіх сферах: *Гаршок разбівают, а асколкі прятчат, как реліквія, как памець, хранят* (в. Івакі, Добр.).

Чарапкі павінны спрыяць замужжу ці жаніцьбе: *Гаршок разбівалі і надзевалі на галаву, еслі халасцяк кум ці кума, штоб тая ўжо замуж пашла. Накінуць на галаву, прыкладуць* (в. Меркулавічы, Чач., перасяленцы з в. Карпавічы, Нараўл.); *З кавалкамі ад гаршка рабілі што: незамужнім дзеўкам на галаву лажылі, штобы замуж і дзеці* (в. Бабічы, Рэч.); *Адзявалі чарапкі незамужнім, нежанатым, каб хутчэй жаніліся* (в. Неглюбка, Ветк.).

Лічылася, што чарапкі ўплываюць на нараджэнне дзетак: *А чарапкі патом раскідвалі. Калі зловіш, тады ў цябе радзіцца дзевачка. Больша чарапкоў злавіць нада* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Чарапкі госці разбіраюць: незамужнія – каб замуж быстрэй выці, а тыя, у каго дзіцей німа – штоб паявілісь быстрэй* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.).

Рэшткі гаршка накіроўваліся на здароўе і павелічэнне гаспадаркі: *Кашу варыла кума. А кум яе разбівае. А тады елі і дамой бралі. Свіням, курам, штоб вяліся, а черепкі свіням паб'ём і ў поела для*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свіней. Клалі дзіцям на галаву, каб раслі (в. Старое Сяло, Ветк.); *Чарапкі клалі ў хлеў, каб вадзіліся свінні* (в. Неглюбка, Ветк.); *Чарапкі тыя бралі, казалі, што добра, каб да свіней у хлеў кідалі, каб свінні вяліся* (в. Меркулавічы, Чач.); *Кашу па кусочкам дамой бярюць, курям даюць, каб нясліся* (в. Хальч, Ветк.).

Гаршок з бабінай кашай на хрэсьбіны ў гаворках беларуска-украінскага памежжа называецца *махотка*. Слова ўжываецца ў семантычна і стылістычна роўных умовах з назвай *гаршчок*: *На хрэсбінах разбівалі* ***махотку*** *і дзялілі кашу. Аскепкі* ***махоткі*** *раздавалі разам з кашай. Яны мелі магічнае значэнне: каб замуж выйсці, жаніцца, дзяцей нарадзіць* (в. Покаць, Чач.); *Кашу маглі замяніць цукеркі, насыпаныя ў* ***махотку*** (в. Неглюбка, Ветк.). Іншы раз сустракаецца варыянт наймення *маходка: Кашу кума варыць. Нясе* ***маходку*** *на стол* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Кум падымае кашу і туды ўжо ложаць грошы на* ***маходку*** (в. Старое Сяло, Ветк.). Памяншальна-ласкальная форма слова перадае замілаванасць і павагу: *Кашу разбіралі і з* ***махоточкі*** *гэтыя асколкі, што пабіліся* (в. Старое Сяло, Ветк.).

У беларускіх гаворках слова *махотка* з'яўляецца спадчынай агульнаўсходнеславянскага моўнага адзінства. У рускіх гаворках слова

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адлюстраванне слова *махотка* ў рускіх гаворках у сувязі з прымяненнем посуду ў адносінах да малака і масла пралівае святло на этымалогію слова і выяўляе яго сувязь з дзеясловам *махати* ў значэнні ‘збіваць масла дамашнім спосабам’ з кантэкстуальнай фіксацыяй: *Завтра уж вечером займусь* ***масло махать*** [17, вып.18, с. 46]. Значэнні дзеяслова ‘рэзаць’ (*махать хлеб*) і ‘біць, калаціць’ набліжаюць яго да семантыкі наймення *махотка* ‘гаршок на хрэсьбінах’.

Традыцыя бабінай кашы добра вядома ўкраінскай народнай абраднасці: *Обов’язковою стравою була* ***бабина каша****, яку приносила баба-пупорізка* [16]. Ва Украіне яна гатавалася з проса ці грэчкі. Падчас хрэсьбін госці адорвалі маладую маці, дзіця і бабу палатном і манетамі.

Адметным украінскім хрэсьбінным абрадам, які здзяйсняе баба-павітуха, з’яўляецца *квітка*: *Під кінець спільної гостини баба-повитуха або найстарша жінка з родини роздавала кожному з гостей «****квітку****»: китички зв’язаних живих квітів і колосся – влітку, калину, барвінок і колоски – зимою. «Квітку» клала вона на тарілку, біля неї ставила чарку горілки і підносила кожному, примовляючи: «Просимо на квіточку і горілочку, на винце і добре слівце». Гості кидали гроші, особливо щедрили куми* [19]. Звычай таксама меў практычную накіраванасць і мусіў спрыяць будучаму дабрабыту дзіця: *Разом із «квіткою» давалися калачі, щоб дитя у майбутньому не відчувало нестатків ні в чому, як відчуває всякий, хто має хліб* [19].

Важная дзейнасць бабы-павітухі ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці ўсходніх славян – гэта першае купанне дзіця, якое спрадвеку мела магічнае значэнне і суправаджалася разнастайнымі рытуаламі: *Бяруць бабку павітуху, і ўжо яна прыходзіць* ***мыць дзіцяці****, калі яно толькі нарадзілася* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.).

У некаторых раёнах беларуска-ўкраінскага памежжа захоўваецца традыцыя на першае купанне дзіця *нож лажыць*: *Калі купалі дзіця,* ***ложылі нож****, каб дзіцяця добра была* (в. Туры, Стол.). Неабходным для здароўя чалавека, па народных уяўленнях, было прымяненне падчас першага купання лекавых раслін: *Ну колы купалы малого, набыралы теплу воду, в якую* ***клалы травы****, коб діте здоровым було* (в. Вулька, Іван.). Да карысных травак часам дадавалі малако, якое мела свае функцыі: *Калі дзіця першы раз купалі дома, туды клалі лячэбныя травы, каб было здаровым, набіралася сілы ад зямлі. Малако лілі, каб цела было чыстае, асобенна ў дзевачак* (в. Меркулавічы, Чач.).

Першае купанне адметнае і ва ўкраінскіх хрэсьбінах: *Потім наставала* ***перша купіль****, яка мала і гігієнічне, і магічне значення* [15]; *Щоб дитина росла здоровою,* ***у першій купелі*** *використовували*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свячене зілля або свячену воду [21]. Украінскія народныя ўяўленні блізкія да беларускіх наконт дадаткаў у ваду першай купелі: *На першу купіль додавали свячену воду, зілля, гроші і шматочок хліба або зерно* [19]; *У воду для дівчаток додавали «свячене зілля», мед, квіти або молоко, щоб ті були красивими, корінь оману для хлопчика – щоб був сильним* [15]; *Хлопчику до купелі клали дев'ясилу («щоб сильним був»), а дівчинці додавали меду, квітів, молока («щоб гарною була»)* [21]. Абавязкі мелі і госці хаты: *Кожен, хто приходив до хати під час першої купелі, мав кинути до неї монету «на щастя»* [21].

Не забывалася ў абрадзе першага купання печ, да якой усходнія славяне заўсёды ставіліся паважліва, шануючы і дзякуючы за цяпло і гарачую смачную ежу. Печ з'яўлялася цэнтрам усходнеславянскай хаты. Падчас хрэсьбін як працэсу ўводзін новай асобы ў шэраг вернікаў і ў сям'ю печ прымала на сябе разам з функцыямі матэрыяльнымі (абагрэў і высушванне выкупанага немаўля) ролю пасрэдніка ў сацыялізацыі нованароджанага, уключэння дзіця ў існуючыя сямейна-родавыя адносіны: *Малюка обсушували біля печі, яка розпалювалася, прилучаючи нового члена сім'ї до домівки. Сина загортали у сорочку батька, дочку – в материнський одяг* [15].

Нездарма для першага купання дзіця звычайна бралі ваду, што цячэ, рухаецца, тады "*буде і доля рухатися*" [19]. Пасля купання бабка-павітуха спавівае дзіця і, згодна з народнай традыцыяй, кладзе да немаўляці кавалак хлеба, соль, вугольчык, гліну з печы (зноў печ выкарыстоўваецца ў абрадзе): *Коли хтось із поганим оком на дорозі зустрічається, слід приказувати: "Сіль тобі в очі, печина тобі в зуби, залізяка на груди!"* [21].

Даследаванне радзінна-хрэсьбінных абрадаў, звязаных з бабкай-павітухай, і іх найменняў у беларускіх і ўкраінскіх гаворках выявіла разнастайнасць рытуальных дзеянняў і абрадаў, якія народная свядомасць "даручае" гэтай асобе. Разгледжаныя намінацыі, як і абрады, што яны абазначаюць, маюць старажытнае агульнаўсходнеславянскае паходжанне, але ў гаворках развіліся і мясцовыя спецыфічныя адрозненні, якія сведчаць аб непаўторнасці і самабытнасці кожнай з усходнеславянскіх моў і кожнага з усходнеславянскіх народаў.

1.2.6 Адведкі ў радзінна-хрэсьбіннай культуры беларусаў

Нараджэнне пачынае жыццё чалавека і адначасова з'яўляецца лагічным вынікам і працягам створанай і сацыяльна замацаванай падчас

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вяселля сям'і. Прыгадаем, што на вясельных святкаваннях асноўнымі пажаданнямі гасцей маладым было мець шматлікіх "сыночкаў і дочкаў".

Важнасць і значнасць стану цяжарнасці, чакання дзіця адзначаецца ў беларускай народнай культуры адпаведнымі традыцыямі, абрадамі, прыкметамі. Адметнае месца ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў займае традыцыя адведак, або наведвання толькі што нарадзіўшай жанчыны іншымі жанчынамі.

З традыцыяй адведак, як і з іншымі радзінна-хрэсьбіннымі абрадамі, у беларускай народнай культуры звязаны шматлікія вераванні. Наведваць маладую маці прыходзілі толькі замужнія, а ў некаторых частках Беларусі – жанчыны, якія мелі дзяцей. Не наведвалі парадзіху цяжарныя. Жанчына, што не наведала парадзіху, звычайна асуджалася. Тэрмін наведвання парадзіхі таксама вагаўся ў розных раёнах Беларусі. У большасці выпадкаў дыялекталагічныя і этнаграфічныя матэрыялы расказваюць аб адведках на трэці-чацвёрты дзень пасля родаў. Аднак на ўсходнім Палессі наведванне парадзіхі часам здзяйснялася на працягу двух тыдняў.

Адведкі з'яўляюцца своеасаблівым сімвалам прыняцця дзіця ў склад грамадства, у калектыў сваякоў і суседзяў і паходзяць з часоў першабытнаабшчыннага ладу. Разам з тым, гэты абрад мае яскрава выражаны практычны і гуманны характар, бо традыцыя заклікана дапамагчы парадзісе аднавіцца пасля фізіялагічных зрухаў арганізму падчас родаў. Нездарма ў традыцыях беларусаў абавязковым было пры наведванні парадзіхі прынесці ёй высокакаларыйныя прадукты харчавання: яечню, хлеб, кашу, сыр, мёд, масла. На Палессі да гэтага дадавалі яшчэ боршч, аладкі, варэнікі, сырнікі і ўзвар, або кампот з сушаных чарніц.

А парадзіха, нават калі і добра сябе адчувала, убачыўшы наведвальніц на парозе дома, клалася ў ложак і прымала жанчын. Наведвальніцы падрабязна распытвалі пра здароўе парадзіхі, аб працяканні родаў. Аднак нованароджаным у гэты час не цікавіліся, нават не пыталі пра пол дзіця. Па народных вераваннях, гэта магло нанесці шкоду здароўю малога, сурочыць яго.

Беларуская народная культура не забылася ў абрадзе адведак і пра мужчын. Мужчыны не хадзілі наведваць парадзіху і нават не маглі частавацца ласункамі, што прынеслі ёй. У рэдкіх выпадках застолля для жанчын-наведвальніц яго якраз і ладзіў муж парадзіхі. І. С. Махоўская фіксуе звычай, распаўсюджаны калісьці ў Магілёўскай губерні: "Ежу, якую прыносілі наведвальніцы, забаранялася есці мужу парадзіхі, яе маглі прабаваць толькі сама парадзіха, сёстры і браты нова-народжанага" [24, с. 52]. На думку даследчыцы, у гэтых звычаях

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прасочваюцца “ўяўленні аб агульнай Долі, якую неабходна пера-размяркоўваць пасля кожнага новага нараджэння ці смерці” [24, с. 53].

Беларуская абраднасць наведвання парадзіхі захавала цікавую лексіку і фразеалогію. Сам абрад мае некалькі найменняў. Часцей сустракаецца назва *адведкі*. Прычым слова ўжываецца ў форме множнага ліку і з прыназоўнікам *у*. У фанетычна-арфаграфічных адносінах адзначаюцца два варыянты лексемы: *атведкі* і *адведкі*, абумоўленыя адрозненнямі мясцовага вымаўлення: *Ну гэта* ***ў атведкі*** *прыходзілі, штот прынясуць, то і іхняе ужо* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Пойдам* ***у атведкі.*** *Раньшэ прыносілі што? Наваруць узвар кампоту і гэта первае блюда было; Камандавала адна баба можа там, уважаемая. І праглашалі тагда* ***ў атведкі*** (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *У хуткім часе пасля родаў да парадзіхі прыходзілі* ***ў адведкі*** *замужнія жанчыны.* ***У адведкі*** *было прынята прыходзіць без запрашэння* [4]; *Характэрна, што, знаходзячыся* ***ў адведках*** *па некалькі гадзін, ніводная жанчына зусім не цікавілася нованароджаным, каб не пашкодзіць яго здароўю* [25].

Лексема *адведкі* паходзіць са старажытнарускага *отвѣдины* ‘наведванне хворага роднымі і знаёмымі’ [7, т. 2, с. 717] і ўзыходзіць да дзеяслова *отвѣдывати* ‘спрабаваць’, ‘праведаць, наведаць’ [7, т. 2, с. 717]. Этымалагічны пачатковы галосны [о] часам захоўваецца ў слове ў беларускіх гаворках. Пры гэтым найменне змяняе месца націску: *Бабы хаділі* ***ў отведы*** *к Марусі, ена толькі заўчора раділа* (в. Ручаёўка) [3, с. 223].

Спецыфічнай беларускай фанетычнай адметнасцю з’яўляецца развіццё пратэтычнага [в] перад пачатковым націскным галосным [о], паводле чаго фіксуюцца адпаведныя варыянты наймення абраду: ***У вотведкі****? Ну што нясуць? Хто што прынясе…* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Пойдам к Веры* ***у воцьведы*** *з Васілём* (в. Дзяражычы) [3, с. 70]. Зноў неабходна заўважыць адрозненні ў вымаўленні зычных [т] – [ц’] у слове, абумоўленыя мясцовымі моўнымі адметнасцямі.

Зрэдку сустракаецца варыянт наймення з формай слова ў адзіночным ліку: *Пасля нараджэння дзіця ўсе жанчыны павіны былі наведаць роджаніцу, акрамя цяжарных, а тая, што ішла* ***ў адведку****, абавязкова павінна была паляжаць у ложку* [26].

Беларуская народна-традыцыйная культура захавала і іншыя найменні для ўказанага абраду. Назва *провідкі* мае дэрывацыйныя сувязі з тым самым старажытнарускім дзеясловам *отвѣдывати,* што і варыянт *адведкі*: *Пасля родаў парадзіху наведвалі суседкі, сяброўкі, абавязкова замужнія. Такое наведванне называлася* ***адведкамі****, або*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

провідкамі [5]. Украінскі ўплыў на лексему *провідкі* вызначаецца ва ўжыванні галоснага [і] на месцы старажытнарускага *ѣ*.

Для традыцыі наведвання парадзіхі адзначаюцца найменні *вотпыты* і *радзіны: Наступным крокам у працэсе вяртання парадзіхі ў сферу «свайго» было наведванне яе суседкамі і сваячкамі ў першыя некалькі дзён пасля родаў. Такія наведванні называліся ў беларусаў* ***«адведкі», «вотпыты», «радзіны», «провідкі»*** [24, с. 52–53].

Беларуская традыцыйная культура захавала адметныя ўстойлівыя выслоўі, звязаныя з абрадам адведак. Прыведзены фактычны матэрыял сведчыць, што часцей ужываецца спалучэнне *хадзіць (ісці, прыходзіць) у адведкі.* Менш пашыраным з'яўляецца выслоўе, што называе стан: *быць (знаходзіцца) у адведках*.

А ў час самога наведвання парадзіхі жанчыны прапаноўвалі ежу з разнастайнымі пажаданнямі: *З'еш, каб заклалася месца ў жываце, Што выйшла з радзільніцы, то штоб папоўнілася, Малае прыміця, а на большае выбачайце* [25]. Пасля гэтых пажаданняў парадзіха каштавала і хваліла ласункі, каб хутчэй набрацца сіл, а ў дзіця, па народных вераваннях, тады добра будуць расці зубкі.

У беларускай народнай лексіцы і фразеалогіі знайшло адлюстраванне і адметнае становішча мужчын. Пра мужчыну, які выпадкова апынуўся ў адведках ці заходзіў у час адведак у хату, па вёсцы казалі *пуп аблізаў* [25].

Даследаваны фактычны матэрыял дае падставы адзначыць, што беларусы са старажытнасці захавалі адметную народную культуру. Карані беларускай народна-традыцыйнай культуры знаходзяцца ў агульнаўсходнеславянскай, агульнаславянскай і агульнаеўрапейскай культуры. Традыцыі радзінна-хрэсьбіннага абраду беларусаў абумоўлены шматвяковым практычным вопытам народа.

Адведкі як адзін з абрадаў радзінна-хрэсьбіннага комплексу мае ўстойлівае функцыянаванне ў беларускай культуры. Замацаваліся ў лексіцы і фразеалогіі беларускіх гаворак выслоўі, звязаныя з абрадам адведак, а таксама варыянты яго намінацыі, якія маюць старажытнарускае паходжанне і па фанетычных і граматычных паказчыках адпавядаюць асаблівасцям мясцовага вымаўлення.

1.2.7 Кум і кума ва ўсходнеславянскіх гаворках

Памянёны фактычны матэрыял выяўляе мэтазгоднасць лінгвістычнай увагі да найменняў хросных ва ўсходнеславянскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гаворках. Дадзеныя лексемы выяўляюць агульныя і спецыфічныя ўласцівасці кожнай усходнеславянскай мовы.

Хросныя з'яўляюцца важнымі дзеючымі асобамі радзінна-хрэсьбіннага абраду беларусаў. У гаворках гэтыя асобы маюць варыянтныя найменні: *крёсные, кросныя, хрёсныя, хросная маці і хросны бацька, хросна матка, хросны бацька, хросныя.* Варыянтнасць выклікана неаднароднасцю ўспрыняцця гаворкамі спалучэння плаўнага з рэдукаваным *-рь-* у становішчы паміж зычнымі (старажытнарускае *крьстъ*) і рознымі адносінамі гаворак да цвёрдаэрасці.

Аб выбары хросных бацькі клапаціліся да хрэсьбін і нават да родаў, бо на хросных кладзецца адказнасць за будучыню дзіця: *Хросныя поручаюцца за яго жызнь, за ўсо на свеце* (в. Меркулавічы, Чач.); *Хросныя – пасаджаныя бацькі на хрэсьбінах* (в. Колбаўка, Ветк.). Нездарма ў праваслаўнай традыцыі адносна хросных ўжываецца тэрмін *восприемники* [9].

Адказнасць за пахрышчанага ўзрастала ў выпадку смерці бацькоў: *Калі паміралі родныя бацькі, кумы бралі яго да сябе і васпітывалі як раднога, мацерыяльна паддзержывалі, падаркі на Паску дарылі* (в. Меркулавічы, Чач.).

Абавязкі абумовілі патрабаванні да кандыдатур хросных: *Кросных вібіраюць сваіх друзей, знакомых, радню, любога могуць выбраць, кто панравіцца. Кросны адзін і кросна адна* (в. Церахоўка, Добр.); *Каб не перадаць сваё замужжа хрэсніку, трэба, каб жэншчына хрысціла первым хлопчыка, а мужчына – дзеўку* (в. Меркулавічы, Чач.). Патрабаванні аб сямейным стане хросных не заўсёды былі строгія: *Хросныя былі ўсё раўно хто: ці замужняя, ці не замужняя* (в. Коззе, Рэч.).

Традыцыя паслядоўна прадугледжвае паводзіны хросных падчас хрышчэння: ***Бацька хросны*** *должан быў заплаціць за хрышчэнне і купіць крэсцік, а* ***мамка хросная*** *далжна купіць адзежку новую і пераадзець дзіценка перад тым, як везці яго хрысціць. Перад тым, як ехаць, мамка перадае* ***мамке хроснай*** *дзіценка, а калі крысцяць, аддаюць абратна* (в. Меркулавічы, Чач.).

Паводле ўкраінскай народнай традыцыі выбар хросных, якія ва ўкраінскіх гаворках называюцца *хрещені батьки*, таксама грунтоўны: *Це міг бути хтось із рідні чи добре знані статечні односельці. До них йшли з хлібом і просили стати* ***хрещеними батьками*** *дитини* [19]; ***Хрещені батьки*** *сприймалися як представники громади, посередники між громадою та батьками* [16].

Адпаведную двухслоўную канструкцыю ведаюць беларускія і рускія гаворкі: *Насілі хрысціць дзіця ў царкву* ***хрышчоны бацька і хрышчоная***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маці *— кум і кума, якія падбіраліся з паважаных багатых нестарых людзей і для якіх давер сям'і нованароджанага быў вялікім гонарам. У задачу* ***хрышчоных бацькоў*** *уваходзіла даць імя дзіцяці* [5]; ***Крестный отец*** *и* ***крестная мать*** *считались вторыми родителями младенца и несли за него ответственность перед Богом* [9].

Дзіця ў адносінах да хросных у беларускіх гаворках называецца фанетычна-словаўтваральнымі варыянтамі *хроснік, хросніца, хрэснік, хрышчэніца,* і двухслоўнымі найменнямі *хросная дачка, хросны сын, хрэшчонае дзіця*. Для назвы дзіцяці ў адносінах да хросных у рускіх гаворках адзначаюцца: *крестникъ, крестница, крестное дитя, крестовое дитя* [7, т. 2, с. 191]. Пахрышчанае дзіця ва ўкраінскіх гаворках мае назвы *похресник, хрещеник*: *Для* ***похресника*** *куми були другими батьками, оскільки мали обов'язок опікуватися дитиною, брати якомога більшу участь у її вихованні* [27]; *Хрещені батьки шанувалися нарівні з рідними і зобов'язані були всіляко піклуватися про* ***хрещеників*** [15].

У адносінах да бацькоў пахрышчанага і адзін да аднаго хросныя называліся *кум, кума, кумы*. Народная традыцыя рэкамендуе, якіх асоб выбіраць у кумы: *Удоў, развядзёнак кумамі не бралі* (в. Пакалюбічы, Гом.); *Кумоў выбіралі з сям'і благапалучнай, штоб дастатак быў, рабацяшчыя, штоб дзеці свае былі* (в. Меркулавічы, Чач.); *Як хрысцяць, дак кума далжна павіток даць, а тады кума дае падарак куме за сталом*. (в. Старое Сяло, Ветк.); *Кумам і кумой з харошых людзей выбіралі, штоб ні былі разводныя, штоб дзіцёнак быў у доме* (в. Меркулавічы, Чач., перасяленцы з в. Шылавічы, Чач.).

Вядомы лексемы *кум, кума* і рускім гаворкам: ***Кум*** *и* ***кума*** *– крестные отец и мать по отношению к родителям окрещенного и по отношению друг к другу* [11]; *Приходи,* ***кума****, любоваться, смеяться* [17, вып.16, с. 78].

Асобы кума і кумы мелі ў старажытнасці і маюць зараз адметнае значэнне ва ўсіх падзеях сямейнай абраднасці. Традыцыйна яны не толькі прымаюць непасрэдны ўдзел у хрышчэнні, але і з'яўляюцца актыўнымі вясельнікамі (удзельнікамі вясельных абрадаў). Усходнеславянскі фальклор захаваў шматлікія прыказкі, звязаныя з кумамі: *Кумъ-то кумъ, да деньги не кумъ. Не спѣши, куманек, не вздутъ огонек. За спесивымъ кумомъ не находишься съ блюдомъ. При кумѣ не жить, а безъ кума не быть. Два кума Абакума, двѣ кумы Авдотьи. Четыре двора, а въ каждом дворѣ кумъ да кума. Кумъ говоритъ наобумъ, у кума бери на умъ. Кума да кумъ наставятъ на*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

умъ! Добрая кума прибавит ума. Кому до чего, а кумѣ до всего [7, т. 2, с. 218].

Для кума і кумы рускія гаворкі захавалі назвы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У. Даль падаў старажытныя варыянты назваў *кмотръ* і *куе*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

усходнеславянскіх народаў развіліся свае адметнасці ў правядзенні разгледжаных рытуалаў, а ў іх найменнях адлюстраваліся спецыфічныя ўласцівасці кожнай з усходнеславянскіх моў.

1.2.8 Хрышчэнне ва ўсходнеславянскіх мовах

З'яўленне новага чалавека і ўваходжанне яго ў акаляючае жыццё, у прыродны свет і соцыум спрадвеку суправаджалася шматлікімі рытуаламі, якія паступова сфарміраваліся ў адпаведныя традыцыі з адметнымі і своеасаблівымі назвамі.

Найменне таямніцы далучэння да хрысціянскай царквы ў большасці еўрапейскіх моў узыходзіць да двух каранёў. Першы з іх мае паходжанне са старажытнагрэчаскага *βάπτισμα* – *baptista* 'пагружэнне'. Грэчаскае запазычанне прыняла лацінская мова, дзе ўтварылася *baptismo*. Пазней з латыні абрадавыя назвы перайшлі ў мовы каталіцкіх краін Заходняй Еўропы. Іспанскае *bautizo*, італьянскае *battesimo*, партугальскае *batismo*, французскае *baptême* нават без грунтоўнага этымалагічнага пошуку выкрываюць свае крыніцы. Убачыць грэчаскую аснову можна ў ірландскім *baisteadh* і румынскім *botez*.

Найменне з другім коранем замацавалася ў мовах славянскіх народаў: балгарскае *кръщение*, македонскае *кштевање*, рускае *крещение*, сербскае *кштење*, славацкае *krst*, чэшскае *křest*. Гэтыя варыянты паходзяць ад праславянскага **krьstъ* і стараславянскага *крьстъ*, узнікненне якога М. Фасмер звязваў з імем *Хрыстос* і лацінскай назвай распяцця *crucifuxus* [29, т. 2, с. 374].

Ужо са славянскіх моў найменне было запазычана мовамі суседніх неславянскіх народаў, і пасля фанетыка-арфаграфічнай адаптацыі з'явілася вянгерскае *keresztség*, латышскае *kristības*, эстонскае *ristimine*.

Паколькі абодва ўказаныя карані шчыльна звязаны з хрысціянствам і хрысціянскімі традыцыямі, заканамерным з'яўляецца захаванне ў некаторых еўрапейскіх мовах варыянтных назваў: англійскія *baptism* – *christening*, літоўскія *krikštas* – *baptism*. Адзначым, што варыянтныя назвы хрышчэння існуюць і ў славянскіх мовах. Характэрна, што варыянтнасць адзначаецца ў мовах тых славянскіх краін, дзе каталіцкая царква спрадвеку моцная: польскае *chrzest* – *Baptism*, харвацкае *krštenje* – *baptizam*.

Нягледзячы на наяўнасць сярод беларусаў і ўкраінцаў дастатковай колькасці асоб каталіцкага веравызнання, ва ўсходнеславянскіх мовах гістарычна замацавалася назва абраду, традыцыйная для праваслаўя:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускае *хрышчэнне*, рускае *крещение*, украінскае *хрещення*. Найменні за аснову маюць стараславянскае *кретенѥе*. Поўны царкоўнаславянскі слоўнік тлумачыць семантыку лексемы такім чынам: ‘христіанское таинство, въ которомъ вѣрующій при троекратномъ погруженіи въ воду во имя Отца, и Сына, и Святаго Духа умираетъ для жизни грѣховной и рождается въ жизнь святую; разумѣется и все церковное послѣдованіе, среди котораго совершается это таинственное возрожденіе’ [18, с. 310].

Найбольш дакладна царкоўнаславянізм захаваны рускай літаратурнай мовай, што абумоўлена гістарычнымі фактарамі, сярод якіх асноўную ролю адыграў другі паўднёваславянскі ўплыў 15–16 ст., узвысіўшы аўтарытэт і праваслаўя, і яго афіцыйнай (царкоўнаславянскай) мовы. Часцей слова ўжываецца з семантыкай ‘царкоўны абрад’: ***Крещение*** *старались провести в течении последующих двух-трех недель* [11]; *Кум должен купить крест и заплатить за* ***крещение*** [11]; ***Крещение*** *ребенка – одна из самых волнительных церемоний в жизни ребенка и его родителей* [31]; ***Крещение*** *– одно из семи христианских таинств, совершение которого означает введение человека в лоно церкви* [28].

Абрады і традыцыі, звязаныя з царкоўным абрадам хрышчэння, якія здзяйсняюцца па-за царквой, у рускай літаратурнай мове часцей маюць назву *крестины*: *Родители ребенка готовили в доме праздничный обед, который назывался* ***крестины*** [11]; ***Крестины*** *– праздник, посвященный ребенку, который вступает в лоно церкви, именно об этом следует помнить и проводить его в соответствующем духе* [28].

Падобная дыферэнцыяцыя захоўваецца ў рускіх мастацкіх творах, што паказваюць матэрыялы Нацыянальнага корпусу рускай мовы [23]. Хаця сустракаюцца і адхіленні ад гэтай заканамернасці: ***Крестины*** *– православный обряд введения новорожденного в христианскую общину* [28]; *Начался обряд* ***крещения****, зажгли свечи. Громко и сочно запел дьякон, помахивая кадилом, участники пошли вокруг купели. Крошечная Настенька, услышав полногласное пение дьякона, завопила истошным криком, успокоить ее было невозможно. А* ***крестины*** *продолжались, священник читал молитвы по чину и тоже подпевал дьякону. Настеньку окунули в купель, и тогда она совсем зашлась от крика* (Лидия Вертинская, «Синяя птица любви», 2004) [23].

У гаворках рускай мовы адзначаецца разнастайнасць найменняў абраду без семантычнай дыферэнцыяцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спалучэння зычных *-стб-*: *крэсьбіны, крэтьбины, хрэсьбіны*. Не трэба забываць і пра нехарактэрнасць беларускім і заходнерускім гаворкам стараславянскага *щ*, што выяўляецца ў імкненні да замены паўднёваславянскага зычнага рознымі адпаведнікамі: перш за ўсё праз спалучэнне *шч*, а таксама да выкарыстання іншых словаўтваральных сродкаў.

Для гаворак украінскай мовы паўднёваславянскі зычны не такі чужы. Украінскае найменне абраду яго захоўвае: *Церковний обряд* ***хрещення*** *в кожній українській родині відзначався особливою урочистістю цієї важливої події* [21]; *У церковному бряді* ***хрещення*** *на перший план виступають хресні мама і тато (куми)* [27].

Ва ўкраінскіх гаворках таксама адзначаюцца варыянтныя адпаведнікі назвы абраду. Аднак назіраецца дакладная семантычная дыферэнцыяцыя: *хрестини* ‘народныя абрады, звязаныя з хрышчэннем’, *хрещення* ‘назва царкоўнага абраду’: ***Хрестини*** *раніше намагалися зробити у день народження* [21]; *Крім родин, влаштовували і* ***хрестини****, в яких розрізнялися дві частини: народна і релігійна, церковна* [19]; *Пізнішу форму ім’янаречення, пов’язували з* ***хрещенням*** *– «йти за молитвою»* [16].

Хрэсьбінная абраднасць усходніх славян мае дастатковую разнастайнасць традыцый і рытуалаў. Натуральна, што многія з іх утрымліваюць у сваёй назве дэрываты ад кораня *крест-*. Царкоўны абрад меркаваў спецыяльнае адзенне, што адпаведна называлася *крестильнае, хрысцільнае*: ***Хрысцільны*** *ўбор шылі з новай, абавязкова з белай (светлай) тканіны, упрыгожваючы яго карункамі, гафтам* [25]; *Кума должна сшить* ***крестильную*** *рубашку* [11]; *Мать могла вышить* ***крестильную*** *простынку, довольно часто она переходила от старшего ребенка к младшему* [11]. З семантыкай ‘які мае адносін да хрэсьбін’ у беларускай мове ўжываецца і прыметнік *хрысцінны*: ***Хрысціннае*** *акунанне ў ваду несла тую ж семантычную нагрузку, што і язычаскае першае купанне* [24, с. 53].

Ад таго самага кораня ўтварылася і захаванае ва ўсходнеславянскіх гаворках слова

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лацінскага *chrisma* і грэчаскага *χρῖσμα* [29, т. 2, с. 376].

Большае пашырэнне мае *крыжма* ва ўкраінскай хрэсьбіннай традыцыі. Украінскія гаворкі захоўваюць звесткі пра *крижму*: *Хресні мама і тато повинні були мати «**крижму**» – біле полотно, на якому тримали дитину під час хрещення* [21]; *Коли куми приходять, приносять із собою хліб, а кума – **крижмо*** [32]; *Та майже всюди в Україні **крижма** – головний атрибут дійства. Загалом **крижмою** називають біле простирадло, або рушник, в яке обгортають під час хрещення людину відразу ж після триразового занурення у воду. Взагалі, за церковними правилами, це повинна бути біла нова одежина для немовлят або біла нова сорочка для дорослого* [33]. Ва ўкраінскай народнай традыцыі лічыцца, хто захаваў *крыжму*, той захаваў свае шчасце.

У перакладах мастацкіх тэкстаў з украінскай мовы на рускую, нягледзячы на наяўнасць у рускіх гаворках лексемы *крижма* ў розных граматычных формах, яе адпаведнікам выступае множналікавае ўтварэнне *ризки* ‘ткань, въ которую воспріемники принимаютъ младенцевъ отъ купели’ [7, т. 3, с. 96]: *Кумом візьмемо Лясковського – чоловік значний і нужний, а кумою буде генеральша Яловська – вона **крижмо** хороше дасть* (Іван Карпенко-Карий, «Мартин Боруля» (1886) – *Кумом возьмем Лясковского, человек почтенный и нужный, а кумой будет генеральша Яловская, она **ризки** хорошие даст*…(пераклад Б. Турганава, 1954) [23].

Даследаваны матэрыял дазваляе адзначыць, што ўтварэнні ад праславянскага кораня **krьst-* ва ўсходнеславянскіх мовах маюць надзвычай старажытнае паходжанне. Некаторыя з разгледжаных намінацый захоўваюцца ў гаворках з часоў агульнаіндаеўрапейскага адзінства. Гэтыя назвы прыйшлі да ўсходніх славян і замацаваліся ў іх гаворках з пашырэннем хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Мова працягвала развівацца, і старажытнейшыя словы ўтварылі ў мовах усходніх славян уласныя словаўтваральныя гнёзды. У кожнай з моў і іх гаворках утварэнні ад праславянскага **krьst-* развіваліся па-рознаму і набылі з часам спецыфічныя адметнасці як у адносінах фанетычных і арфаэпічных асаблівасцей, так і ў семантыцы.

1.2.9 Уплыў генезісу на варыянтнасць радзінна-хрэсьбіннай лексікі беларускіх гаворак

Вывучэнне лінгвістычных адметнасцей радзінна-хрэсьбіннай лексікі мяркуе выяўленне яе генезісу і этымалагічных асаблівасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Субстантываваны прыметнік *цяжарная* трывала ўвайшоў у слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Паходжанне субстантыва відавочнае: ад назоўніка *цяжар* ‘цяжкасць, нешта цяжкае, тое, што абцяжарвае’.

Чаканне і нараджэнне дзіцяці заўсёды было працэсам таямнічым і часта даволі небяспечным, таму ў народзе спрадвеку было імкненне не абазначаць дакладна асаблівы стан жанчыны, каб не сурочыць роды. З гэтай прычыны ў гаворках для назвы цяжарнай жанчыны выкарыстоўваюцца мнагазначныя прыметнікі тыпу *грубая, тоўстая,* а ў літаратурнай мове захоўваюцца апісальна-эўфемічныя найменні цяжарнай: *будучая маці, чакаць дзіця (папаўнення).*

Беларускія найменні жанчыны падчас родаў *рожаніца*, *роджаніца, парадзіха* паходзяць ад старажытнага кораня *род-* і выкарыстоўваюць прадуктыўны ў беларускай мове афікс *-аніц-* у значэнні ‘назва асоб жаночага полу паводле заняткаў’. Паралельнае ўжыванне зычнага і афрыкаты *д//дж* мае гістарычныя вытокі і абумоўлена адрозненнямі лёсу праславянскага спалучэння **dj* ва ўсходнеславянскіх гаворках: у гаворках рускай мовы **dj* змянялася на [ж], часам пад уплывам стараславянскай мовы – на [жд] (*рождение*), у гаворках беларускай мовы на месцы **dj* ужываюцца зычныя [ж] і [дж]. Прычым афрыката [дж] – спецыфічная фанетычная рыса беларускай мовы.

Калі лексемы *рожаніца (роджаніца)* называюць часцей жанчыну ў час родаў, то слова *парадзіха* мае семантычнае адценне ‘жанчына, якая нядаўна нарадзіла дзіця’. Карані наймення таксама ў слове *род*. Назоўнік утварыўся ад дзеяслова *родити.* Прыстаўка *па-* надае ў семантыку слова значэнне ‘пасля’ (*пасля родаў*). Адзначым і прадуктыўны для беларускіх гаворак суфікс *-іх-* з семантыкай ‘назва асоб жаночага полу паводле ўласнай прафесіі ці рамяства або паводле прафесіі мужа’ (*каваліха* ‘жонка каваля’, *ткачыха*).

Як і назвы *рожаніца, роджаніца, парадзіха*, выяўляе сувязь са словамі *род*, *роды* адно з найменняў бабкі-павітухі *прыродніца.* Ад кораня *род-* вядуць паходжанне ў лексіцы родавага цыклу і найменні самога працэсу, якія таксама называюць і ўвесь комплекс абрадаў, звязаных з нараджэннем і хрышчэннем: *радзіны*, *народзіны*, *нарадзіны*.

Для абраду хрышчэння ў беларускіх гаворках таксама захаваліся варыянтныя найменні. З фанетычнымі адрозненнямі захоўваецца ў гаворках характэрная для беларускай літаратурнай мовы намінацыя *хрэсьбіны*, *хрэзбіны, крэсьбіны, хрысбіны.*

Група варыянтаў назвы абраду з’яўляецца беларускай народнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

агаласоўкай царкоўнаславянізма кретенѥ: *крашчэнне, крешчэніе, крэшчэнне, храшчэнне.*

Захоўваюць беларускія гаворкі абеларушанае слова рускай мовы *крестины*: *кресціны, крысціны, хрэсьціны.*

Варыянтнасць назіраецца і сярод дзеяслоўных назваў: *крестіть, крэсьціць, крысціць, пахрэсціць, пахрысціць, храсціць, хрысціць.*

Існаванне варыянтаў абумоўлена ўплывам іншых моў: больш – рускай як адной з двух больш-менш раўнапраўна функцыянальных на тэрыторыі беларуска-ўкраінскага памежжа, менш – украінскай. Пэўны ўклад у разнастайнасць найменняў унеслі і мясцовыя асаблівасці фанетычнай адаптацыі на глебе беларускіх гаворак царкоўнаславянскай лексемы: розныя рэфлексы спалучэнняў зычных *кр-* і плаўнага з рэдукаваным *-рь-* паміж зычнымі (старажытнарускае і царкоўнаславянскае *крьстъ,* пазней *крестъ* – беларускае *крыж*).

Часам беларускія гаворкі прапануюць адметныя адпаведнікі слова *крыж*: *Нясуць пад* ***хрост****, эта поп перахрэсця, а тады хрэсьбіны дзелаяць, сабіраяць людзей і гуляюць* (в. Харашэўка, Добр.)

Разнастайнасць рэфлексаў спалучэнняў плаўнага з рэдукаваным у становішчы паміж зычнымі абумоўлена адметным лёсам рэдукаваных галосных ва ўсходнеславянскіх мовах. Страта рэдукаваных карэнным чынам змяніла ўсю фанетычную сістэму гаворак усходніх славян. У постпазіцыйным становішчы ў спалучэнні з плаўнымі зычнымі *р, л* лёс рэдукаваных залежаў ад іх пазіцыі ў слове адносна націску. У націскным становішчы рэдукаваны *ь* у слове *крьстъ* заканамерна змяніўся на [‘э]. У частцы ўсходнеславянскіх гаворак такое змяненне пашырылася на ўсе аднакарэнныя словы і ўзніклі варыянты тыпу *кресціны, кресціць*, у сувязі з зацвярдзеннем *р* – *крэсціны, хрэсьбіны*, а ў сувязі з аканнем – *храшчэнне.* У слабым ненаціскным становішчы *ь* страчваўся, утвараўся збег зычных, цяжкі для вымаўлення, што з часам кампенсавалася другасным галосным *ы* (утварэнні на ўзор *хрысціць*). Акрамя таго, існаванне варыянтаў абумоўлена ўплывам суседніх славянскіх моў: пашырэнне ў беларускіх гаворках лексем са спалучэннем *-ры-* на месцы старажытнага *-рь-* падмацавана ўплывам польскай мовы (*krzyż* ‘крыж’), таксама як лексем са спалучэннем *-ре-* – уплывам рускай мовы як адной з двух больш-менш раўнапраўна функцыянальных у Беларусі.

Паводле паходжання з лексемай *крьстъ* звязаны словы *крёсны, хросны, хрэснік*. Варыянтнасць найменняў, як і ў выпадку з назвай усяго абраду, выклікана неаднароднасцю адаптацыі царкоўнаславянскай лексікі і рознай якасцю зычнага [р] у беларускіх гаворках.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларускія радзінна-хрэсьбіныя традыцыі захавалі варыянтныя назвы дзіця паводле адметнасцей нараджэння. Назва першага дзіця ў сям'і *первенец* яскрава матывуецца парадкавым лічэбнікам *першы* – у рускай мове *первый*, паходзіць ад старажытнарускага *пьрвьшии*. Адказам на ўспрыманне пазашлюбных дзетак як выпадковых, знойдзеных у гаворках з'яўляецца найменне *знайдён*. Складанасці будучага жыцця пазашлюбных дзяцей і адносіны да іх грамадства выклікалі ў народным уяўленні аналогіі з пякучай раслінай, адсюль – узнікненне назвы *крапіўнік*. У беларускіх гаворках адзначаецца найменне *бахур*: *калі ў незамужняй жанчыны з'яўлялася незаконна-народжанае дзіця (байструк, крапіўнік,* ***бахур****), яна падвяргалася ўсеагульнаму асуджэнню, грамадскай ізаляцыі* [25]. Слова паходзіць ад старажытнарускага *бахорити* 'шмат гаварыць, паклёпнічаць, распаўсюджваць чуткі'.

Даследаванне варыянтнасці лексікі радзінна-хрэсьбіннага абраду ў сувязі з яе паходжаннем паказвае старажытнарускую аснову большасці найменняў у беларускіх гаворках. У выніку развіцця мовы ўказаная лексіка набыла спецыфічныя фанетычна-арфаэпічныя адметнасці і характарызуецца варыянтнасцю агаласоўкі. Лексічная варыянтнасць найменняў радзінна-хрэсьбіннай лексікі ў большасці выпадкаў абумоўлена адрозненнямі ў матывацыі і ўплывамі іншых моўных сістэм. Шматлікія радзінна-хрэсьбінныя намінацыі яскрава выяўляюць свае этымалагічныя сувязі і матывуюцца адпаведнымі дзеясловамі і назоўнікамі.

Літаратура

1. Прыводзіцца фактычны матэрыял картатэкі (тут і далей) лінгвістычнай лабараторыі кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» з указаннем лакалізацыі – населеных пунктаў раёнаў Брэсцкай (Іван. – Іванаўскі, Стол. – Столінскі) і Гомельскай (Браг. – Брагінскі, Буда-Каш. – Буда-Кашалёўскі, Ветк. – Веткаўскі, Гом. – Гомельскі, Добр. – Добрушскі, Жлоб. – Жлобінскі, Нараўл. – Нараўлянскі, Рэч. – Рэчыцкі, Чач. – Чачэрскі) абласцей і захаваннем фанетычных і граматычных адметнасцей мясцовага вымаўлення.
2. Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / рэд. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.
3. Янкова, Т. С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны / Т. С. Янкова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 432 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. Варфаламеева, Т. Б. Радзіны / Т. Б. Варфаламеева, Т. И. Кухаронак [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.kimpress.by. – Дата доступа: 27.02.2012.

5. Фядосік, Анатоль. Радзінна-хрэсьбінная і вясельная паэзія Беласточчыны / Анатоль Фядосік [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.zbsb.org. – Дата доступа – 27.02.2012.

6. Хрэсьбіны, або Радзіны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.ng.by. – Дата доступа – 22.02.2012.

7. Даль, Владимир. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / Владимир Даль. Т. 1: А – З. – 699 с. Т. 2: И – О. – М.: Русский язык, 1979. – 779 с. Т. 3: П. – М.: Русский язык, 1980. – 555 с.

8. Баранов, Д. А. Крестины и крестные родители / Д. А. Баранов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// www.ethnomuseum.ru. – Дата доступа: 22.02.20102.

9. Шангина, И. И. Семейный быт. Обряды жизненного цикла [Электронны рэсурс]. – Рэжим доступа: http://www.edapskov.narod.ru. – Дата доступа: 27.02.2012.

10. Листова, Т. А. Обряды и обычаи, связанные с рождением детей. Первый год жизни / Т. А. Листова // Русские / Рос. акад. наук, Ин-т этнологии и антропологии им. Н. Н. Миклухо-Маклая; отв. ред.: В. А. Александров и др. – М. : Наука, 1999. – С. 500–512. [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.jarusskiy.ru. – Дата доступа: 27.02.2012.

11. Блинова, А. Н. Родильный обряд русских Сибири [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.russkiymir.ru. – Дата доступа: 27.02.2012.

12. Крестины [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.ru.wikipedia.org. – Дата доступа: 22.02.2012.

13. Словарь иностранных слов / под ред. И. В. Лёхина, Ф. Н. Петрова. – М.: Государственное издательство иностранных и национальных словарей, 1949. – 800 с.

14. Крещение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kraevedenie.net. – Дата доступа: 22.02.2012.

15. Родильні (пологові) обряди [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://uk.wikipedia.org. – Дата доступу: 22.02.2012.

16. Лядецька А. В. Традиційна родильна обрядовість Наддніпрянщини в другій половині XIX – на початку XX століття [Єлектронний ресурс]. – Режим доступа: http://s-journal.cdu.edu.ua. – Дата доступа: 22.02.2012.

17. Словарь русских народных говоров: в 42 вып. / под ред. Ф. П. Филина [гл. ред.]. Вып. 15: Кортусы-Куделюшки. – Ленинград: Наука, 1979. – 400 с. Вып. 16: Куделя-Лесной. – Ленинград: Наука, 1980. – 376 с. Вып. 18: Масленичек-Мутарсливый. – Ленинград: Наука, 1982. – 368 с. Вып. 29: Покорочеть-Попритчиться. – С-Пб: Наука, 1995. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

18. Полный церковно-славянский словарь / сост. Г. Дьяченко. – Спб., 1898. – 1159 с.

19. Медведчук Галина. Родильні обряди [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://garbuz.org.ua. – Дата доступу: 22.02.2012.

20. Фраземи родильних обрядів у лексикографічному описі [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://bestreferat.ru. – Дата доступу: 22.02.2012.

21. Аспекти весільної та родильної обрядовості в Україні [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http:// tur.kosiv.info. – Дата доступу: 01.01.2014.

22. Расторгуев, П. А. Словарь народных говоров Западной Брянщины (Материалы для истории словарного состава говоров) / П. А. Расторгуев. – Минск: Наука и техника, 1973. – 296 с.

23. Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ruscorpora.ru. – Дата доступа: 25.01.2014.

24. Махоўская, І. С. Радзінны рытуал у беларускай традыцыі: структура і мэты / І. С. Махоўская // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн: БДУ, 2007. – С. 51–55.

25. Катовіч, Аксана Радзінная абраднасць беларусаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.belarus.kz. – Дата доступа: 22.02.2012.

26. Нараджэнне і хрэсбіны дзіцяці [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://jivebelarus.net. – Дата доступа: 22.02.2012.

27. Сімейні обряди та звичаї [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http: http://about-ukraine.com. – Дата доступу: 03.01.2014.

28. Чернявская, Евгения Крестины [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.bdmag.narod.ru. – Дата доступа: 22.02.2012.

29. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4 т. Т. 2: Е – Муж. / Пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 2-е изд., стер. – М. : Прогресс, 1986. – 672 с.

30. Срезневский, И. И. Матеріалы для словаря древне-русскаго языка по письменнымъ памяникамъ: в 3 т. Т. 1: А – К. – С-Пб.: Типография Императорской Академіи наукъ, 1893. – 1420 с.

31. Савина, Наталья. Крещение ребенка [Электронный ресурс] / Наталья Савина. – Режим доступа: http:e-prazdnik.ru. – Дата доступа : 22.02.2012.

32. Хрещення [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://proridne.com. – Дата доступу: 26.03.2014.

33. Крижма для хрещення [Єлектронний ресурс]. – Режім доступу: http://vidido.ua. – Дата доступу: 26.03.2014.

А. М. Воінава

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1.3 Лексіка пахавальнага абраду ў гаворках Гомельскага рэгіёна

Лінгвістычным даследаванням належыць асаблівая роля ў комплексным вывучэнні духоўнай культуры народа: яна не абмяжоўваецца тым, што моўныя факты дапаўняюць і пацвяржаюць дадзеныя фалькларыстыкі і археалогіі, а ўносіць у агульнае вывучэнне славянскай культуры распрацаваныя ёю сучасныя метады сістэмнага разгляду матэрыялу і аналізу тэксту, прынцыпы ўнутранай і знешняй рэканструкцыі. Комплекснае даследаванне народнай духоўнай спадчыны, аб'ядноўваючы этнаграфію, фальклор і мовазнаўства, з'яўляецца адным з самых актуальных і перспектыўных напрамкаў сучаснага мовазнаўства. Этналінгвістычныя даследаванні разглядаюць мову ў цеснай сувязі з культурнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі, міфалагічнымі ўяўленнямі народа. Асноўная ўвага ў такіх даследаваннях надаецца лексіцы, звязанай з традыцыйнымі абрадамі і звычаямі.

Лакалізацыя Гомельскай вобласці спрыяла цесным міжмоўным кантактам. Вынікі гэтага кантактавання адзначаюцца ў абрадавай лексіцы гомельскіх гаворак. Пастаянныя шматвяковыя сацыяльна-эканамічныя і культурныя зносіны суседніх роднасных народаў паўплывалі на фарміраванне асобных блізкіх і агульных рытуалаў і ў сямейным жыцці беларусаў і ўкраінцаў. Паспрыяла такім працэсам і агульная старадаўняя гісторыя, і падобныя аб'ектыўныя сацыяльныя сучасныя рэаліі.

У мове захоўваюцца самыя разнастайныя па часе ўзнікнення і функцыянавання лексічныя адзінкі. У сістэме нацыянальнай мовы гэта скарбніца ўяўляе сабой абрадавыя назвы, якія адлюстроўваюць важныя падзеі ў грамадскім і сямейным жыцці народа. Абрадавы тэрмін – слоўнае абазначэнне прадмета, асобы або дзеяння, якія ўваходзяць у сферу абраду, якія самі па сабе, у адрозненне ад прадметаў і дзеянняў пазаабрадавай рэальнасці, з'яўляюцца знакамі або сімваламі. Пласт матэрыяльнай культуры, вывучэнне якога неабходна для высвятлення значэння і паходжання ўсякай тэрміналогіі, у сферы абрадавага народнага жыцця асветлены асаблівым святлом. Тут матэрыяльная культура неаддзельная ад духоўнай, кожны прадмет у абрадавым ўжыванні нясе семантычную нагрузку тады, калі яго ўласцівасці адказваюць патрабаванням міфічнай сімволікі.

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляюцца абрадавыя тэрміны пахавальнага абраду, зафіксаваныя на тэрыторыі Гомельскай

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

вобласці. Матэрыялам даследавання паслужылі матэрыялы, сабраныя падчас фальклорных і дыялекталагічных экспедыцый студэнтаў і выкладчыкаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Сучасны пахавальны абрад з'яўляецца толькі асколкам архаічнай культуры, які меў розныя формы ў мінулым. Неабходна адразу ж адзначыць адносную беднасць спецыфічнай лексікі абраду пахавання, але пры гэтым вылучаецца падрабязна распісаны рытуал дзеяння. Прычынай нешматлікай у колькасных адносінах лексікі даследчыкі бачаць ва ўздзеянні надмоўных уяўленняў на фарміраванне пахавальнай лексікі, перш за ўсё ў "табуіраванні паняццяў, звязаных са смерцю" [1]. Табуістычная лексіка фарміруецца на аснове метафары, таму пры найменні смерці чалавека часта выкарыстоўваюцца фразеалагізмы, заснаваныя на метафарычным пераносе: *даць дуба, ногі працянуць, надзець белыя тапкі* і пад.

Для пахавальных абрадаў на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна характэрна перавага архаічных рысаў, агульных для ўсіх усходніх славян. Тэматычную класіфікацыю найменняў пахавальнага абраду можна прадставіць наступным чынам:

1. Найменні абрадавых актаў і іх выканаўцаў. У пахавальным абрадзе замацоўваецца перамена статуса чалавека. Акт пахавання звязаны з уяўленнямі аб жыцці і смерці, аб заканчэнні адной формы існавання і пераходзе ў іншую – вечную. Вечнае жыццё звязана з паняццем душы, якая не памірае. У свядомасці людзей рэлігійныя ўяўленні пра смерць не проціпастаўляюцца міфалагічным, народным. Пры гэтым часта міфалагічныя ўяўленні выцякаюць з рэлігійных ведаў і засноўваюцца на іх. Можна заўважыць, што народныя, язычніцкія веды і абрады змяніліся нязначна, а рэлігійныя акты (споведзь, сабораванне) вытрымліваюцца не ўсімі. Часта рэлігійныя каноны некалькі пераасэнсоўваюцца і дапаўняюцца.

Так, пастулаты рэлігіі пра бессмяротнасць душы і яе існаванне пасля смерці значна пашыраны народам. Душа таксама прадстаўляецца як бессмяротная, яна сыходзіць з цела пасля смерці, блукае па свеце на працягу сарака дзён, а пасля прадстае перад Богам. Аднак у народным уяўленні душа ўяўляе сабой паслясмяротны двайнік чалавека, якому неабходна есці і піць. Адсюль ідуць многія рытуальныя дзеянні: пакідаць ежу, ручнік, каб уцірацца, выконваць шэраг забарон, каб не запэцкаць душу, не абцяжарыць дарогу на той свет: *На акне астаўляюць кусочак хлеба, каўбасы на маленькай тарэлачке, ставяць свечку. Лічаць, што душа памершага будзе кушаць тое, што ляжыць на тарэлке* (в. Марусенька, Жлоб.) Гэтая ж падвоенасць датычыць і пра знешні выгляд душы: яна нябачная і ў той жа час можа мець

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

розны выгляд – часцей птушкі ці насякомага [1, с. 9].

Душа таксама прадстаўлялася ў выглядзе пары, воблака – *ідзе парок*: *Як мацер памірала, сядзела я радом. Толькі із рота парок пошоў і ўсё – вышла душа.* Дзякавічы Жытк.; *Кажуць, што душа ротом выходзіць. Як облачко, але парок.* Дзякавічы Жытк.; *Як заховаюць, на другі дзень з могілы толпа дыма такого подымаецца, як туча. Дошла до плота, разбілась і не стало. То, кажуць, душа вышла* (в. Дзякавічы, Жытк.). Матыў палёту прасочваецца ў выразе *душа адляцела*, а таксама ў вобразе птушак, якія часта згадваюцца ў прыкметах: кукуе зязюля – адлічвае тэрмін жыцця, птушка б'ецца ў шкло хаты – значыць, нехта хутка памрэ. У галашэннях сустракаем: *Прэўраціласа сізай зязюляю, к роду паляцела* (в. Колкі, Петр.)

"Прастора жыцця" і "прастора смерці" (або "вечнага жыцця") – асноўныя ўяўленні ў пахавальным абрадзе. Гэтыя прасторы блізкія ўяўленню пра два дамы: *Раней людзі верылі, што памёршы чалавек адпраўляецца на той свет і там ён працягвае жыць* [2, с. 163]. У прадстаўленні ўсходніх славян часта жывы чалавек прадстаўляецца *госцем*, а памёршы – *ужо дома: Усе там будзем. Ты ўжо дома, а мы шчэ госці тутака* [3]. З гэтым матывам можа быць звязана тэрміналогія слова *пагост 'могілкі'*.

Найменнямі для вырабаў, у якім хавалі чалавека, былі *дамавіна, труна, гроб: У першы ж дзень пахавання прасілі зрабіць труну і крыж* [2, с. 164]. *Калі гроб выносілі, каледор пасыпалі елачнымі лапкамі.* Рэчыца. Неабходна было акуратна абыходзіцца з вяроўкамі, на якіх апускалі труну: *Трэба абавязкова спаліць ці схаваць вяроўкі, на каторых апускалі гроб у яму* (в. Марусенька, Жлоб.); *Вяроўкі не выкідвалі, як гроб апусцяць, а вешалі ці на дрэва, ці на крыж* (в. Бабунічы, Петр.).

У выпадку правільнага здзяйснення пераходу ў іншы свет чалавек у славянскім малюнку свету набывае статус *бацькоў, дзядоў*. Калі па нейкіх прычынах пераход не здзяйсняецца, тады душа застаецца на зямлі. Яшчэ адзін момант у пераходзе ў іншы статус чалавека – "цяжкая" смерць. Ёю караліся звычайна калдуны: *Чалавек, які займаецца калдаўством, дык вот як ён умірае, ён ніяк не ўмрэ, мучаецца.* [2, с. 166]. Палёгка смерці патрабуе асаблівых абрадавых дзеянняў: разбіраюць столь, падымаюць страху і інш.: *Каб яго душа выйшла, пракручваюць дырку ў столі* [2, с. 163].

Падвойным ўяўленням пра душу блізкія ўяўленні пра нябожчыка. Фізічна чалавека няма, але ён можа прыходзіць – у сне, у выглядзе прывіда. Асабліва часта прыходзілі нябожчыкі, у якіх засталіся незакончаныя справы, калі былі парушаны пэўныя абрадавыя дзеянні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пры іх пахаванні або якія не пражылі адведзены ім век. Абрадавая назва *век* як тэрмін чалавечага жыцця – гэта час расходавання закладзенай жыццёвай патэнцыі. Жыццёвая сіла, не вычарпаная ў тых, хто памёр да часу, пераносіцца ў вобласць смерці і пераўтварае іх у актыўную шкодную сілу – чалавек становіцца *двухдомнікам, пужайлам, прывідам*. [3]. Для абароны ад іх існуюць спецыяльныя прыёмы, аднак найбольш дзейсным сродкам з'яўляецца ***грамнічная, стрэчанная свечка*** *[встрэчэньска свечка]*, якая асвячаецца ў храме на Стрэчанне і, паводле павер'яў, мае вялікую ахоўную сілу: *На Стрэчанне беруць свечону свечку і ставяць у хаці* (в. Васькаўка, Маз.).

Існуе шэраг прыкмет і дзеянняў, якія неабходна выконваць і пры пахаванні, і пасля смерці, каб нябожчык не забраў каго-небудзь з жывых, не крыўдзіўся, каб яму было лягчэй на тым свеце: *Калі пакойніка вязуць, нельга пераязжаць дарогу* (в. Мормаль, Жлоб.); *Дзверы ў хаце закрывалі, а ў хляве, наадварот, адкрывалі, каб жывёла не перавялася ў хаце* (в. Галубіца, Петр.); *Не нада садзіцца на тое месца, дзе пакойнік* (в. Мормаль, Жлоб.); *Нельга сільна плакаць па пакойнаму, яму там мокра* (в. Баравікі, Светл.); *Нельга была ў дом пускаць какіх-небудзь жывотных. Думалі, што гэта какая-небудзь ведзьма прэвраціласа в ката, штоб нашкодзіць родным і не пусціць душу пакойніка на неба* (в. Марусенька, Жлоб.); *Калі харанілі каго-небудзь і ўжо ішлі на могілкі, нельга было глядзець з вакна на гэта. Нельга было спаць у гэты час* (г. Жлобін).

Для наймення мёртвага чалавека на тэрыторыі Гомельшчыны зафіксаваны наступныя лексемы: *нябожчык,* [нябошчык]*, пакойнік, усопшы, мерцвец, мерцвяк: Над нябожчыкам бабулькі чыталі Псалтыр* [2, с. 163]; *На абед звалі пакойнага абедаць* [2, с. 163]; *Могуць сказаць, што ў нас на вуліцы ўсопшы* [3]; *Мерцвеца мыюць усегда жэнщчыны* [9, с. 77], *Вязуць мерцвяка ў цэрковь* (в. Вышалаў, Петр.). Абавязкова пры такіх намінацыях улічваўся і спосаб смерці – натуральны ці чалавек сам вырашыў закончыць сваё жыццё. Такіх людзей называлі *багахульнікамі: У царкве багахульнікаў не адпявалі, но харанілі на адных могілках* (в. Васілевічы, Рэч.); *самаўбійцамі, даўленікамі: А тых, што павесіліся, даўленікамі называлі* (в. Стаўбун, Ветк.).

Асноўным момантам, які фарміраваў склад удзельнікаў пахавання, быў момант блізасці да пакойніка. Ваганні ў розных мясцовасцях па гэтай прыкмеце даходзяць да супрацьлеглых уяўленняў: галасіць павінны толькі самыя блізкія – галасіць павінны чужыя, выносіць цела павінны толькі блізкія – толькі чужыя: *Гроб свае не выносяць, а саседзі, і яму не капаюць* [4, с. 243]; *Асобенна маць і атца даўжны дзеці несці, как маць і ацец іх насілі, так і ані далжны предаць земле*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маць і атца [4, с. 243].

У рэальным абрадзе акт немагчымы па-за яго выканаўцам, адносна якога існуюць пэўныя рэгламентацыі. Для некаторых абрадавых актаў паўсюдна адзначаецца выкананне іх толькі чужымі (выраб гроба, мыццё нябожчыка, перакладванне ў гроб): *Жонка, сын, дачка не мылі нябожчыка, не апраналі – запрашалі суседзяў* [4, с. 243]; *У нас гаварылі, што нельга, каб родныя капалі яму, нельга, каб мылі і адзявалі пакойнага.* [11, с. 469]. Розныя выканаўцы мяняюць семантыку аднаго і таго ж акта: так, напрыклад, калі "мыццё" даручаецца абавязкова старым і людзям таго ж полу, што і памерлы, – кожны раз мы маем розную ўнутраную інтэрпрэтацыю самога акта "мыцця": *Памёр чалавек. Родныя просяць чужых памыць яго, каб на той свет ішоў чыстым* [4, с. 251]; *Жэншчына ўмрэ – надзявае жэншчына. Калі мужчына памрэ, адзяваюць, мыюць мужчыны.* [4, с. 248]. Магілу капалі толькі ‘чужыя’ – капачы: *Капачы – мужчыны, якія капалі* (в. Пракопаўка, Гом.). Аднак у некаторых рэгіёнах адзначана магчымасць капання ямы ‘сваімі’: *Уперад дурылі, што і ямы нельзя капаць сваім. А бацька казаў, што ўсё, што паложана, самім можна дзелаць* (в. Гарадок, Жлоб.).

На ‘сваіх’, родных, ускладаюцца іншыя функцыі: ачышчэнне месца смерці, хаты, знішчэнне слядоў пахавальнай працэсіі, аплата расходаў на пахаванне, выкананне траура: *Гаспадары пераглядалі вешчы нябожчыка, і калі штосьце не было патрэбна, раздавалі людзям* [6, с. 258]. Асабліва выразна падзел на сваіх і чужых праяўляецца ў пахавальным шэсці, на парадак якога аказвае ўплыў не толькі падзел на родных-нярродных, але і больш тонкая дыферэнцыяцыя па ступені блізкасці да нябожчыка: спачатку ідуць самыя блізкія, пасля больш далёкія родзічы і г. д.: *Калі неслі гроб, то за ім шлі блізкія родныя, пасля далёкія, пасля знаёмыя* [6, с. 258]. Несці ікону ўперадзе працэсіі павінна была толькі ўдава, якая магла быць родзічкай, магла быць ‘чужой’: *Ікону на кладбішчэ далжна несці только вдова. Ні в коем случае не молодые, не родственнікі. Может быть родственніца, но вдова* (г. Жлобін).

Абавязковым элементам пахавальнага абраду былі галашэнні, *прычытанні*: *На пахаранах плакалі з прычытаннямі, з крыкамі, а на памінках успаміналі, плакалі, толькі ціха* [4, с. 245]; *Словы, якімі прычыталі па нябожчыку, то прычытанне* (г. Рэчыца). Галосяць толькі жанчыны, мужчыны гэтага ніколі не рабілі. У некаторых месцах для гэтага запрашаліся пажылыя жанчыны: *галашэніцамі* называлі жанчын, якія прычыталі па пакойніку: *Прыглашалі жэншчын-галашэніц. Яны галасілі па пайконіку* (в. Хальч, Ветк.). Галашэнні часцей за ўсё былі імправізаваныя; у іх падкрэслівалася гора асірацелых, гучалі просьбы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узяць іх пад ахову, ухваляліся станоўчыя якасці пакойнага [5, с. 355]: *Звычайна галосяць аб тым, як дрэнна без гэтага нябожчыка жывецца* (в. Колкі, Петр.). Галасілі адразу, як паміраў чалавек, за памінальным сталом ужо гэтага не рабілі. У некаторых мясцовасцях, у прыватнасці, Петрыкаўскім раёне, галасілі ў час гадавіны на могілках.

Адным з элементаў пахавальнага абраду было чытанне малітваў, спецыяльных псалмоў, канонаў: *Свяшчэннік чытае памінальную*. Верхняя Алба Жлоб. Для гэтага запрашаліся спецыяльныя людзі. На тэрыторыі Гомельскага рэгіёна зафіксаваны наступныя іх найменні: *пеўчыя: Пеўчых запрашалі і запрашаюць на ўсю ноч* [4, с. 243]; *хор: Прыходзяць людзі, і мы – хор – вечар паём псальмы* [4, с. 247]; *пеўшыя: Паюць над пакойнікам увечары пеўшыя, каторыя галасілі або бажэственныя песні пелі* [4, с. 248]; *захлёбніца: Захлёбніца – бабка, якая адпявае пакойніка.* Васілевічы Рэч.; *малельшчыцы: Ноччу каля яго сядзяць і чужыя, і родныя, а таксама бабкі-малельшчыцы* (в. Верх. Алба, Жлоб.).

2. Назвы дзеянняў, звязаных з пахавальным абрадам: ***запячатаць магілу:*** *Бацюшка вядзе малебен. Як апускаюць гроб, то той пясок апускаюць. Бацюшка атмалюе пясок у платочку. То запячаталі магілу* (в. Ліскі, Рэч.); ***перад пахаваннем*** ‘дзеянні, якія адбываліся перад тым, як пахаваць чалавека’: *Чыталі малітву, паміналі, свенцілі свяцонай вадой.* г. Рэчыца; ***завесіць шторы:*** *Шторы завешвалі, каб фанарі не свяцілі, казалі, мярцвец праснуцца захоча* (г. Рэчыца); ***завесіць зеркало****: Еслі покойнік у доме, надо було зеркало завесіць, каб не спужав* (в. Ляскавічы, Петр.); ***адчыніць дзверы:*** ‘наведаць магілу на другі дзень пасля пахавання’: *Гэта робіцца, каб душа нябожчыка паляцела ў неба, а не хадзіла па зямлі’* [9, с. 76].

Царкоўнае памінанне чалавека называлася *адправа, одправа: На багатые дзеды адправа йдзе ў царкве* (в. Васькаўка, Маз.).

Ашчэ адно дзеянне звязана з важным семантычным матывам ў пахавальнай лексіцы – матывам ачышчэння. Для яго выкарыстоўвалі ваду, агонь. “Вада і агонь у роўнай ступені выступаюць у ролі ачышчальнага сродку” [2, с. 39]. Так, побач з амавеннем выкарыстоўвалася спальванне валасоў, прыжыганне ран нябожчыка; мыццё рук пасля могілак – і глядзенне ў агонь, датыканне да печкі: *Пасля могілак трэба абязацельна мыць рукі* [4]; *Пасля помінак ўсё мыюць, ваду выліваюць туды, дзе ніхто не ходзіць, а сена, якое лажылі пад пакойніка, спальваюць* [4]. І вада, і агонь валодаюць семантыкай ‘перашкоды’ паміж тым і іншым светам, ‘сувязі’ паміж імі: раўнапраўнае значэнне маюць закопванне рэчаў нябожчыка, адпраўленне па вадзе і спальванне.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3. Найменні абрадавых страў. Ежа, яе прыгатаванне, частаванне гасцей цесна звязана з культам мёртвых ва ўсіх архаічных традыцыях. Галоўная роля на памінках належала такой абрадавай страве, як *канон, куцця: Перад тым, як есці, нада было канона трохі з'есці, патом ужо ўсё, што на стале стаіць* (в. Старое Сяло, Ветк.). Калі А. А. Патабня выводзіць міфалагічнае значэнне куцці як абрадавай стравы са спалучэння ў ёй двух кампанентаў – вады і зерня, то ў памінальным і пахавальным абрадах куцця выступае як непадзельная семантычная адзінка. [1, с. 64]. Тое, што памінальная ежа з'яўляецца ўласнасцю пакойнага, гаворыць абрадавае абыходжанне з ежай, што засталася пасля абеду: усё павінна было быць з'едзена або раздадзена, гэтак жа, як і іншыя рэчы пакойнага. Тэрмін 'мёртвая вада' (вада, якой мылі посуд на памінках) адлюстроўвае ўяўленне пра тое, што ежа належыць пакойнаму і ў пазаабрадавы час становіцца небяспечнай і шкоднай: *Ваду з пакойніка выліваюць, дзе ніхто не ходзіць* [4, с. 248]. Абавязковымі стравамі сярод абрадавай ежы былі каша і кісель: *Пахаранілі – ідуць на абед. Стравы: канон, боршч, каша, картошка, ладушкі, узвар (кампот) і кісель* [4, с. 248], у Рэчыцкім раёне неабходным элементам быў *просвер – гэта пірагі, пячоныя ў цэркві, пускалі іх па кругу, каб кожны еў* (г. Рэчыца). Памінальная ежа ў Веткаўскім раёне мела назву *гарачы стол: На гарачым стале павінна быць каша* (в. Пакалюбічы, Ветк.).

У большасці населеных пунктаў адлюстравана сімволіка лічбы дванаццаць: колькасць памінальных стаў павінна быць роўная 12: *У нас дванаццаць страў гатуюць на памінкі* (в. Яланы, Светл.). Аднак у некаторых мясцовасцях колькасць прыгатаваных страў павінна быць роўнай 13: *На абед гатавалі 13 блюд* [6, с. 259]. У Жлобінскім раёне ўказваецца іншая лічба: *Павінна быць у першую чаргу тры стравы або сем ці дзевяць, напрыклад, боршч, каша, бліны* (в. Верхняя Алба). Дастатковая колькасць ежы на памінках звязана з матывам долі, лёсу, які чакае памерлага чалавека. 'Той свет' можа быць жорсткім, а можа быць царствам багацця. Некаторыя прыкметы смерці паказваюць, што багаты ўраджай некаторых культур (лён, жыта) разглядаецца як прадвесце смерці.

Традыцыйная памінальная вячэра мела назву ***дзеды***: *На дзеды гатуем куццю, м'ясо, блінцы, кісель* (в. Казловічы, Калінк.).

4. Найменні крыжа, магілы, могілак. Асноўная семантыка магілы і пагоста – выдзеленае, узаконенае месца смерці. Да нашага часу існуе апазіцыя месцаў пахавання 'чыстых' і 'нячыстых' пакойнікаў, дзе магіле супрацьстаяць палі, перакрыжаванні, месцы за могілкамі [1, с. 87]. У такіх уяўленнях адрозніваюцца два віды смерці: смерці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэальнай і смерці абрадава перажытай. Сувязь ‘нячыстых’ пакойнікаў з месцамі, не адведзенымі для пахавання знаходзіцца ў прамой залежнасці ад таго, што ‘нячыстыя’ пазбаўлены абраду, які асэнсоўваецца ў дадзеным выпадку як свайго роду падзел, размеркаванне прасторы паміж жыццём і смерцю.

Падчас пахавальнага абраду смерці адводзіцца абрадава замацаваны ўчастак зямлі. У ім разам з целам замыкаецца сама смерць. Для наймення месца пахавання фіксуюцца назвы: *кладбішча, кладбішчэ: Вынеслі і ідут на кладбішча* [4, с. 247], *Несом на кладбішчэ паску, яечкі своім* (в. Малыя Аўцюкі, Калінк.); *кладаўе: Звязвалі пакоўніку рукі і ногі, а на кладаўі развязвалі* (в. Стаўбун, Ветк.): *могілкі: Я ўжо і на могілкі хадзіла і прычытала* (г. Добруш); *могліцы: Як на могліцах: як пахаронят чалавека, праз 4 дні выходзіць фосфар* (в. Сімонічы, Лельч.). Там, дзе месца пахавання не лічыцца ўзаконеным, прысутнасць смерці кансервуецца: *На кладаўе даўленікаў і самаўбіўцаў не клалі. У канаву закінуць. На канаве выкапаюць яму і так кінуць, і закапаюць, абы толькі было* (в. Стаўбун, Ветк.); *На кладбішчы не хаваюць самазабойцаў* (г. Лоеў).

Паводзіны на магіле абавязкова рэгламентуюцца. Вялікім грахом лічылася наступіць на магілу: *Адзін з родічаў стаў на магілу і стаіць, а кагда яму сказалі пра гэта, дык ён не адышоў. А цераз некалькі дней забалеў і памёр* (в. Марусенька, Жлоб.) Дрэнным знакам было, калі капальшчык звальваецца ў магілу: *Калі той, хто капаў, зваліцца туды, значыць, яшчэ нехта памрэ ў сям’і, для якой капаюць яму* [11, с. 469], або магіла хутка абвальвалася: *Альбо калі ўжо закапаная магіла абвальвалася на другі дзень, таксама было знакам таго, што нехта з сям’і памрэ* (в. Марусенька, Жлоб.).

5. Найменні прадметаў, зафіксаваных у абрадзе. З семантычным матывам дарогі, шляху звязаны наступныя прадметы, зафіксаваныя ў пахавальным абрадзе. Так, для палёгкі цяжкага шляху нябожчыку давалі *прахожую: На грудзі ложаць прахожую, а на лоб венчык* [4, с. 244]. Зафіксаваны шматлікія ўяўленні, сны, па якіх зборы ў дарогу абазначаюць смерць: *“Калі чалавек кажа ў трызненні пра дарогу, коней, што трэба некуды ісці, то хутка памрэ”* [4]. У любой са сваіх канкрэтызацый *шлях*, які мадэліруе пахавальны абрад, проціпастаўлены блуканню ‘нячыстых’ нябожчыкаў як прамы, як той, што дасягае сваёй мэты. Цемра загробнага свету складае матывацыю шматлікіх актаў са *свечкамі* і запальваннем свечак у хаце: *У руку абазацельна свечку ўстаўлялі.* Рэчыца; *Каля пакойніка гараць свечкі, лампадкі* (в. Верхняя Алба, Жлоб.). Свет дапамагаў нябожчыку перайсці цёмны шлях на той свет.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З матывам шляху звязаны ўяўленні пра тое, што сорак дзён душа яшчэ знаходзіцца на зямлі: *Людзі гавораць, што да 40 дней ходзіць душа па хаце. Ад 40 да году – по двору* (в. Макарычы, Петр.).

Апазіцыя вядомае / невядомае, бачнае / нябачнае падтрымліваецца спецыяльнымі прадметамі: так, невядома, што будзе там, душа нябачная, але жыццё вечнае, таму чалавеку на тым свеце шмат што спатрэбіцца. Менавіта ў матыве вечнага жыцця знаходзім карані таго, што нябожчыку ў труну кладуць рэчы, якія яму спатрэбяцца на тым свеце: акуляры, расчоску, насоўку і інш.: *Мужчынам клалі расчоску, гадзіннік. Калі пакойнік быў п'яніцай, то яму клалі бутэльку ў гроб* (в. Пакалюбічы, Гом.); *У труну звычайна лажылі, калі памёр мужчына, брытвенны прыбор, шапку, платок, расчёску; калі памерла жанчына – платкі, расчёску* [6, с. 255]. У некаторых мясцовасцях у труну абавязкова клалі ручнік: *Покойнік на том свеце ўмываецца і ўціраецца. У него есть свое полотенце* [6, с. 256]. Часта пры пахаванні выкарыстоўвалі ***жыта*** – сімвал жыцця: *Як гроб выносілі, усю хату пасыпалі жытам, каб усе жылі, хто ў хаце астаўся* (в. Бабунічы, Петр.); *Ваду наліваюць у стакан і крэпяць каласком* (в. Верхняя Алба, Жлоб.).

Амаль паўсюдна абавязковым элементам пры пахаванні быў платочак, насавічок: Трэба несці вянкі ў платочках, а потым іх трэба захоўваць (г. Жлобін); У мужчын на рукавах павязаны платочкі-насавічкі (в. Верхняя Алба, Жлоб.).

6. Найменні памінальных дзён. Асноўны аб'ём абрадавых дзеянняў размеркаваны на працягу года пасля смерці. Так, на наступны дзень пасля пахавання нясуць снеданне: *Вот сёння пахаранілі, назаўтра нясуць снеданне, так у нас. Так і гаворым – снеданне* (в. Стаўбун, Ветк.). Асобна вылучаліся трэці, дзявяты і саракавы дзень, якія мелі спецыяльныя назвы: *трэцці дзень: На трэцці дзень пасля пахавання абавязкова адведвалі магілу* (в. Колбаўка, Ветк.), *Памяць па нябожчыку ўшаноўвалі на трэці дзень* [4, с. 251]; *дзевяціны: Дзевяціны на дзевяты дзень пасля пахавання атмічалі. Дзевяты дзень атмічалі, патаму што душа яшчэ дома находзіцца* (в. Старое Сяло, Ветк.): *сорок дней, саракавіны, саракоўнік: Саракоўнікам яго называюць, бо лічаць, што душа сорак мытарств прайшла пасля смерці* (г. Рэчыца).

На працягу года спраўляліся яшчэ два памінальныя абеды: калі з моманту смерці прайшло паўгода і год – ***гадавіна***. Паўгода адзначаюць не ва ўсіх мясцовасцях, год – паўсюдна: *Памінаюць на трэці дзень, на дзевяць, сорак і на год.* [4, с. 248]; *Паўгода не спраўлялі, а год трохі атмячалі* [4, с. 251]; *У час гадавіны галосяць на могілках* (в. Колкі, Петр.).

Ушанаванне продкаў працягвалася і пасля гадавога цыклу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

памінання. У прынцыпе памінаць сваіх продкаў, аддаваць ім даніну памяці патрэбна было кожную суботу. Амаль усе даследчыкі славянскай міфалогіі адзначаюць, што ўшанаванню мёртвых адводзіцца вельмі значнае месца: "Пакланенне памерлым займае ўсё рэлігійнае жыццё славян" [1, с. 11]. Аднак зараз вызначыліся спецыяльныя дні, якія фіксуюцца і царквой – *радзіцельскі дзень, радзіцельская субота: На Радзіцельскі дзень ходзім у цэркоў* (в. Махнавічы, Маз.); *На Радзіцельскі дзень да абеду пашуць* (в. Аляксандраўка, Калінк.). Перш за ўсё гэта Дзяды, сярод якіх вылучаюць мясаедныя, як пачатак новага вітка росквіту жыцця, траецкія – найбольшы ўзровень росквіту прыроды і апошняя кропка, галоўная – змітраўскія дзяды: *Гавораць, што Змітравы дзяды – самы галоўные.* (в. Новыя Навасёлкі, Калінк.); "Разам з Вялікаднем яны ўяўляюцца галоўнымі святамі, бо першае сведчыць, што мы – дзеці Сонца, а другое – што мы нашчадкі вялікага роду дзядоў, волатаў, асілкаў" [7, с. 155].

Дзедамі называлі не толькі дзень памінання продкаў, а таксама і саміх памёршых продкаў: *На Радуніцу варым вечэру, зовём дзедоў* (в. Прудок, Маз.). Амаль перад кожным вялікім народным святам ўзгадваліся і паміналіся продкі. Так, на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна зафіксаваны найменні:

багатые дзеды – дзень памінання продкаў, які адзначаецца праз тры дні пасля Пакроваў: *На багатые дзеды варылі куццю, абазацельна кісель з розных ягад* (в. Буркі, Браг.); *На багатые дзеды хозяін зваў памерлых на вечэру* (в. Васькаўка, Маз.);

Міхайлаўскіе, Міхальскія дзеды – памінальныя дні напярэдадні Міхайлавага дня. Восенькія Дзяды сімвалізуюць перш за ўсё заканчэнне жыццёвага шляху чалавека, таму што асноўнае на іх святкаванні – позірк у мінулае, на пройдзены шлях: *Перэд Міхайлом – Міхальскія дзеды* (в. Ляскавічы, Петр.);

масленыя дзяды спраўляліся на Масленіцу: *На масленые дзеды ходзяць на могілкі і ставяць блінцы дзедам нашым* (в. Аляксандраўка, Калінк.); *На Масленіцу ўсегда робім масленые дзеды, зоўём дзедоў есці з намі* (в. Завайць, Нар.); ***змітравы дзяды, змітраўская субота*** – памінанне продкаў, якое праходзіць на Змітра – 8 лістапада: *У суботу – Змітравы дзяды, а тады ўжо Змітар* (в. Прудок, Маз.); *У Змітраўскую суботу обязацельно гатуем вечэру, успамінаем памерлых сваякоў* (в. Балажэвічы, Маз.); *У Змітраўскую суботу на вечэру прасілі сваякоў, суседаў* (в. Крыўча, Браг.); ***радушные дзеды:*** *Перэд Радоўніцай бываюць Радушные дзеды* (в. Ліснае, Лельч.); *Кажуць, радушные дзеды прыходзяць дахаты* (в. Сцежарнае, Браг.); ***Зялёная субота, дзедова субота*** – гэта памінальны пярэдадзень

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тройцы: *Дзедова субота перэд Тройцою* (в. Дуброва, Лельч.); *У дзедову суботу ходзім на могілкі* (в. Букча, Лельч.); *У Зялёную субову дзедоваць будзем* (в. Зімовая Буда, Лельч.).

Вялікаднем мёртвых называюць ***Радуніцу.*** Зафіксавана шмат варыянтаў наймення гэтага веснавога народнага свята, якое адзначаецца ў аўторак другога тыдня пасля Вялікадня – *Раданіца*: *На Раданіцу палілі свечку і говорылі: "Дзеды нашы, прыходзьце вечэраць!"* (в. Крыўча, Браг.); *Радаўніца: Несом на кладбішчэ паску, яечкі своім, яны на Радаўніцу разгоўляюцца* (в. Малыя Аўцюкі, Калінк.); *Радоўніца: На Радоўніцу перэд обедом ішлі на могілкі* (в. Вербавічы, Нараўл.); *Радоўныца: На Радоўныцу помінаюць мэртвых* (в. Сяменча, Жытк.); *Радульніца: У каго Радульніца бывае ў аўторак, а ў каго – у чацвер* (в. Бывалькі, Лоеўск.); *На Радульніцу ходзім на могілкі* (в. Прудок, Маз.); *провады, проводы: У нас хто на Радаўніцу ідзе на кладбішчэ, а хто – на Провады* (в. Прудок, Маз.); *На Проводы ідом, несом горэлку, хлеб, кладом на могілкі* (в. Тонеж, Лельч.); *На Проводы обязацельно збіраемса ўсе і ідом на кладбішчэ до своіх* (в. Глушкавічы, Лельч.).

Пахавальны абрад з'яўляецца праяўленнем традыцыйнай культуры беларусаў, таму ў генетычных адносінах амаль уся лексіка належыць да агульнаславянскага лексічнага фонду. Гэта такія лексемы, як *нябожчык, могілкі, куцця, канон, свечка* і інш. [8]. Большасць зафіксаваных лексем з'яўляюцца суфіксальнымі ўтварэннямі ад дзеясловаў: *пеўчыя, захлёбніца*, *прычытанне*; назоўнікаў: *пакойнік, нябожчык, гадавіна*; лічэбнікаў: *саракавіны, саракоўнік, дзевяціны*, прыметнікаў: *мерцвец*.

Адзінкавыя назвы ўтвораны шляхам асновескладання і складана-суфіксальным спосабам, у выніку спалучэння іменнай і дзеяслоўнай асноў. Апорным кампанентам такіх найменняў з'яўляецца аддзеяслоўная аснова: *багахульнік, самаўбіец*.

Некаторыя найменні з'яўляюцца субстантываванымі назвамі: *пеўчы, усопшы, прахожая, памінальная.*

Зафіксаваны на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна і складаныя назвы:

прыметнік + назоўнік: *гарачы стол, Зялёная субота, Дзедова субота, радзіцельская субота, змітравы дзяды, змітраўская субота;*

дзеяслоў + назоўнік: *запячатаць магілу, ідзе парок, завесіць шторы, адчыніць дзеверы.*

лічэбнік + назоўнік: *сорак дней, трэцці дзень.*

Сустракаюцца сярод назваў пахавальнага абраду і адзінкавыя запазычанні з грэчаскай мовы: *прасвіра, псалом, кафізм* [8].

Неабходна падкрэсліць метафарычнасць пахавальнай лексікі, якая ярка прадстаўлена ў галашэннях: *Учора касіў, араў, А сёння ўжо бараду*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

задраў [9, с. 76]; *Адвалілася сцяна каменная Ад маяго цёплага гнёздышка* [11, с. 467]; *Сырой вырыт мне прыют* [11, с. 466]; *Адпала правае крылышка ад мяне* [11, с. 467]; наяўнасць сталых эпітэтаў: *сырая зямля, вечная памяць, белы свет, паследні пуць, цёплае гнёздышка, друг мілы, вочы ясныя, горкая сіраціпушка* і інш.; параўнанняў: *Звук тихо раздался, подобно дрожащей струне* [11, с. 467]; адухаўлення: *Душа ходит вокруг дома* [11, с. 468]; *Ці ты раннею зарою ўскінешся, Ці ты да мяне жаркім сонейкам ускоцішся?* [9, с. 76]. У галашэннях сустракаюцца таксама вялікая колькасць слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, якія перадаюць розныя адценні пачуццяў. Такія адценні значэння могуць выражацца ўнутраным зместам моўных адзінак, з'яўляюцца імпліцытнымі – выражацца праз знешнія, фармальныя паказчыкі, перш за ўсе суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі:

-еньк-, -эньк-, -аньк-: *мамачка родненькая, міленькі, даражэнькі, татанька, сіротанькі*;

-ок-, -ак-, -ёк-: *сынок, зяцёк. А мой жа ты галубок! А мой жа ты сакалок!*

-ачк-: *мамачка, кучачка, работачка, галовачка, ручачкі, ножачкі;*

-ыц-, -ец-: *сястрыца, брацец.*

Іншы раз сустракаюцца мнагазначныя словы, нейтральныя ў асноўным значэнні, якія атрымліваюць якасна-эмацыянальнае адценне пры пераносным ужыванні: нябожчыка ў галашэннях называюць *галубок, сакалок, пчолачка: А пчолачка мая дарагая, Куды ж ты раненька паляцела?* [9, с. 76]; *А мой жа ты галубок! А мой жа ты сакалок!* [9, с. 76]; *Мая ж ты галубачка!* [9, с. 78].

Абрадавая лексіка, якая да сённяшняга часу шырока функцыянуе на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна, вызначаецца багатай і складанай сістэмай лексічных адзінак, варыянтнасцю і разнастайнасцю сродкаў з іх семантычнымі і граматычнымі асаблівасцямі, з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай культуры беларусаў, у якой захаваны старажытныя моўныя з'явы.

Літаратура

1 Седакова, О. А. Обрядовая терминология и структура обрядового текста (погребальный обряд восточных славян). Диссертация на соискание ученой степени кандидата филологических наук. – М., 1983. – 182 с.

2 Лоеўшчына... Бэзавы край, песенны рай. Сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны. Гомель, 2007. – С. 426–430

3 Матэрыялы фальклорных і дыялекталагічных экспедыцый студэнтаў і выкладчыкаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

4 Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / Укладанне,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сістэматызацыя, тэксталагічная праца і рэдагаванне В. С. Новак. – Гомель: ААТ “Полеспечать”, 2007. – 456 с.

5 Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. – 511 с.

6 Жаўруковая песня Радзімы: Народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю: манаграфія / ГДУ імя Ф. Скарыны; пад аг. рэд. В. С. Новак – Гомель: Сож, 2008. – С. 396–400.

7 Ліцьвінка, Васіль. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мн.: Беларусь, 1998. – 190 с.

8 Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4-х т.: пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачёва / под ред. и с предисл. Б. А. Ларина / М. Фасмер – М., 1986–1987.

9 Жыцця палескага бяздонныя глыбіні: народная духоўная культура Петрыкаўскага раёна: фалькл.-этнагр.зб. / пад агул. рэд. В. С. Новак. – Мн.: Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 303 с.

10 Народная демонология Полесья: Публикация текстов в записях 80–90 гг. XX в. Т. 2. Демонология умерших людей / Сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М., 2012. – 800 с.

11 Святло каштоўнасцей духоўных: Жлобінскі край: мінулае і сучаснае / пад агул. рэд. В. С. Новак, А. А. Станкевіч. – Гомель: ААТ “Полеспечать”, 2009. – 544 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Каляндарна-абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны

А. М. Воінава

2.1 Лексіка каляндарна-абрадавага цыклу на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна: структурна-семантычны аналіз

Комплекснае вывучэнне духоўнай спадчыны беларусаў, якое аб'ядноўвае этнаграфію, фальклор і мовазнаўства, з'яўляецца адным з самых актуальных і перспектыўных напрамкаў сучасных навуковых даследаванняў. Этналінгвістычныя даследаванні разглядаюць мову праз прызму традыцыйнай народнай духоўнай культуры. У аснову ўказанага падыходу пакладзена формула "мова + культура". Уласцівасць мовы адлюстроўваць адметнасць культуры яе носьбітаў абумоўлена кумулятыўнай функцыяй, якая заключаецца ў назапашванні і захаванні традыцый, гістарычных здабыткаў, нацыянальнай свядомасці народа. Мову ў яе кумулятыўнай функцыі даследчыкі разглядаюць як механізм, што спрыяе кадзіраванню і трансляцыі культуры.

У кантэксце ўзаемазвязанага вывучэння мовы і культуры беларускага народа аб'ектам увагі становяцца культурна афарбаваныя моўныя адзінкі, якія з'яўляюцца прадуктам кумулятыўнай функцыі мовы і тым ці іншым элементам сваёй семантыкі або структуры адлюстроўваюць сувязь мовы і культуры, у якой дастаткова дакладна адлюстраваны дыялектныя рысы і многія асаблівасці беларускай гаворкі. У мове захоўваецца самыя разнастайныя па часе ўзнікнення і функцыянавання лексічныя адзінкі. Цікавай у гэтым плане з'яўляецца абрадавая лексіка, якая звязана са зменамі ў жыцці прыроды і імкненнем чалавека ўздзейнічаць у сваіх інтарэсах на з'явы прыроды, прымусіць працаваць на сваю карысць. Каляндарныя святы беларусаў падпарадкаваны гадавому земляробчаму і жывёлагадоўчаму цыклам і выразна падзяляюцца на восеньскія, зімовыя, веснавыя і летнія.

Дастаткова багатай і разнастайнай з'яўляецца каляндарна-абрадавая лексіка Гомельскай вобласці, зафіксаваная ў дыялекталагічным архіве кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". Матэрыялы ўказанага архіва прыводзяцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ніжэй як ілюстрацыйны матэрыял з захаваннем мясцовых моўных адметнасцей і ўказаннем у дужках лакалізацыі: вёсак, гарадоў і раёнаў (Буда-Каш. – Буда-Кашалёўскі, Ветк. – Веткаўскі, Гом. – Гомельскі, Добр. – Добрушскі, Жытк. – Жыткавіцкі, Калінк. – Калінкавіцкі, Лельч. – Лельчыцкі, Маз. – Мазырскі, Нар. – Нараўлянскі, Петр. – Петрыкаўскі, Рэч. – Рэчыцкі, Светл. – Светлагорскі, Хойн. – Хойніцкі, Чач. – Чачэрскі) Гомельскай вобласці.

Лексіку каляндарнага абрадавага цыклу можна выявіць у наступным выглядзе:

Назвы абрадаў і свят. *Найменні зімовых свят.* Першыя святы ў новым годзе звязаны з адзначэннем новага года і зімовымі святкамі. Зімовыя святкі пачыналіся пасля поснай куцці і заканчваліся на Вадохрышча. Каляды былі пачаткам язычніцкага святкавання ў гонар зімовага сонцазвароту і каляднага мясаеду пасля шасцітыднёвага Піліпаўскага посту [1, с. 163].

Святкі – тыдзень з 6 студзеня па 19 студзеня. *Две недзелі у нас называюцца святкі. Две недзелі – эта тут Крышчэніе, Новы год і шчадруха. Тут ходзяць шчадраваць і песні пяюць усякія на эту шчадруху. Асобенна перад Новы год увечар сабіраюцца к каждаму двару, праз вокны: – Цётка, спець? – Пейце! – Каму? – Івану! І начынаюць песні пець такія красівенныя. А калісь даўно дак яшчэ звязду насілі. Дзелаюць такую звязду. Звязда такая бальшушчая. Тамака, штоб гарэла свечка такая і званкі такія і калакольчыкі такія. І ў кажды дом ходзяць са звездой* (в. Старое Сяло, Ветк.). Зімовыя святкі пачыналіся пасля поснай куцці і заканчваліся на Вадохрышча.

Новы год – свята, якое адзначаецца ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Адметнае комплексам каляднай абраднасці, варажбой, накіраванымі на прадугадванне будучага ў новым годзе; надяляецца магічнай сілай, якая прыносіць паляпшэнне дабрабыту, шчасце ў сям'ю. Галоўным атрыбутам свята з'яўляецца ёлка як сімвал урадлівасці, жыцця, здароўя. *Кажуць, што калі першым у хату прыйдзёт мужчына, то пашчасціць у дабрабыце, а калі женчына, то нічога харошага не будет* (в. Старое Сяло, Ветк.) *Вечарам напярэдадні Новага года хадзілі па шчодрыках. У гэты вечар на стале было шмат страў. Існавала такое павер'е: як правядзе сям'я стары год і сустрэне новы, такім для ее будзе ўвесь надыходзячы год* (г. Лоеў); *В первый дзень новага году і курку, і карову, і свінку накарміць нада, усе далжны быць сытыя і давольныя* (в. Хальч, Ветк.);

Каляды [Коледы] [Коляды] – зімовае свята народнага календара, якое адзначаецца 7 студзеня. *Сабіраліся і маладзёж, і старыя. Перад*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Калядамі ставілі куццю, варылі з розных круп: ілі аўсянка, ілі пшано, ілі грэчка, ілі пярловая крупа. Варылі кампот з груш, з яблык. Потым хадзілі шчадраваць: і бабкі, і хлопцы, і малая дзетвара тожэ хадзіла. Казу дзелалі. Хадзілі ў каждую хату, пелі песні, і каза танцавала. Раньшэ насілі звязду. Гадалі дзеўкі. Усяка-усяка гадалі. Лоеў. *Калісь калядавалі Каляды, і мы хадзілі на Каляды* (в. Старое Сяло, Ветк.). Каляды лічыліся пачаткам язычніцкага святкавання з прычыны павелічэння дня, якія ў сувязі з прыняццем хрысціянства супалі з нараджэннем Хрыстовым па новаму стылю. Свята адметнае багатым комплексам абраднасці, варажбой.

Ражаство [Ражство] [Ражэство] [Раждзество] [Раждество] – свята нараджэння Хрыста, 7 студзеня. *На Ражаство, хто постуе, нада сочыва есць, узвар нада піць* (в. Неглюбка, Ветк.); *На Ражаство папамыеш усюды, напапавешаеш. Штоб было чыста і ўсё харашо было. Абязацельна* (г. Ветка); *Ражаство – хрысціянскі празнік, у якой святкуецца нараджэнне Іісуса Хрыста і Госпада Бога. У госці ходзяць да родзічаў або друзей з угашчэннямі, з празнікам паздраўляюць* (в. Хальч, Ветк.); *Я знаю, што на Ражаство хаты "абсяваць" нада. Абычна пастухі абсяваюць, абходзяць дама з празнікам паздраўляюць. У каждую хату горсць аўса кідаюць* (г. Ветка).

Па старому стылю беларусы захавалі і святкаванне ***Старага новага года*** – з 13 на 14 студзеня. *Стары новы год празнуют 14 января. Тагда ўжэ ходят шчадраваць. Ходят ужэ на дом, пераадзяваюцца ў цыганей, нарядныя такія.* Ветка. *На Стары новы год дзеўкі абдымаюць калкі ў плоце. Калі абніме да пары, то ў етым годзе замуж пойдзе* (в. Церуха, Гом.); *На Стары новы год ходзяць засяваць: ходзяць па хатах і абсыпаюць пакоі зернем. Пры гэтым гавораць: "Сею, сею, засяваю, з Новым годам паздравляю!" Яго адмячаюць праз дзве нядзелі пасля Новага года* (в. Хальч, Ветк.); *На Стары новы год варажылі на зеркала. Я не варажыла. Таво я не застала. А патом бацінак там, сапог через забор перекідаюць. Куда пападёт сапог, значіт аттуда жэніх* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Апошнім зімовым святам было ***Крашчэнне*** [Крэшчэнне] [Крэшчэнье] [Крашчэніе] [Крешченіе] [Крешченне] [Крешченье] [Крышчэнне] [Храшчэнне] [Хрышчэнне] [Хряшченне] або ***Вадохрышча*** [Вадохрышч] [Вадохрышчанне] [Водахрышчэнне] [Водохрышча] [Вадохрышч] – рэлігійнае свята, якое адзначаецца 19 студзеня. *На Вадохрышча нада воду піць, умывацца ею, таму што вада этая ад балезней паможэт* (в. Хальч, Ветк.); *На Вадохрышч свецім ваду* (в. Крукавічы, Калінк.; *На Вадохрышчанне несом ваду свеціць, затым п'ём ее ад дурнога вока* (в. Крукавічы, Калінк.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Водахрышчэнне – людзі ў гэты дзень рабілі проруб на возеры ці рацэ і ныралі ў яе (в. Старое Сяло, Ветк.); *На Вадохрышчэ ў цэркву ходзім* (в. Казловічы, Калінк.); *Крэсціцель бувае пасля Водохрышча* (в. Баравое, Лельч.); *На Ражаство ёлку ставяць, украшаюць. Украшу яе разнымі бумагамі і стаіць яна да Крашчэння* (в. Азершчына, Рэч.); *Крашчэнне празнуют 19 января. У храме крэсцят вадзічку – асвяшчают ваду. У цэркве очэнь харошая служба ідзёт* (г. Ветка); *На Крашчэнне на раке на льду высякалі крэст. Бацюшка асвяшчаў ваду і абпырсківаў людзей. Нада схадзіць у цэркву і набраць святой вады. Адмячалі яго 19 января* (в. Хальч, Ветк.).

Зімовыя абрады, якія ажыццяўляюцца ў снежні і студзені, даследчыкі звычайна звязваюць з сонцастаяннем [2, с. 389].

Назвы веснавых абрадаў і свят. Першае веснавое свята пачынаецца 15 лютага, калі адзначаецца ***Стрэчанне, Стрэчэнне, Стрэценне, Срэценне, Встрэчэнне, Устрэчанне, Стрэчанне Гасподне*** – дзень сустрэчы зімы з летам: *На Стрэчанне ўжо свепаюць веснянкі* (в. Асавец, Маз.); *У нас кажуць, што на Стрэчанне зіма з летам страчаецца* (в. Вялікія Сялюцічы, Петр.); *На Стрэчэнне ў хлеў носяць свечку ад нечыстае сілы.* Зарэчча Браг. *Стрэценне, ды ўжо пост* (в. Бярэжцы, Браг.); *Срэценне – 15 фэўраля* (в. Сямурадцы, Жытк.); *Бувало, на Встрэчэнне свечкай выпаляць крэсцікі ад гразы на дзверах* (в. Навасёлкі, Петр.); *Калі Устрэчанне, свецяць свечкі, яны не дапускаюць пажару, калі граза* (в. Бывалькі, Лоеўск.); *На Устрэчэнне бываюць марозы* (в. Капцэвічы, Петр.); *Кажуць, што на Стрэчанне Гасподне Семіён падзержаў на руках Ісуса, так яго стрэціў, таму і Стрэчанне Гасподне* (в. Новы шлях, Браг.). Падчас святкавання выконваліся стрэчаньскія песні, у якіх вітаўся надыход вясны.

Свята яшчэ мела назву ***Грамніцы***: *На Грамніцы свечку ў цэркві біруць.* Станкі Ветк. Назва звязваецца з імем старажытнага язычніцкага бога маланкі Грамаўніка. Агонь, запалены маланкай, называўся жывым і меў цудадзейную сілу аховы людзей і жывёл ад злых сіл.

Восьмы тыдзень перад Вялікаднем называўся ***Масленка, Масленіца, Масляніца.*** Гэта былі афіцыйныя провады зімы. *На Масленіцу зіму адпускаюць* (в. Загорыны, Маз.); *На Масленку пяклі блінцы з прысмакамі: з маслом, з грыбамі* (в. Новыя Навасёлкі, Калінк.); *Масляніцу празнувалі на сорок пяты дзень пасля Каляд* (в. Казловічы, Калінк.) На Масленіцу елі шмат бліноў – сімвал сонца, спальвалі чучала – выяву зімы, вадзілі першыя веснавыя карагоды.

Свята працягвалася тыдзень, які так і называўся: *Маслены тыждзень, Масляны тыждзень: У Маслены тыждзень кожэн дзень*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

робілі своё свято, а му у сераду робімо чэшчыны бліны – ето чэшча зоўе з'яця на бліны, а ў пятніцу – чэшчын вечар, ето ўжэ з'яць чэшчу на бліны (в. Града, Жытк.). Заканчваўся Масляны тыдзень *масленымі запускамі* – нядзеля на масленым тыдні, пярэдадзень Вялікага посту: *Масленіца канчалася масленымі запускамі на молочно* (в. Буда-Сафіеўка, Лельч.); *На масленые запускі весну клікаюць* (в. Кочышчы, Ельск.)

Адметнае абрадавым комплексам заклікання вясны, памінання продкаў і любоўнай варажбой вылучалася свята ***Саракі, Соракі, Сарака, Соракі, Сорока, Сорок Светых, Сорок Светые, Сорок Светых***, якое адзначалася дваццаць другога сакавіка, у дзень веснавога раўнадзенства. Гэта дзень надыходу вясны, прылёту птушак: *На Саракі сорак піражочкаў такіх маленькіх пеклі. І піражочкі тыя мёдам аблiваюць і ўгашчаюць ужо дзяцей* (в. Церахоўка, Добр.); *У нас на Сорока дзеўке ворожаць про чоловека* (в. Азяраны, Жытк.); *На Сорок Светые хрэсты пеклі і етым хрэстом вугонялі худобу ў полі* (в. Буйнавічы, Лельч.).

Вялікім рэлігійным святам з'яўляецца ***Благавешчанне*** [Блавешчанне] [Благавешчэнне] [Благовешчанне] [Благовешчэнне] [Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы] [Благовешчэнне Прысвятой Богородзіцы], ***Дабравешчанне, Звеставанне***, якое адзначаецца 7 красавіка; свята надыходу вясны. *У нас Благавешчанне – велікі празнік* (в. Прудок, Маз.); *На Блавешчанне ніхто не сее* (в. Баравое, Лельч.); *До Благавешчэння земля спіць* (в. Макрэц, Браг.); *Калі на Благовешчанне ідзе дошч – будзе добрэ жыто* (в. Града, Жытк.); *У нас на Благовешчэнне дзеўкі ідуць весну гукаць* (в. Пагоннае, Жытк.); *З Благавешчання Прасвятой Багародзіцы сем дзён отыдзе – і Вялікдзень* (в. М. Аўцюкі, Калінк.); *На Дабравешчанне весну гукаюць* (в. Замосце, Калінк.); *На Звеставанне трэба з'есці ейцэ, каб куркі несліся* (в. Крукавічы, Калінк.)

Найвялікшым каляндарным святам лічыўся ***Вялікдзень*** [Велікдзень], ***Паска*** – 1. Хрысціянскае свята, якое не мае строгай каляндарнай прымеркаванасці і адзначаецца (у залежнасці ад месячнага календара) у перыяд з 4 красавіка да 8 мая; веснавое свята надыходу палявых работ. *Вялікдзень – вялікае свята* (в. Бібікі, Маз.); *У нас Велікдзень – самое радасное свято пасля доўгага посту* (в. Веляцін, Хойн.); 2. Чацвер велікоднага тыдня. *На Велікдзень мёртвых, у чэцвер, усегда помінаем нашых родзіцелей* (в. Вуглы, Калінк.); *Сем тыдняў посту, а патом Паска – усё можна есці* (в. Хутар, Светл.) Да свята старанна рыхтавалія. З велікоднага тыдня пачыналіся веснавыя гульні і карагоды, дні ўшанавання продкаў, качанне і біццё яек, "ваджэнне і пахаванне стралы' [1, с. 66].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вербная нядзеля [вербна недзеля] [вербніца] [вербіч], ***белая недзеля*** [бела недзеля] – народнае свята, якое адзначаецца за тыдзень да Вялікадня і звязваецца з культам зеляніны, надыходам вясны і распусканнем першага дрэва – вярбы, якой надаюцца аберагальныя ўласцівасці. *У Вербную недзелю вербы свецяць* (в. Капань, Рэч.)*; На вербну недзелю вербу на покуці стаўляць, а на другі дзень, вутром, маці б'е вербою дзеці* (в. Ліпляны, Лельч.); *У Вербніцу раней робілі засеўкі* (в. Завайць, Нар.).

Юр'я, Юрай, Юры, Юрый, Юрэй, Весняны Юрэй – старажытнае свята народнага календара, якое адзначаецца шостага мая: *На Юр'я ходзілі жыто свеціць* (в. Каплічы, Калінк.); *Юр'я дзеўкі корогод водзяць* (в. Валаўск, Ельск.); *Юрай клічэ весну заспеваці* (в. Савічы, Калінк.); *На Юры гуркі садзяць* (в. Асянскае, Лельч.); *У Юрэй начапляюць на граблі красного хвартука ды ходзяць спеваці* (в. Бярэжцы, Жытк.); *Весняны Юрэй едзе на коні, а конь копытамі б'е* (в. Сяменча, Жытк.).

Назвы летніх абрадаў і свят: Першым важным летнім святам лічылася Троіца, якая была найвышэйшай кропкай росквіту прыроды, "калі яна ў самай моцнай зялёнай магічнай сіле сваімі гаючымі лекамі ўздымае чалавека да радаснага, аптымістычнага светаўспрымання" [1, с. 100]. У свяце выразна прасочваецца культ раслін, некаторыя ж даследчыкі ў ім бачаць змяшэнне двух культаў – раслін і культа нябожчыкаў, якія загінулі раней вызначанага тэрміна [2, с. 394].

На тэрыторыі Гомельскага рэгіёна зафіксаваны найменні для свята:

Сёмуха, бо адзначалася на сёмым тыдні пасля Вялікадня: *Цераз сем недзель после Паскі Тройца светая будзе* (в. Буда-Сафіеўка, Лельч.),

Тройца, Троіца, Труйца, дзень Светой Троіцы: Тройца ўсегда ў недзелю (в. Ляскавічы, Петр.); *Троіца – ето Сёмуха* (в. Карчовае, Хойн.).

Намінацыя *Троіца* звязана з хрысціянскай Троіцай – Бог-Бацька, Бог-Сын, Бог-Дух Святы: *Тройцы тры дні: першы дзень – Дзень Бога-Бацькі, другі дзень – Бога-Сына, трэці дзень – Дзень Святого Духа* (в. Буйнавічы, Лельч.). У агульначалавечым вымярэнні – гэта космас, атмасфера і зямля, у чалавечым – галава, тулава, ногі, у традыцыйнай культуры – мінулае, сучаснае, будучае [1, с. 100]. Магічная лічба *тры* пранізвае многія традыцыйныя святы. Яе можна знайсці і ў асноўных святах беларускага народа: Каляда (абуджэнне прыроды) – Вялікдзень (найвышэйшы росквіт) – Дзяды (увяданне): *На Сёмуху спяваюць песні і клён ломяць* (в. Небытаў, Хойн.); *І мы помінаем своіх на Сёмуху* (в. Мікулічы, Браг.); *На Труйцу прослаўляецца сошэсце на опостолоў Светого Духа* (в. Града, Жытк.); *Пройдзе п'яцьдзесят дзён после Паскі, а тады – Дзень Светой Троіцы* (в. Бярэжцы, Жытк.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Лічылася, што ў суботу на Сёмуху на Духаў дзень нябожчыкі маглі выйсці на свет і паўплываць на жыццё жывых, паглядзець, як нашчадкі захоўваюць традыцыю [1, с. 100]. Таму перад гэтым днём, у пятніцу, прыбіралі могілкі, на вячэру запрашаліся памерлыя – спраўляліся *Траецкія дзеды, Сёмушныя дзеды, Троечныя дзеды, Тройчаны дзеды, Тройчатые дзеды, Труйчаныя дзеды: У пятніцу будуць правіць Сёмушные дзеды.* Мялешкавічы Маз.; *Тройчаны дзеды ето дзеды перэд Тройцаю* (в. Вятчын, Жытк.); *На Тройчатые дзеды вараць штось дужэ хорошэ* (в. Слабада, Маз.); *Зовём душы на Троечные дзеды* (в. Азяраны, Жытк.); *Колі Троечные дзеды – не плач, душы дзедоў радаюцца* (в. Васькаўка, Маз.)

Абавязковым элементам правядзення свята Троіцы было пляценне вянкоў з галінак бярозы, якая лічылася сімвалам дзявоцкасці. Яшчэ адзін рытуал – *кумленне* ‘абрад устанаўлення прыязных адносін паміж дзяўчатамі – дзяўчаты цалаваліся пад аркай звязаных уверсе бярозак, пасля чаго павінны былі сябраваць увесь год’: *У нас, бувала, весной, на Сёмуху, усегда кумленне заводзілі* (в. Казловічы, Калінк.)

Вялікім святам, якое ў найбольшай ступені захавала язычніцкую сутнасць, было *Купалле, Купала, Купайла, Купайло, Купально, Іван, Іван Купало, Іван Петроўскі, Купаль Іван.* Свята прымяркоўвалася да летняга сонцастаяння, прысвячалася Сонцу і адзначалася з 6 на 7 ліпеня. “Лічылася, што ў гэты час каляндарная вяршыня росквіту прыроды.. вызывала і самую актыўную дзейнасць варожых чалавеку прыродных сіл: ведзьмаў, чараўнікоў, гадаў, сурокаў” [1, с. 100]: *Усе ведзьмы выходзяць на Купайло* (в. Смалегаў, Нараўл.); *У нас была баба, дак ана на Івана Купайла ходзіла ў лес прыробляць* (в. Мялешкавічы, Маз.); *Кажуць, у купалаву ноч страхоцце на людзей находзіць* (в. Валаўск, Ельск.); *У купальну ноч злёталіся ведзьмы* (в. Буйнавічы, Лельч.).

Адрознівальнай рысай правядзення свята было раскладанне вогнішча, на якім палілі старыя рэчы, сухое ламачча, якое засталося ад Троіцы. Усю ноч маладыя людзі гулялі ля купальскага агню, скакалі праз вогнішча: *Калі той, хто хворэе, попаліць на купальным агні свое зношаны рэчы, у того отыдзе хвороба* (в. Завайць, Нараўл.), купаліся ў вадзе: *Купально бувае сёмого юля, шо купаюцца да венкі на воду кідаюць* (в. Прыбалавічы, Лельч.), каб ачысціцца і засцерагчыся ад злых сіл.

Травы, сабраныя ў час найвышэйшага росквіту прыроды, лічіліся цудадзейнымі: *На Купайло бугуць у лес по кветкі* (в. Галубіца, Петр.). У ноч на Івана Купалу шукалі папараць-кветку, якая прыносіла шчасце: *На Петроўскага Івана дзеўкі жоўту кветку шукаюць* (в. Казловічы, Калінк.). Пошукам кветкі перашкаджаюць цёмныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сілы, таму аднаму ў лес хадзіць небяспечна: *Не йдзі одна ў лес на Івана, а то заблудзіш* (в. Вялікія Аўцюкі, Калінк.); *З суседкай хадзілі ў лес на Івана* (в. Крыўча, Браг.)

Мяжой паміж летам і восенню лічылася свята ***Ілля, Ілья, Лья, Лля,*** якое адзначалася 2 жніўня. Свята было адметнае дажджамі і навальніцамі, якія пачыналіся пасля ліпеньскай спёкі: *Ілля лето кончае* (в. Слабада, Маз.); *У етум годзі на Іллю не було дажджу* (в. Замошча, Лельч.); *Да Ільі трэбо сено звозіць* (в. Дуброўнае, Браг.); *Лья бувае ек жыто ўжо жнуць* (в. Вубалаць, Калінк.).

Назвы восеньскіх абрадаў і свят: ***Багаслоў, Багуслаў, Багуслоў, Богослаў, Богослоў, Іван Багаслоў, Іван Богослоў, Іван Богуслаў*** – земляробчае свята народнага календара, якое адзначаецца 9 кастрычніка: дзень, да якога заканчваюцца ўсе работы ў полі. *Ад Багаслова на полі не робім.* Барбароў Маз.; *Пасля Багуслава правяць дажынкі* (в. Мікулінск, Калінк.); *Да Багуслова кончаюць работы на полі* (в. Ясяні, Браг.); *Прыйшоў Богослаў – дзеўкі сватоў сустракаюць* (в. Канатоп, Нар.); *Колісь говорылі: ек прыйшоў – ідзі з поля домоў* (в. Малешаў, Жытк.); *На Івана Багаслова веселлі робяць* (в. Савічы, Калінк.); *На Івана Богослова госці правяць* (в. Сяменча, Жытк.); *После Івана Богуслава на полі ўжэ не робімо* (в. Завайць, Нар.).

Галавасек, Головосек, Іван Головосек – свята, якое адзначаецца 11 верасня і звязваецца з усталяваннем за ім бытавых прыкмет і павер'яў. У гэты дзень забараняецца рэзаць, сячы і есці круглае: *У Галавасек не можно есці капусту й бульбу* (в. Слабада, Маз.); *Ек Головосек – нічого не рэжэм, не сяком* (в. Завайць, Нараўл.); *Колісь на Івана Головосека ножа ў рукі не бралі, а лусты рэзалі зараней* (в. Маркоўскае, Лельч.).

Калінавік, Калінник – народнае свята, якое адзначаецца 11 верасня і звязваецца з выспяваннем пладоў каліны: *На Калінавіка ламалі каліну і варылі з яе кашу, говораць не будзе болець голова* (в. Даманавічы, Калінк.).

Міхайла, Міхайло – свята, акое адзначаецца 21 лістапада і звязваецца з метэаралагічнымі назіраннямі: *Міхайла ўсіх з поля гоніць* (в. Прудок, Маз.); *Пройдзе Міхайло – тады пачынаем прасці* (в. Грабаў, Петр.).

Вялікім святам былі ***Пакрова, Покрова, Пакроў*** – свята, якое паказвала на пераход ад лета і зімы і адзначалася 14 кастрычніка; свята заканчэння палявых работ і вельмі цесна звязанае з хрысціянскім уплывам: *Пакроў, кажуць, пакрывае людзей ад грахоў* (в. Вубалаць, Калінк.); *Пакрова ўжэ сцеле лістом* (в. Навасёлкі, Калінк.). Свята прыпадала на час Вялікай Вясельніцы, калі маладую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пакрывалі накідкай. У гэтыя дні рыхтаваліся да зімы, не пускалі жывёлу ў поле, хатняя праца спалучалася з песнямі, гульнямі. Асаблівая ўвага надавалася варажбе на вясельную тэму [1, с. 148].

Узвіжанне, уздвіжэнне, уздзвіжанне, уздзвіжэнне, уз'южанне, уздзюжэнне, воздвіжэнне, двіжэнне, дзвіжэнне, звіжэнне – хрысціянскае свята народнага календара. Адзначаецца 27 верасня; апошняе цёплае свята, калі заканчваюцца работы на полі, дзень адлёту птушак у вырай. *На Узвіжанне галка перва адлетае* (в. Мялешкавічы, Маз.); *На Уздвіжэнне ўсё гадоўе здвігаецца ў кучы і ховаецца* (в. Сяменча, Жытк.); *На Уздзвіжанне адзначаем дзень найдзенага краста, на якім быў распяты Господзь* (в. Бывалькі, Лоеўск.); *На Уздзвіжэнне земля закрываецца* (в. Хобнае, Калінк.) *На Уздзюжэнне змеі уходзяць* (в. Юркавічы, Браг.); *На Уз'южанне ў лес ездзіць бояцца: вужэ обкружаць, неможно ступіць* (в. Бобрыкі, Петр.); *На Воздвіжэнне ў лес не ідуць, бо земля воздвігаецца, і ўсе змеі ў землю ховаюцца* (в. Сяменча, Жытк.); *На Двіжэнне пропасць здвігаецца* (в. Юркевічы, Жытк.); *Пройшло Дзвіжэнне і ўжы поховаліса* (в. Маркоўскае, Лельч.); *На Звіжэнне почынаем збіраць журавіны* (в. Небытаў, Хойн.)

Найменні прысвяткаў: ***Андрэй*** [Андрэйкі] [Ондрэй] – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 13 снежня: дзявочае свята, адметнае варажбой. *Андрэй – і цепер ето свято* (в. Аляксандраўка, Калінк.); *На Андрэйкі дзеўкі гадаюць, хочуць знаць, ці пойдуць у етум годзі замуж.* (в. Малейкі, Браг.); *Колісь на Ондрэя і снег, і мецеліца, а дзеўкі бегуць под вокны, коб послухаць, як зарэ хлопца назовуць. Тады ўжо і суджоного так звацьмуць* (в. Чэрнічы, Жытк.); ***Аўлас*** [Улас] [Улассе] – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 24 лютага: свята жывёлы. *У святога Аўласа просім здороўя своёй жыўнасці: коніку, короўцы* (в. Прудок, Маз.); *На Уласа нічагуські не рабілі, а токі даглядалі коровы і коні* (в. Паселічы, Хойн.); *Улассе сільно не гуляем, а не робім, а то карова на вясне не ўстане на ногі* (в. Казанск, Калінк.); ***каровячы Ўлас*** – *Каровячы Ўлас на масленай недзелі. Ад каровячага Ўласа да посту мяса не елі* (в. Навасёлкі, Петр.).

Бацькам Міколы Зімовага лічыўся ***Сава, Савы, Саўкі***, прысвятак у гонар якога адзначаўся 18 снежня: *Сава мосце рэчкі* (в. Скароднае, Ельск.); *На савы бабы не прадуць* (в. Мялешкавічы, Маз.); *На Саўкі мы хавалі пчол* (в. Данілаўка, Ельск.).

Жаночым святам лічылася ***Варвара*** [Варвары] [Варка] [Варуха] [Вары] [Ворвары] – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 17 снежня. Пасля яго пачынае прыбываць дзень: *Варвара ноч уварвала.* Хутар Светл. *На Варвары дзень большае* (в. Хобнае,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Калінк.; *Варка – Міколіна матка* (в. М. Аўцюкі, Калінк.); *Трэшчыць Варуха – берэжы нос і вухо* (в. Завайць, Нар.); *Вары ночы одорвалі* (в. М. Аўцюкі, Калінк.); *Ворвары правім ў цэркве* (в. Града, Жытк.); ***Варвара-мучэніца*** – свята. *Варвара-мучэніца за тое так называецца, што Варвару бацько мучаў, шоб вона одрэкласа ад веры Хрыстовай. Кажуць, што на Варвару-мучэніцу зажываюць усе раны за ноч.* (в. Маркоўскае, Лельч.); ***Варварын дзень.*** *Таму так празнік назвалі Варварын дзень, што ў еты дзень Варвара багацько мук і здзек поперэцерпвала* (в. Хамічы-2, Калінк.)

Адметнымі метэаралагічнымі назіраннямі, варажбой вызначаўся дзень пачатку зімы, які меў назву ***Кацярыны, Кацерыны, Кацярына-Санніца, Светое Катэрыны*** і адзначаўся 7 снежня: *Колісь на Кацярыны дзяўчаты варажылі: пеклі аладку, хавалі пад падушку, а той, хто ў сне прыйдзе за аладкаю, той і е суджаны* (в. Загорыны, Маз.); *У нас гаварылі Кацярына-санніца, етэ ж і е Кацерыны. У еты дзень було много снегу, і ўсе вывозілі санкі, хто куды ездзіў на санках* (в. Мялешкавічы, Маз.).

Дзень памінання святога Васілія, які быў міласэрным епіскапам да нямоглых, адзначаўся 14 студзеня, супадаючы па даце са Старым новым годам, і меў назву ***Васілле*** [Васілей] [святое Васілле]: *Пасля Новага году атмячаўся Стары новы год, 14 января, так ён у нас называўся Васілле. Эта Каляды такіе былі* (в. Стаўбун, Ветк.); *Чатырнаццатага чысла Васілле, эта зімовы празнік царкоўны* (в. Неглюбка, Ветк.).

Ганны – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 22 снежня і звязваецца з назіраннямі за надвор'ем: *На Ганны ўжэ прыбаўляецца багато дня* (в. Загорыны, Маз.); *Ганны – два тыдні до Коляд* (в. Аляксандраўка, Калінк.)

Найменні вясенніх прысвяткаў: ***Аляксей*** *[Лексей] [Лексей]* – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 30 сакавіка; дзень рыбака і пчаляра. *У Аляксей рыба на нэрас, пчолка на верас, чалавек на хвою пчолкі глядзіць* (в. Мялешкавічы, Маз.); ***Аляксей цёплы*** – *Прыдзе Аляксей Цёплы – будзе цёпла* (в. Глініца, Маз.); ***Аўдокі*** *[Аўдоцця] [Еўдокі] [Оўдокі] [Оўдоцця] [Яўдокі]* – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 14 сакавіка: першы веснавы дзень, з якога пачыналася гуканне вясны. *Колісь на Аўдокі робілі адны мужыкі, а бабы не* (в. Навасёлкі, Хойн.); ***Макарэй*** – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 14 мая; дзень асвячэння вады: *Бувало, на Макарэя заходзілі ў рэчку і тэю водою мулі вочы, штоб не болелі* (в. Чырвонабярэжжа, Лельч.); ***Мікола, Мікула*** – свята, якое адзначаецца 22 мая; свята пастухоў і конюхаў: *Мікола бувае ў маі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(в. Буйнавічы, Лельч.); *На Мікулу пастухі ўжо ходзяць па хатах, збіраюць усё, што ім даюць* (в. Стадолічы, Лельч.).

Найменні летніх прысвяткаў: ***Анапрэй, Нупрэй, Онапрэй*** – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 25 чэрвеня і лічыцца спрыяльным днём для сяўбы грэчкі: *Бувала, у дзень Анапрэя сеелі грэчку* (в. Паселічы, Хойн.); *На Анапрэя спеюць суніцы* (в. Васькаўка, Маз.); *У того будуць блінцы смашные, хто грэчку посее на Онапрэя* (в. Завайць, Нараўл.); ***Барыс і Глеб, Барыс*** – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 6 жніўня. Праца ў гэты дзень асабліва забараняецца, бо з працуючым чалавекам можа здарыцца няшчасны выпадак: *На Барыса і Глеба нічого цяжкого не робілі, а хто не гледзіць гетого, той можэ покалечыцца* (в. Махнавічы, Маз.); *На Барыса і Глеба сено не косім, можэ моланка ўбіць* (в. Мялешкавічы, Маз.).

Святам маку лічыўся *Макавей, Маковей, Макаўка, Медовы Спас, Мядовы Спас, Першы Спас* і адзначаўся 14 жніўня: *Макавей – у Спасаўку.* (в. Лукі, Калінк.); *На Макавея мак свецяць, коб рос* (в. Жахавічы, Маз.); *На Маковея опсыпалі хлеў, коб добра худоба була* (в. Малешаў, Жытк.); *Макавей – ето Мядовы Спас* (в. Казловічы, Калінк.); *У Мядовы Спас несом мед у цэркву.* (в. Асавец, Маз.)

Найменні восеньскіх прысвяткаў: ***Казанская, Казанска Богородзіца*** – прысвятак народнага календара, які адзначаецца 4 лістапада і адметны шлюбнай варажбой, вяселлямі, метэралагічнымі назіраннямі: *Раней обязацельно молодые ішлі пад венец на Казанскую* (в. Казловічы, Калінк.); *На Казанску Богородзіцу не можно робіці* (в. Камаровічы, Петр.).

Параскі, Параскімка – прысвятак, які адзначаецца 10 лістапада; дзень забароны прадзення і ткання: *Раней у нас на Параскі не пралі і не ткалі.* (в. Буйнавічы, Лельч.); *А у нас на Параскімку ходзяць у цэркву, просяць Параскімку даці жаніха* (в. Махнавічы, Маз.). Святам кавалёў і шаўцоў лічыўся прысвятак, які меў найменне ***Кузьма і Дзям'ян*** і адзначаўся 14 лістапада (1 лістапада ст.ст.): *За Параскімкай – Кузьма і Дзям'ян* (в. Навасёлкі, Хойн.); *Той не будзе голонной смерцю поміраці, хто будзе посціць у пятніцу перэд Кузьма-Дземян* (в. Маркоўскае, Лельч.).

Матрыпан, Матрыхваны – прысвятак, які адзначаецца 23 лістапада: дзень, вольны ад працы, ад прадзення і адметны варажбой: *Колісь як прыходзіў Матрыпан – ніхто не садзіўса прасці* (в. Буйнавічы, Лельч.); *Матрыхваны бувалі ў Піліпоўку* (в. Валаўск, Ельск.); ***Піліп*** – прысвятак, які адзначаецца 27 лістапада: *Калі на Піліпа вороны крычаць, мороз адляжэ* (в. Загорыны, Маз.); ***Цуда, Цудо, Чуда*** – прысвятак, які адзначаецца 19 верасня; дзень дзівосаў:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Не рабі нічого, а то Чуда ўчудзіць (в. Сырод, Калінк.); *Цуда не празнік, а дзень такі, просто не робімо ды і ўсё* (в. Веляцін, Хойн.); ***дакопкі*** – свята заканчэння ўборкі бульбы: *Як бульбу дакапаюць – правім дакопкі* (в. В. Сялюцічы, Петр.)

“Галоўным святам беларусаў з часоў Адама Міцкевіча лічацца Дзяды, бо яны адначасова сімвалізуюць не толькі “смерць” прыроды, але і непазбежнае заканчэнне жыццёвага шляху і пераход на той свет, да продкаў, кожнага чалавека” [1, с. 20]: ***багатые дзеды*** **–** дзень памінання продкаў, які адзначаецца праз тры дні пасля Пакроваў: *На багатые дзеды варылі куццю, абязацельна кісель з розных ягад* (в. Буркі, Браг.); ***міхайлаўскіе дзеды*** – памінальныя дні напярэдадні Міхайлавага дня. Восенькія Дзяды сімвалізуюць перш за ўсё заканчэнне жыццёвага шляху чалавека, таму што асноўнае на іх святкаванні – позірк у мінулае, на пройдзены шлях. *Масленыя дзяды* спраўляліся на Масленіцу: *На масленые дзеды ходзяць на могілкі і ставяць блінцы дзедам нашым* (в. Аляксандраўка, Калінк.); *На Масленіцу ўсегда робім масленые дзеды, зоўём дзедоў есці з намі* (в. Завайць, Нар.).

Найменні ўдзельнікаў абрадаў. Пры правядзенні каляднага абраду абавязковымі ўдзельнікамі былі ***баба*** ‘жанчына, апранутая ў адзенне старой жанчыны’: *На Стары новы год увечары дарослыя хадзілі калядаваць. Вадзілі з сабой казу, насілі бусла, вадзілі мядзведзя, бабу рабілі* (в. Церахоўка, Добр.); і ***дзед:*** *Баба, бабулька лавіла свайго дзеда, дзядульку: Казу вадзілі, дзеда, бабу рабілі* (в. Церахоўка, Добр.).

Не ўяўлялася каляднае свята без ***валачобнікаў*** [валачонікі] [волочоўные] – тых, хто выконвае традыцыйны абрад абходу двароў з велічальна-віншавальнымі песнямі на Вялікдзень: *На Вялікдзень у нас раней усегда хадзілі валачобнікі* (в. Гурыны, Маз.); *Ужэ пашлі валачонікі – гатіуй каўбасы, сыр і масла* (в. Зімовая Буда, Калінк.); *Волочоўным йейцо давалі, пірага адрэжуць* (в. Грабаў, Петр.)

Найбольшая колькасць найменняў асоб зафіксавана пры правядзенні каляднага абраду і шчадравання:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

калбасу давалі (г. Ветка); *Мы называлі тых, хто каледуе, каляднікі.* Ветка. *Калядоўшчыкі на Калядкі збіраліся і калядаваць хадзілі па хатах* (в. Станкі, Ветк.); *А тады каледоўшчыкі паюць ва ўвесь голас, ходзюць па хатам да шчадруюць* (в. Старое Сяло, Ветк.); *На Стары новы год ходзяць калядоўшчыкі, пяюць шчадроўкі, жалаюць усім шчасця. Плоха, када калядоўшчыкі не заходзяць у хату. Шчасця будзе мала* (в. Церуха, Гом.); ***маханоша*** – удзельнік каляднага свята: той, хто носіць сумку за калядоўшчыкамі. *Калядоўшчыкі адзяваюцца па-разнаму, павінна быць каза, маханоша (той, хто носіць сумку), звязда* (в. Жмураўка, Рэч.); **шчадроўшчык** [шчадроўнік] [шчадравальнік] [шчодрык] [шчодрікі] [шчодры] – людзі, якія хадзілі па дамах і віншавалі з Калядамі: *Ходзяць шчадруюць дзеці. Ім і дзеньгі дают. А раньшэ і старыя. Эта очэнь багаты дзень, бо людзі бліны пякуць, каўбасы робяць і выносяць тым, хто прыходзіць. Паздравляют шчадроўшчыкі людзей. Адзяваюцца па-рознаму, там і козлікамі, і катамі* (в. Насовічы, Добр.); *Ой, шчадраваць любілі, то гэта шчодры станавіліся пад акно* (в. Яланы, Светл.); ***шчадруха*** – жанчына, якая шчадруе: *Шчадрухі ходзяць шчадраваць, а потым гуляюць* (г. Ветка).

Удзельнікам абрадавага свята на Івана Купалу была *Купала* – персанаж у вобразе дзяўчыны і *Купаліш* – персанаж у вобразе хлопца: *У нас Купалу выбіраюць, веночак звіваюць і ёй на галаву напранаюць* (в. Камонаў, Браг.); *Пад вечар Купала ў селе кветкі раздае* (в. Небытаў, Хойн.); *Бувала, усе бегуць гледзець на Купалу* (в. Катловіца, Браг.); *Колісь, бувало, едзе Купаліш на коніку і дзевоньку вугледае і до себе зове* (в. Глініца, Маз.); *Кажуць, Купаліш з Купалкою ў лес бегаюць удвоіх на Купалу* (в. Загорыны, Маз.).

Найменні асобных элементаў абрадаў і свят: ***банкеты*** – элемент святкавання каляднага абраду. *Банкеты водзяць у гэты дзень, гарэлку п'юць, ходзяць з гармонямі. Банкеты? Во я нагатую стол, ка мне прыйдуць, нагатую ўсяго: варэнікаў, жаркога там, блінчыкаў, салатаў усякіх. Але банкеты водзяць усё радзей. Другія людзі сталі* (г. Ветка); ***Калядкі*** – вечар 13 студзеня і ноч на 14 студзеня: *Ну у нас ходзяць па дамам. Песні пяюць, і мы ім канхветы і дзеньгі даём. А ну хтось сціхі красівыя чытае, а малыя – дак пляшуць. Тожа даём. Эта все на 14 января дзелалі, о так!* (г. Ветка); ***шчадроўкі*** [шчодрыкі] [шчодрікі] [шчёдрікі] [шчадруны] [шчодра] [шчодры] [шчодрык] [шчадруха] – элемент каляднага свята: хаджэнне па дамах з песнямі, каб атрымаць гасцінцы: *Шчадроўкі адбываюцца кожны год пад Новы (Стары) год. Калі наступаў ранні вечар, ужо можна пачуць на вуліцах шчадроўныя песні; Маладзёж ходзіць шчадраваць. Пяюць шчадроўныя песні. Заходзяць у кожную хату. Хазяева сустракаюць*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

іх. І хто што ўжо ім дае: хто сала, хто каўбасы, хто грошай (в. Маркавічы, Добр.).

Заканчэнне калядных свят мела спецыяльную назву: *распісувацца з колядамі: У Вахохрышча ў нас распісуюцца з Колядамі* (в. Верасніца, Жытк.).

Велікодне *[веліконне] [веліконье] [велікэнне],* ***Велічка*** – другі дзень пасля Пасхі: *І на Велікодне ў біткі гуляюць* (в. Гарочычы, Калінк.); *На Веліконне і цепер збіраюцца мужыкі да йдуць по дворах пець песні, як раней* (в. Зеляначы, Калінк.); *Хто первы прыдзе на Веліконье, тому ейцэ даюць* (в. Града, Жытк.); ***светые вечэра*** – вечары ад Пасхі да Ушэсця: *Пасля Паскі да Ушэсця ідуць светые вечэра, тогды нічого не роблім* (в. Навасёлкі, Петр.); ***вербіч*** – апошні дзень перад Вялікаднем: *Вербіч – последні дзень перад Вяліконнем* (в. Махнавічы, Маз.).

Вербная нядзеля [вербна недзеля] [вербніца] [вербіч], ***белая недзеля*** [бела недзеля] – вербны тыдзень: *Зараз будзе іці похвальная недзеля, а потом будзе іці Вербная недзеля до Пасхі* (в. Буйнавічы, Лельч.); *Вербная недзеля – шостая недзеля Велікого посту* (в. Завайць, Нар.); *На белой недзелі трэ ўсё беліці, чысціці* (в. Буйнавічы, Лельч.); ***зборова субота*** – субота на першым тыдні Вялікага посту: *Раней у Зборову суботу не ўчынялі хлеба* (в. Махнавічы, Маз.): ***красная субота*** – субота перад Вялікаднем: *Красная субота, таму што красяць ейцэ ў краснае шалупкамі ат цыбулі* (в. М. Аўцюкі, Калінк.).

Зафіксаваны назвы другога або наступнага пасля Благавешчання дня: *благавеснік [благовеснік,* ***благавеснікі*** *[благовеснікі]* – дзень пасля Благавешчання: *На другі дзень опосля Благавешчання – Благавеснік* (в. Казловічы, Калінк.); *Благовеснік – другі дзень Благовешчання* (в. Буйнавічы, Лельч.); *Благавеснікі – на другі дзень за Благавешчаннем* (в. Турцэвічы, Калінк.).

Пэрэдадзень перад вялікім пастом называўся ***запускі, загавіны:*** *Акраз зостолоса два тыжні до Запусок* (в. Буда-Лельчыцкая, Лельч.); *Тые разы збіраліся у Запускі на беседы* (в. Падварак, Лельч.); а перад Міколам – ***Мікольнік***: *Мікольнік бувае перэд Міколай* (в. Васькаўка, Маз.); ***гувесна*** – першы дзень вясны: *Калі м'ясоед заканчваецца, а пост пачынаецца, то тэй дзень му зоўём гувесна, тому што тоды ўжэ весну сустрэкаюць* (в. Града, Жытк.).

Серада пасля Тройцы мела назву *градовая серада, градова серада, градобойна серэда: Градовая серада бувае на Тройцу, у сераду* (в. Мялешкавічы, Маз.); *У градову сераду ў полі не робім, штоб град не побіў* (в. Буйнавічы, Маз.).

Спецыяльная назва для пятніц на дзевятым і дзесятым тыднях пасля Вялікадня зафіксавана ў Лельчыцкім раёне – *дзевятуха:*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзявятуху празнуем, шоб грозы не було (в. Буйнавічы, Лельч.); *Дзесятуха – етэ ж дзесятая п'ятніца после Велікодня* (в. Чырвонабярэжжа, Лельч.), а ў Петрыкаўскім раёне *дзеўятнікам* называюць чацвер на дзявятым тыдні пасля Вялікдня: *На дзеўятнік возьму дзеўяць егодзін чарніц у лесе* (в. Вялікія Сялюцічы, Петр.); *На дзеўятнік ідом у лес шукаць дзеўяту ягоду і прыказваем: "Новінка ў роток, а здороўечко ў жывоток!"* (в. Навасёлкі, Петр.).

Назвамі асобных элементаў абрадавых свят з'яўляліся: ***веснянка*** – веснавая песня, у якой заклікаецца надыход вясны: *На Стрэчанне ўжо спеваюць веснянкі* (в. Асавец, Маз.); ***волачэнне*** – традыцыйны абрад абходу двароў з велічальна-віншавальнымі песнямі на Вялікдзень: *На волачэнне гатуй печэнне* (в. Вятчын, Жытк.); ***кермаш*** – гулянка ў адно з рэлігійных свят. *Сходзімо сегоні ў Пудварак на кермаш* (в. Буда-Лельчыцкая, Лельч.); ***дакопкі*** – заканчэнне ўборкі бульбы. *Бувае, што з дакопак чуць ідом – так наробімса* (в. Бібікі, Маз.; в. Чырвонабярэжжа, Лельч.); ***піліпоўскіе запускі*** – пярэдадзень каляднага посту: *Послі мясоеда начынаюцца піліпоўскіе запускі* (в. Валаўск, Ельск.); ***варажыць, гадаць, гаданне, гадаці*** – прадказваць будучае: *На Матрыпана дзеўкі ўсегда гадалі, не можно було говорыць, а то не спраўдзіцца гаданне.* Месцам варажбы звычайна з'яўлялася перакрыжаванне дарог, лазня, хлеў, печ і парог хаты. Вельмі часта пры гаданні выкарыстоўваюць розныя ўпрыгожанні і прадметы адзення, ручнікі, пярсцёнкі [2, с. 403].

Купайло, купальнае вогнішча, купальны агонь, пажарышча – такія найменні зафіксаваны для вогнішча, якое раскладаецца ў купальскую ноч і валодае вялікай ачышчальнай сілай: *Сонцэ заходзіць – купайло разложым* (в. Мялешкавічы, Маз.); *Гавораць, хто пераскочэ праз купальнае вогнішча, той не будзе хворэць* (в. Васькаўка, Маз.); *На Івана Купального пойдам пажарышча рабіць* (в. Вятчын, Жытк.).

Спецыяльную назву мела і ноч перад Купаллем – *Купальная ноч, Купальна ноч, Купалава ноч, Купалова ноч: Мой чоловек бачыў, ек у купалову ноч ручаўка стояла коло самое воды, дак спужаўся сільнэ.* Пагоннае Жытк.

Прадметы, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні абрадаў і свят. Найбольшая колькасць такіх магічных прадметаў ужывалася пры правядзенні каляднага абраду. На Каляду насілі ***звязду*** [зорка], на якой былі намаляваны розныя казачныя фігуркі: *Павінна быць каза, маханоша, звязда* (в. Жмураўка, Рэч.); *Абязацельна далжна быць каза, мядзведзі і зорка* (г. Ветка); *Насілі зорку. Выраблялі зорку, у сярэдзіну ўстаўлялі ікону і свечку. Свечку запальвалі* (г. Брагін).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ноч пад Стары новы год адметная абрадам шчадравання. Самай распаўсюджанай формай правядзення шчадровак быў абход з ***казой*** [казёл] ‘чалавекам, пераапранутым у казла або з маскай з выявай казла’: *Казу дзелалі. Хадзілі ў каждую хату, пелі песні, і каза танцавала.* Лоеў. *Звязду не насілі, а калі насілі, дык песні пяюць. Перадзяваліся ў казла, штоб не ўгадвалі* (в. Пералёўка, Добр.); *Добра, калі ў хаце каза скакала, гэта была к багатаму ўраджаю* (в. Церахоўка, Добр.); *Казу з кардону дзелалі* (в. Шупейкі, Светл.). Павадыр, апрануты ў ***світку***: *Світку доўгую надзявалі, бараду прыклеім і казу вадзілі* (в. Яланы, Светл.), паганяў ***пугай*** Казу: *Ходзя Ілля на Васіля. Носіць пугу, дрэцена, уплецена, дзе пугай махне, там жыта расце* (в. Церахоўка, Добр.). Казу апраналі ў ***кажух***: *Казу вадзілі, кажухом накрывалі чалавека, як каза* (г. Ветка); *Перапраналіся ў казу з рагамі. Кажух пераварочвалі* (в. Гардуны, Ветк.). У некаторых раёнах замест казы вадзілі каня.

Традыцыйнай прыналежнасцю абраду шчадравання былі маскі ***бусла***: *Вадзілі з сабой казу, насілі бусла, вадзілі мядзведзя* (в. Церахоўка, Добр.); ***каня***: *На Стары новы год сабіраліся, вываручвалі шубу, надзявалі шубу. І от каза ідзе дзераза. Насілі ці каня ці зорку на палке. Галаву коньскаю з кардоніны. Ну і ідуць і просяць хазяіна: пусці казу-дзеразу* (в. Барталамееўка, Ветк.).

Не ўяўлялася свята Вадохрышча без ***святой вады*** – вада пасля Хрышчэння, якую пілі і якой свяцілі хату: *На Крешченне ўсе ідуць, набіраюць святую ваду, і год, як узялі, так яна і стаць* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Ахоўную сілу, паводле павер’яў, мела ***грамнічная, стрэчанная свечка*** *[встрэчэньска свечка]* – свечка, якая асвячаецца ў храме на Стрэчанне: *На Стрэчанне беруць свечону свечку і ставяць у хаці, штоб гром не ўдарыў, таму і завецца грамнічная свечка* (в. Васькаўка, Маз.).

Рытуальнымі элементамі святкавання Вербнай нядзелі былі ***вярба [верба]***: *У Вербную нядзелю ў царкве вярбу свецяць* (в. Капань, Рэч.); *Вербу ставяць за ікону, да Вялікадня* (в. Азершчына, Рэч.); ***крэпакі*** – драўляныя яйцы, зробленыя для гульні ў біткі на Вялікдзень: *На Веліконне мушчыны гуляюць у біткі. Падстойваюць, каб крэпакамі біць, а тогды пачнуць сварыцца* (в. Грабаў, Петр.); *смолянікі* – шкарлупіна яйца, залітая смалой: *На Паску смолянікі робілі: возьме йейцэ, со срэдзіны ўсё вып’е, а туды смолы нал’е і б’е ў біткі* (в. Вялікія Сялюцічы, Петр.).

Атрыбутамі забаў на Масленіцу выступалі ***колода***: *Калі хлопец не поспеў узяць дзеўку за себе до Масленіцы, то повесяць колоду ему на Масленіцу* (в. Буйнавічы, Лельч.); ***вулей:*** *На Благавешчанне палілі* ***вулей****, стралялі ахотнікі. Як толькі Хрыста слаўляюць, тады*

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

стралялі, адганялі плахіх людзей (г. Добруш); ***чучыла**: На Масленіцу сабіраліся ўсёй дзірэўняй, зазывалі вісну, палілі **чучыла**, бліны пеклі* (г. Буда-Кашалёва); ***кола*** – атрыбут забаў на Масленіцу: *Каталіся на Масленіцу на коле* (в. Яланы, Светл.).

Свята Троіцы не ўяўлялася без троіцкай зеляніны: галінак клёна, ліпы, явара, якая мела назву ***май**: Май поможэ ад грому* (в. Малыя Аўцюкі, Калінк.). ***Берозай, бярозай*** называлі галінкі бярозы, якімі ўпрыгожвалі хаты, падвор'і на Сёмуху (Тройцу): *На Тройцу свецяць клён і берозу і затыкаюць у дзверы, каб чэрці не прыйшлі* (в. Бярозаўка, Калінк.); *На Тройцу бярозу ў цэркву насілі, а тады ўжэ вешалі ў хаце* (в. Бібікі, Маз.). Для правядзення такога абраду выкарыстоўвалі таксама клён: *На Тройцу клёна вешаюць, хто ў хаце, у цэркві тожэ* (в. Буйнавічы, Маз.).

Вялікую ачышчальную сілу меў ***мак***, які выкарыстоўваўся як абавязковы атрыбут свята Макавей: *На Макавея мак свецілі і опсыпалі ім жывёлу, хлеў* (в. Буйнавічы, Лельч.).

Вянок, венок – рытуальнае ўпрыгожванне з кветак, стужак, неабходны атрыбут, якім суправаджаецца Купалле, дажынкі і пад.: *У нас на Купалле дзяўчаты плетуць венкі* (в. Казловічы, Калінк.); *На дожынкі плетуць венкі з колосоў* (в. Града, Жытк.); *У той год дык вадзілі русалку па дзярэўні пасля Тройцы* (в. Гурыны, Маз.).

Абрадавыя назвы ежы. Вялікае месца ў правядзенні абрадаў надавалася ***куцці*** – абрадавай страве з круп. На зімовых святках гатаваліся тры куцці: перадкалядная посная; багатая, шчодрая пры сустрэчы Новага года і галодная перад Вадохрышчам: *Во куцця ета інцярэсна. Куццю рабілі з крупы пярловай, варылі ў печцы. Трэба было ўсім нам, тром дзецям, у той куцці, што мамка зварыла, усім разам набраць па ложке той куцці. З той куццёй бягом па дзярэўні і каго сустрэнеш, так і мужа тваго будуць зваць, ну і бягом далей* (в. Івакі, Добр.); *На першую куццю сена ложаць на стол, пяком пірог і ложаць сена. Потым на другую і трэцюю куццю дабаўляюць яшчэ сена. А ўжэ после трэцяй куцці свяцілі сена і яду, якія стаялі на стале, і сена аддаюць карове. На багатую куццю многа гатовілі. Казалі, чым багацейшы стол, тым багацейшая будзе жызнь дальша* (г. Ветка).

Тры куцці былі прысвечаны ўшанаванню продкаў і варыліся ў адным гаршку, іх забаранялася спрабаваць да святочнай вячэры: ***галодная куцця*** *Куцці было тры: самая первая – галодная* (в. Азершчына, Рэч.); *Абычна на галодную куццю ячную кашу гатовілі* (в. Хальч, Ветк.); *На галодную куццю ставілі посныя стравы* (г. Ветка);

бедная [посная] ***куцця*** *На бедную куццю елі кіслую капусту, бульбу, малочнае не елі, рыбу тожа* (в. Азершчына, Рэч.); *На посную*

куццю жырнае, яечкі не елі (в. Хальч, Ветк.). Бедную куццю запраўлялі *малаком з канопленага семя* – вадкасцю, якая здабываецца з семя канапель: *У нас як бедная куцья, дак канопленае семя таўкуць, покі белае молоко не стане. Тогды ўжэ етэ малако з канопленага мемя разводзяць вадой, яшчэ й пудсолодзяць ды ў кашу* (в. Грабаў, Петр.);

багатая куцця *Багатая куцця была, калі пост заканчваецца. Варылі кашу, калі яе елі, казалі: "Дзед Мароз, прыходзь к нам гушчу есці!"*. Азершчына Рэч. *На багатую куццю рабілі багаты стол. Чым багацейшы стол, тым і ўраджай будзе багацейшы* (г. Ветка); *После Раждзества Хрыстова – гэта ўжэ багатая куцця. Кроме кашы, кампоты былі, ладкі былі абізацельна, што-та мясное. Еслі куцця была багатая, то запраўлялі маслам, салам* (в. Хальч, Ветк.);

шчадровая куцця – страва, прыгатаваная на калядныя святы. *Шчадровая куцця бывае і пасля Калядаў – 13 студзеня вараць. Некалькі іх бывала* (в. Хальч, Ветк.);

раждественская куцця – *Вараць перад Раждествам куццю з ячменю – раждественская куцця* (г. Ветка). На ўсе тры куцці каша варылася ў адным і тым жа гаршку. Магічнае значэнне куцці даследчыкі бачаць у тым, што зерне валодае якасцю доўга захоўваць і зноў аднаўляць жыццё, сімвалізуе земляробчы кругаварот, бясконцасць жыцця [1, с. 164].

Пачастунак для валачобнікаў меў назву ***валачонае, вуноска***: *Валачобнікам усегда збіраем валачонае* (в. Загорыны, Маз.); *Опослей господар вуносіць волочоўным вуноску: і сало, і пірогі, і горэлку* (в. Чырвонабярэжжа, Лельч.).

Харчовыя прадукты, сабраныя пастухом ад гаспадароў жывёлы ўвосень (на свята Варвары), называліся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

называлі (в. Гадзілавічы, Раг.); *каліннік* – кісель, які варылі на свята Калінавік: *На Івана Калінавіка каліннік варылі – кісель такі – і пілі яго, каб галава не балела* (в. Бібікі, Маз.).

Найменні дзеянняў пры правядзенні абрадаў і свят:

абсяваць, абсяванне, засяваць – абрад на Ражаство, калі хаты аднавяскоўцаў абсыпалі зернем, каб быў добры ўраджай. *Я знаю, што на Ражаство хаты абсяваць нада. Абычна пастухі робяць абсяванне: абходзяць дама, з празнікам паздраўляюць У каждую хату горсць аўса кідаюць.* Ветка. *Засяваць ходзяць на Каляды. Засяваюць – хазяева выходзяць, выносяць, пякуць бліны, даюць сала, у каго шо е, то і даюць* (в. Івакі, Добр.); ***варажба*** [варожба] – прадказанне будучага. *Варажбу пачынаюць у святыя вечары* (в. Баравікі. Светл.); *На варожбу сабіраліся нескалька дзевушэк, посярэдзіне дома сыпалі пшано, кожная сваю кучку рабіла. Залазілі на печ і пускалі петуха з печы: на якую стане ці будзе кляваць. Тая першая замуж пойдзе* (в. Краснае, Гом.); ***варажыць, гадаць*** [гаданне] [гадаці] – прадказваць будучае. Вядомы самыя разнастайныя спосабы варажбы: *Варажылі яшчэ так: грабяшок пад падушку на ноч клалі, сужаны прасыпаўся. Або курэй збіралі, клалі кучачкі зерня. Каля каждай кучачкі ставілі куру, якую клюне, тая першая замуж пойдзе. Драва абхапывалі або забор. Калі там двенаццаць паленняў, то ў пары будзеш, а калі нечотна, тады ты будзеш без пары. Вот, усё спаўнялася* (в. Хальч, Ветк.); *Варылі на гаданне кашу ў махотцы ці глёку і стаўлялі на кут, лажылі сена на кут, а самі ішлі гадаць. Выходзілі ў двор, снімалі з сябе валенкі і кідалі цераз забор. Куды валенак ляжыць – у той бок пойдзеш замуж.* (в. Стаўбун, Ветк.); *Дзеўкі гадаці любілі. Ідзеш ад падруг дахаты, дай пагадаю на плоці. Ідзеш і плаціны лічыш: бедны, багаты, хітры, праставаты, прыгожы, непрыгожы, харошы, нехарошы. На якую скончыцца – с такім і будзеш* (в. Гадзічава, Раг.). Месцам варажбы звычайна з'яўлялася перакрыжаванне дарог, лазня, хлеў, печ і парог хаты. Вельмі часта пры гаданні выкарыстоўваюць розныя ўпрыгожанні і прадметы адзення, ручнікі, пярсцёнкі [2, с. 403];

заклікаць вясну, весну гукаць, клікаць – спяваць веснавыя песні, у якіх заклікаецца надыход вясны: *На Масленіцу дзеўкі пачынаюць весну гукаць* (в. Мялешкавічы, Маз.); ***веснаваці*** – вясну сустракаць: *З Благавешчання дзяўчаты пачынаюць ужэ веснаваці* (в. Прудок, Маз.). Гуканне вясны на Масленіцу дасягала сваёй кульмінацыі нп Благавешчанне, калі і адбывалася непасрэднае рытуальнае дзеянне, і працягвалася да таго моманту, як узаруць поле [1, с. 40]; ***разгавецца*** – пачаць есці мяса пасля паста: *Цяпер упершыню пасля посту можна было ўволю паласавацца рознымі стравамі* (в. Станкі, Ветк.); ***біткі*** –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гульня з пафарбаванымі яйкамі на велікодныя дні. *Даем дзецям яйцэ, да і граюць воны ў біткі* (в. Ліпляны, Лельч.); ***гушкацца*** – гушкацца на Масленіцу на арэлях. Звязвалася гэта дзеянне з павер'ем, што ў такім выпадку лён ў гэтым годзе будзе моцны і доўгі: *На Масленку гушкаліся на варотах* (в. Бібікі, Маз.); ***варажыць*** – прадказваць будучае: *У нас на Сорока дзеўке ворожаць про чоловека* (в. Азяраны, Жытк.); *Дзеўкі кідалі сабаку піражок, чый першы з'еў, тая і замуж першая пойдзе* (в. М. Аўцюкі, Калінк.); ***куміцца*** – устанаўліваць сяброўскія, прыязныя адносіны паміж дзяўчатамі: *Раней на Тройцу куміліса* (в. Ляскавічы, Петр.).

Вянкі пускаць, венкі пускаць – абрадавае дзеянне апускання вянкоў у раку, якім суправаджаецца варажба на Купалле: *Ето ж калі Купала – вянкі пускаюць* (в. Загорыны, Маз.).

Народныя святы і абрады з'яўляюцца праяўленнем традыцыйнай культуры беларусаў, таму ў генетычных адносінах амаль уся належыць да агульнаславянскага лексічнага фонду. Гэта такія лексемы, як *вада, баба, дзед, Ражаство, Крашчэнне, Вадохрышча, Святкі, каза, звезда, шчадроўка, варажыць, кола* і інш. [4]. Большасць найменняў, звязаных з даследуемай тэматыкай, з'яўляюцца матываванымі. Матываванасць слова – гэта суаднесенасць вытворнага слова з тым, ад якога яно ўтворана, пры якой сэнс с структура першага слова могуць быць растлумачаны шляхам звароту да сэнсу слова, ад якога ўтворана. Словы з матываваным лексічным значэннем, маюць "унутраную" форму. Унутраная форма слова – семантычная і структурная суаднесенасць складаючых слова марфем з іншымі марфемамі дадзенай мовы; прыкмета, пакладзеная ў аснову намінацыі пры ўтварэнні новага лексічнага значэння слова [5, с. 248]. Даследчыкі па фармальным крытэрыі вылучаюць фанетычную, марфалагічную, семантычную і марфолага-семантычную разнавіднасці матываванасці. Фанетычная матываванасць рэалізуе выяўленчыя або ацэначныя патэнцыі таго, хто абазначае прадмет ці з'яву. Астатнія віды матываванасці зводзяцца да асноўнага – семантычнай матываванасці, якая можа быць ці не можа быць выражана марфалагічна [6, с. 24].

У аснове канцэпцыі матываванасці моўнага знака ляжыць уяўленне пра безумоўны прыярытэт свядомага над бессвядомым у маўленчай і моватворчай дзейнасці. У. У. Лявіцкі адзначае, што матываванае слова аказваецца больш жыццяздольным, чым нематываванае. Слова, матываванае фанетычна і семантычна, больш устойлівае, чым слова, матываванае толькі адным са спосабаў. Пры гэтым, пры суадносінах нематываванага і нематываванага слова другое часта выцясняе першае [6, с. 24].

Самым пашыраным тыпам матывацыі найменняў, звязаных з народнымі святамі, з'яўляецца намінацыя паводле працэсуальнай прыкметы. Лексічным матыватарам такіх найменняў з'яўляюцца назвы разнастайнага дзеяння. Вялікая колькасць зафіксаваных з'яўляюцца суфіксальнымі ўтварэннямі ад:

дзеясловаў для абазначэння працэсуальнай прыкметы: пры дапамозе суфіксаў *-к-* (*выноска, запускі, біткі, святкі); -нн-* (*абсяванне, Крашчэнне, уздвіжанне, Стрэчанне, кумленне); -б-* (*варажба, -ств-: Ражаство)* або для абазначэння асобы (*валачобнік, шчадроўнік, шчадроўшчык, крэсціцель, шчадруха);*

назоўнікаў: апісаныя намінатыўныя адзінкі ўтвараліся пераважна суфіксальным спосабам ад асновы назоўніка пры дапамозе суфіксаў *-ын-, -ар, -чык-, -нік-, -іц-, -іч-*: *варваршчына, звездар, калядоўшчык, каляднік, веснянка, Мікольнік, веснаваці, калінник, піліпаўка; Грамніца; куміцца, Купалле, вербіч, спасоўка;*

прыметнікаў: *крэпакі, Масленіца; смолянікі;*

лічэбнікаў: *Троіца, дзевятуха, дзесятуха, дзеўятнік.*

Нешматлікія назвы сярод лексікі народных свят утвораны шляхам асновескладання і складанасуфіксальным спосабам, у выніку спалучэння іменнай і дзеяслоўнай асноў. Апорным кампанентам такіх найменняў з'яўляецца аддзеяслоўная аснова (*вадохрышча, Благавешчанне, Дабравешчанне, маханоша, Галавасек)* або іменная аснова (*вялікдзень, Багаслоў).*

Некаторыя найменні з'яўляюцца субстантываванымі назвамі: *скоромное, валачонае*.

Зафіксаваны на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна і складаныя назвы:

прыметнік + назоўнік: *Варварын дзень, святое Васілле, Стары новы год, каровячы Ўлас, велікодны пірог, красная субота, зборова субота, белая недзеля, Аляксей цёплы, піліпоўскіе запускі, багатые дзеды, міхайлаўскіе дзеды, Казанска Богородзіца;*

дзеяслоў + назоўнік: *вянкі пускаць, заклікаць вясну, весну гукаць, распісувацца з колядамі.*

Аднак сустракаюцца сярод каляндарна-абрадавых назваў і адзінкавыя запазычанні з розных моў, якія датычаць перш за ўсё ўласных назваў:

– з грэчаскай: *Андрэй* 'мужны', *Улас (Аўлас)* < Влас 'просты', *Варвара* 'чужаземная', *Васіль* 'царскі'; *Аляксей* 'абаронца'; *Юрый* 'земляроб', *Макар* 'блажэнны', Мікола < Мікалай 'пераможца народаў'; *Мітрапан* 'маці народжаны', *Параскева* 'пярэдадзень свята', *Сава* 'святы і пустыннік'; *Піліп* 'аматар коней'; *куцця* 'зерне'; *паска* пад уплывам лацінскай *paschalis* [4, т. 3, с. 216];

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– старажытнаяўрэйскай: *Ганна* ‘міласць’; *Міхаіл* ‘падобны да бога’;

– лацінскай праз пасрэдніцтва польскай мовы: *Каляда* < calendae ‘пачатак месяца’ [4, т. 2, с. 300]; *май* < maius [4, т. 2, с. 559];

– італьянскай: *банкеты;*

– стараславянскай: *спас, Благавешчанне* [4];

– нямецкай праз пасрэдніцтва польскай мовы: *кірмаш* < kiermasz ‘пачатак месяца’ [4, т. 1, с. 652].

Абрадавая лексіка, якая да сённяшняга часу шырока функцыянуе на тэрыторыі Гомельскага рэгіёна, вызначаецца багатай і складанай сістэмай лексічнай сродкаў, варыянтнасцю і разнастайнасцю сродкаў з іх семантычнымі і граматычнымі асаблівсцямі, з’яўляецца неад’емнай часткай духоўнай культуры беларусаў, у якой захаваны старажытныя моўныя з’явы.

Літаратура

1 Ліцьвінка, Васіль. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мн.: Беларусь, 1998. – 190 с.

2 Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. – 511 с.

3 Лапіцкая, Л. І. Слоўнік каляндарна-абрадавай лексікі Усходняга Палесся / Л. І. Лапіцкая. – Мазыр, 2007. – 65 с.

4 Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4-х т.: пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачёва [Текст] / под ред. и с предисл. Б. А. Ларина / М. Фасмер – М.: Прогресс, 1986-1987

5 Термины и понятия лингвистики: Лексика. Лексикология. Фразеология. Лексикография: Словарь-справочник – Назрань: ООО «Пилигрим». Т. В. Жеребило. – 2011.

6 Левицкий, В. В. Виды мотивированности слова, их взаимодействие и роль в лексико-семантических изменениях // Материалы семинара по проблеме мотивированности языкового знака. – Л., 1969. – С. 24.

А. А. Станкевіч

2.2. Каляндарна-абрадавая лексіка на тэрыторыі руска-беларускага памежжа

Традыцыйная народная культура памежжа фарміруецца пад уплывам розных гісторыка-этнаграфічных, сацыяльна-палітычных і канфесійных фактараў ва ўмовах працяглых этнічных кантактаў і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

складанага ўзаемадзеяння розных нацыянальных груп. Супастаўляльны аналіз матэрыялаў, сабраных у беларускіх прыгранічных рэгіёнах і памежных тэрыторыях усходнеславянскіх этнасаў – даўніх суседзяў беларусаў, якія маюць агульныя гістарычныя карані і тыпалагічна блізкія па характары культуры, выконвае важную ролю ў вызначэнні асаблівасцей гісторыка-культурных працэсаў.

Тэрыторыя беларуска-рускага памежжа адлюстроўвае унікальнасць і непаўторнасць традыцыйнай культуры ў сувязі з эстэтыкай асяроддзя існавання славян. Лінгвістычная прастора гэтай тэрыторыі прадстаўлена двума вектарамі : білінгвізмам – выкарыстаннем беларускай і рускай моў (на гарызантальным зрэзе) і мезалектам – змешанай гаворкай у паўсядзённых зносінах (на вертыкальным зрэзе).

Даследуючы тэрыторыю з пераходнымі рысамі культуры, неабходна праводзіць сістэмны аналіз этнакультурнага развіцця на працягу розных гістарычных эпох, што дазволіць паказаць генезіс, асаблівасці фарміравання, этапы і асноўныя тэндэнцыі развіцця традыцыйнай культуры гэтага рэгіёна.

Традыцыйная народная культура памежжа фарміруецца пад уплывам розных гісторыка-этнаграфічных, сацыяльна-палітычных і канфесійных фактараў ва ўмовах працяглых этнічных кантактаў і складанага ўзаемадзеяння розных нацыянальных груп.

Параўнальны аналіз фактаў, сабраных на тэрыторыі міжэтнічных кантактаў, мае асаблівае значэнне для ўстанаўлення характару яе фарміравання і развіцця розных элементаў агульнай сістэмы

У сістэме канцэптаў, якія вызначаюць змест духоўнай культуры, асноўнымі, сутнаснымі з’яўляюцца паняцці *чалавек, сям’я, праца, прырода, рэлігія.*

Змест названых апазіцый раскрываецца праз разнастайныя формы духоўнай культуры. Апазіцыя *чалавек* ↔ *праца* рэалізуецца ў такіх формах, як каляндарна-абрадавы фальклор, звязаны з народным календаром, каляндарна-абрадавая лексіка, народнагаспадарчая лексіка і г. д.

Аб’ектам нашага даследавання з’яўляецца прадметна-тэматычная група “каляндарна-абрадавая лекска”, прадметам вывучэння – **лексіка абрадаў земляробчага календара.** Крыніцай фактычнага матэрыялу паслужыў дыялекталагічны архіў кафедры беларускай мовы ГДУ імя Ф. Скарыны, складзены па выніках дыялекталагічных практык у Веткаўскім і Добрушскім раёнах Гомельскай вобласці. Гэта тэрыторыя інтэнсіўных гісторыка-культурных і этнічных кантактаў рускага і беларускага народаў, якія абумовілі рэгіянальную спецыфіку традыцыйнай народнай культуры, у тым ліку і мовы. Г. Ветка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знаходзіцца за 22 км ад абласнога цэнтра. Веткаўскі раён мяжуе на поўдні з Добрушскім раёнам, на поўначы – з Чачэрскім, на захадзе і паўднёвым захадзе з Гомельскім раёнам, на ўсходзе – з Бранскай вобласцю. Гэта тэрыторыя інтэнсіўных гісторыка-культурных і этнічных кантактаў рускага і беларускага народаў, якія абумовілі рэгіянальную спецыфіку традыцыйнай народнай культуры, у тым ліку і мовы.

Лексіка-семантычная група аналізуемых назваў прадстаўлена шматлікімі тэматычнымі падгрупамі. Найбольш значную ў колькасных адносінах групу складаюць назвы важнейшых хрысціянскіх свят, якія адзначаліся ў розныя пары года і былі прысвечаны разнастайным падзеям рэлігійнага жыцця. Яны мелі агульную назву *прэстольныя празнікі, прыстольныя празнікі, прыстольшчына*: *Ражаство, Крашчэнне ў нас прэстольнымі празнікамі завуць* (Неглюбка, Ветк.).

Святы зімовага цыклу

Асноўнымі святамі зімовага цыклу лічыліся *Коляды, Стары Новы год, Вадохрышча, Стрэчанне.*

Важнейшым зімовым святам з'яўляецца, безумоўна, свята нараджэння Хрыста, якое адзначаецца 7 студзеня. У даследуемым рэгіёне надзвычай пашырана руская назва гэтага свята, якая ўжываецца ў шматлікіх варыянтах: *Рождество, Раждество, Раждзіство, Раждзяство, Ражджаство, Ражжаство, Рэджаство, Разаство, Ражаство, Ражэство, Раство, Ражство, Раздво, Разжво: На Ражаство хаты "абсяваць" нада. Абычна пастухі абсяваюць, абходзяць дама з празнікам паздраўляюць. У каждую хату горсць аўса кідаюць* (Ветка); *Ражаство гулялі калісь нядзелю. У хатах гулялі, нанімалі музыку на тры дні* (Глыбаўка, Ветк.); *На Разтво мы ў цэркву пойдам, свечку паставім і молімся* (Неглюбка, Ветк.); *У гэты дзень у гонар Рождества Хрыстова нічога не елі да першай зоркі* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Раждзество – гэта 7 января. У гэты дзень гатовілі разныя блюда. Халадзец гатовят, в аснавном, каўбасы жараць, мяса запекаюць. Ну і мучное, канешна. Прыглашаюць гасцей, родственнікаў* (г. Ветка); *Раждзяство – гэта празнік аброчный, святы дзень – радзіўся Хрыстос, наш заступнік. У гэты дзень гуляюць, песні пяюць і банкеты водзяць. Хто дзень празнуе, хто і тры* (г. Ветка); *Вечарам перад Ражджаством служба ідзе, адпраўляецца канон, пеем псалмы* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Ражэство гулялі калісь у нас нядзелю Нанімалі музыку на тры дні, гарманіста* (в. Глыбаўка, Ветк.).

Лексема *Каляды* і яе варыянты *Каляда, Коляды, Калядкі* , паўсямесна распаўсюджаныя у адзначаным рэгіёне, маюць розныя значэнні: 1) 'святкі ад Нараджэння Хрыстова да Вадохрышча':

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Каляды празнавалі калісь две неделі, танцавалі, гулялі (Ст. Сяло, Ветк.); *На Каляды усе свадзьбы гуляюць. От добра ў гэты час вяселле ладзіць* (г.п. Церахоўка, Добр.); *Святкі былі ад Раждества да Хряшчэння. У ета время былі святыя вечары, маладзёж гуляла, спраўлялі ігрішчы, гадалі, калядавалі, пелі шчодры. Нельзя было работаць, стукаць, резаць* (г. Ветка); 2) ‘зімовае свята, якое адзначалася 7 студзеня’, ‘свята Нараджэнне Хрыстова’: *Святкавалі Каляды кожны ў сваёй хаце. Усё прыбіралі, мылі. Стол засцілалі святочным абрусам, пад яго клалі сена, ставілі гаршчок з куццёй, каб быў не голы, а багаты, Дзеці залазілі пад стол і кудахталі: “Кудак, кудак, наша курка нясе яйцо з кулак. У суседа вароты трасуцца, а ў нас куры нясуцца”. Дзецям сыпалі ў рукі семечкі, зерне, ці цукар* (в. Насовічы, Добр.); *Каляды празнавалі 7 января. Перад калядамі мылі палы, у парозе сцялілі сена, таго, што Ісус Хрістос радзіўся ў яслях і яго хавалі ў сене ад ірадаў. Каляды – бальшэй празнік* (г. Ветка); ‘абход двароў з велічальна-віншавальнымі песнямі ў ноч з 13 на 14 студзеня, калядаванне’: *Каляда на сівым коніку прыяжжала* (в. Барталамееўка, Ветк.); *Каляды – гэта на стары Новы год сабіраліся, выварочвалі шубу, надзявалі так , хадзілі пад вокнамі, пелі, танцавалі, казу вадзілі* (Ст. Сяло, Ветк.); ‘калядная песня’: *Хадзілі, калядавалі, каляду спявалі, перэадзяваліся, ну, іх угашчалі, дзеньгі давалі, гасцінцы* (в. Хальч, Ветк.).

Дзень каляд у асобных мясцовасцях называўся “засеўкамі”: *Маладыя хлопцы насілі па вуліцы бліскучую звязду з лентачкамі, заходзілі ў хаты, сыпалі на мост зерне і гаварылі: ”Сею, сею, пасяваю, з Новым годам паздраўляю”* (в. Насовічы, Добр.).

Абход двароў з велічальна-віншавальнымі песнямі з 13 на 14 студзеня называўся таксама *шчодры, шчодрыкі, шчодрікі, шчадроўкі, шчадруха, шчодзяр: На шчодры ходзяць шчадроўшчыкі, наражаюцца і казой, і мядзведзем, і цыганамі, пяюць песці, іх адорваюць прысмакамі* (в. Хальч, Ветк.); *На шчодрікі пелі песні, переадзіваліся ў казу, у цыганей, выварочвалі шубу наверх і адзявалі, вымазываліся сажай. Хто ўгашчаў харашо, тым пелі харошую песню, хвалілі хазяеваў, жадалі багатага ўражая і багацтва. А хто нічога не даваў, таму пелі плахую песню, стыдзілі, нічога не жалалі* (г. Ветка). Лексемы *шчодры, шчадроўкі* мелі таксама значэнне ‘песні, якія выконваліся шчадроўнікамі’: *Шчадроўнікі ходзяць па дварах і пытаюць:”Шчодры нада?” Еслі ім атвечаюць, што нада, то яны заходзяць і пяюць песні. Калі заходзюць у хату, то кідаюць зярно і гавораць:”Хай той, хто тут ходзіць, у таго жыта родзіць!” Патом пяюць песню і каза танцуе. А патом каза падае і гаворуць*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шчадроўнікі: “Штоб каза устала, дайце хлеба, сала!”. Хазяевы даюць пачастункі, і шчадроўнікі ўходзяць у другі двор (г. Ветка). *Шчодрыкамі* называлі таксама падарункі, якія выносілі гаспадары дома.

Гурт людзей, якія з песнямі на Каляды абыходзілі хаты вёскі, называлі *каляднікі, калядоўшчыкі, шчадроўнікі, шчадрухі*: *А тады калядоўшчыкі паюць ва ўвесь голас, ходзюць па хатам да шчадруюць* (в. Ст. Сяло, Ветк.); *Бабуля мая называла етых людзей шчадроўнікі* (г. Ветка). Чалавека, які насіў зорку, называлі *звязднік, звяздар*: *Хадзілі па хатах, усе нараджаліся ў чучалы, гралі на гармошке, бубне, барабанілі. Звяздар ці звязднік насіў звязду, якая абазначала шчасце, рабілі казу і хадзілі шчадраваць* (г. Ветка).

Важнейшай рытуальнай стравай у гэтыя святы была *куцця*: *Варылі тры куцці. Першая куцця была перад Ражаством, 6 января, посная, галодная, варылі яе з ячменнай крупы, запраўлялі алеем і сахарам.Ставілі яе на кут, і як садзіліся есць, то хазяйка выхадзіла на вуліцу і гаварыла: “Мароз, мароз, хадзі куццю есць!” Ета каб мароз не памарозіў пасевы. Другая куцця – шчадровая, багатая, была 13 января, варылі яе з пшана, рысу, у каго што было, запраўлялі маслам, яйкамі, пасля хадзілі шчадраваць. Трэцяя куцця была посная, бедная, вадзяная перад Храшчэннем, 18 января* (г. п. Церахоўка, Добр.).

Традыцыйным абрадам калядных свят была *варажба, гаданіе, гаданне*. Варажылі перад Калядамі, перад Старым Новым годам і перад Вадохрышчам: *Гадалі маладыя дзеўкі. Кідалі сапагі там, тухлі якія, буркі, валянкі, чобаты чараз плот. Куды насок глядзіць, туды замуж пойдзеш* (в. Хальч, Ветк.); *Складалі спічкі – рабілі ў галавах калодзеж. Хто прысніцца, што прыйшоў па воду – нарачоны; На выгане, на перакрэсці дарог гукалі: “Доля, доля – дзе ты?” Як дзе сабака загаўкае, ці людзі загавораць, ці што-небудзь стукне – у той бок замуж выйдзеш; Мачылі ў калодзежы фартухі і беглі па вуліцы – у каго замерзне, у таго будзе мужык п’яніца; Вазьму камянёк, кіну ў калодзеж. Вада ціха блішчыць – будзе з мілым мне добра жыць. А як вада бурчыць – будзе мяне мілы біць* (в. Насовічы, Добр.); *Гадалі перад Старым Новым годам. Блін спікёш, з гарачім блінам выскаківаеш на уліцу, кто встречаіцца – сын ці брат будзе* (в. Ст. Сяло, Ветк.); *На зеркала гадалі, пад поўнач, ставяць перад зеркалам свечкі і нешта кажуць* (в. Вуць, Добр.).

Калядны цыкл свят завяршала Вадохрышча, якое ў дадзеным рэгіёне мае такія варыянтныя назвы *Крашчэнне, Крашчэніе, Крышчэнне, Крешченье, Крешченне, Крішченіе, Хрышчэнне, Храшчэнне, Хряшченне, Хряшьчэнне*: *Крашчэнне атмічалася 19 января. У еты дзень пасвяцалі ваду, купаліся ў прорубях. Пасвяцоную ваду давалі піць дзецям і*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бальным. Ёй брызгалі там, дзе стаяў скот і хранійся ўражай (г. Ветка); *У Хрышчэнне хрышчыкі рысавалі на дзвярах, на варотах* (в. Хальч, Ветк.); *На Крашчэніе васямнаццага чысла у цэрькву ідуць, у тры часы вадасяціе, ваду свецяць – вялікая вада называецца, а патом ужэ назаўтра свецяць, хрышчэнская, святая вада называецца, яе дома хранят* (г. Ветка); *Крашчэнне ў нас пападае на 19 январа. У гэты дзень ваду абязацельна ў царкве свецюць, а патом хранят её гадамі і ана не спараецца*. (Хальч, Ветк.); *А на Храшчэнне ўсягда маразы бываюць дужыя.* (Ветка); *На Вадохрышча нада воду піць, умывацца ею, вада этая ад балезней паможет* (Хальч, Ветк.).

Да зімовых свят адносілася таксама *Стрэчанне, Стречанне, Стрэценіе, Встрэчанне, Устрэчанье, Страчэнне, Грамніцы* – праваслаўнае свята, якое адзначаецца 15 лютага, у народзе тлумачыцца як сустрэча зімы з вясною: *На Стречанне зіма з вясной стрячяюцца* (в. Неглюбка, Ветк.); *Стрэчанне – Грамніцы. На Грамніцы палавіна зіміцы*; *На Встрэчанне нада схадзіць у цэркву і прынесці святыя свечачкі. А кагда граза ці нешчасце якое ў доме, то нада іх запаліць – яны аберегают дом* (г. Ветка); *На Стрэчанне ходзяць у царкву, свечкі свечуць.* Ветка; *На Стрэценіе Гасподняе сустракаецца ўжэ вясна з летам*. (Старое Сяло, Ветк.).

Менш пашырана назва свята *Увядзенне, Введеніе* ‘увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы, якое адзначаецца 4 снежня’: *Увядзенне Святой Багародзіцы ў храм – ета значыт Марыя, маць Хрыста. У іх долга не было дзяцей, ані решылі: ужо хто ні радзіцца – ета божы дзіцёнак, і ў тры годзіка павялі её в цэркавь, к Богу с узелочкам. І ана там васьпітывалась* (г. Ветка).

Даволі значную групу ўтвараюць назвы прысвяткаў народнага календара, або, як іх інакш называюць, дні святых:

Андрэй ‘свята ў гонар мучаніка Андрэя, якое адзначаецца 13 снежня, у народзе лічыцца дзявочым святам’: *Вот пачынаецца пост. Панядзелак, аўторак, серада і чацвер – тры дні маліліся, а тады ўжэ на чацвёрты дзень ідзе Андрэй* (Старое Сяло, Ветк.);

Варвара ‘праваслаўнае свята ў гонар Варвары – велікамучаніцы, адзначаецца 17 снежня. У народзе ўсведамляецца як жаночае свята, з якога пачынае прыбываць дзень’: *Ну, Варвара – мучаніца, гэта ідзе перад Міколай* (Старое Сяло, Ветк.);

Савы і Варвары ‘дзень шанавання святых Савы і Варвары’: *Савы і Варвары ноч адарвалі, так гаворат* (Хальч, Ветк.);

Сава (Савы) ‘свята ў гонар мучаніка Савы, якое адзначаецца 18 снежня, Сава лічыцца ў народзе бацькам Міколы Зімовага’: *Варвара дзень адарвала, а Сава ночы прытачыў* (Старое Сяло, Ветк.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мікола, Нікола Чудатворац ‘праваслаўнае свята ў гонар святога Міколы, якое адзначаецца 19 снежня (Мікола халодны) і 22 мая (Мікола галодны)’. *Два Міколы ходзя: вясной і ў восені*. Хальч, Ветк.; *Ікону Ніколы Чудатворца пераносілі ў нас у Барталамееўцы з хаты ў хату. Вот ад саседкі мне прынеслі ікону, яна ў нас зімуе, да веснавой Міколы, а патом ужо сцелім коўры ат нас і да саседкі, я гатую вячэру, а яна абед, калі прымае Міколу* (Барталамееўка, Ветк.);

Васілле ‘прысвятак народнага календара, дзень памінання святога Васілія, адзначаўся 14 студзеня’: *Васілле – эта зімовы празьнік царкоўны*. Неглюбка, Ветк.*; На Васілле музыку наймалі*. (г. Ветка).

Святы веснавога цыклу

Благавешчанне, Благавешчаніе, Дабравешчанне ‘царкоўнае свята ў гонар весткі пра нараджэнне Хрыста, якое адзначаецца 7 красавіка’. У народе асэнсоўваецца як свята прыходу вясны. *Благавешчанне – эта бальшой празнік, как гаварыцца, пцічка гнезда не ўёт, а дзеўка косу не плецёт. Ангел Божай Мацеры ізвесціл, што у неё будет сын, духам гасподнім зачат* (г. Ветка); *Благавешчаніе ідеть седьмога, Вялікі пост, нікто не справлял, нічево не дзелалі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *На Благавешчанне бусел прылятае* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Да Благавешчання нельзя чапаць зямлю – яна яшчэ спіць* (в. Хальч, Ветк.); *На Дабравешчанне нічога дзелаць нільзя* (г. Ветка); *Благавешчанне – такі празьнік, як і Паска. І дайжа можна разгаўляцца. На Благавешчанне дайжа сонца красуецца, што прыйшла весць благая* (Барталамееўка, Ветк.);

Паска, Пасха, Вялікдзень, Вялікадне ‘веснавое хрысціянскае свята, прысвечанае ўваскрэсенню Хрыста, якое адзначаецца ў першую нядзелю пасля поўні ў перыяд ад 4.04 па 08.05’: *Паска – ета первае васкресенне пасля Вялікага паста. Убіралі чыста хату перад Паскай, пяклі паскі, кулічы, красілі яйцы, хадзілі ў цэркаў на ўсяночную, гатовілі багаты стол* (г. Ветка); *Пасху усе любілі, гэта самы глаўны празнік* (в. Гардуны, Добр.); *Яйкі ўсягда красілі ў красны колер, таму што Хрыстос праліў кроў за нас* (в. Насовічы, Добр.); *Пасля вербніцы ўся нядзеля была красная, рыхтаваліся да Вялікдня* (г. п. Церахоўка, Добр.); *К Вялікадню хочаш – не хочаш, а ўсі ўжо печ беляць* (в. Неглюбка, Ветк.); *А вот Паска – самае вялікае свята, ужо ж такая радасць. У цэркаў на Паску ходзім на ўсяночную. Пячом булкі, калі ўдаюцца яны добра, увесь год дастатак будзе* (Хальч, Ветк.); *Калі памрэш на Пасху, то і самаму вялікаму грэшніку ўсе грахі прашчаюць* (Старое Сяло, Ветк.); *К Вялікадню хочаш – не хочаш, а ўсі ўжо печ беляць* (Неглюбка, Ветк.);

Троіца, Тройца, Сёмуха, Зялёнае свята, Сядміца, Пяцідзесятніца ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца на 50-ты дзень пасля Вялікадня’:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тройца – ета празнік трох святых – Айца, Сына і Святога Духа. На Троіцу людзі украшают хату маем (маёлкай) – кляновымі, бярозавымі, ліпавымі веткамі, явар на вокны ставяць. Эта аберагает хату ад злых духаў. Калі клён быстра засохне – сухі будзе год, калі не быстра – мокры (г. Ветка); *На Троіцу хату яварам украшалі* (г. Ветка); *На Тройцу нельга зямельку трывожіць, нада дама зеленью украшаць.*(Старое Сяло, Ветк); *На Тройцу нада на могелкі хадзіць, бярозавымі веткамі абмятаць іх, яйкі класці* (Хальч, Ветк.); *На Троіцу пішчолкі (пісцёлкі, піпу) рэжуць, у цэркві свецяць, на вокны ставяць, потым сушаць, у мішочкі складваюць, хранят. Пакойніку пісцёлкі ў падушачку кладуць. Пішчолкі паляць, ад гразы дым пускаюць; На Тройцу хадзілі друг к другу ў госці, куміліся паміж сабой* (в. Хальч, Ветк.); *Тройца была тры дні. Яе шчэ называлі Сёмуха, ці Зялёнае свята. Праз сем тыдняў ад Пасхі адзначалі* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Сядміца – гэта сёмая нядзеля пасля Пасхі, тож царкоўнае свята; Пяцідзесятніца – бальшы празнік, первым долгам ідзеш в цэркаў, на службу, эта самае главнае* (г. Ветка).

Дні святых:

Саракі, Соракі, Соркі ‘праваслаўнае свята ў гонар сарака мучанікаў, дзень веснавога раўнадзенства, адзначаўся 22 сакавіка’: *На Соракі пяклі сорак галубкоў з цеста, бо было замучана сорак святых. Первыя булачкі нада аддаць птушкам, каб прыляталі ўжо і няслі цяпло; Соркі бываюць 22 марта; На Саракі пякуць галак, жаўранкаў з цеста, каб вясна была добрая* (г. Ветка); *На Соракі сорак выр’яў прыляціць* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Соракі ідзём у цэркві адпраўляць* (Хальч, Ветк.); *Гэта на Соракі калісь у старыя гады яшчэ да вайны людзі старыя так пяклі такія пампушачкі, кругленькія і туды капейку клалі. Каму пападзе та пампушачка с капейкай, значыць, той год замуж выйдзеш* (Старое Сяло, Ветк.). На Саракі ў многіх вёсках *“гукалі вясну”*(у іншых гэта рабілі на Благавешчанне) – выходзілі на высокае месца, распальвалі вогнішча, рыхтавалі абрадавае печыва, вадзілі карагоды, выбіралі дзяўчыну на ролю вясны, гушкаліся на арэлях, выконвалі песні-вяснянкі. У некаторых мясцовасцях спальвалі старыя рэчы на вогнішчы , білі старыя гаршкі, разбівалі саламянае пудзіла са словамі :”Ідзі, зіма, каб на дзевяць месяцаў ад нас пайшла”. Так сустракалі вясну, развіталіся з зімой. Гэта сімвалізавала пачатак абноўленаму жыццю.

Юр’я, Юр’е, Юрый, Георгій, Георгій-Пабедзіцель ‘праваслаўнае свята ў гонар святога Георгія, якое адзначаецца 6 мая’: У гэты дзень першы раз пасля зімы выганялі скаціну ў поле’: *На Юр’я кароў свячонай вярбой ў стада ганялі. Пастухам скібу хледа і яіц лажылі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на “выганішча”. (в. Неглюбка, Ветк.); *Эта счытаецца на юр’еву расу нада первы раз выгнаць скаціну, яшчэ вербачкай пастукаць* (в. Хальч, Ветк.); *Юр’я было два: адзін вясной – галодны, другі восенню – халодны* (г. Ветка); *На Юр’я запальвалі свечку і абходзілі скаціну, каб худога што не было* ; *Хадзілі слухаць ваду у калодца: калі ціха, то зіма будзе цёплая, калі будуць звукі, тады будуць крэпкія маразы* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Георгій-пабедзіцель всегда бывае 6 мая. Сей на Георгія гуркі – агуркі будуць сладкі* (г. Ветка);

Мікола вясенні, *Нікола, Мікалай, Нікалай Чудатворац* ‘свята народнага календара, якое адзначаецца 22 мая, свята пастухоў і конюхаў’: *Ета празнік святога Мікалая Чудатворца. У еты дзень людзі маліліся яму, прасілі памагчы; Счытаецца, што да Міколы няма добрай пагоды, а пасля Міколы ўжо будзе цёпла – лета. Таму гаварят: “Да Міколы няма дабра ніколі”* (г. Ветка); *На Міколу ярмалкі былі, парасят прадавалі. Не капалі на гародзе, каб усё расло* (в. Хальч, Ветк.);

Пахом ‘старажытнае веснавое свята народнага календара, якое адзначаецца 28 мая’: *Пахом весной ідзёт. На Пахома агурцы пасеят – будут браць мехом; Прышоў Пахом – запахла цяплом* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Святы летняга цыклу

Спас ‘праваслаўнае свята (Прэабражэнне Гасподне), якое адзначаецца 19 жніўня, у час яго ў царкве свяцілі яблыкі, мёд’: *На Спаса куплялі мёд, хадзілі свяціць яго ў царкву, пасьвечаны мёд на лекарства адкладвалі. Таму і называлі Мядовы Спас* (г. Ветка, в. Хальч, Ветк.)*; На Яблачны Спас яблакі свецяць, самі прычашчаюцца. После Спасу можна яблакі, грушы есці, а да гетага дня нельзя, таму што гета грешныя плады* (в. Неглюбка, Ветк.); *У царкве на трэці Спас арэхі свяцілі, гэта Арэхавы Спас. Варылі пшаную кашу з мёдам, перагі пеклі. Пасля дажынкі спраўлялі* (в. Неглюбка, Ветк.);

Успенне, Успеніе, Первая Прачыстая, Прачыстае, Прячістая ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца 28 жніўня ў гонар Багародзіцы, дзень сканання Багародзіцы’: *Успеніе – гэта ўжэ Багародзічын празнік. Тожа молімся, канон увесь і абедню молімся* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Первая Прачыстая 28 аўгуста. На Прачыстую нада прычашчацца* (г. Ветка).

У народны каляндар, акрамя названых вышэй асноўных, прастольных праваслаўных свят, уключаліся таксама :

Купала, Купалле ‘старажытнае свята летняга сонцастаяння ў ноч з 6 на 7 ліпеня, свята сонца і агню, урадлівасці і росквіту зямлі’: *На Купалу брасаюць венкі, загадваюць жэланіе. Куда венок паплывёт, у ту старану дзеўка замуж пайдёт* (в. Хальч, Ветк.); *На Купалле*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вянкі пускалі. Калі вянок тапіўся, дзеўка пела:”Вяночак утануў, мяне мой міленькі абмануў”. Яшчэ палілі агонь, клалі яго высока (в. Барталамееўка, Ветк.);

Макавей, Макаўе ‘земляробчае свята народнага календара, якое адзначаецца 14 жніўня’: *На Макавей цвяты свецяць, моркву, мак* (г. Ветка); *На Макавею нада перагі з макам есці. Макам свяченым хлеў нада асыпаць, хату ад нябожчыкаў* (в. Неглюбка, Ветк.).

Дні святых:

Ражджаство Іаана ‘хрысціянскае свята ў гонар нараджэння Іаана Хрысціцеля, якое адзначаецца 7 ліпеня’*: Вот скора будзе Ражджаство Іаана* (в. Старое Сяло, Ветк.);

Пятро, Пітроўка ‘дзень памінання святога апостала Пятра (і Паўла), які адзначаецца 12 ліпеня’: *Пятро гэта летні празнік: ходзім, гуляем па вуліцы* (в. Неглюбка, Ветк.); *Пітроўку люблю, таму што летам свята* (в. Хальч, Ветк.);

Ілья ‘праваслаўнае свята ў гонар святога прарока Ільі, адзначаецца 2 жніўня’*: На Ілью абязацельна далжна мяняцца пагода, прайці дождж. Усегда пападае Ілья, калі настае маладзічок, а маладзічок усегда абмываецца* (в. Хальч, Ветк.); *Як прыходзіць Ілья, дык купацца нельзя* (в. Старое Сяло, Ветк.)

Святы восеньскага цыклу

Ражджаство Багародзіцы, Втарая Прачыстая ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца 21 верасня, дзень нараджэння Багародзіцы. У народзе лічыцца святам ураджаю і падрыхтоўкі да сяўбы’*: На втарую Прачыстую ў нас свячу пераносяць. Нанімалі музыку, гарманіст,. пелі, яшчэ бубен быў.* Хальч, Ветк.; *Пасля Прачыстай засеўкі пачыналі. На Прачыстую буслік ужо на зіму адлятае* (г. Ветка);

Здвіжанне ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца 27 верасня (здвіжанне Крыжа Гасподня). У народзе асэнсоўваецца як канец восені’: *На здвіжанне , гавораць, уся гадасць лесавая збіраецца ў кучу і хаваецца на зіму* (в. Хальч, Ветк.);

Пакроў, Пакров ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца 14 кастрычніка (Пакроў прасвятой Багародзіцы). У народзе ўсведамляецца як свята глыбокай восені, пасля якога пачынаецца зіма’: *Пакроў сабірае ўсіх латроў (хто не трудзіўся, штоб усе былі сытыя, штоб Гасподзь насыціў іх* (г. Ветка); *На Пакров зіма лета закрывае, а Божанька пячатае зямлю. Пасля гетага дня зямельку трогать не нада* (Хальч, Ветк.);

Радзіцелі, Родзічы, Дзяды ‘свята, калі ўшаноўваюць памяць продкаў’: *Дзяды некалькі разоў бываюць* (в. Старае Сяло, Ветк.); *На Родзічы мы ў цэркву хадзілі, бацькоў паміналі* (в. Неглюбка, Ветк.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Восеньскія Дзяды ‘дзень памінання продкаў, які адзначаецца 2 лістапада’: *Трэба гатаваць стол, у гэты дзень далжны прыдці пакойнікі, навесціць дом і ўсё атмеціць* (в. Неглюбка, Ветк.) і інш.

Дні святых:

Іван Галавасек ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца 11 верасня’ *У гэта свята нельга секчы было, нават боршч варыць* (в. Старое Сяло, Ветк.);

Міхайла, Міхаіл ‘праваслаўнае свята ў гонар святога архангела Міхаіла, якое адзначаецца 21 лістапада’*: Міхайла эта ў нас прыстольны празнік. Ну ета ўсё ж былі святыя, апосталы етыя* (в. Хальч, Ветк.); *Ну, а после Міколы эта ўжэ тады ідзе Міхаіл. Эта ўжэ паследні празднік к Новаму году* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Як вядома, у народным календары значная ўвага ўдзялялася не толькі святам, але і дням або тыдням, якія папярэднічалі святу або завяршалі яго. Лексіка, якая называе ў дадзеным рэгіёне **перыяд да або пасля свят, іх пачатак або канец**, даволі шматлікая:

Новы год ‘свята, якое адзначаецца ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня’: *В первый дзень новага году і курку, і карову, і свінку накарміць нада, усе далжны быць сытыя і давольныя* (в. Хальч, Ветк.);

Сачэльнік ‘канун Ражаства’: *У гэты дзень у хаце бальшую ўборку дзелаюць, пол падміталі, каб лён быў чысты, у баню ходзілі. Елі ячную кашу з алеем або мёдам, пірагі затіралі, ставілі на заўтра бліны, не ругаліся, не пралі. У хату сена прыносілі, мароза клікалі* (в. Неглюбка, Ветк.);

Святкі, Каляды, Коледы ‘зімовыя святы, звязаныя з нараджэннем Хрыста, адзначаліся з 7 па 19 студзеня’: *Гэта зімовыя святы. Нада скаціну бярэгці, амбар ад нячыстай сілы, нада гатовіцца к вясне, семяна перабіраць* (в. Неглюбка, Ветк.); *Канешна, і Коледы атмячалі, шчадраваць хадзілі, гулялі дык гулялі* (в. Барталамееўка, Ветк.); *Калядскія празьнікі длілісь ад Ражаства да Крышчэння* (в. Хальч, Ветк.);

Стары Новы год, Шчодры, Шчадруха ‘свята, якое адзначаецца ў ноч з 13 на 14 студзеня’: *А Стары Новы год мы празднуем так: ходзім па знаёмых, песні пяем, стол накрыём* (в. Глыбаўка, Ветк.); *На Шчадруху, перад Новым годам, гатавалі, хадзілі ў госці да суседзей* (г. Ветка);

Мясаед ‘тэрмін ад 7 студзеня да масленай нядзелі’: *Мясаед – усё ядзяць ад сёмага января і да самай Масленкі, а тады ўжо пост* (г. Ветка);

Вясновыя Дзяды ‘дзень памінання памерлых, які адзначаецца ў суботу напярэдадні масленічнага тыдня’: *Нада на Дзяды ставіць кампот, усё постнае, дзелаць куццю* (в. Хальч, Ветк.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зборава субота ‘субота ў канцы першага тыдня Вялікага посту’: *Нядзельку папасціць – і бацюшка заборуе, прычашчае, іспаведуе* (г. Ветка);

Пахвальная субота 1)‘субота на трэцім тыдні Вялікага посту’: *Пахвалавалі: “Вой, сёння пахвала! Сённяшній дзень што-та пахвала не хваліцца – пагода плахая”* (г. Ветка); 2) ‘трэці тыдзень ад Вялікага посту’: *‘Пахвальная недзеля ета за тры недзелі ад Пасхі. Ужэ птічка первым яйцом пахваліцца; Пахвальная нядзеля – пахвала. Хваліцца, як будзе лета, як будзе восень* (в. Хальч, Ветк.);

Масленіца, Масленніца, Масленка, *Масленая недзеля, Блінная нідзеля* 1) ‘старажытнае славянскае свята провадаў зімы’: *На Масленіцу пяклі бліны з маслам і мёдам, ета быў паследні дзень Мясаведа, начынаўся Вялікі пост на сем нядзель. У этат дзень зіма уходзіць, лета надаходзіць* (г. Ветка); *Палілі “зіму” – рабілі чучала і спальвалі* (в. Насовічы, Добр.); *На Масляніцу хлопцы запрагалі каней і каталісь з дзяўчатамі па сялу і пелі так: “По деву, по деву Каму хочыш падзялю” – прадавалі дзяўчат* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Масленіца – провады зімы, чучыла сжыгаюць, праважаюць зіму, сустрыкаюць весну, штоб яна была красна, штоб прынесла ўраджай.* (в. Хальч, Ветк.); *На Масленніцу бліны пякуць*. Неглюбка, Ветк.; 2) ‘тыдзень перад Масленіцай, які папярэднічаў Вялікаму посту’: *Масленку мы некалі адзначалі две нідзелі. Першая нядзеля ета канец зімы, а другая – начала вясны* (в. Неглюбка, Ветк.); *Масленая недзеля – недзеля перад Масленіцай. Людзі гатовяцца к празніку, усю недзелю пекут бліны, у госці ходзят* (Ветка); *На блінную нідзелю ў каждым двары гульня* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Масленка – гэта нядзеля перад Масленіцай* (в. Неглюбка, Ветк.).

Загвіны, Загавіны ‘апошні дзень Мясаеда перад Вялікім пастом’: *Ета паследній дзень, калі можна было есць мяса, жырную яду. На загвіны нежанатым хлопцам вешалі на ногі калодкі і гаварілі, што нада жаніцца* (г. Ветка); *На Загавіны бліны пеклі* (в. Хальч, Ветк.);

Вербная нядзеля, Вярбная нядзеля, Вербнае скрысене, Вербнае воскресенье, Вербніца ‘свята, якое адзначаецца за тыдзень перад Вялікаднем (уваход Госпада ў Іерусалім)’. У народзе звязвалася з надыходам вясны, распусканнем першага дрэва – вярбы’: *У Вербную нядзелю вербачку свецім. Эту вярбу ставяць на кут, на акно, раскладаюць у хаце, у сараі. Ёю кароў на пашу выганялі* (в. Хальч, Ветк.); *Вербнае васкрасенье перад самай Паскай* (в. Барталамееўка, Ветк.); *На Вербнае васкрэсенне нада схадзіць у цэркву і пасвяціць*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ветачкі вярбы. А кагда дамой з цэрквы прыйдзеш, то нада ўсіх дамашніх етай ветачкай пасцябаць і гаварыць: "Не я б'ю – вярба б'е. Вярба б'е – сілу дае!"А яшчэ гавораць:"Бей, вярбічка, ты расці, як цялічка", "Верба ксціць, бог прасціць". Тады счытаецца, што чалавек будзе здаровы (г. Ветка); *Еслі у ково скот, значыць, праганяюць на пашы кароў этай вербой: "Пашла на луг, пашла"* (в. Старое Сяло, Ветк.);

Белая нядзеля, Белае воскресенье, Велікодная нядзеля, Паклонны тыдзень 'тыдзень перад Вялікаднем': *Белая нядзеля называецца нядзеля перад Паскай: "Белая ж бяліць, а вербная вярбіць"* (г. Ветка); *Белая недзеля – эта нада ўсё мыць у доме, сціраць, печ бяліць, на дварэ прыбраць, штоб усё чыстае было* (г. Ветка); *Белая нядзеля, а тады Паска – нядзеля і тры дні, калі нічога не дзелалі* (в. Глыбаўка, Ветк.); *Нядзеля перад Паскай – Велікодная нядзеля* (г. п. Церахоўка, Добр.); *Тыдзень перад Паскай называюць Паклонны тыдзень* (в. Неглюбка, Ветк.);

Чысты чацверг (чэцверг, чацьверьх), Чістый чітверг, страсць, страсці, 'апошні чацвер перад Вялікаднем': *Чысты чэцверг на Белай нядзелі, у гэты дзень усе мыліся, каб цела чыстае было, баню тапілі да васхода сонца, мылі дзетак, патом самі мыліся, на еты дзень страсць служылі у цэрькві* (г. Ветка); *У чацвер перад Паскай ідуць у цэркву і моляцца да двінаццаці ночы, тады са свечкамі ідуць дамоў і копацью ад свечкі робяць крэшчыкі на дзверах, на вокнах – эта страсць* (в. Хальч, Ветк.); *Перад Паскай ідзе после Вербнага васкрэсенья ў чацвер Страсць. Страсць – чысты чацвер* (в. Старое Сяло, Ветк.);

Велікодная (Вялікодная) субота 'субота перад Вялікаднем': *На Вялікодную суботу Хрыста славілі, служылі ў цэркві* (Неглюбка, Ветк.); *Велікодная субота – ета счытаўся перадпразнічны дзень* (в. Івакі, Добр.);

Мёртвая нядзеля, Радушная нядзеля 'тыдзень, на якім адзначаюць Радуніцу' : *На этой недзеле нельзя нічэво садзіць – не прыжывецца; Мёртвая нядзеля – радушная, после Радуніцы* (г. Ветка); *Нельзя ў етую нідзелю крышыць капусту, бо згніець* (в. Хальч, Ветк.); *Мёртвая нядзеля – бо перад Радуніцай празнік мёртвых* (г.п. Церахоўка, Добр.);

Радуніца, Раданіца, Радаўніца 'праваслаўнае свята, якое адзначаецца на дзесяты дзень пасля Вялікадня ў аўторак. У гэты дзень памінаюць памерлых': *На Радаўніцу памінаем святых і сваіх радзіцелей, магілкі ўбіраем, за ўпакой молімся* (в. Хальч, Ветк.); *На Радуніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ветка; Нядзеля ад Паскі, а ў аўторак ужо Раданіца, у цэркавь хадзілі, а пасля да сваіх на могілкі (в. Барталамееўка, Ветк.);

Праводное васкрысенье, Правадная нядзеля ‘першая нядзеля пасля Вялікадня’: *Правадное васкрысенье пасля паскі ў нядзелю ано* (в. Хальч, Ветк.); *Первая нядзеля после Пасхі – ета правадная* (Ветка);

Переплаўная (Перяплаўная, Пераплаўна) серада (середа, сірада) ‘серада на чацвёртым тыдні ад Вялікадня’: *Да Пераплаўнай серады нельзя было купацца* (п. Сямёнаўскі, Добр.); *У эты дзень абязацельна нада паплаваць* (в. Старое Сяло, Ветк.); *На Переплаўную середу чалавек, які ня ўмеў плаваць, хадзіў на речку і переплываў яе. Старыя людзі казалі, што чалавек еты наўсігда навучыцца плаваць* (г. Ветка); *Пераплаўна сірада бывае пасля Паскі: хадзілі свіцілі на рэчку ваду, штоб меньш утоплінікаў было* (в. Хальч, Ветк.);

Абрад ваджэння сулы, пахавання стралы, вадзіць старцоў. – выконваўся ў большасці вёсак Добрушскага і Веткаўскага раёнаў праз шэсць тыдняў пасля Вялікадня, у чацвер, на Ушэсце. *У гэты дзень служылі раніцой малебен у царкве, асвячалі галінкі ліпы і травы, якімі, як лічылі, можна адагнаць ад двара ўсё худое, гушкаліся на арэлях, спявалі. Вадзілі сулу так: з пачатку вуліцы сабіраліся некалькі чалавек і ішлі ўздоўж сяла, спявалі песні, вадзілі карагод, да іх далучаліся іншыя. Абавязковым лічылася частаванне ўдзельнікаў карагодаў, якое мела сэнс – паспрыяць ураджайнасці. У час карагодаў падскоквалі ўверх, падкідвалі рукі, каб лён рос у рост чалавека, завязваюць бараду на жыце, каб жыта высокае расло і ўраджай быў добры.. Семантыка іншых абрадавых дзеянняў (абліванне вадою, аранне дарогі) была звязана з магічнай ідэяй выклікання дажджу. На полі закопвалі якую-небудзь невялікую рэч (хаваюць стралу, сулу), каб маланка не біла*

Духавая субота, Зялёная субота ‘субота перад Сёмухай’: *Перад Троіцай у Духавую суботу ў хату носяць клён, ліпу, на вокны ложаць, каб у доме ўсё добра было* (г. Ветка)*; Субота перад Троіцаю Зялёная, таму што ўкрашаюць зеленню дом, стаўляюць пішчолкі на вокны* (в. Хальч, Ветк.);

Русальная нядзеля ‘шосты тыдзень пасля Вялікадня, тыдзень перад Сёмухай’: *На шастой нядзеле пасля Пасхі, перад Троіцай русалку вадзілі, як жыта каласуецца. Бралі самую красівую дзеўку і нараджалі у цвяты, вялі вакол яе хараводы, а потым кідалі ў жыта, а яна бегала за маладёж’ю і старалася паймаць* (г. п. Церахоўка, Добр.); *На Русальнай нядзеле нельзя было купацца – русалкі цягалі, хто купаецца, і тапілі* (в. Хальч, Ветк.); На гэтым тыдні выконваўся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абрад ваджэння русалкі. *Збіраліся маладыя. Выбіралі маладую дзяўчыну або жанчыну – пявуху, скакуху, каб была добрая, не стыдлівая, каб умела павесці за сабою, запець. Прыбіралі яе ў розныя цвяты, у зелень. ,абсыпалі жытам, вялі ў край сяла з песнямі і танцамі. Там гулялі ў гульні. Русалка лавіла дзяцей, дзяўчат, вадзілі карагоды і спявалі ручальныя песні* (в. Кругавец, Добр.);

Граная нядзеля (нідзеля) ‘тыдзень пасля Сёмухі’ : *Граная нідзеля – самая страшная, на ёй нічога нільзя рабіць. А ўже еслі што дзелаў, то треба на парозе дзіркач секці, бог грэх просціць* (в. Хальч, Ветк.); *Граная нядзеля – после Троіцы, дужа апасная, на ёй дзелаць нічога нельзя, ана можа атразіцца на што-нішто* (г. Ветка);

Сухі чацвер (чацьверьх, чітверг, чэцьвер 1) ‘чацвер перад Вялікаднем’: *У гэты дзень трэба ўсё бельё са шкафа пасушыць, выцягнуць адзежду с сундука, абратна ўсё злажыць* (в. Хальч, Ветк.); 2) ‘чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня’: *У сухой чэцьвер землі нельзя варушіць – ні сеяць, ні палоць, а то засохне* (в. Івакі, Добр.);

Ушэсце, Ушэсця, Учэсце ‘праваслаўнае свята, якое адзначаецца ў чацвер на шостым тыдні пасля Вялікадня (Узнясенне Гасподняе)’: *Ушэсце – эта ад Паскі на шастой недзеле ў чацвер бывае, калі карагоды вадзілі, хадзілі ў жыта, хавалі ў травы пугаўку* (в. Глыбаўка, Ветк.); *На Учэсце тут старцоў водзяць, песні пяюць, на гармоні граюць* (Неглюбка, Ветк.); *У нас Ушэсця казалі, а не Вознесеніе* (в. Неглюбка, Ветк.);

Дзевятуха ‘дзевяты тыдзень пасля Вялікадня’: *Дзевятуха – таму што на дзевятай нядзеле после Пасхі* (Ветка);

Дзесятуха ‘дзесяты тыдзень пасля Вялікадня’: *На дзесятуху мы, бывала, у Шарсцін ездзілі, прыстольны празнік быў* (г. Ветка); *Дзесятуха на дзесятай нідзелі после Пасхі, еслі празнік пападае, дак у гароді нічаво не дзелаеш* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Дзесятуха* – ета пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня, *бальшы празнік быў* (в. Неглюбка, Ветк.).

Такім чынам, народныя назвы свят, якія бытуюць у гаворках Веткаўскага і Добрушскага раёнаў, вызначаюцца вялікай варыянтнасцю і разнастайнасцю формы. Яны адлюстроўваюць інтэнсіўныя міжэтнічныя кантакты, актыўнае руска-беларускае ўзаемадзеянне, звязанае з памежным становішчам даследаванага рэгіёну.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

К. Л. Хазанава

2.3. Каляндарна-абрадавая лексіка ва ўсходнеславянскім кантэксце

2.3.1 Лексіка-тэматычная дыферэнцыяцыя каляндарна-абрадавых назваў у беларускіх гаворках

У лексічнай сістэме мовы каляндарна-абрадавыя назвы займаюць асаблівае месца, бо адлюстроўваюць разнастайныя важныя падзеі ў грамадскім і сямейным жыцці народа: называюць святы, прысвяткі і абрады розных перыядаў народнага календара. Указаныя лексемы захаваліся ва ўсходнеславянскіх мовах з часоў агульнаўсходнеславянскага моўнага адзінства, а асобныя словы – і яшчэ раней.

Каляндарна-абрадавая лексіка ўяўляе сабой даволі разгалінаваную групу слоў як ў літаратурнай мове, так і ў гаворках. Абрадавыя найменні, звязаныя з календаром, традыцыйна і заканамерна дыферэнцуюцца паводле пор года. Беларускія каляндарныя святы падпарадкаваны гадавому земляробчаму і жывёлагадоўчаму цыклам і выразна падзяляюцца на восеньскія, зімовыя, веснавыя і летнія.

Цікавасць для этналінгвістычнага даследавання ўяўляюць каляндарна-абрадавыя лексемы гаворак Гомельскага рэгіёна. Лакалізацыя на памежжы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх тэрыторый спрыяе міжмоўным кантактам і выклікае пастаянны ўзаемаўплыў суседніх блізкароднасных усходнеславянскіх моў у народнай лексіцы.

Ужо некалькі стагоддзяў усходнія славяне адзначаюць Новы год узімку. На гэту пару года з прычыны кліматычных умоў не прыходзяцца шматлікія гаспадарчыя работы, маецца больш часу для адзначэння свят і правядзення абрадаў. Лексіка традыцыйных зімовых святкаванняў Гомельшчыны адрозніваецца ад іншых каляндарных цыклаў паводле колькасці і тэматычнай разнастайнасці. Цэлыя два тыдні, з 6 па 19 студзеня, адзначаюцца *Святкі* [1]. У апошнюю ноч снежня адзначаецца *Новы год*. Гомельскім гаворкам вядома назва *Стары новы год*. Вялікім зімовым святам з’яўляюцца *Каляды (Коледы, Коляды).* У гаворках Гомельскага рэгіёна для назвы свята ўжываюцца дзве лексемы – *Каляды* і *Ражаство* – з перавагай другога з указаных найменняў з варыянтамі *Раждество, Раждзество, Ражство, Раство*. Для наймення Вадохрышча ў гаворках Гомельскай вобласці сустракаюцца назвы: *Крэшчэнне, Крэшчэнье, Крашчэніе, Крешченіе,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Крешченне, Крешченье, Крышчэнне, Храшчэнне, Хрышчэнне, Хряшченне, а таксама *Вадохрышч, Вадохрышчанне, Водахрышчэнне, Водохрышча, Вадохрышч*.

Асобную групу намінацый зімовай каляндарна-абрадавай лексікі складаюць найменні прысвяткаў: 17 снежня – *Варвара (Варвары, Варка, Варуха, Вары, Ворвары, Варвара-мучэніца, Варварын дзень),* 22 снежня – *Ганна*, 14 студзеня – *Васілле (Васілей, святое Васілле)*, 24 лютага – *Аўлас (Улас, Улассе)*.

У каляндарна-абрадавай лексіцы зімовага цыклу гаворак Гомельшчыны вызначаюцца найменні асоб-удзельнікаў абрадаў: *баба*, *дзед*,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лексіцы Гомельскага рэгіёна функцыянуюць двухслоўнае (*Уваскрэсенне Хрыстова*) і трохслоўнае (*Светлае Уваскрэсенне Хрыстова*) найменні свята. Да даты Вялікадня прымяркоўваюцца даты некаторых іншых свят веснавога народнага і рэлігійнага календара (*Трыцідзесятніца*). Адпаведна Вялікадня разлічваецца і веснавы дзень памінання продкаў, які ў гомельскіх гаворках мае фанетычныя варыянты: *Радуніца, Радаўніца.* Перадвелікодная нядзеля ў гаворках Гомельшчыны, як і ў іншых усходнеславянскіх гаворках, ад галінак вярбы і звязаным з гэтым днём адпаведным рытуалам атрымала назву *вербная*.

Найменне *Пасха (Паска)* мае і традыцыйнае страва, што гатуецца ў гэты святочны дзень. На Гомельшчыне так называюцца абодва традыцыйныя пачастункі: і пірог з мукі, яек і з дабаўленнем разнастайных смачных прысмакаў, які фіксуецца пад назвамі *булка* ці *куліч*, і выраб з тварагу, свежага ці запечанага, у які таксама гаспадынямі дадаюцца яйкі, масла, разынкі, курага, карыца, ваніль і іншая смаката. Велікоднай традыцыяй было і гатаванне *бабкі*.

У групе найменняў веснавых абрадавых дзеянняў у календары Гомельшчыны выдзяляюцца моўныя адзінкі: *красіць яйкі (лукам), разгавецца (разгавенне).* Працягвае адзначацца ў Гомельскім рэгіёне і спецыфічна беларуская велікодная традыцыя валачобніцтва. Хаця зараз ужо не так пашырана, як, напрыклад, калядаванне ці шчадраванне ўзімку, але *валачобныя пачастункі* на Вялікдзень усё яшчэ фіксуюцца ў народным календары.

У веснавой каляндарнай лексіцы Гомельшчыны адзначаюцца найменні прысвяткаў: першы дзень вясны – *Аўдокі;* 22 сакавіка – *Соракі (Саракі);* 6 мая – *Юр'я (Юр'ев дзень);* 22 мая – *Вясенні Мікола.*

Сярод каляндарна-абрадавых назваў летняга цыклу выдзяляецца *Троіца* з фанетычным варыянтам наймення *Тройца.* На Гомельшчыне існуе і назва свята *Пяцідзесятніца*, што звязана з вызначэнне даты Троіцы адносна Вялікадня. Ад датавання Вялікадня залежыць таксама і дата такога летняга свята, як *Ушэсце*, якое адзначаецца на шостым тыдні пасля Вялікадня. З часоў язычніцтва замацаваліся на Беларусі традыцыі Купалля. Свята адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня, называецца ў гаворках *Купалле, Купала, Іван Купала*. Улетку традыцыйныя былі і застаюцца святы пачатку і заканчэння ўборкі ўраджаю: *Зажынкі, Дажынкі.* Жнівень у народным календары Гомельскага рэгіёна адзначаецца трыма Спасамі: Мядовым (14 жніўня), Яблычным (19 жніўня) і Арэхавым (29 жніўня). Больш пашыранымі з'яўляюцца *Мядовы Спас* (*Макавей*) і *Яблычны (Яблачны) Спас*.

У летняй каляндарна-абрадавай лексіцы існуе група назваў абрадаў і дзеянняў. Трывалай траецкай традыцыяй Гомельшчыны

з’яўляецца ўпрыгожванне хаты якой-небудзь раслінай. Агульная назва ўпрыгожванняў – *май.* Сустракаюцца ўзгадкі розных раслін: *аер, берёзавые ветачкі, ліпа.* Мае адметныя абрады і Купалле: *цветок шукаць, касцёр паліць, дзевачку адзеваць.* Існуюць адметныя рытуалы паводзін і падчас Спаса. Натуральна, што на Яблычны спас традыцыйнай стравай становяцца *пірагі з яблык*. Абавязкова трэба схадзіць у царкву *пасвяціць яблыкі* і *мёд*.

У групе назваў прысвяткаў у летнім цыкле каляндарнай лексікі Гомельшчыны выдзяляецца Дзень Роўнаапостальных Святых Пятра і Паўла (12 ліпеня). Напярэдадні адбываецца *Пятроўскі Пост*. Час свята ў народным календары мае назву *Пятроўкі* (*Пятроўка*). Дзень Святых Пятра і Паўла ў беларускіх гаворках мае назвы *Пятра, Пятро, Пятро і Павел.* У жніўні адзначаюцца прысвяткі: *Ілья* (2 жніўня), *Ціхан* (26 жніўня).

Групу назваў асоб-удзельнікаў свята ці абраду летняга цыклу складаюць найменні лялькаў, што робяцца на Купалле: *Купала (Купаліна, Купалінка)* і *Купаліч*.

Цікавыя народныя традыцыі абрадавага календара Гомельскай вобласці прыходзяцца на восень. Восеньскія каляндарныя святы сімвалізавалі заканчэнне сельскагаспадарчага года. У беларускіх гаворках сустракаюцца наступныя найменні восеньскіх свят: *Галавасек (Галаварэз, Іван Галавасек, Іван Прэдцечы); Прачыстая (Прячістая, Прачыстае), Узвіжанне (Уздвіжанне, Здвіжанне), Пакроў Прасвятой Багародзіцы Прэснадзевы Марыі (Пакравы), Іван Багаслоў (Іван Пакроўны, Іван Пакравіцель), Казанская (Казанка).* Дні канца кастрычніка – пачатку лістапада ў народным календары звязаны з памінаннем продкаў. На 2 лістапада прыходзяцца *Дзяды (Дзеды, Дзмітраўскія, Дзмітроўскія, Змітраўскія дзяды, Змітрок)*.

Разгледжаны матэрыял дае падставы сцвердзіць, што ў абрадавым календары Гомельшчыны, як і ўсёй Беларусі, самай яскравай па святах і звычаях з’яўляецца зіма. Узімку прырода “адпачывала”. З часам да духоўнага сусвету ўсходніх славян далучыліся хрысціянскія звычаі Каляд (Нараджэння Хрыстова). Акрамя таго, пазней менавіта ўзімку, услед за астатнімі еўрапейскімі народамі, усходнія славяне пачалі святкаваць Новы год. Каляндарна-абрадавыя лексемы зімняга цыклу ў гаворках называюць святы, прысвяткі, асоб-удзельнікаў абрадаў, дзеянні, што выконваюцца падчас абрадаў, прадметы, якія выкарыстоўваюцца ў рытуалах. У іншых цыклах каляндарна-абрадавай лексікі, зафіксаванай у гаворках Гомельшчыны, цяжэй выявіць такую тэматычную разнастайнасць.

Найменні каляндарна-абрадавай лексікі Гомельскай вобласці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паказваюць, што сярод каляндарных свят больш рэлігійных, а паколькі пануючае веравызнанне рэгіёна многія стагоддзі – праваслаўе, то і назвы свят, прысвяткаў і абрадаў у пэўных адносінах звязаны з царкоўнаславянскай традыцыяй, хаця назіраецца тэндэнцыя і да праяўлення народных мясцовых моўных адметнасцей у намінацыі свят. Разнастайнасць варыянтаў каляндарна-абрадавых лексем Гомельшчыны абумоўлена імкненнем кампенсаваць неўласцівасць беларускай мове царкоўнаславянізмаў і ўплывам суседніх рускіх гаворак.

2.3.2 Каляндарна-абрадавая найменні ў беларускай і рускай лексіцы

З глыбокай старажытнасці існаванне беларусаў поўнасцю было абумоўлена каляндарнымі адметнасцямі пэўнага адрэзку часу. Яшчэ самыя старажытныя віды дзейнасці людзей – збіральніцтва, паляванне і пазней земляробства – залежалі ад кліматычных умоў. У выніку гэтых абставін для кожнага перыяду года ў беларусаў захаваліся асаблівыя святы і абрады, а ў мове адзначаецца вялікая колькасць іх намінацый, якія ўяўляюць сабой даволі вялікі і разгалінаваны ў лексіка-семантычных адносінах пласт слоў.

Указаныя лексемы маюць старажытнае паходжанне з агульна-ўсходнеславянскага моўнага адзінства, а асобныя словы з’яўляюцца больш старажытнымі, з прычыны чаго шматлікія найменні абрадаў, звязаных з календаром, не з’яўляюцца спецыфічнымі беларускімі лексемамі, а маюць адпаведнікі ў іншых усходнеславянскіх мовах.

Узаемаўплыў суседніх блізкароднасных моў у народнай лексіцы асабліва яскрава выяўляецца пры даследаванні лексікі памежных гаворак. Гомельскаму рэгіёну ў гэтых адносінах пашанцавала размясціцца на памежжы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх тэрыторый. Такая лакалізацыя спрыяла цесным міжмоўным кантактам. Вынікі ўказанага кантактавання адзначаюцца ў каляндарна-абрадавай лексіцы гомельскіх гаворак.

Двухмоўе жыхароў Гомельскай вобласці пры пераважным функцыянаванні рускай мовы ў горадзе і большым пашырэнні беларускай мовы ў сельскай мясцовасці дазваляе правесці параўнальна-супастаўляльны аналіз каляндарна-абрадавых намінацый ў беларускай і рускай мовах і выявіць беларуска-рускія лексічныя паралелі ва ўказанай лексіка-тэматычнай групе.

Найбольш вядомым зімовым святам з’яўляюцца *Каляды*. У беларускай моўнай традыцыі ўжываюцца амаль раўнапраўна дзве

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лексемы: *Каляды* і *Ражаство*. У гаворках сустракаюцца варыянты апошняга наймення, абумоўленыя ўплывам фанетычных асаблівасцей гаворак, а таксама беларуска-рускім білінгвізмам: *Раждество, Раждзество, Ражство, Раство*. У рускай мове ўжываецца лексема *Рождество*, якая нясе на сабе адбітак стараславянскай мовы, што выявілася ў наяўнасці [жд’] на месцы праславянскага **dj*. Паколькі для беларускіх гаворак уплыў стараславянскай мовы не быў характэрны, у слоўніку захоўваюцца варыянты назвы свята, закліканыя кампенсаваць цяжкасці ў вымаўленні стараславянізма.

У рускай моўнай традыцыі адзначаюцца лексемы *Коледа, Коляда* [2, т. 2, с. 136]. Намінацыя *Коляда* сустракаецца ў рускім фальклоры: ***Коляда, коляда***! *Ты подай пирога* [3, с. 168].

Некалькі найменняў захоўваецца ў беларускіх гаворках для свята, што адзначаецца ў праваслаўных веруючых 19 студзеня – *Вадохрышча, Крашчэнне, Хрышчэнне*. Узнікненне варыянтаў зноў выклікана імкненнем ліквідаваць цяжкасці ў вымаўленні стараславянізма *Крещение*. У рускай мове пры захаванні стараславянскага наймення існуе лексічны варыянт – складаная па структуры намінацыя гэтага царкоўнага свята – *Богоявление*.

Ужо адзначалася пра пачатак года ў старажытным усходнеславянскім календары вясной. Аддзяляе вясну ад зімы *Масленіца* – свята развітання з зімой, калі можна ладзіць вялікія гулянні перад Вялікім Пастом. Падобныя святы ўласцівы і іншым народам. У католікаў Заходняй Еўропы – гэта знакаміты *карнавал* (у даслоўным перакладзе з лацінскай мове – развітанне з мясам: *carne vale* ‘мяса, будзь здарова’).

Для ўсходнеславянскіх моў замацавалася лексема *Масленіца*. Этымалагічна слова звязана з маслам, бо ў гэтыя дні можна ўжываць ўказаны прадукт (як і шэраг іншых) у апошні раз перад шматдзённым Вялікім пастом. Успомнім, што і ў беларускай, і ў рускай каляндарнай лексіцы ёсць варыянтныя найменні: *Масленая, Масляна, Масляніца, Масляная, Маслены тыдзень* (у рускай мове – *Масленая неделя*).

25 сакавіка адзначаецца *Благавешчанне* – яшчэ адзін стараславянізм, для якога беларускія гаворкі маюць некалькі варыянтаў: *Благавешчанне, Благавешчаніе, Дабравешчанне*. Апошні варыянт утварыўся паводле калькавання стараславянскага *благо* ‘дабро’. У рускай абрадавай лексіцы ўжываюцца лексемы *Благовещение*. Па паходжанні кампазіт з’яўляецца ўтварэннем ад словазлучэння *благая* ‘добрая’ *весть* ‘вестка, навіна’. З’яўленне беларускага адпаведніка *Дабравешчанне* поўнасцю апраўдана.

Вялікім святам для веруючых заўсёды быў *Вялікдзень*. Дадзенае найменне, як і *Благавешчанне*, этымалагічна з’яўляецца словазлучэннем

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

старажытнага кароткага прыметніка *великъ* і назоўніка *день*. У рускай мове адпаведная лексема *Великдень* не ўжываецца вельмі часта. Хаця У. Даль зафіксаваў намінацыю *Великъ-день* з паметай *старое, паўднёвае* [2, т. 1, с. 176]. Для наймення свята Уваскрэсення Хрыста ў рускай мове выкарыстоўваецца лексема *Пасха*. Запазычаная са старажытнаяўрэйскай мовы лексема ўвайшла ў слоўнік многіх заходнееўрапейскіх, асабліва – раманскіх, моў: іспанскае *Pascua*, французскае *Pâques*, італьянскае *Pasqua*.

Ужываецца лексема *Пасха* і ў беларускіх гаворках. Уласцівым найменне з'яўляецца менавіта для гомельскіх гаворак, што тлумачыцца блізкасцю рускіх гаворак. І ў беларускай, і ў рускай абрадавай лексіцы функцыянуюць двухслоўныя найменні свята: беларускае – *Уваскрэсенне Хрыстова*, рускае – *Светлое Христово Воскресение*. Існаванне словазлучэнняў мае крыніцай рэлігійныя царкоўнаславянскія тэксты, у якіх свята ўзгадваецца з традыцыйнымі эпітэтамі.

Сярод каляндарна-абрадавых назваў летняга цыклу выдзяляецца *Троіца*. Фанетычным варыянтам наймення ў беларускіх гаворках стала ўтварэнне з рэдукцыяй *і – й* пасля галоснага *Тройца*. У рускай лексіцы адзначаюцца назва *Троица* і двуслоўнае найменне *Троицин день*, аб якім узгадваў У. Даль [2, т. 4, с. 431].

Асобнай лексіка-тэматычнай групай у каляндарна-абрадавай лексіцы з'яўляюцца назвы асоб-удзельнікаў каляндарных абрадаў. У Беларусі на Каляды традыцыйным быў візіт калядоўшчыкаў. Іх добрыя пажаданні і шчырыя зычэнні прыносілі гаспадарам добры ўраджай, поспех і разнастайны плён. Тыя, хто прыходзіў з такімі велічальнымі песнямі, называліся *калядоўшчык, калядоўшчыца, каляднік*. Падобныя намінацыі захаваліся і ў рускіх гаворках: *колядчик, колядчица, колядовщик*. Адметна, што ў асобных абласцях Расіі калядоўшчыкамі былі толькі мужчыны.

Калі калядоўшчыкі хадзілі па хатах і зычылі плёну гаспадарам на Каляды, то ў вечар перад Новым годам (Васільеў вечар) прыходзілі *шчадроўнікі* або *шчадрухі*. Рускай лексічнай паралеллю наймення асоб, якія шчадруюць, з'яўляюцца *щедровники*. Часам сустракаецца ўтварэнне з суфіксам *-ец*, што, як і суфікс *-нік*, звычайна абазначае асобу: *щедрованец* [2, т. 4, с. 652]. Назвы асоб з суфіксам *-ец* больш уласцівыя для рускай мовы ў параўнанні з беларускай, для якой характэрны падобныя найменні з суфіксам *-ар, -чык*.

Зварот да назваў дзён святых у беларускіх і рускіх гаворках дазваляе выявіць беларуска-рускія паралелі, залежныя ад варыянтаў імён чалавека: *Мікола – Николай, Аўдакія – Евдокия*. Пры гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

часцей прыдатак да імені Святога ў беларускіх гаворках з'яўляецца транслітарацыяй з рускай мовы: *Николай Чудотворец – Мікалай Чудатворац, Георгий Победоносец – Георгій Пабедзіцель*. Такое становішча абумоўлена ўздзеяннем стараславянскай мовы, выкліканым уплывам праваслаўнай рэлігійнай традыцыі. У беларускіх гаворках назіраецца тэндэнцыя да пазбягання стараславянізмаў: кампазіт *победоносец* замяняецца на кальку *пабедзіцель* 'пераможац'. У беларускіх і рускіх гаворках сустракаюцца найменні дзён Святых, звязаныя з народнымі варыянтамі імя *Георгій – Юрый, Юр'я*.

Параўнальна-супастаўляльнае даследаванне каляндарна-абрадавай лексікі беларускай і рускай моў сведчыць аб наяўнасці вялікай колькасці лексічных паралелей у беларускай і рускай каляндарна-абрадавай традыцыі. У рускай каляндарна-абрадавай лексіцы назіраецца значная колькасць стараславянізмаў, абумоўленая ўплывам праваслаўнай рэлігійнай традыцыі, асноўнай мовай якой з'яўляецца стараславянская (царкоўнаславянская). Нягледзячы на тое, што для беларускай мовы царкоўнаславянскі ўплыў не быў характэрны, у каляндарна-абрадавай беларускай лексіцы сустракаецца вялікая колькасць стараславянізмаў, якая захоўваецца яшчэ з часоў прыняцця ўсходнімі славянамі хрысціянства і падмацоўваецца сучасным беларуска-рускім двухмоўем.

2.3.3 Беларуска-ўкраінскія моўныя паралелі ў каляндарна-абрадавай лексіцы зімовага цыклу

Традыцыйная народная культура ўсходніх славян уяўляе сабой непаўторную і самабытную духоўную скарбніцу. Важную ролю ў вызначэнні асаблівасцей гісторыка-культурных працэсаў развіцця блізкароднасных народаў мае супастаўляльны аналіз матэрыялаў, сабраных у беларускіх рэгіёнах і памежных тэрыторыях усходне-славянскіх этнасаў – даўніх суседзяў беларусаў, якія маюць агульныя гістарычныя карані і тыпалагічна блізкія па характары культуры. Указаныя фактары робяць актуальным і надзённым зварот да параўнальна-супастаўляльнага даследавання абрадавай лексікі беларускай і ўкраінскай моў як важнага складніка духоўнай культуры ўсходнеславянскіх народаў.

Каляндарныя святы беларусаў і ўкраінцаў падпарадкаваны гадавому земляробчаму і жывёлагадоўчаму цыклам, у іх налічваецца вялікая колькасць агульных найменняў, абумоўленая агульнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гісторыяй, падобнымі кліматычнымі асаблівасцямі, блізкімі рэлігійнымі памкненнямі і прыкладна роўнымі сацыяльнымі ўмовамі жыцця.

Лексіка-семантычная група назваў абрадаў зімовага цыклу мае шматлікія тэматычныя падгрупы, з якіх у колькасных адносінах выдзяляюцца назвы хрысціянскіх свят пад агульнай назвай *прэстольныя празнікі, прыстольныя празнікі, прыстольшчына.* Асноўныя святы зімовага цыклу – *Ражство*, *Коляды, Стары Новы год, Вадохрышча, Стрэчанне.*

Калядныя і навагоднія святы вызначаюцца сярод зімовых свят і дзён асаблівай папулярнасцю. Працягваюцца святы амаль два тыдні: ад Каляд да Вадохрышча. Увесь гэты перыяд усходнія славяне спрадвеку называюць *святкі, святыя вечары*. Найменне вядома ўсім усходнеславянскім гаворкам і паходзіць ад старажытнарускага дзеяслова *св#тити* ‘захоўваць у святасці, непарушна’, ‘рабіць святым’ [2, т. 4, с. 161]: ***Святыя вечары*** *былі ад Раждества да Крашчэння, а на Крашчэнне – калядкам прашчэнне, значыць, канец, прайшлі святы* (в. Сялец, Буда-Каш.); *Каляды святкавалі да 14 студзеня. У гэтыя дні нічога не рабілі: ні дроў, ні лучыны не секлі, не шылі. На Каляды ў* ***святыя вечары*** *мы пелі песні* [4, с. 77]; *“**Святки** – время отъ Рождества до Крещенья. Кто на Святки рожу над҃валъ, купается на Іордани. Славятъ Христа, ходятъ съ вертепами и со зв҃здой, гадаютъ”* [2, т. 4, с. 161].

Святкі пачынаюцца 7 студзеня – найбольш важнае і ўрачыстае зімовае свята, свята Нараджэння Хрыста, асаблівая весялосць якога абумоўлена заканчэннем посту і прадчуваннем надыходу новага года. У беларускай моўнай традыцыі для назвы гэтага свята ўжываюцца лексемы: *Каляды і Ражаство*. Стараславянізм *Рождество* у беларускіх гаворках мае варыянты *Ражаство, Ражэство, Раждзество, Раждество, Ражство, Раство.* Ва ўкраінскай мове, акрамя фанетычнага спрашчэння, што кранула стараславянізм у беларускіх гаворках, адбылося ўласцівае ўкраінскай мове змяненне галоснага: *Різдво: Вечір напередодні* ***Різдва*** *— «Свят-вечір», «вілія», «кутя» був магічним часом творення іншого, вимріяного буття* [5].

Лексема *Каляды* і яе варыянты *Каляда, Коляды, Калядкі,* распаўсюджаныя ў адзначаным рэгіёне, маюць значэнні:

– ‘святкі ад Нараджэння Хрыстова да Вадохрышча’: ***Каляды*** *празнавалі калісь две неделі, танцавалі, гулялі* (в. Старое Сяло, Ветк.); *На* ***Каляды*** *усе свадзьбы гуляюць. От добра ў гэты час вяселле ладзіць* (г. п. Церахоўка, Добр.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– ‘зімовае свята, якое адзначалася 7 студзеня’, ‘свята Нараджэнне Хрыстова’: *Святкавалі* ***Каляды*** *кожны ў сваёй хаце. Усё прыбіралі, мылі. Стол засцілалі святочным абрусам, пад яго клалі сена, ставілі гаршчок з куццёй, каб быў не голы, а багаты, Дзеці залазілі пад стол і кудахталі: “Кудак, кудак, наша курка нясе яйцо з кулак. У суседа вароты трасуцца, а ў нас куры нясуцца”. Дзецям сыпалі ў рукі семечкі, зерне, ці цукар* (в. Насовічы, Добр.);

– ‘абход двароў з велічальна-віншавальнымі песнямі ў ноч з 13 на 14 студзеня, калядаванне’: ***Каляда*** *на сівым коніку прыяжжала* (в. Барталамееўка, Ветк.); ***Каляды*** *– гэта на стары Новы год сабіраліся, вывaрочвалі шубу, надзявалі так , хадзілі пад вокнамі, пелі, танцавалі, казу вадзілі* (в. Гусявіца, Буда-Каш.);

– ‘калядная песня’: *Хадзілі, калядавалі,* ***каляду*** *спявалі, перэадзяваліся, ну, іх угашчалі, дзеньгі давалі, гасцінцы* (в. Жгунская Буда, Добр.).

Найменне *Каляды* выяўляе этымалагічную сувязь з лацінскім *Kalendae* ‘першы дзень месяца ў старажытных рымлян’. Ва ўкраінскай моўнай традыцыі захавалася ўтварэнне ў форме адзіночнага ліку *Коляда: У святах* ***Коляди*** *й Щедрого Вечера виявлюється старо-українська культура у великій силі* [6]. Таксама сустракаецца варыянт назвы гэтага цудоўнага зімовага свята *Різдво-Коляда: Українське* ***Різдво-Коляда*** *– це Свято Різдва Світа і хвали Господу-Творцю* [6].

Калядны цыкл свят завяршала *Вадохрышча,* якое ў беларускіх гаворках мае ўжо ўзгаданыя разнастайныя варыянтныя назвы: *Крашчэнне, Крэшчэнне, Крэшчэнье, Крашчэніе, Крешченіе, Крешченне, Крешченье, Крышчэнне, Крішченіе, Храшчэнне, Хрышчэнне, Хряшченне; Вадохрышч, Вадохрышчанне, Водахрышчэнне, Водохрышча, Вадохрышч, Водопошчэ:* ***Крашчэнне*** *атмячалася 19 января. У еты дзень пасвяцалі ваду, купаліся ў прорубях. Пасвяцоную ваду давалі піць дзецям і бальным. Ёй брызгалі там, дзе стаяў скот і хранійся ўражай. Святую ваду леюць у калодзец, каб там вада асвячалася* (г. п. Уваравічы, Буда-Каш.); *У* ***Хрышчэнне*** *хрышчыкі рысавалі на дзвярах, на варотах; Васямнаццага чысла у цэрькву ідуць, ваду свецяць – вялікая вада называецца, а патом ужэ назаўтра свецяць, хрышчэнская, святая вада называецца, яе дома хранят* (в. Хальч, Ветк.).

Ва ўкраінскай народнай традыцыі свята *Вадохрышча* набыло некалькі найменняў:

– развітыя намінацыі – *Святе Богоявлення, Хрещення Господа Бога і Спаса нашого Ісуса Христа, свято Хрещення Господнього, свято Йордана, свято Хрещення* [7];

– кароткія, пашыраныя ў звычайным маўленні, назвы: *Йордана*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(Ордана, ордань, ардан, Йордан), Водохреща, Богоявлення, відорощі, водохрещи: Йордана (Ордана, Водохреща, Богоявлення) [7].

Узнікненне варыянтаў выклікана адрозненнямі ў фанетычнай адаптацыі на ўсходнеславянскай глебе стараславянізма *Крещение,* а таксама метанімізацыяй назвы ракі, у якой адбываліся Біблейскія падзеі.

Да зімовых свят адносілася *Стрэчанне, Стречанне, Стрэценіе, Встрэчанне, Устрэчанье, Страчэнне, Грамніцы* – праваслаўнае свята, якое адзначаецца 15 лютага, у народзе тлумачыцца як сустрэча зімы з вясною: *На* ***Стречанне*** *зіма з вясной стрячяюцца* (в. Неглюбка, Ветк.); ***Стрэчанне – Грамніцы****. На* ***Грамніцы*** *палавіна зіміцы; На Встрэчанне нада схадзіць у цэркву і прынесці святыя свечачкі. А кагда граза ці нешчасце якое ў доме, то нада іх запаліць – яны аберегают дом* (г. п. Уваравічы, Буда-Каш.).

Украінскія назвы свята – *Стрітення, громовище* [7]. Найменні, што пайшлі з кораня *гром-* (па беларуску *пярун*), звязаны з павер'ем аб тым, што асвечаная 15 лютага свечка, запаленая ў непагадзь, абараняе ад маланкі і перуну. Паколькі лічылася, што ў гэты дзень зіма з летам змагаюцца, то ва ўкраінскай традыцыі ёсць назва *зимобор* [7].

У зімовага свята *Увядзенне, Введеніе* 'увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы, якое адзначаецца 4 снежня', у народным календары менш варыянтаў назвы: *Увядзенне Святой Багародзіцы ў храм – ета значыт Марыя, маць Хрыста. У іх долга не было дзяцей, ані решылі: ужо хто ні радзіцца – ета божы дзіцёнак, і ў тры годзіка павялі её в цэркавь, к Богу с узелочкам. І ана там васьпітывалась* (в. Неглюбка, Ветк). Па-ўкраінску свята называецца *Введення.* Поўная назва – *Введення у храм Пресвятої Діви Марії* [7]: *Початок нового господарського року в введенських повір'ях виступає ясно: до* ***Введення*** *можна копати землю, від* ***Введення*** *до Благовіщення не можна; жінки запасаються глиною до Введення* [7].

Асобным складнікам каляндарна-абрадавай лексікі з'яўляюцца найменні ўдзельнікаў абрадаў. На *каляды* ў беларускія хаты з віншаваннямі і добрымі пажаданнямі абавязкова завітвалі *калядоўшчыкі (каляднікі, калядоўшчыкі, каледоўшчыкі), засявальнікі,* пад *Стары новы год – шчадроўшчыкі (шчадроўнікі, шчадравальнікі, шчодрыкі, шчодрікі, шчодрыя, шчадрухі).* У Беларусі ў святкаваннях абавязкова прымалі ўдзел *баба, дзед, вернік* 'каляднік, які насіў сабраныя грошы, сала, гарэлку', *звездар* 'чалавек, які нёс зорку (*звязду*) у час калядавання', *каза* 'каляднік, пераапрануты ў казла або з маскай з выявай казла'. Вядома беларускім гаворкам *Маланка* 'персанаж каляднага абраду, шчадроўшчыца', *маханоша* 'ўдзельнік

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каляднага свята, які носіць сумку за калядоўшчыкамі’: *На Каляды хадзілі калядаваць.* ***Калядоўшчыкамі*** *былі ўсе, хто хацеў. Але абязацельна ўсе пераапраналіся, каб іх не пазналі, ..з калядоўшчыкамі былі* ***мядзведзь, каза, цыганка і дзед Мароз*** (в. Дуброва, Рэч.) [4, с. 53–54].

Адпаведнікі ўказаных намінацый фіксуюцца ўкраінскай народнай творчасцю: *колядник, щедрівник, маланкар, Маланка: В минулому столітті колядник з “козою”, сподіваючись на багату винагороду, спосатку йшлі до місцевого пана* [8, с. 91]; *Колядники в масках – провісники весни і нового аграрного сезону* [8, с. 141]; *Платилі щедрівникам, що ходили із “козою”, більше* [8, с. 91]. *На Маланку наведвалі хату ва Украіне маланкарі* [8, с. 117]. *У працэсіі прымала ўдзел і сама Маланка* [8, с. 117].

У складзе каляндарна-абрадавай лексікі беларусаў выдзяляюцца найменні асобных этапаў і абрадавых дзеянняў: *калядкі* ‘вечар 13 студзеня і ноч на 14 студзеня’, *шчадроўкі (шчодрыкі, шчодрікі, шчёдрікі, шчодра, шчодр, шчодры вечар, шчадроўкі)* ‘хаджэнне па дамах з песнямі, каб атрымаць гасцінцы’: *На шчадраванні наражаліся па-ўсякаму. Кто смялейшы, таго наражалі казой і хадзілі ў шчодры* [4, с. 77]. Украінская мова мае амаль дакладныя адпаведнікі: *щодрий (щедрий) вечер, щодрівник: Кожну Колядку кінчать Колядники .. Старовіцькі Колядки і Щедрівки, своїм змістом так дуже не підхожі до церковно-християнської ідеольоґії Різдва* [7].

Дзень каляд у асобных мясцовасцях называўся *засеўкі*: *Маладыя хлопцы насілі па вуліцы бліскучую звязду з лентачкамі, заходзілі ў хаты, сыпалі на мост зерне і гаварылі: ”Сею, сею, пасяваю, з Новым годам паздраўляю”* (в. Насовічы, Добр.); *Пасля Каляд хадзілі “засявальнікі”, яны засявалі. Ну, ужэ калі прыдуць к табе засяваць, ета ўжэ будзе багаты ўраджай* [4, с. 52]. Беларускае каляднае *абсяванне (засяванне),* калі хаты аднавяскоўцаў абсыпалі зернем, каб быў добры ўраджай, ва Украіне называецца *засівання (посівання, посипання).* Абрад ва ўсходніх славян меў аграрна-магічны сэнс.

У асобную тэматычную групу каляндарна-абрадавай лексікі вылучаюцца найменні рытуальных прадметаў, кулінарных страў, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні абрадаў і свят. На Каляды насілі *звязду (зорку),* на якой былі намаляваны розныя казачныя фігуркі, павадыр, апрануты ў світку, паганяў казу пугай, а выканаўца ролі казы апранаў перавернуты ўверх скурай кажух. *“Каза”* для беларускага і ўкраінскага народаў уяўляе сабой вельмі важны абрад у сістэме калядавання. Па словах А. Курачкіна, “персонаж новорічного рядження “*коза*” в минулому був надзвичайно популярнийв Україні и

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Білорусі” [8, с. 87]. Традыцыйнай прыналежнасцю абраду шчадравання былі таксама маскі бусла і каня.

Вялікае значэнне ў правядзенні абрадаў мела *куцця (*украінскае *кутя)* ‘абрадавая страва з круп’. На святкі традыцыйна беларусы гатавалі *тры куцці: перадкалядная посная (бедная, галодная, раждественская), багатая (шчодрая* – пасля Каляд*) і галодная* – перад Вадохрышчам. На 13 студзеня рабілася *шчадровая куцця* – страва, прыгатаваная на калядныя святы. На ўсе тры куцці каша варылася ў адным гаршку.

На святочным перадкалядным стале беларусаў і ўкраінцаў мусіла быць дванаццаць посных страў: *Гатовіліся к Калядам. Казалі: “Святое Ражаство радасць прынясло”. Трэба было 12 страў прыгатаваць, самая галоўная – куця* (в. Роўнае, Рэч.); *Риба просіл, пісний борщ, вареники, гречаники й пироги, пироги з капустою, грибами, квасолею, горохом, сливами, яблуками тощо. Зійшла вечірня зоря, й можна сідати вечеряти; починали із куті. А панувала у Свят-вечір кутя – головна обрядова страва. Як удасться кутя – буде крута ще й із «верхом» - то буде на урожай, а в оселі щастя* [6].

Праведзенае даследаванне беларускіх і ўкраінскіх каляндарна-абрадавых найменняў дае падставы сцвярджаць, што народныя святы і абрады з’яўляюцца праяўленнем традыцыйнай культуры ўсходніх славян. У генетычных адносінах значная частка ўказанай лексікі належыць да агульнаславянскага лексічнага фонду: *Вада, баба, дзед, Ражаство, Крашчэнне, Вадохрышча, Святкі, каза, звезда, шчадроўка, варажыць*. Большасць зафіксаваных лексем – суфіксальныя ўтварэнні ад дзеясловаў (*абсяванне, варажба, Ражаство, Крашчэнне*) і ад назоўнікаў (*звездар, калядоўшчык, каляднік*). Абрадавая лексіка, якая да сённяшняга часу шырока функцыянуе на тэрыторыі пражывання беларусаў і ўкраінцаў, вызначаецца багатай і складанай сістэмай лексічных сродкаў, варыянтнасцю і разнастайнасцю, семантычнымі і граматычнымі асаблівасцямі, з’яўляецца неад’емнай часткай духоўнай культуры беларусаў і ўкраінцаў, у якой захаваны старажытныя моўныя з’явы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2.3.4 Сустрэча вясны ў абрадавым календары ўсходніх славян

У пару абуджэння ваколіц, абнаўлення акаляючай прыроды і чалавеку трэба было пасля доўгай і часцей халоднай зімы зноў

актывізаваць гаспадарчую працу, брацца за апрацоўку зямлі. Радасныя пачуцці ад веснавога сонейка, ад свежай маладой зеляніны выявіліся ў веснавой каляндарнай абраднасці ўсходніх славян, і перш за ўсё – у святах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

станавіліся веснікамі надзеі людзей на добры ўраджай, што абазначала добрае, сытае жыццё ўвесь наступны год: *Несколько* ***жаворонков*** *клали в закрома. Когда выходили в поле, брали их вместе с зерном и там на поле ели, чтобы был урожай* ***сорок*** *пудов* [10, с. 78–80]. Вобразы жаўрукоў традыцыйныя і ў беларускіх песнях, прысвечаных гуканню вясны: *Жавароначкі прыляцелі, Вясну красну захацелі...*.

У некаторых выпадках разам з жаўрукамі запрашаюцца іншыя птушкі: *В этот день пекли из теста* ***жаворонков****, а когда вытаскивали их из печи, приговаривали: «Чу-виль-виль! Чу-виль-виль!»* ***Жаворонков*** *выносили на улицу, поднимали на ладонях к небу, и говорили: «****Жавороночки****,* ***перепелочки****, прилетите к нам, принесите Весну-красну!»* [10, с. 78–80]. Аднак нават калі на Саракі ўжываліся іншыя назвы прысмакаў, абавязковай была форма птушкі і нязменнай сувязь з вясной, летам і будучым плёнам: *Пекли* ***пекушки*** *в форме птичек, считалось, что в этот день прилетал жаворонок. На* ***Сороки*** *пекли* ***плюшечки-жаворонки****. На* ***Сороки*** *пекли* ***кулики, сороки****, давали детям. Они перекидывали их через омет, через садок с приговорками, прибаутками. На* ***Сороки*** *пекли* ***куликов*** *и с ними кувыркались на соломе и приговаривали: «****Кулики-жаворонушки****, летите у в одонушки, пашаничку клевать, куколь выбирать»* [10, с. 78]; ***Блинцы*** *пекли****, оладья****.* ***Пышки*** *делали, как сороки, хвост кверху. Типа крестика, а внутрь кладёт денежку на счастье. Пекли* ***жавораты****. Испекешь, дети их возьмут и на улицу идут: «****Жавораточки*** *летите, вы нам летушку несите!» Много пекли. Залазили с ними повыше. Звали, чтоб лето пришло. А пекли жаворонков,* ***орешки****.. На* ***Сороки*** *пекут* ***птичек*** *– булочки в форме птичек, их едят в семье, выходят с этими* ***птичками*** *на улицу и кличут весну.. В понедельник после Масленицы пекли* ***тужики****. «****Тужик*** *помаслёный» – как пышки с головой и крылышками. Дети выносят на улицу и говорят: «****Тужик****-жавороныки, где ваша мать? За лясом привязана поясом»* [10, с. 80].

Па звестках беларускіх этнографаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Успаміны пра падобнае гаданне на выпечцы захоўваюцца і ў рускіх гаворках: *На* ***Сороки*** *и на пятой неделе Великого поста пекли* ***куличи*** *из разной муки.* ***Куличи*** *бросали через сарай. Считалось, куда упадет* ***кулич****, в какую сторону, туда девушка и выйдет замуж* [10, с. 79]. Найменне *куліч*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

камы збівалася гарохавая каша, што людзі неслі ў пачастунак да мядзведзя [9]. Свята Камаедзіцы было ўласцівым не толькі для беларусаў. Вядома традыцыя была і ў некаторых абласцях пражывання рускага народа, аб чым сведчыць фіксацыя наймення ў "Слоўніку рускіх народных гаворак":

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У беларускіх гаворках гэты тыдзень называецца *Масленечны*: ***Масленечны*** *– тыдзень перад Масленіцай* (в. Старое Сяло, Ветк.). У рускіх гаворках такі тыдзень мае найменне *Масленица, Масленицкая неделя, Широкая Масленица, Сырная неделя, Мясопустница:* ***Масленица*** *называлась* ***Широкой****. Гуляли всю неделю, пекли блины с маслом и с сыром* [10, с. 64]; *Начинают праздновать Масленицу со вторника. Всю* ***Масленицу*** *пекут блины с маслом, сметаной, молоком. Первый блин клали на икону, говорили: «Встречаем Масленицу».* ***Масленичная неделя*** *называлась* ***сырной*** [10, с. 65]; *Длилась Масленица неделю. Называли* ***Сырная****,* ***Мясопустница.*** *Гуляния начинались с четверга* [10, с. 70]; ***Масленицкая*** *неделя длилась семь дней. Суббота называлась широкой, воскресенье – прощеный день* [10, с. 75]. Украінскія гаворкі для масленічнага тыдня фіксуюць назвы *Масляна, Сиропустний тиждень, Пущення, Загальниця, Ніжкові заговини, Колодій* [14].

Асноўная харчовая традыцыя ўсходніх славян на Масленіцу – гэта *бліны, блінцы, млінци* (ва ўкраінскай мове). Кожная гаспадыня валодала адметнымі сакрэтамі іх гатавання, якія перадаваліся ад маці да дачкі. Захоўваліся таксама і абрады першага выпечанага бліна. Прыгадаем вядомую прыказку аб першым бліне комам. А яшчэ масленічнымі блінамі абавязкова частавалі гасцей, і самі хадзілі з блінамі ў госці. У рускіх гаворках, акрамя бліноў, адзначаюцца печаныя з цеста *арэхі*: *Молодые, поженившиеся первый год, пекут и раздают* ***орехи****. Пекли* ***орехи*** *так: раскатывали тесто толщиной в палец, красили его и резали на кусочки в треть пальца.* ***Орехи*** *раздавала молодуха в субботу* [10, с. 69]; *Выпекали* ***орехи*** *вместе с тыквенными семечками. Пекли их так: натирали тесто, мелко резали и красили в малиновый цвет. Молодожёны носили целую сумку* ***орехов****. По* ***орехам*** *смотрели, хорошая ли стряпуха молодая хозяйка* [10, с. 69].

Знакамітым масленічным абрадавым пачастункам з’яўляюцца варэнікі. Натуральна, што асабліва ўлюбёныя яны ва Украіне: *Основою обрядовою стравою Масляної (Масниці, Масляниці) були* ***вареники*** *з сиром, які вживалися з маслом чи сметаною* [14]; *Головною їжею на Масляну є* ***вареники*** *з сиром і сметаною* [12, с. 149]; *Це обрядове їство було особливо пошанованим у неділю, а тому казали: "****Вареники*** *доведуть, що й хліба не дадуть"* [14].

Адметнай масленічнай традыцыяй усходніх славян таксама былі *калодкі*, якія з жартамі і смехам вешалі на тых хлопцаў і дзяўчат, што не ажаніліся. Такі звычай вядомы беларускім, рускім і ўкраінскім народам. На Украіне абрад больш развіты. Калодку ладзілі жанчыны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўвесь тыдзень: у панядзелак зранку збіраліся ў карчме, абарочвалі калодку кавалкамі палатна, што абазначала нараджэнне калодкі. Адзначэнні працягваліся да суботы: “У понеділок колодка народилась, у вівторок христилась, у середу похрестили, в четвер колодка помирає, в п’ятницю її хоронять, а в субботу плачуть” [12, с. 147–148].

Даследаваныя адзінкі каляндарна-абрадавай лексікі ўсходнеславянскага веснавога цыклу падкрэсліваюць блізкасць і агульнасць паходжання моў усходніх славян. Разнастайнасць і багацце каляндарна-абрадавых традыцый беларусаў, рускіх, украінцаў накіроўвае на неабходнасць іх захавання і дэталёвага навуковага вывучэння. У асобных абрадах веснавога цыклу яшчэ можна адшукаць сляды старажытнейшых язычніцкіх вераванняў і традыцый усходніх славян. Некаторыя веснавыя язычніцкія святы і абрады былі адаптаваны хрысціянствам і на сучасным культурна-гістарычным часавым зрэзе выяўляюць даволі арганічнае ўваходжанне ў хрысціянскія традыцыі. Разгледжаная лексіка сведчыць таксама аб адметнасцях і спецыфічных асаблівасцях кожнай з усходнеславянскіх моў.

2.3.5 Лексіка летняга каляндарна-абрадавага цыклу ў беларускай і ўкраінскай мовах

Абрадавая лексіка ўваходзіць у скарбніцу духоўнай культуры народа як частка нацыянальнай мовы, як памяць пакаленняў, увасобленая ў моўных адзінках, што перадаюцца праз дзесяцігоддзі і стагоддзі. Каляндарныя святы беларусаў і ўкраінцаў натуральна і заканамерна падпарадкаваны гадавому земляробчаму і жывёлагадоўчаму цыклам. У каляндарна-абрадавай лексіцы адметным чынам кадзіруюцца звычаі і ўяўленні старажытных і сучасных усходніх славян, абумоўленыя кліматычна-геаграфічнымі і сацыяльна-культурнымі фактарамі. Адметныя рысы мае лексіка летняга каляндарна-абрадавага цыклу ў беларускай і ўкраінскай мовах.

Паводле часу адзначэння адпаведных абрадаў каляндарна-абрадавая лексіка ўсходніх славян падзяляецца на найменні з дакладна вызначанай датай, якая паўтараецца штогод у адзін і той самы дзень календара, і назвы абрадаў, даты якіх непасрэдна залежаць ад даты Вялікадня. Вядома, што Пасхалія – каляндар вызначэння даты Вялікадня – ствараецца адзін раз на 532 гады. Так званы Вялікі Індыктыён складаецца з 19 сонечных колаў і 28 месячных, бо кожныя 28 гадоў дні тыдня прыпадаюць на тыя самыя даты месяцаў, а кожныя 19 гадоў супадаюць дні па месячным календары, ад памнажэння 19 на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

28 атрымліваецца 532. Зараз мы карыстаемся календаром вызначэння даты Вялікадня, складзеным яшчэ ў 1492 годзе.

На шостым тыдні ад Вялікадня адзначаецца *Ушэсце*. У народнай традыцыі захаваліся ўспаміны аб традыцыях гэтага дня: *На празнік, на* ***Ушэсце****, усе збіраюцца карагод вадзіці. Многа людзей прыходзіць* (в. Церахоўка, Добр.).

На пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня адзначаецца адно з самых вялікіх летніх святаў – *Троіца* ‘свята Святой Троіцы, устаноўленае ў гонар і памяць трыіпостаснага Боства, адзінага Бога ў трох асобах, Айца, Сына і Святога Духа’ [2, т. 4, с. 431]. Паходжанне наймення ад лічэбніка *тры* адбілася ў наяўнасці ва ўсходніх славян прыказак, у якіх слова *троіца* абазначае адпаведную колькасць: *Бог любіць* ***троіцу****; Без* ***троіцы*** *дом не будуецца.*

У беларускіх гаворках фанетычным варыянтам наймення *Троіца* стала ўтварэнне з [j]: *На тройцу берёзкі прібівалі на кажды столб, любісцік занасілі. У хаце клен развешвалі, каб нячыстую сілу адганяў* (в. Церахоўка, Добр.). Такі самы варыянт зафіксаваў ва ўсходнеславянскіх прыказках вядомы расійскі этнограф У. Даль: *Тройца перстовъ крестъ кладетъ* [2, т. 4, с. 431].

Ва ўкраінскай мове таксама адзначаецца рэдукцыя галоснага, акрамя таго, існуе варыянт наймення, дзе [о] змяняецца на [і] – *Трійця* і *Тройця: Трійця, Тройця – це церковне свято, яке відзначають у 8 неділю після Пасхи* [15]. Змена галосных [о] – [і] выклікана старажытнай гістарычнай фанетычнай з’явай знікнення рэдукаваных галосных *ъ, ь*. Спачатку перад складам з пазней страчаным слабым канцавым рэдукаваным адбывалася падаўжэнне кароткага [о] да дыфтонгаў [уо] або [уі] з перавагай апошняга. З дыфтонга [уі] ва ўкраінскай мове замацавалася другая частка [і]: *кінь, стіл*. Пазней пераход [о] – [і] стаў спецыфічнай рысай украінскай фанетыкі, што адзначаецца ў варыянце *Трійця*. Неспрадвечнасць пераходу[о] – [і] у гэтым выпадку дае права на існаванне і наймення з галосным [о]: *Тройця.*

Існаванне лексічных варыянтаў наймення свята звязана з вылічэннем яго даты. Пяцідзясяты дзень ад Вялікадня спарадзіў назву, што з’яўляецца больш афіцыйнай, царкоўна-рэлігійнай – *Пяцідзясятніца*, украінскае *П’ятидесятниця*: *Церква називає його* [свята] *ще П’ятидесятницею* [15]. Паколькі пяцідзясяты дзень – гэта прыкладна сёмы – восьмы тыдзень, то ў беларускай мове сустракаецца і намінацыя свята *Сёмуха* [16, с. 151].

Па слушнай заўвазе этнографаў, “увібравши в себе багато рис іудейської *П’ятидесятниці*, християнська *Трійця* приєднала й

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

національні риси тих свят, з традиціями яких вона частково злилася. Так, в українців *Трійця* злилася із *Зеленими Святами*” [15]. Часта Троіца прыпадае на чэрвень, час, калі наваколле буяе расліннасцю, пасля доўгай марознай зімы прырода аднаўляецца і паказвае сваю сілу і прыгажосць. З гэтай прычыны асноўным элементам траецкай абраднасці стаў культ расліннасці. Ва Украіне існуе абрад упрыгожвання хаты, а таксама ўсёй сядзібы, зелянінай: *Біля порога хати ставили зелені дерева, вікна, дахи і тини теж клечали зеленим гіллям* [17]. Акрамя таго, зеляніну прыносілі і ў царкву: *В Україні ще у XVIII столітті до церкви приносили різні трави: зорю, м’яту, канупер тощо* [15].

Падобныя традыцыі не толькі вядомыя ў Беларусі, але і надта трывалыя. І зараз у часы святкавання Троіцы на кожнай вясковай хаце, на кожнай агароджы абавязкова сустрэнеш раслінкі: *На Тройцу дом украшалі клёнам, ліпай ці бярозай* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.). Агульная назва траецкіх раслінных упрыгожванняў у беларускіх гаворках – *май: Вешаіцца, прыбіваецца* ***май****. У лес хлопцы ездзаць, сакуць ды і прыбіваюць к хаце* (в. Івакі, Добр.). У розных беларускіх мясцовасцях сустракаецца ўзгадкі розных раслін: *На Тройцу хто ветачкі эта, а хто с речкі аер этат* (в. Івакі, Добр.); *Хто берёзавые ветачкі на Тройцу эта вешае* (в. Івакі, Добр.); *На Тройцу ліпу вешаюць, у хаце і на дварэ* (в. Івакі, Добр.).

Адпаведнае ўкраінскае найменне расліннага ўпрыгожання хаты на Троіцу –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кросны” [16, с. 136]. Пры гэтым асобная ўвага адводзілася чацвяргу, які называецца ў гаворках *русальчын вялікдзень*.

Падобныя павер’і адзначаюцца і ва ўкраінскай абраднасці, дзе вобразы русалак надзвычай распаўсюджаныя. Разам з найменнем *русалка* ва ўкраінскай мове пашыраная назва *мавка* (прыгадаем “Лісову пісню” Лесі Украінкі): ***В русалчин тиждень*** *ніхто не відважується купатися в річці, хіба що відьми, бо лише вони не бояться* ***русалок****. В Зелений тиждень, у четвер, ніхто не повинен працювати, щоб не розгнівати русалок, щоб вони не попсували худоби, птиці й усього господарства. Цей день називається* ***Русалчин Великдень****. Дівчата ранком йдуть у поле «на жита» та на межах кладуть хліба для* ***мавок*** *— «щоб жито родило».. По одинці в ліс чи в поле не ходять, і не купаються в річках — «щоб* ***русалки*** *не залоскотали»* [17].

Аб старажытнасці паходжання ўзгаданых назваў сведчыць фіксацыя іх у слоўніку У. Даля:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каляндарнай традыцыі больш пашыранымі з'яўляюцца Мядовы Спас і Яблычны Спас.

Мядовы Спас адзначаўся 14 жніўня. У гаворках гэта свята мае таксама назвы *Макавей*: *На 14 аўгуста* ***Медовы Спас*** *гавораць, но чашчэ* ***Макавей*** *гавораць у нас* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.); *Быў бальшы празнік* ***Макавей****. Празнавалі – 14 аўгуста* (в. Івакі, Добр.); ***Макавей*** *святы. Празнік будзе у авгусці* (в. Івакі, Добр.). Назва абумоўлена тым, што ў гэты час збіраюць мак.

Самы вядомы, распаўсюджаны, традыцыйна і шырока адзначаны Спас – Яблычны – адзначаўся 19 жніўся: *Тры Спасы ёсць, но 19 аўгуста самы глаўны Спас* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.); ***Спас яблачны*** *дзеветнадцатага августа. На этат Спас яблака ўже едзят, а да этага празніка нет* (в. Івакі, Добр.). Царкоўная назва свята – *Прэабражэнне (Праабражэнне) Гасподне* – у беларускіх гаворках не вельмі пашыраная, што абумоўлена нехарактэрнасцю для беларускай мовы царкоўнаславянізмаў. Свята вядомае і ўкраінскай абраднасці: *Другий (Великий) Спас* ***Яблучний****, Преображення Господнє. Одне з найбільших хліборобських свят. Його ще називали святом урожаю* [7].

Другі Спас непасрэдна звязаны з яблыкамі. Паводле беларускіх павер'яў, да гэтага дня нельга есці яблыкаў, бо будуць паміраць дзеці [16, с. 114]. Украінскія этнографы сведчаць, што да Спаса не ўжывалі яблыкаў жанчыны, у якіх памерлі дзеці, і прыводзяць цікавае паданне аб тым, што "в цей день мати Божа роздає діткам на тому світі золоті яблука, а ті, чиї батьки порушили обітницю, стоять збоку і плачуть, на що мати Божа відповідає: "*Твоє яблуко свиня з'їла*" [7]. Па сцверджанні Алексы Варапая, "правовірні селяни до цього дня не їли садовини, бо це вважалося гріхом [12]. Падобныя звесткі адзначаюцца і У. Далем: *Да другога Спаса не ядуць ніякіх пладоў, акрамя агуркоў* [2, т. 4, с. 287].

Існуюць адметныя рытуалы паводзін падчас гэтага свята. Натуральна, што на Яблычны спас традыцыйнай стравай становяцца яблыкі і пірагі з яблык: ***Пірагі з яблак*** *пяклі* (г. Добруш). Абавязкова трэба схадзіць у царкву пасвяціць яблыкі і мёд: *Падчас яблачнага спасу* ***свяціць яблыкі*** *ў цэркаў насілі* (г. Добруш)*; У яблачны спас і* ***мёд свяцілі*** (г. Добруш). Тыя самыя звесткі падаюць украінскія навукоўцы: *Повернувшися з церкви, родина, звичайно, врочисто сідала за стіл і розговлялася:* ***їли яблука з медом*** *і запивали виноградним або яблуневим вином, – «щоб садовина родила»* [12]. Як пісаў У. Даль, "на другі Спас і жабрак яблычка з'есць". [2, т. 4, с. 287].

Трэці Спас адзначаўся 29 жніўня, называецца ён *Арэхавы*, бо да гэтага часу звычайна паспяваюць арэхі. Па часе гэты Спас супадае з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дажынкамі, бо да гэтага дня трэба было паспець убраць апошні сноп у поле.

Паколькі Спас прыпадае на канец лета, у народнай традыцыі свята асацыіруецца звычайна з паступовым надыходам восені, а пасля – і зімы. З гэтай нагоды ўсходнія славяне маюць цікавыя прыказкі: беларускія – *Прыйшоў спас – рыхтуй рукавічкі пра запас; Спас – усяму час*; украінскія – *Прийшов Спас – пішло літо від нас. Перший Спас час припас, Петро і Павел – два прибавив, Ілля-пророк – три приволок* [7]. А паводле У. Даля, *Первый Спасъ на воде стоятъ; второй Спасъ – яблоки едятъ, третій Спасъ – не зеленыхъ горахъ холсты продаютъ* [2, т. 4, с. 287–288].

Паходжанне наймення *Спас* звязана са старажытнарускім дзеясловам *спасати* ‘ратаваць, вызваляць’ [2, т. 4, с. 287], хаця часам у народнай свядомасці сустракаецца атаясамліванне назвы *Спас* з сугучным дзеясловам *спаць* [16, с. 144].

У жніўні таксама адзначаюцца прысвяткі: ***Ціхан –*** *прыстольны празнік у нас у дзеревні. Эта двадцаць шестога августа* (в. Івакі, Добр.); ***Ілья*** *адзначаецца 2 жніўня. Ілья Прарок два дня увалок* (в. Ларышчава, Добр.). Этнографы лічаць, што з прыходам хрысціянства на Старажытную Русь за вобразам Іллі замацаваліся рысы і функцыі галоўнага язычніцкага бога Перуна [16, с. 74]: *У слов'янських народів прообразом Іллі вважається дайбозький Перун, який був покровителем грому та блискавок* [12]. Сапраўды, у гэтую пару часта бываюць грамы і маланкі. Украінцы мяркуюць, што “Ілля у вогняній колісниці їде, калачі везе, або метає стріли-блискавиці в нечисту силу” [12]. Беларусы дадаюць, што “ад хуткага бегу коней, на якіх Ілля раз’язджае па небе, губляецца падкова, падае ў ваду, і вада адразу ж робіцца халоднай” [16, с. 75]. Менавіта з дня Іллі народная традыцыя не рэкамендуе купацца ў рэчках і азёрах. Ва Украіне “дітям казали, що не можна купатися, "бо на спині верба виросте, "після Іллі купається лише свиня" [12]. Па народных уяўленнях Ілля – даволі суровы Святы, з маланкамі, перунамі, аднак ён таксама шчодра і клапатліва пасылае на зямлю дажджы, каб спрыяць ураджаю: *На Іллі лежить новий хліб на столі*; *Ілля заходить до хати, щоб свіжого хлібця скуштувати*" [12].

Ілюстрацыйны матэрыял паказвае, што ўкраінская мова захоўвае найменне прысвятка з падаўжэннем зычных у той час, як у беларускай мове назіраюцца варыянты: *Ілля, Ілья*. Падаўжэнне зычных у беларускай і ўкраінскай мовах выклікана наступнай за стратай рэдукаванага *ь* рэгрэсіўнай асіміляцыяй мяккіх зычных перад *j, які паступова прыпадабняўся да папярэдніх фанем, у выніку чаго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яны асіміляваліся, і на месцы спалучэння *зычны + ь + j* пачалі вымаўляцца падоўжаныя зычныя. Такая змена неўласцівая рускай мове, уплывам якой абумоўлена захаванне ў беларускіх гаворках варыянта без падаўжэння.

Беларуская і ўкраінская абраднасці захоўваюць не толькі рэлігійныя святы, якія часам удала зліліся з язычніцкімі абрадамі, але ўтрымлівае традыцыі, у якіх рэшткі язычніцтва выяўляюцца больш выпукла.

З часоў язычніцтва замацаваліся на Беларусі традыцыі Купалля. Свята адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня, называецца ў беларускіх гаворках *Купалле, Купала, Іван Купала* і мае трывалыя абрады, якія праводзяцца і зараз у некаторых рэгіёнах Беларусі: *На* ***Купала*** *цветок шукалі* (в. Прудоўка, Добр.); *Гадаць лучше ўсяго на коляды ці на* ***Івана Купалу*** (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.); *На* ***Купалле*** *касцёр палят і дзевачку адзеваюць вот здзесь у нас* (в. Івакі, Добр.); ***Іван Купала*** *сёмага будзе. Там лі вады будуць сабірацца, плаваць* (в. Івакі, Добр.); ***Купала*** *гуляюць красівенна, раней гулялі каля рэчкі* (в. Івакі, Добр.).

Безумоўна, у вызначэнні гэтага свята не абышлося без хрысціянства. У гэты дзень царква адзначала Нараджэнне Іана Хрысціцеля, і таму нават у намінацыі да язычніцкай назвы *Купала* далучылася імя *Іван*. Аднак з Купаллем звязана усё ж такі больш язычніцкіх традыцый. Свята прымеркавана да летняга сонцастаяння. У гонар сонца знакамітае купальскае вогнішча – вядомая ўсходнеславянская традыцыя скокаў маладых юнакоў і дзяўчат праз вялікі купальскі касцёр. І канешне, абавязковая лялька чалавека, часцей дзяўчыны, якую ў гэтую ноч купалі ў возеры і рацэ. З гэтага абраду – і назва *Купалле*. Гэтая лялька называлася *Купала, Купалка* або *Купалінка*. Часам рабілася і лялька хлопца, што зваўся *Купаліч:* ***Купаліч*** *– гэта хлопец на Купалле* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Украінская традыцыя таксама мяркуе двух персанажаў – *Купалу* і *Марэну*: “Спеціально до дня Купала хлопці та дівчата виготовляли ляльки-опудала *Купало* та *Марену*.. *Марена* являє собою зроблену із соломи ляльку, яку вдягають у жіночий одяг, *Купало* також виготовляється із соломи, але одяг на ньому чоловічий. *Марену*, відповідно, роблять дівчата, а *Купало* – хлопці. Цікаво, що походження ні того, ні іншого образів невідоме, зате відомо, що і *Купало* і *Марену* чекає трагічна розв'язка. Їх обох, або ж топлять, або ж спалюють” [7]. Адметныя найменні свята захоўваюць украінскія народныя купальскія песні: *Цєпер* ***Купайло****, а завтра* ***Йван****, Чорт кидав відзьму церез баркан. Ой ти,* ***Купайло****, дзє зімовало* [18, с. 212].

Неадрыўным ад Купальскай ночы з’яўляецца рамантычнае паданне пра кветку шчасця – Папараць-кветку, якая быццам бы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

квітнее толькі адну, гэту самую, купальскую, ноч, і таму абавязкова яе, гэтую цудадзейную кветачку, неабходна адшукаць апоўначы ў лесе.

Нездарма ўсходнеславянская купальская абраднасць натхняла пісьменнікаў і паэтаў. Так, малады паэт Іван Дамінікавіч Луцэвіч узяў сабе за творчае імя найменне абраду, што адбываўся падчас яго народзін, і менавіта пад імем Янка Купала стаў Народным паэтам Беларусі, класікам беларускай літаратуры і адным з заснавальнікаў беларускай літаратурнай мовы.

Для сельскай гаспадаркі лета – гэта перш за ўсё пара гарачая, таму што цёплае надвор'е дае магчымасць сабраць ураджай. Час пачатку жніва ў беларускіх гаворках называецца *зажынкі*. Напрыканцы жніва «дажыналі хлеб», апошні сноп захоўвалі ў доме пад іконамі. Паводле старажытных сялянскіх уяўленняў, гэта неабходна, каб і наступным годам быў ураджай. У дзень, калі дажынаўся апошні сноп, ладзіліся *дажынкі*: *Як канчаецца жніво, звязваюць бальшы сноп пшаніцы ці жыта і гуляюць* ***дажынкі****. Бывала, што ведзьмы ці русалкі звязвалі жыта. Ідзем жыта жаць на палоску, каласкі пазломаны-пазломаны, так кучкай. Ужо таго ня жнеш, нельзя. Ілі нагаворана што, ілі што яшчэ. Не жнеш, астаўляіш яго* (в. Старое Сяло, Ветк.). У. Даль прыводзіць наступныя найменні абраду: *вспожинки, госпожинки, дожинки, обжинки, оспожинки* [2, т. 4, с. 288].

Адметна, што старадаўні звычай захоўваўся ў савецкія часы, а асаблівае аднаўленне набыў зараз, калі адзначаецца ў Беларусі на дзяржаўным узроўні. У беларускіх гаворках захоўваецца некалькі найменняў абраду дажынак. Акрамя пашыранай назвы *дажынкі*, што супадае з лексемай літаратурнай мовы, ужываецца і лексема *дакопкі*. Гэта слова ў беларускіх гаворках іншы раз называе 'заканчэнне копкі бульбы': ***Дакопкі*** *спраўляем, калі ўсё да каліва пакопана* (в. Ручаёўка) [19, с. 96].

Узгаданы фактычны матэрыял дазваляе выявіць колькасна меншую, у параўнанні з іншымі, напрыклад, зімовым, каляндарнымі цыкламі, лексіка-тэматычную групу найменняў летніх свят народнага календара. Абрадавая лексіка звязана са зменамі ў жыцці прыроды і імкненнем чалавека ўздзейнічаць у сваіх інтарэсах на з'явы прыроды, прымусіць працаваць на сваю карысць. Некаторы спад «святочнай актыўнасці» летніх каляндарна-абрадавых рытуалаў тлумачыцца цеплынёй надвор'я, якая вымагае шматлікіх работ па гаспадарцы. Неабходна паспець зрабіць усё, каб сабраць добры ўраджай і мець магчымасць "гуляць і святкаваць" будучую доўгую зіму і вясну.

Прыведзены матэрыял сведчыць аб трывалым захаванні беларусамі і ўкраінцамі старадаўніх летніх звычаяў і абрадаў, якія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мінск - Інстытут мовы і літаратуры імя Я.Коласа

арганічна перапляліся з хрысціянскімі традыцыямі і зараз складаюць адно неразрыўнае цэлае. Даўнія традыцыі і іх найменні захаваліся ў большасці выпадкаў яшчэ з перыяду агульнаўсходнеславянскага адзінства і нават з дахрысціянскіх язычніцкіх часоў. Многія з указаных традыцыйных звычаяў настолькі замацаваліся ў нашай свядомасці, што набылі сучаснае пераасэнсаванне, заснаванае на старажытных вытоках. Лексіка летняга каляндарнага цыклу ўсходнеславянскіх народаў мае вялікую колькасць агульных найменняў, народжаную падобнымі кліматычнымі асаблівасцямі, агульнымі рэлігійнымі памкненнямі і прыкладна роўнымі сацыяльнымі ўмовамі жыцця. Падобныя лексемы на беларускай і ўкраінскай глебах звычайна трансфармуюцца ў адпаведнасці з адметнасцямі традыцыйнай агаласоўкі.

2.3.6 Пятроўкі ў беларускіх і рускіх гаворках

Народны каляндар усходніх славян заканамерна арыентаваны на прыродныя адметнасці тэрыторыі пражывання і блізка прымеркаваны да сельскагаспадарчых работ. Большая частка працы па сельскай гаспадарцы прыходзілася на лета, калі неабходна клапаціцца пра будучы ўраджай, каб напрацаваць магчымасць больш-менш прыстойна перажыць халодную і марозную зіму. Вядомае беларускае выслоўе – *Як дбаеш, так і маеш* – добра характарызуе адносіны нашых продкаў да летняй працы. І летнія святы і абрады абавязкова былі прымеркаваны да клопату пра будучы ўраджай.

На самую сярэдзіну лета, па новым стылі 12 ліпеня, па старым – 29 чэрвеня, прыпадае Дзень Святых Першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла. У даследаваннях каляндарнай абраднасці адзначаецца, што “Пятроў дзень быў значным святам для ўсіх усходнеславянскіх народаў, на якое пашыраліся ўсе гаспадарчыя забароны, вядомыя для двунадзясятых свят” [20].

У беларускіх гаворках захаваліся розныя найменні гэта дня:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пятрок [21, с. 70], а таксама фіксуецца двухслоўная канструкцыя *Пятроў дзень* [21, с. 72].

Адпаведныя намінацыі свята захоўвае народны каляндар рускіх гаворак: *Петр, Петрок*, хаця больш частым з'яўляецца словазлучэнне *Петров день*: ***Петров день*** *отпразднуют и пойдут косить. Это как старики. Сейчас косят и до праздника; В* ***Петров день*** *в там, где это было возможно, посещали храмы* [20]; *На* ***Петров день*** *кашу варили* [10, с. 122]. Суфіксальнае ўтварэнне адзначаецца ў народных выслоўях: *Пришел* ***Петрок*** *– оторвал листок* [20]. Прымаўка бытуе і на Беларусі: *Прыдзе* ***Пятро*** *– сарве лісток* (в. Хальч, Ветк.).

У беларускіх і рускіх гаворках адзначаюцца назвы, што ўзгадваюць імёны абодвух Святых, у гонар якіх прымеркавана свята: ***Пятро і Павел*** *будзе двенацатага іюля. Празьнік бальшы* (в. Грушаўка, Добр.); *Святы* ***Пётра*** *ў косы звоніць, а святы* ***Паўла*** *граблі робіць* [21, с. 69]; ***Пётр, Павел*** *день убавил;* ***Петръ и Павелъ*** *два прибавилъ* [2, т. 3, с. 106].

Аднак у беларускіх гаворках іншы раз адбываецца часавы падзел свят Пятра і Паўла, і свята Святога Паўла адзначаецца на наступны за Пятровым дзень, 13 ліпеня, а па старым стылі – 30 чэрвеня. Гэта – *Паўпятро, Паўлюк, Павел* – дзень талакі [21, с. 75]. Па ўяўленнях беларусаў, у гэты дзень "не дазвалялася працаваць ("грэх"), можна было толькі дапамагаць іншым, але не за плату, а за частаванне. Нават наймалі музыкаў. Паўпятроўская талака адлюстравана ў песнях: "*А што ў полі шуміць, гудзе? Шуміць, гудзе. Там талака дамоў гудзе...", "Святы Пётра талаку збіраў копы сена вазіць, стагі мятаць*" [21, с. 76]. Падзел свят захоўваўся нават у беларусаў, што перасяляліся ў іншыя рэгіёны. Гэты факт успамінаюць даследчыкі каляндарных абрадаў народаў Сібіры [20].

Пятроў дзень – макушка лета. Дзень звязаны з сонечнай сімволікай: *На* ***Петровъ день*** *солнышко играетъ* [2, т. 3, с. 106]. Па народных уяўленнях, гэты дзень – самы цёплы, "сонца гуляе, пераліваецца рознымі колерамі" [22]. Адлюстраванне сувязі Пятрова дня з сонцам паходзіць яшчэ з язычніцкім часоў. Спрадвеку лічылася, што так своеасабліва сонца гуляе двойчы на год: у дзень прыходу Ярылы, на Вялікдзень, ды ў дзень яго адыходу – у Пятроў дзень [22].

У вуснай народнай творчасці беларусаў і рускіх спрадвеку захоўваюцца прыказкі, якія прапануюць рэкамендацыі наконт гэтага дня: *Не хвались, баба, что зелено, а смотри, каковъ* ***Петровъ день*** [2, т. 3, с. 106]; *Калі зязюлька будзе кукаваць да* ***Пятра*** *– восень харошая, а калі на* ***Пятра*** *– лета доўгае і харошае, снег ня хутка выпадзе* [21, с. 70].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры гэтым у большасці выпадкаў парады арыентаваны на якасць і плён будучага ўраджаю: *Коли дождь на* ***Петровъ день****, то и сенокосъ будетъ мокрым; На* ***Святого Петра*** *дождь – жито будетъ какъ хвощъ; На* ***Святого Петра*** *дождь – урожай не худой, два дождя – хорошій, а три – богатый* [2, т. 3, с. 106]; *Да* ***Пятра*** *высушыш траву і пад кустом, а на* ***Пятра*** *не сохне і на кусце* [21, с. 64]; *Калі на* ***Пятра*** *пойдзе дождж – жыта, як хвошч; уродзіць мятліца – хлеба палавіца*; *зарадзіў званец – жыту канец* [21, с.70].

У многіх выслоўях *Пятро* супастаўляецца з іншымі значнымі днямі: *Спасовка – лакомка, Петровка – голодовка; Прошли Петровки – опало по листу, прошел Илья – опало и два; До Петрова взорать, до Ильина – заборонить, до Спаса – засеять* [2, т. 3, с. 106]; *На Івана* (21 мая) *каласок, а на Пятра піражок* [21, с. 61]; *На Яна нажала, на Пятра напякла* [21, с. 69]; *Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілля — ападуць два, а па Усіх Святых — ня будзе іх* [21, с.70].

Некаторыя выразы прапануюць рабіць больш аддаленыя прагнозы: *Па Калядах ясна – ясна й на Пятры* [21, с. 112]; *Калі на Пятра цёпла – зіма працягнецца да Вялікадня* [21, с. 30].

Дню Святых Пятра і Паўла папярэднічаў пост. У гаворках адзначаюцца яго варыянтныя найменні, што адрозніваюцца афіксацыяй прыметнікаў-азначэнняў: ***Пятроў пост*** *– пост перад святом Пятра і Паўла* (в. Хальч, Ветк.); *На* ***Пятроўскі пост*** *мала што елі* (в. Прудоўка, Добр.); *На* ***Пятроўскі пост*** *строгага паста не была, у сраду і пятніцу ня елі мяса* (в. Меркулавічы, Чач.); *Пост перад святам Пятра і Паўла* – ***Пятровски пост*** (в. Туры, Стол.). Такі самы прыметнік фіксуецца ў назве пярэдадня Пятроўскага паста – наступнай нядзеля пасля Троіцы, якая ў гаворках называецца *Пятроўскія запускі* [21, с. 69].

Беларускія гаворкі маюць і аднаслоўную назву паста: ***Пятроўка, Петравіца*** – *Пятроўскі пост* [21, с. 69]. Часта назва *Пятроўка* прымяняецца ў прыказках: ***Петроўка****-голодоўка, потому што старый хліб поелі, а нового не нажалі;* ***Петроўка*** *сушыць болота, а Спасоўка – рэкі; У* ***Пятроўку*** *Бог блюдзе рагожкі, а ў шубе вошкі; Хто ў* ***Пятроўку*** *сена не косіць, той зімою ў сабак просіць* [21, с. 69].

У рускіх гаворках для Пятроўскага паста ўжываюцца найменні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўсё – *кумаванне* ‘абранне сяброўак і сяброў’: *Кумаўё* ***кумяцца****. 12 іюня куміцеся, сабярыцеся, вазьміце і пасадзіце дзераўца зялёнае, нарадзіце яго, пастаўця на стале і ежу стаўця кругом яго* (в. Раманавічы, Гом.).

У традыцыях кумавання прасочваецца сувязь Пятровак і Троіцы. На Троіцу дзяўчаты ішлі ў лес, звівалі вянком суседнія галінкі бярозы і варажылі на іх: калі праз тыдзень галінкі застануцца свежымі, дзяўчыну чакае замужжа [21, с. 77]. Такія варожбы ладзіліся і на Пятроў дзень [20]. Кумаванне на Пятра можа адбывацца ў лесе, дзе на Троіцу завівалі вянкі: "У лесе распальваюць кастры, наладжваюць арэлі, танцы; гатуюць абавязкова яешню; прыносяць бліны, гарэлку. Калі на такую жаночую гулянку з’явяцца мужчыны, жанчыны зрываюць у іх шапкі і кідаюць у агонь” [21, с. 77].

Кумаванне іншы раз ладзіцца ў хаце: “Вечарам на Пятра дзяўчаты прыносяць гаспадыні сыр, масла, малако, яйкі, сала, муку на бліны. Гаспадыня з адной дзяўчынай гатуе, а астатнія спяваюць песні і танцуюць пад прыпеўкі. Хлопцы прыходзяць з гарэлкаю, і танцы робяцца жывейшымі. Запрашаюцца і музыкі, і адбываецца, такім чынам, поўнае ігрышча” [21, с. 77].

Падобныя абрады вядомы і рускім гаворкам, дзе захоўваюцца найменні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

слупамі. Пры пад'ёме ўверх і апусканні ўніз жанчыны павінны старацца, каб не раздуваліся спадніцы. Сядаюць звычайна папарна, мужчына з жанчынаю. За 15–20 абаротаў вала плаціцца ад кожнага сядзення пара яек або адна капейка. Тут жа пры арэлях на пляцоўцы размяшчаюцца музыкі са скрыпкамі і гармонікамі. Каля іх збіраецца кола аматараў патанцаваць і пагушкацца" [21, с. 70].

Такія самыя пацешныя забаўкі адбываюцца і ў некаторых рэгіёнах Расіі. У Варонежскай вобласці "*в этот день ставили качели*" [10, с. 225]. Цікава, што ў рускіх гаворках пры гэтым нават ужываецца лексема, сугучная з беларускай: *Катались на* ***кружилках, рельях*** *(качелях)* [10, с. 122]. Дарэчы, беларусізм сустракаецца ў рускіх гаворках памежных з Беларуссю Бранскай і Смаленскай абласцей: *А сердце мое бахается, как будто я качаюсе на*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Кліматычныя ўмовы тэрыторыі спрадвечнага пражывання ўсходніх славян патрабавалі адрознення гаспадарчых работ у залежнасці ад пары года. У выніку сфарміраваліся адрозныя паводле месцаў года каляндарна-абрадавыя традыцыі.

У абрадавым календары беларусаў, відаць, самай яскравай па святах і звычаях з'яўляецца зіма. Узімку амаль не было працы па гаспадарцы. Прырода «адпачывала», з часам менавіта зімой усходнія славяне пачалі святкаваць новы год, да чаго далучыліся і хрысціянскія звычаі Каляд (Нараджэнне Хрыстова). Вясёласць веснавых абрадаў народнага календара звязана з абуджэннем і аднаўленнем прыроды, а таксама з чаканнем Вялікага Паста і, безумоўна, святкаваннем Вялікадня. Улетку «актыўнасць» каляндарна-абрадавых рытуалаў тлумачыцца цеплынёй надвор'я, шматлікімі работамі па гаспадарцы.

Цікавыя і адметныя народныя традыцыі ў абрадавым календары беларусаў прыходзяцца і на восень. Восеньскія каляндарныя святы сімвалізавалі заканчэнне сельскагаспадарчага года.

Яшчэ ў канцы лета, напрыканцы жніва, «дажыналі хлеб» і апошні сноп захоўвалі ў доме пад іконамі. Паводле старажытных сялянскіх уяўленняў, гэта неабходна было, каб і наступным годам быў ураджай. А ў дзень, калі дажынаўся апошні сноп, ладзіліся дажынкі. Старадаўні звычай захоўваўся ў савецкія часы і адноўлены зараз.

Самая пашыраная назва абрадусупадае з лексемай літаратурнай мовы: ***Дажынкі*** *– старадаўні земляробчы звычай, звязаны з закончэннем жніва* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.). Ужываецца і лексема *дакопкі*: ***Дакопкі*** *ешчэ завуцца дажынкі* (в. Прудоўка, Добр.).

Вядомае свята восеньскага каляндарнага цыклу прыпадае на дзень 11 верасня. У гэты дзень паводле праваслаўнага календара адзначалася Адсячэнне (Усекнавенне) галавы Іана Хрысціцеля. Пра паводзіны ў гэты дзень у народным свядомасці захавалася шмат парад: нельга нічога рэзаць, рубіць капусту, працаваць пілой ці сякерай. Нават бульбу 11 верасня варылі "ў мундзірах". Лічылася, што ў мужчыны, які паголіцца ў гэта дзень, зранку забаліць галава.

У беларускіх гаворках сустракаюцца варыянты наймення свята:

Галавасек: Галавасек – *адзначаецца 11 верасня. У этат дзень нельзя было нічога рэзаць і сеч* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.); ***Галавасек*** *– праваслаўнае свята, калі забараняецца рэзаць і сячы, адзначаецца адзінаццатага верасня. Не рэзалі качаноў і баршча не варылі. Таго, што Іван не верыў у Бога. Яму галаву адсяклі. Казнілі яго. Качана ніхто не рэжа* (в. Хальч, Ветк.); ***Галавасек*** *– праваслаўнае свята, калі забараняецца рэзаць і сячы, адзначаецца адзінаццатага верасня. На Галавасек не крышуць качана* (в. Хальч, Ветк.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Галаварэз: ***Галаварэз*** *– свята, ў якое забаранялася секчы. Па-іншаму свята называецца Усекнавенне галавы Іана Прадцечы* (в. Покаць, Чач.); *На* ***Галаварэза*** *хадзілі ў цэркаў. Не елі нічога круглага, не шынкавалі, не засальвалі капусту* (в. Покаць, Чач.);

Іван Галавасек: *Эта казалі Ірадава дачка пажелала атсек самаму харошему прыслугу галаву. Прыняслі галаву, вот і* ***Іван Галавасек*** (в. Івакі Добр.); ***Галавасека Івана*** *празнавалі адзінацатава сенцабра* (в. Івакі, Добр.);

Іван Прэдцечы: *Ешчо этат празнік па цэркоўнаму* ***Іван Прэдцечы*** *называецца* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.).

У верасні адзначаецца і яшчэ адно свята, з'яўленне якога ў народным календары звязана з прыняццем і пашырэннем хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Гэта – Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы. Па этнаграфічных звестках даўней свята прыпадала на 8 верасня [20]. У сувязі з пераходам на новы стыль, у дзень 8 верасня Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы адзначаюць беларусы каталіцкага веравызнання. Адпаведна праваслаўнай традыцыі, свята прыпадае на 21 верасня.

У беларускіх гаворках гэты дзень завецца *Прачыстая*. Пры гэтым неабходна ўспомніць, што ў беларускіх вёсках Прачыстая адзначаецца не толькі 21 верасня, але 27 жніўня: ***Прачыстая*** *– праваслаўнае свята, якое адзначаецца два разы.* ***Першая Прачыстая*** *дваццаць сёмага жніўня,* ***другая Прачыстая*** *– дваццаць першага верасня* (в. Хальч, Ветк.). Па іншых звестках, свята адзначаецца 22 верасня: ***Прачыстае*** *– аброчны празнік дваццаць другога сенцября. Сабіраліся з другіх сёл, дзерівень і празнавалі два дні. Эта ў нас быў аброк дваццаць другога сенцября* (в. Хальч, Ветк.). Народ захаваў свае прыкметы на гэты дзень: ***Прячістая*** *любя чістае. Штоб на гародзе к* ***Прячістай*** *ўжо чыста, штоб ужо бульбу пакапалі* (в. Хальч, Ветк.).

Памянёнае найменне ў гаворках мае фанетычныя (з вымаўленнем мяккага [р'] і [ч']: ***Прячістая***) і марфалагічныя варыянты: ужываецца ў форме субстантываванага прыметніка жаночага (больш распаўсюджаны варыянт) і ніякага роду: ***Прачыстае*** *– праваслаўнае свята, якое адзначаецца два разы ў год. Першае* ***Прачыстае*** *дваццаць сёмага жніўня, другое – дваццаць першага верасня* (в. Хальч, Ветк.)

Напрыканцы верасня надыходзіць Узвіжанне. 27 верасня адзначаецца Уздвіжанне Чэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга. У гаворках сустракаюцца найменні свята: *Узвіжанне, Уздвіжанне, Здвіжанне*. Разнастайнасць варыянтаў выклікана цяжкасцю вымаўлення на беларускай глебе стараславянскай лексемы. Да гэтага дня народ прымеркаваў адлёт птушак у вырай, а таксама незвычайную актыўнасць змей, якія, паводле народных уяўленняў, менавіта ў гэты дзень

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

запаўзаюць у норы: *На* ***Узвіжанне*** *ў лес не нада хадзіць, ужы ўсе вылазяць, усе ўмесце. І тады ўжо ў норы залазяць* (в. Івакі, Добр.).

Асноўнае месца ў каляндарных святах восеньскага цыклу належыць Пакрову. Гэта вялікае праваслаўнае свята – Пакроў Прасвятой Багародзіцы Прэснадзевы Марыі. Пакроў адзначаецца 14 кастрычніка: ***Пакроў*** *эта празнік осенью. Счас с днём маці саўпадае* (в. Івакі, Добр.).

Яшчэ за некалькі дзён перад Пакровам у беларускім традыцыйным календары адзначаецца *Іван Пакроўны*. Гэты дзень таксама ў гаворках мае некалькі варыянтаў наймення: ***Іван Багаслоў (Іван Пакроўны)*** *адзначаецца дзявятага, дзясятага кастрычніка.* ***Іван Пакравіцель*** *адзначаецца таксама* (в. Старое Сяло, Ветк.).

Усходнія славяне здаўна лічылі Пакроў самым важным святам восені. Ужо сабраны ўраджай, гаспадары больш вольныя, каб сустрэць гасцей або нават ладзіць вяселлі дзецям. Пакроў станавіўся часам масавых шлюбаў. Часам шлюбныя святкаванні працягваліся да Піліпаўскага паста (27 лістапада).

Традыцыйна на беларускіх і рускіх землях у час Пакрова ладзіліся кірмашы. У наш час традыцыі кірмашоў і выстаў пад Пакроў аднавіліся ўжо на ўзроўні сучасных эканамічных тэндэнцый, калі многія галіны бізнесу збіраюць менавіта ў кастрычніку свае злёты, выставы і кірмашы, каб падвесці вынікі сезону, замацаваць створаныя сувязі, набыць новых бізнес-партнёраў, абмеркаваць планы на наступны год.

Беларусы захоўваюць адпаведныя прыкметы на 14 кастрычніка. Звычайна ў гэты дзень бывае халадней за папярэднія дні і чакаюць першага снегу. Назіранні людзей за восеньскімі змяненнямі ў прыродзе спарадзілі прыказку: *Прыйшоў Пакроў – не сагрэеш хату без дроў*. А па звестках этнографаў, у расійскіх вёсках «беларускія перасяленцы на Пакроў зрывалі рабіну і вешалі на іконы, каб на будучы год у гаспадарцы вадзіўся скот» [20].

22 кастрычніка адзначаецца свята Казанскай іконы Прасвятой Багародзіцы. У некаторых беларускіх мясцовасцях існуюць свае паданні і абрады, звязаныя з гэтай іконай і гэтым днём: *Казанскую ікону пераносілі, называлася свіча. Вот прымерна год эта свіча ў маёй хаці стаяла, а патом пераносілі ў другую. Яна ў рамкі такой. На ножках. Украшана ўсім. Ну ціпер у нас не носяць эту свячу* (в. Залужжа, Ветк.).

Называецца прысвятак *Казанская*: ***Казанская*** *– прысвятак народнага календара* (г. Ветка), а таксама *Казанка:* ***Казанка****, кажуць, калі-то дзеці запалілі і выгарыла ўсё Хальчо. Так ужо і сдзелалі празнік.* ***Казанка*** *– Божая ікона такая* (г. Ветка).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дні канца кастрычніка – пачатку лістапада ў беларускім народным календары звязаны з памінаннем продкаў. На 2 лістапада прыходзяцца *Дзяды (Дзеды): На* ***Дзеды*** *ходзяць на кладбішча, памінаюць, радзіцелей памінаюць* (в. Івакі, Добр.). У гэты дзень: *у цэркве адпраўляюць і на кладбішча ідуць к сваім родственікам на магілкі* (в. Хальч, Ветк.).

Восеньскія дзяды з'яўляюцца адметнасцю беларускага народнага календара і прыйшлі з каталіцкай традыцыі. Прыгадаем знакамітую паэму Адама Міцкевіча "Дзяды" ("Dziady"). Для восеньскага дня памінання ў беларускіх гаворках фіксуюцца назвы *Дзмітраўскія* і *Змітраўскія дзяды*, адзначаецца скарочанае найменне *Змітрок*.

У гэты дзень звычайна адбывалася рытуальная вячэра ў памяць памерлых продкаў: *Это помінаюць усіх. Дзяды ён называўся. Второго ноября помінаюць.* ***Дзмітроўскія дзяды*** (в. Меркулавічы, Чач.).

Часам сустракаецца памінанне і ў дзень 8 лістапада: ***Змітраўскія дзяды, Змітрок*** *– дзень памінання продкаў, які адзначаўся 8 лістапада. На кладбішча хадзілі. Дома гатавалі абед і прыглашалі сваіх радных, якія памерлі. Пасля таго, як паядуць, пад іконы стаілі чарку гарэлкі накрытую кусочкам хлеба і тарэлку з тым, што было на стале, каб прэдкі паелі* (в. Меркулавічы, Чач.).

Напрыканцы восені наступае Піліпаўскі пост, які працягваецца да Каляд і сведчыць ад паступовым надыходзе зімы, а з ёй – зімовых свят і прысвяткаў традыцыйнага народнага календара беларусаў.

Прыведзены матэрыял сведчыць аб захаванні многіх восеньскіх звычаяў і абрадаў беларусаў з перыяду агульнаўсходнеславянскага адзінства і нават з дахрысціянскіх язычніцкіх часоў. Такія абрады на працягу гісторыі ўсходнеславянскіх народаў арганічна перапляліся з хрысціянскімі традыцыямі і зараз складаюць адно неразрыўнае цэлае. Многія з традыцыйных звычаяў настолькі трывала замацаваліся ў нашай свядомасці, што набылі сваё сучаснае пераасэнсаванне, заснаванае на старажытных вытоках.

Большасць абрадаў восеньскага цыклу накіравана на захаванне і павелічэнне жыццёвых сіл зямлі і людзей. Каляндарна-абрадавая лексіка восеньскага цыклу ў асноўным матывуецца адпаведнымі рэлігійнымі найменнямі, пераважна стараславянскага (царкоўна-славянскага) паходжання. Падобныя лексемы на беларускай глебе звычайна трансфармуюцца ў адпаведнасці з адметнасцямі беларускай традыцыйнай агаласоўкі (*Галавасек, Галаварэз, Казанка, Пакроў, Піліпаўка, Прачыстая, Узвіжанне*).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2.3.8 Суфіксацыя ў дэрывацыі каляндарна-абрадавай лексікі гаворак беларуска-расійскага памежжа

Лінгвістычны зварот да гаворак Гомельшчыны паказаў цесныя міжмоўныя кантакты ў каляндарна-абрадавай лексіцы. Рэгіён знаходзіцца на памежжы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх тэрыторый, але ў першую чаргу ўражвае беларуска-рускае ўзаемадзенне, падмацаванае дзяржаўным білінгвізмам і большай інфармацыйнай нагрузкай рускай мовы ў штодзённым ужыванні беларусаў. Беларуска-рускае ўзаемадзеянне ў значнай меры праяўляецца ў словаўтварэнні каляндарна-абрадавых намінацый.

Пры даследаванні дэрывацыйных адметнасцей каляндарна-абрадавай лексікі беларуска-расійскага памежжа фіксуецца дастатковая колькасць вытворных адзінак, утвораных лексіка-марфалагічным спосабам. Шматлікія прааналізаваныя лексемы ўяўляюць сабой суфіксальныя ўтварэнні. У такіх адзінках вызначаецца разнастайнасць словаўтваральных мадэляў і словаўтваральных сродкаў.

Назіральна выдзяляюцца аддзеяслоўныя намінацыі з суфіксам *-ніj-*. Афікс царкоўна-славянскага паходжання на беларускай глебе перажыў рэдукцыю галоснага [і] і асіміляцыю зычнага з [j], вынікам чаго стала падаўжэнне зычных. Указаныя моўныя працэсы адзначаюцца ў найменнях *Адсячэнне (Усекнавенне), Крышчэнне, Нараджэнне, Стрэценне, Узвіжанне, Уздвіжанне, Здвіжанне*: *На* ***Крашчэнне*** *у храме крэсцят, асвяшчают вадзічку* (г. Ветка); ***Стрэценне –*** *свята перад масленіцай, калі зіма з летам сустракаецца* (в. Прудоўка, Добр.); *11 верасня –* ***Адсячэнне (Усекнавенне)*** *галавы Іана Хрысціцеля* (г. Добруш); ***Нараджэнне*** *Прэсвятой Багародзіцы – 21 верасня* (г. Рэчыца); *На* ***Узвіжанне*** *ў лес не нада хадзіць, ужы ўсе вылазяць, усе ўмесце* (в. Івакі, Добр.).

Змены ў суфіксе *-ніj-* пашырыліся і на найменні агульна-славянскага паходжання. Ад дзеяслова *абсяваць* з дапамогай указанага афікса ўтварылася назва *абсяванне,* ад дзеяслова *гадаць – гаданне:*: *На Ражаство хаты* ***абсяваць*** *нада. Абычна пастухі робяць* ***абсяванне****: абходзяць дама, з празнікам паздраўляюць* (г. Ветка); *Варылі на* ***гаданне*** *кашу ў махотцы ці глёку і стаўлялі на кут, лажылі сена на кут, а самі ішлі* ***гадаць****. Выходзілі ў двор, снімалі з сябе валенкі і кідалі цераз забор. Куды валенак ляжыць – у той бок пойдзеш замуж* (в. Стаўбун, Ветк.).

Такія самыя фанетычныя змяненні характарызуюць аддзеяслоўныя і адназоўнікавыя ўтварэнні з суфіксамі *-іj-, -j-* *Васілле, Купалле,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ушэсце: ***Ушэсце*** *адзначаецца у чацвер на шостым тыдні пасля Паскі. На* ***Ушэсце*** *карагод вадзілі* (в. Церахоўка, Добр.); *На* ***Купалле*** *касцёр палят і дзевачку адзеваюць* (в. Івакі, Добр.); *Чатырнаццатага –* ***Васілле****, эта зімовы празнік царкоўны* (в. Неглюбка, Ветк.).

У дэрывацыі аддзеяслоўных каляндарна-абрадавых найменняў удзельнічаў суфікс *-ств-*. У гаворках сустракаюцца варыянты *Ражаство*, *Раждество, Раждзество, Ражство, Раство*. Хаця для беларускай мовы больш характэрная назва *Каляды*, у гаворках беларуска-расійскага памежжа часцей фіксуюцца розныя прачытанні суфіксальнага царкоўна-славянскага ўтварэння.

У каляндарна-абрадавай лексіцы гаворак беларуска-расійскага памежжа фіксуюцца аддзеяслоўныя намінацыі, што ўтварыліся пры дапамозе ўласнабеларускіх сродкаў. Назва *шчадруха* ўтварылася ад дзеяслова *шчадраваць* пры дапамозе суфікса *-ух-*: *Две недзелі – эта тут Крышчэніе, Новы год і* ***шчадруха****. Тут ходзяць шчадраваць і песні пяюць усякія на* ***шчадруху*** (в. Старое Сяло, Ветк.).

Рознымі шляхамі адбывалася дэрывацыя аддзеяслоўных множналікавых назоўнікаў з суфіксам *-к-*. У адных выпадках гэты афікс далучаўся да ўтваральнай асновы, якая страчвала дзеяслоўныя суфіксы *-ва-* або *-а-*:

дакопкі – дакопваць: ***Дакопкі*** *ешчэ завуцца дажынкі* (в. Прудоўка, Добр.); ***Дакопкі*** *спраўляем, калі ўсё да каліва пакопана* (в. Ручаёўка) [19, с. 96];

дажынкі – дажынаць: Як канчаецца жніво, звязваюць бальшы сноп пшаніцы ці жыта і гуляюць ***дажынкі*** (в. Старое Сяло, Ветк.);

зажынкі – зажынаць: ***Зажынкі*** *звязаны з пачаткам жніва* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.);

калядкі – калядаваць: ***Калядкі*** *спяваюць, у нас ходзяць па дамам. Песні пяюць і мы ім канхветы і дзеньгі даём. А ну хтось сціхі красівыя чытае, а малыя, дак пляшуць* (г. Ветка);

шчадроўкі – шчадраваць: ***Шчадроўкі*** *адбываюцца кожны год пад Новы (Стары) год. Калі наступаў ранні вечар, ужо можна пачуць на вуліцах шчадроўныя песні* (в. Івакі, Добр.).

У іншых прыкладах суфікс *-к-* у субстантыве перайшоў з утваральнай асновы: *святкі – святкаваць*: *Две недзелі у нас называюцца* ***святкі*** (в. Старое Сяло, Ветк.).

Адметнай словаўтваральнай мадэллю з'яўляюцца вытворныя найменні з суфіксам *-іц-*. Гэты суфікс удзельнічаў ва ўтварэнні слоў ад розных часцін мовы і часта патрабаваў выкарыстанне інфіксаў. Паводле такой мадэлі вызначаюцца адпрыметнікавыя, аддзеяслоўныя і адлічэбнікавыя дэрываты:

лексема *Масленіца*, этымалагічна звязаная са словам *масла*,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

утварылася ад прыметніка *маслены.* Нездарма такую назву мае тыдзень, калі адзначаецца свята: *Раньше* ***Масленіцу*** *празнавалі: коней запрагалі, ездзілі па ўсой дзерэўні* (в. Івакі, Добр.); *Масленіца заканчвае* ***Маслены тыдзень*** (г. Рэчыца);

найменне *Радуніца (Радаўніца)* уяўляе сабой аддзеяслоўнае ўтварэнне ад *радаваць*: *Перед* ***радуніцай*** *усё убіраем на магілках, что б было красіва, акуратно* (в. Церахоўка, Добр.); *На* ***радаўніцу*** *да абеда плачуць – после абеда скачаць* (г. Добруш);

лексема *Троіца* паходзіць ад лічэбніка *тры*: ***Троіца*** *адзначаецца на 50-ты дзень пасля пасхі у нядзелю* (в. Буда-Люшаўская, Буда-Каш.); *На* ***тройцу*** *березкі прібівалі на кажды столб, любісцік занасілі. У хаце клен развешвалі, каб нячыстую сілу адганяў* (в. Церахоўка, Добр.).

Назвы ўдзельнікаў абрадаў часцей утвараюцца з дапамогай суфіксаў *-шчык, -нік, -оўнік, -оўшчык, -льнік,* што называюць асобу паводле абавязкаў:

калядоўшчык, каледоўшчык, каляднік: *Хадзілі на Каляды* ***калядоўшчыкі****, песні пелі, шуцілі, у вокны стукаліся, ім хазяева канфеты, грошы, булкі, калбасу давалі* (г. Ветка); ***Каледоўшчыкі*** *паюць ва ўвесь голас, ходзюць па хатам да шчадруюць.* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Мы называлі тых, хто каледуе,* ***каляднікі****.* (г. Ветка);

шчадроўшчык, шчадравальнік, шчадроўнік: *Ходзяць шчадруюць дзеці. Ім і дзеньгі дают. А раньшэ і старыя былі* ***шчадравальнікі****. Эта очэнь багаты дзень, бо людзі бліны пякуць, каўбасы робяць і выносяць тым, хто прыходзіць. Паздравляют* ***шчадроўшчыкі*** *людзей* (в. Насовічы, Добр.).

Акрамя субстантываў, суфіксальны спосаб утварэння характэрны і для дзеясловаў-найменняў каляндарна-абрадавых дзеянняў і працэсаў. Часцей гэта ўтварэнні з суфіксам *-ава-* ў інфінітыве і ў формах прошлага часу, які ў асабовых формах цяперашняга часу чаргуецца з суфіксам *-уj-*: ***Калядавалі*** *і ў нас раньшэ. Выбіраюць чалавека, рогі дзелаюць казіныя, шубу адзяюць. Прыходзя ў хату. Качаіцца па палу. Каза тая песні пяе і ёй доруць і грошы, і сала, і хлеп, усё* (в. Старое Сяло, Ветк.); ***Калядуюць*** *узрослыя, надзяваюць цыганскую адзежу, платкі, шырокія юпкі, шубы* (в. Старое Сяло, Ветк.); *Дзеткі у Раждзество гэты дзень ходзяць і* ***калядуюць****, песні прыгожыя спяваюць* (в. Церахоўка, Добр.); *На шчодрыкі па хатам хадзілі,* ***шчадравалі****. Была што і ў адной хаце можам шмат чаго ўзяць, а было, што нічога амаль не даюць* (в. Вуць, Добр.).

Разгледжаны матэрыял дае падставы сцвердзіць, што найменні абрадавага календара гаворак беларуска-расійскага памежжа

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомельскага рэгіёна паводле дэрывацыйных адметнасцей уяўляюць сабой спецыфічную частку слоўніка мовы. Колькасна выдзяляюцца суфіксальныя ўтварэнні. Большасць даследаваных адзінак вельмі старажытныя і зазналі ўплыў царкоўна-славянскай мовы, аднак за кошт штодзённага выкарыстання ў мове каляндарна-абрадавыя назвы перажылі змены, што сталі прыкметай іх трывалага замацавання ў маўленні жыхароў рэгіёна.

2.3.9 Кніжнаславянізмы ў каляндарна-абрадавай лексіцы ўсходнеславянскіх моў

Моўныя сувязі ўсходнеславянскіх народаў прыкметна выяўляюцца пры вывучэнні лексікі, звязанай з каляндарнымі абрадамі. У каляндарна-абрадавай лексіцы кожнага з ўсходнеславянскіх народаў існуе вялікая колькасць агульных найменняў, што абумоўлена падобнымі прыроднымі абставінамі, агульнымі рэлігійнымі памкненнямі і прыкладна роўнымі сацыяльнымі ўмовамі жыцця. Супастаўленне беларускіх, рускіх і ўкраінскіх каляндарна-абрадавых лексем дазваляе выявіць разам з агульнымі рысамі некаторыя адметнасці, самыя відавочныя з якіх абумоўлены рознымі адносінамі кожнай з усходнеславянскіх моў да царкоўна-славянскай лексікі.

У 9 ст. хрысціянства, якое прыйшло з Візантыі праз паўднёвых славян, прапанавала ўсходнім славянам рэлігійныя праваслаўныя абрады, святы, традыцыі з найменнямі, што ўзыходзілі да стараславянскай (кніжнаславянскай, царкоўна-славянскай) мовы. Усходнеславянскія мовы прайшлі доўгую адаптацыю паўднёва-славянскіх запазычанняў. У рускай мове другі паўднёваславянскі ўплыў 15–16 ст. замацаваў каляндарна-абрадавую лексіку са стараславянскімі каранямі. Для гаворак беларускай і ўкраінскай моў царкоўнаславянізмы засталіся нехарактэрнымі, што прывяло да ўзнікнення разнастайнасці варыянтаў намінацый абрадавага календара.

Семантычныя і фанетычныя ваганні мае ва ўсходнеславянскіх гаворках назва свята Нараджэння Хрыстова. Усходнеславянскія гаворкі ўтрымліваюць дзве назвы: *Рождество* і *Каляды*. У рускіх гаворках пераважае першы варыянт, які ўвайшоў у слоўнік літаратурнай мовы: *На* ***Рождество*** *разговлялись, курицу готовили, блинцы, холодец, квас* [10, с. 39]. Кніжна-славянская лексема з характэрным спалучэннем *жд* на месца праславянскага **dj* знайшла на глебе беларускіх гаворак варыянтнае прачытанне: *Раждество, Раждзество, Раждаство, Ражство, Раство*, *Ражаство, Раздво*. Фанетычна блізкая да апошняга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

варыянта назва ўкраінскай мовы *Різдво*.

Найменне з лацінскімі каранямі – *Каляды (Каляда)* – больш уласціва для беларускіх і ўкраінскіх гаворак: *Перад* ***Калядамі*** *ставілі куццю з розных круп* (г. Лоеў); *В Святах* ***Коляди*** *й Щедрого Вечера є основні складові Староукраїнської культури й релігії* [7]. Украінскія гаворкі маюць вышэйузгаданае складанае ўтварэнне дзвюх назваў *Різдво-Коляда.*

Словы *Коляда, колядовать, колядовщик* сустракаюцца ў рускіх гаворках і фальклоры [10, с. 43]. Разам з тым з семантыкай ‘наведваць дамы з магічнай мэтай віншавання і атрымання ад гаспадароў рытуальнай узнагароды’ рускія гаворкі фіксуюць назвы: *Христа славить*, *христославить*, *Рождество петь*: *мальчики – «звездари» ходили по домам задолго до рассвета: «Дяденька, можно* ***Христа пославить?****»; Бывало, как стукнеть двянадцать нощи, мама нас подымать и говорить: «Одевайтеся, болюшки, пора идти* ***христославить****!».. Придем ко двору и крищим: «Хозяева, пуститя* ***Похристославить****!» и они нас у дом зовуть* [24]. Захаванне назваў у рускай каляндарнай абрадавасці пры адсутнасці іх у беларускай і ўкраінскай абумоўлена большымі слядамі другога паўднёваславянскага ўплыву ў рускай культуры ў супрацьпастаўленасці ўплывам язычніцкай культуры ў беларускай і ўкраінскай традыцыях.

На карысць памянёных адметнасцей выяўленае ва ўкраінскім народным календары найменне *керечун* ‘навагоднее свята, звязанае з зімовым сонцастаяннем’ [8, с. 77]. Найменне захоўваецца ў мовах іншых еўрапейскіх народаў, тэрытарыяльна блізкіх да ўкраінцаў: так, у венграў *karacsony*

РЕПОЗИТОР

Ва ўкраінскай народнай традыцыі свята называецца *Богоявлення, Ардан, Йордан, Йордана, Ордана, Ордань, Відохрощі, Водохреща, Водохрища.* Фанетычная разнастайнасць абумоўлена перш за ўсё рознымі рэфлексамі ў гаворках старажытных рэдукаваных галосных [ь] і [и] у слове *крьст-*, ад якога і ўтварылася стараславянізм крещение.

Благавешчанне ў беларускіх гаворках называецца *Благавешчаніе* і *Дабравешчанне*. У рускай абрадавай лексіцы ўжываюцца назва *Благовещение* і варыянт са страчаным рэдукаваным [и] *Благовещенье* [10, с. 83]. Заканамерныя фанетычныя пераўтварэнні кніжнаславянізма адбываюцца ў назве ўкраінскіх гаворак *Благовіщення* [12, с. 196].

У беларускай каляндарнай традыцыі сустракаецца назва ***Звеставанне***. На большай тэрыторыі Беларусі свята супадае з гуканнем вясны. Захаваліся многія прыкметы адносна гэтага дня: *У **Звеставанне** мароз – пад кустом авёс. Калі ў дзень **Звеставання** вецер, іней і смуга да ўраджайнага года. Калі на **Звеставанне** неба бясхмарнае і сонца яркае – быць лету навальнічным. Калі на **Звеставанне** пойдзе дожджык – год будзе грыбны, а рыбаловы спадзяюцца на ўдалую лоўлю рыбы. На **Звеставанне** сонечны дзень – пшаніца ўродзіцца* [25].

Стараславянскае паходжанне маюць назвы прысвяткаў. Усходнеславянскія гаворкі паказваюць тэндэнцыю да народнага прачытання гэтых найменняў. Пры гэтым кожны з такіх дзён мае адметныя прыкметы, звычаі і забабоны.

Для дня памінання *Святога Васілія* ўсходнія славяне маюць варыянтныя па структуры назвы *Васілле, Васілей, Святое Васілле* (беларускія), *Василий, Васильев вечер* (рускія) [10, с. 48, 54], [24], *Василь, Василій* (украінскія) [7]. У гаворках Смаленшчыны фіксуюцца калядныя прыпеўкі, у якіх персаніфікаваны Мароз надзяляецца адпаведным імем па бацьку: *Мороз, Мороз **Васильевич**! Ходи кутью есть! Цепом голову проломлю, Метлой очи высеку!* [24].

Старажытнае *Влас* у беларускіх гаворках змянілася на *Аўлас, Улас, Улассе*.

Трансфармацыі на ўсходнеславянскай глебе адбыліся з найменнем Дня Святога *Георгія* Пераможца. У рускай каляндарнай абрадавасці знаходзяцца ўзгадкі пра *Егора* і *Ягория: **Егорий** с водой, а Микола с травой* [20]; *На **Ягория** нельзя работать, а то волк прореже скотину; На **Егорья** надо огород посадить до обеда* [10, с. 100]. Для ўкраінцаў больш уласцівак адзначэнне *Дня Юрія*: ***Святий Юрій** пасе корів, а Микола коней* [5]; *Скільки на Введіння води, стільки на **Юрія** трави* [12, с. 15]. У беларускіх гаворках прысвятак набыў назвы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Юр'я, *Юрай, Юр'еў дзень*. У. Даль указаны дзень называў *Егорій-вешній* і прыводзіў прыкметы і звычаі з фіксацыяй абодвух імёнаў: *Не* ***Егорьевой*** *неделе прилетъ ласточкамъ; Святой* ***Юрій*** *запасаетъ коровъ, а Никола коней; До Св.* ***Юрья*** *кормъ есть и у дурня; На* ***Юрья*** *пастуха окачиваютъ, чтобы во все лето не дремалъ; Въ поле стадо сгонять и* ***Егорья*** *окликать* [2, т. 1, с. 514].

Разгледжаны фактычны матэрыял паказвае адметнасці засваення царкоўна-славянскай каляндарна-абрадавай лексікі гаворкамі ўсходнеславянскіх моў. Прыйшоўшы да ўсходніх славян разам з праваслаўем, царкоўна-славянскія намінацыі каляндарных падзей трапілі пад уплыў мясцовых моўных рыс. Хаця транслітараваныя варыянты найменняў, якія перажылі фанетычна-арафаграфічныя змены, працягваюць актыўнае функцыянаванне (*Ражаство, Благавешчанне, Крашчэнне*), аднак падмацоўваецца яно перш за ўсё захаваннем ўказаных назваў у афіцыйным літаратурным ужытку. Народнае маўленне (беларускае, рускае, украінскае) прапануе свае спецыфічныя намінацыі каляндарна-абрадавых традыцый (*Вялікдзень, Вадохрышча, Звеставанне, Юрай, Аўлассе*). Адзначаныя найменні блізкія ці падобныя па гучанні ў кожнай з усходнеславянскіх моў, але разам з тым маюць і пэўныя адрозненні, што пацвярджае, што беларуская, руская і ўкраінская мовы паходзяць з аднаго кораня, маюць надзвычайную блізкасць, але развіваліся і развіваюцца як самастойныя моўныя сістэмы.

2.3.10 *Куцця* ва ўсходнеславянскай традыцыі

У багатай разнастайнасці старадаўніх народных традыцый усходніх славян асобнае месца займаюць абрадавыя ежа і напоі. Да большасці свят і абрадаў народнага календара і сямейных рытуалаў прымеркавана прыгатаванне і ўжыванне адметных страў. Некаторыя з іх маюць спецыфічную накіраванасць, гатуюцца па пэўных канкрэтных датах або з вызначанай нагоды, як, напрыклад, вясельны каравай, Велікодны тварог і фарбаваныя яйкі, а таксама мёд і яблыкі ў дні Спаса. Іншыя абрадавыя стравы пры вызначанасці і прымеркаванасці да адпаведных рытуалаў маюць месца падчас розных абрадаў. Яскравы прыклад падобнай абрадавай стравы – *куцця*. Трывалае захаванне ўсходнімі славянамі абраду і яго наймення разам з заканамернымі спецыфічнымі адметнасцямі, развітымі ў асобных усходнеславянскіх гаворках, стварае цікавасць для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

этналінгвістычнага вывучэння традыцый куцці.

Як абрадавая страва куцця ўяўляе сабой кашу, якая, у залежнасці ад нагоды, гатуецца з дабаўленнем розных прысмакаў. Ва ўсходнеславянскай традыцыйнай абраднасці выкарыстанне куцці перш за ўсё фіксуецца ў калядных абрадах і пахавальна-памінальным рытуале.

У беларускім народным календары вядомы тры куцці, прызначаныя да трох зімовых свят: перад Нараджэннем Хрыстовым, на Новы год, на Вадохрышча. На ўсе тры куцці ўважліва сачылі за надвор'ем. Народнае ўяўленне выявіла адпаведнасці: "Калі неба яснае і шмат зорак, то будзе ўраджай на грыбы; калі ідзе снег і мяцеліца, то будуць раі" [21, с. 20].

Паколькі гэтыя зімовыя святы непасрэдна звязаны з пастом, то прыгатаванне кожнай куцці мела адметнасці і адпаведныя найменні. Пры гэтым паводле наймення стравы ў беларускіх гаворках называецца ўвесь святочны абрад.

У ноч Нараджэння Хрыстова (6 студзеня па новым стылі, 25 снежня – па старым) куцця была абавязковай: *На Раждзество* ***куццю*** *варылі абязацельна. Называлі* ***раждзественская куцця*** (в. Івакі, Добр.); *Перад Ражеством –* ***галодная куцця****, гатовіца з алеями, пост таму што* (в. Туры, Стол.); *Первая – ета* ***бедная****, з макам, можна масла поснага палажыць. Карова была ў мяне, так стол еты бальшы я стаўляю туды далей перад іконаю, там пад ніз кладу сена, тады скацерку, тады кашу* (в. Чырвоны Бераг, Жлоб.); *Першая,* ***галодная, куцця*** *гатавалася ўвечары перад Калядамі. Таўклі ў ступе пшаніцу, а потым варылі ў печы. Да першай звязды нічога не елі, а потым пасцілалі на стол сена, накрывалі настольнікам,чыталі малітву і вячэралі* (в. Вятхінь, Рэч.); *Шостага чысла да ўсходу сонца ставілася* ***куцця****, далжна была быць* ***посная*** (в. Дземяхі, Рэч., перасяленцы з в. Гардзееўка, Бранск.).

Акрамя памянёных, першая куцця мела назвы *вялікая* і *марожаная* [21, с. 15]. Звычайна ладзілася сямейная вячэра, "лічылася: якая куцця, такі будзе і ўраджай; які дзень, такі будзе і год" [21, с. 15]. У Першую куццю асабліва сачылі за паводзінамі: "Не сварыліся, не пралі, хавалі кудзелі, грабяні, верацёны. У хату прыносілі сена, за сталом выклікалі "марозе". А на Віцебшчыне гаспадар адчыняў акно і гаварыў: *"Строк! А строк (авадзень)! Просім да куцці, толькі маіх коней (валоў) не кугуці"*. Падмяталі падлогу, а ў наступныя дні – не, каб быў чысты лён" [21, с. 15].

Першая куцця традыцыйна шанавалася беларусамі і за межамі краіны. У беларусаў Латвіі "стол для вячэры засцілаецца чыстым абрусам, пад які кладуць сена, што потым аддаюць жывёле; на стале

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пад абразамі абавязкова ставіцца міска з *куццёй*, прыгатаванай з пшанічнага зерня і падсалоджанай мёдам. Пасля вячэры з-пад абруса выцягваюць травінкі сена і па даўжыні іх мяркуюць пра будучы ўраджай лёну і каласавых; хто выцягне сучкаватую і тоўстую травінку, той будзе багатым. Варажба, пачаўшыся з *каляднай куцці*, ідзе цераз усе святы аж да Хрышчэння" [21, с. 112].

Другая куцця ладзілася пад Стары новы год: ***Другая, багатая, куцця*** *гатавалася вечарам перад Абразаннем Гасподнім 13 студзеня з мясам, таму і багатая* (в. Вятхінь, Рэч.); ***Другая куцця*** *магла быць з чым хочаш* (в. Дземяхі, Рэч., перасяленцы з в. Гардзееўка, Бранск.). Менавіта Другая куцця прыходзіцца на знакамітыя Шчодрыкі, адсюль – яе назвы *шчадроўная, шчадруха, шчодрая, сярэдні шчадрэц* [21, с. 20]. Адметнасці прыгатавання садзейнічалі найменням *багатая, мясная, нішчымная, скаромная, тоўстая,* якія сведчаць, што пераднавагодняя вячэра характарызавалася багаццем страў: "Гаспадар запрашаў за стол: "*Мароз, хадзі куццю есці. А летам не бувай, хвастом не віляй, бо будом пугою секці*" (Лельч.)" [21, с. 20]. У гэтыя дні адбывалася і ваджэнне казы, таму другую куццю часам называюць *куцця святога козліка* [21, с. 20].

Перад Вадохрышчам, 18 студзеня, рабілася Трэцяя куцця: ***Трэйцяя куцця*** *была посная* (в. Вятхінь, Рэч.); ***Крэшчэнская куцця****, катораю на Крэшчэнне варылі* (в. Івакі, Добр.). Назвы куцці абумоўлены яе тэрмінам, указваюць на адметнасці прыгатавання і сувязь Куцці з Вадохрышчам: *апошняя, ваданосная, вадапосце, вадзяная, вадзянка, вадзянуха, галодная, посная, хрышчэнская* [21, с. 24]. У гэты час "акраплялі вадою будынкі. У Магілёўскай губерні гаспадар "зваў марозе" з лыжкаю куцці: "*Мароз, мароз, хадзі куццю есць! І іржа і бель, хадзіце цяпер! А ўлетку к нам не бывайце, Хлеба нашага ня ўбівайце"*. У Віцебскай губерні прасілі мароза, каб не марозіў грэчку, ячмень, квасулю. У Гомельскім павеце, калі вымалі звараную куццю з печы, усе "кохалі", як курыца-квактуха. Дзеці залазілі пад стол і там "кохалі" і "кукарэкалі", маці сыпала ім семкі. Гэта рабілася для таго, каб выводзілася многа куранят, часцей куры нясліся і найболей было іх у гаспадарцы" [21, с. 24].

Добра вядома куцця зімоваму календару рускіх і ўкраінцаў. У рускай мове найменне мае агаласоўку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

удачней будет год у хозяев [10, с. 241].

Да святкавання Нараджэння Хрыстова куццю гатавалі ў многіх рэгіёнах Расіі. У данскіх казакоў “*канун праздника проводился в особо строгом посте. Этот день назывался* ***сочельником****, т.к. по церковному уставу в этот день полагалось употреблять в пищу* ***сочиво*** *(пшеницу с медом или послащенную сахаром – «****кутья****»)”* [24]. Асаблівыя адносіны меркаваліся да посуду з куццёй, які меў такую самую назву: *“На Дону в канун великого праздника, в красном углу, под образами, на чистой скатерти, на пучке сена или соломы стояла чаша с отваренными зернами пшеницы, политой медом и посыпанной изюмом (тоже* ***кутья****)”* [24].

У Варонежскай вобласці “*Калёда называлась* ***Голодная кутья*** *– варили перловую* ***кутью***” [10, с. 53]. Захаваліся звесткі пра зносіны хросных і хроснікаў у гэты дзень: *6 января –* ***Кутья****, вечером готовят специальное блюдо –* ***кутю*** *(рисовая или перловая каша с изюмом), и крестники носят это блюдо своим крестным* [10, с. 57].

Для прыгатавання куцці карысталіся і гарохам: *Перед рождеством, в Сочельник, накануне Крещенья, варили* ***кутью****: положат в горшок гороху, крупы толстые, посолят, сочней нарежут мелкохонько* [13, вып. 16, с. 178].

Куцця адзначаецца рускімі гаворкамі таксама падчас святкавання Вадохрышча: *“Вечер накануне Крещения назывался крещенским сочельником или вторым сочельником, а также канун Богоявления,* ***голодная кутья****. В этот день, как и в Рождественский сочельник, не ели до первой звезды. После появления на небе первой звездочки, ели только лишь* ***кутью****, потому-то она и получила название* ***голодная****”* [24].

Як паказваюць прыклады, для рускіх гаворак характэрныя спалучэнні з лексемай *кутья*: ***Богатая кутья*** *– канун Нового года, когда бывает богатое угощение;* ***Голодная кутья*** *– канун крещенья, когда ничего не едят, кроме нескольких ложек отваренной пшеницы;* ***Сытая кутья*** *– канун рождества, когда заканчивается пост и бывает богатое угощенье* [13, вып. 16, с. 179].

У гаворках Расіі, памежных з беларускімі рэгіёнамі, сустракаецца варыянт намінацыі з падаўжэннем зычных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не развілося і старажытная лексема

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***кутейник**, ни одной панихиды, не пропустит* [13, вып. 16, с. 172].

У якасці памінальнай стравы ўспрымае куццю праваслаўная царква. “Поўны царкоўна-славянскі слоўнік” прапануе сінонімы *Кутіа* –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– *не разбери-поймешь, ей-пра!* (Н. Ларионов. Тишина, 1925) [26].

Пашырэнне семантычнага напаўнення слова і фанетычныя варыянты наймення ў гаворках сведчаць аб старажытнасці лексемы на ўсходнеславянскай глебе. На думку М. Фасмера, слова

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Разгледжаныя выпадкі ўжывання лексемы *куцця* ў беларускай, рускай і ўкраінскай мовах паказваюць трывалае яе замацаванне гаворкамі, выкліканае захаваннем названых словам традыцый і абрадаў. Пры развіцці нацыянальных рыс старажытныя традыцыі куцці ў беларусаў, рускіх і ўкраінцаў застаюцца даволі блізкімі і падобнымі. Куцця ўяўляецца як страва памінальная з адметнай сімвалічнасцю і шчыльнай сувяззю з памінальнай абраднасцю.

Найменне *куцця* мае вытокамі грэчаскую мову. Трапіла да ўсходніх славян слова ў сувязі з пашырэннем хрысціянства і стала ўжывацца ў царкоўна-славянскіх і старажытнарускіх помніках у выглядзе *Кѹтї", Кѹти"*. Графічная выява *ї* сведчыць, што літарай абазначаны рэдукаваны галосны [і]. У часы змянення рэдукаваных галосны ў слабым ненаціскным становішчы скараціўся да *ь*, а пазней страціўся. Моўныя адметнасці ўсходнеславянскіх гаворак паўплывалі на ўзнікненне і захаванне варыянтаў агаласоўкі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6 Сосенко, Ксенофонт. Культурно-історична постать Староукраїнських свят Різдва і Щедрого Вечора / Ксенофонт Сосенко [Електронний ресурс]. – Режім доступу: www.pisni.org.ua. – Дата доступу: 29.09.2011.

7 Народні свята [Електронний ресурс]. – Режім доступу: http://www.sviato.in.ua. – Дата доступу: 29.09.2011

8 Курочкін, Олександр. Українці в сім'ї європейскій: звичаї, обряди, святи / Олександр Курочкін. – Київ: Видавництво "Бібліотек українця", 2004. – 246 с.

9 Сяменьчык, Я. Беларускія святы: Камаедзіца / Я. Сяменьчык [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://jivebelarus.net/our-heritage. – Дата доступа: 27.02.2012.

10 Календарные обряды и обрядовая поэзия Воронежской области. Афанасьевский сборник. Материалы и исследования. – Вып. III. / Сост. Пухова Т. Ф., Христова Г. П. – Воронеж: Изд-во ВГУ, 2005. – 249 с.

11 Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер. Т. 2: Е – Муж. / Пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 2-е изд., стер. – М. : Прогресс, 1986. – 672 с.

12 Воропай, Олекса. Звичаї нашого народу: Етнографічний нарис / Олекса Воропай. – Мюнхен: Українське видавництво, 1958. – 310 с.

13 Словарь русских народных говоров: в 42 вып. / под ред. Ф. П. Филина [гл. ред.]. Вып. 1: А. – Ленинград: Наука, 1965. – 303 с. Вып. 14: Кобзарик-Корточки. – Ленинград: Наука, 1978. – 376 с. Вып. 16: Куделя-Лесной. – Ленинград: Наука, 1980. – 376 с.

14 Скуратівський, Василь. Дідух: Свята українського народу / Василь Скуратівський [Електронний ресурс]. – Режім доступу: http:// www.sviato.in.ua. – Дата доступу: 15.03.2013.

15 Кушерець Лідія. Трійця. Зелені свята / Лідія Кушерець [Електронний ресурс]. – Режім доступу : http://www.artvertep.dp.ua/ celebrates. – Дата доступу : 29.09.2011.

16 Коваль, У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы : Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. – Гомель : Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.

17 Довбуш, Олекса Трійця / Олекса Довбуш [Електронний ресурс]. – Режім доступу: http://www.artvertep.dp.ua/celebrates. – Дата доступу: 29.09.2011.

18 Музичний фольклор з Полісся у запісах Ф. Колесси та К. Мошинського / Упоряд., вступ. ст. прим., пер. з пол. С. Й. Грици. – К. : Муз. Україна, 1995. – 432 с.

19 Янкова, Т. С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны / Т. С. Янкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 432 с.

20 Фурсова Е. Ф. Календарные обряды [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sati.archaeology.nsc.ru. – Дата доступа: 20.01.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

21 Беларускі народны каляндар / аўтар-ўклад. Алесь Лозка. – Мінск: Полымя, 1993. – 117 с.

22 Петров день (Петровки) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://eternaltown.com.ua. – Дата доступа: 6.09.2014.

23 Расторгуев, П. А. Словарь народных говоров Западной Брянщины (Материалы для истории словарного состава говоров). – Минск: Наука и техника, 1973. – 296 с.

24 Костина, Л. П. Обряды зимнего календарного цикла / Л. П. Костина [Электронный ресурс]. – Рэжим доступа : http: www.razdory-museum.ru. – Дата доступа : 20.01.2013.

25 Звеставанне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://spadchyna.net. – Дата доступа : 18.10.2013.

26 Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ruscorpora.ru. – Дата доступа: 27.05.2014.

27 Полный церковно-славянскій словарь / сост. Григорій Дьяченко. – С-Пб., 1897. – 1120 с.

28 Срезневскій, И. И. Матеріалы для словаря древне-русскаго языка: в 3 т. / И. И. Срезневскій. Т. 1 : А – К. – С-Пб. : Типографія Императорской Академіи наукъ, 1893. – 771 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А. М. Воінава, К. Л. Хазанава

3 Абрадавая лексіка ў літаратурных творах

Адным з самых актуальных і перспектыўных напрамкаў сучасных навуковых даследаванняў з'яўляецца вывучэнне духоўнай спадчыны народа. Этналінгвістычны падыход, які аб'ядноўвае этнаграфію, фальклор і мовазнаўства, дазваляе разглядаць мову ў цэлым, а таксама мову кожнага пісьменніка праз прызму традыцыйнай народнай духоўнай культуры. У аснову ўказанага падыходу пакладзена формула "мова + культура", якая па-рознаму праяўляецца ў творах канкрэтнага аўтара. Надзвычай цікавым аб'ектам даследавання з'яўляецца творчасць выдатных паэтаў і публіцыстаў, якія стаялі ля вытокаў фарміравання нацыянальнай беларускай мове. У іх творчасці знайшла адлюстраванне багатая духоўная культура ўсходнеславянскіх народаў.

У кантэксце ўзаемазвязанага вывучэння мовы і культуры беларускага народа аб'ектам увагі становяцца культурна афарбаваныя моўныя адзінкі – лексемы, якія з'яўляюцца прадуктам кумулятыўнай функцыі мовы. У такіх адзінках дастаткова дакладна адлюстраваны дыялектныя рысы і многія асаблівасці беларускай гаворкі. У некаторых словах этнаграфічная інфармацыя для сучаснага носьбіта мовы з'яўляецца імпліцытнай, прыхаванай і можа быць атрымана толькі апасродкавана, але яна ёсць і працуе на ўзроўні падсвядомасці.

Зварот да народнай культуры ў прагматычны час 20 стагоддзя меў і, безумоўна, мае зараз, у такім зменлівым і мітуслівым 21 стагоддзі, выключнае значэнне для духоўнага развіцця грамадства, адраджэння многіх страчаных эстэтычных ідэалаў. Беларуская матэрыяльная і духоўная культура ўяўляе сабой яскравае сведчанне самабытнасці і непаўторнасці нашага народа. Захаваная праз стагоддзі для нас, яна патрабуе асаблівай увагі і клопату, бо мусіць перадацца нашчадкам як свайго роду запавет духоўных і матэрыяльных прынцыпаў існавання ў гэтым сусвеце. Творчая інтэлігенцыя ў асобах пісьменнікаў, навукоўцаў, настаўнікаў уяўляе сабой захавальнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры народа і "перадавальнікаў" яе будучым пакаленням.

3.1 Беларуская абрадавая лексіка ў выданнях Францыска Скарыны

Францыск Скарына захаваўся ў гісторыі беларускай культуры ўвогуле і гісторыі беларускага пісьменства ў прыватнасці як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

усходнеславянскі першадрукар і прапагандыст слова беларускага ў рэлігійных творах 16–17 ст. Славуты палачанін, на думку даследчыкаў мовы яго выданняў, захаваў царкоўнаславянскую моўную аснову, але “насыціў іх беларускімі моўнымі сродкам ў такой меры, што яго мова заняла самае крайняе становішча ў беларускай рэдакцыі царкоўна-славянскай мовы і фактычна аказалася прамежкавым звяном у працэсе пераходу ад царкоўнаславянскай мовы да непасрэдна беларускай у сферы рэлігійнай літаратуры” [1, с. 33].

Свае кнігі асветнік адрасаваў люду простаму, “посполитому”, і таму натуральна, што ў мове Скарынавых тэкстаў адзначаюцца не толькі прыкметы “беларуска-іншаславянскага сінкрэтызму” [1, с. 3], але лексічныя беларусізмы, сярод якіх выдзяляецца лексіка-семантычная група абрадавай лексікі.

У абрадавую лексіку ўваходзяць найменні абрадаў, звычаяў, традыцый, рытуалаў. Указаныя найменні падзяляюцца на дзве вялікія групы: каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя лексемы.

Лексіка каляндарнай абраднасці непасрэдна звязана з найменнем разнастайных дат, свят, прысвяткаў. Пра ўжыванне Ф. Скарынам некаторых каляндарных лексем дае ўяўленне “Шасцідневец” – адно з выданняў, што ўвайшло ў знакамітую “Малую падарожную кніжыцу”: *Шgстоднgвgць кратъкій навси нgдgлю поченти ^сиботы, по wбычаю всgхъ восточнихъ цgрквий* [2, с. 107].

У назве выдання першадрукар ужыў слова *неделя* з семантыкай ‘тыдзень’. У тэксце твора тая самая лексема ўжо мае семантыку ‘сёмы дзень тыдня’: ***внgдgлю*** *итрgн"* [2, с. 127]; ***внgдgлю*** *наwбgдніи* [2, с. 131]; ***внgдgлю*** *вgчgръ* [2, с. 139]. Такім чынам, полацкі першадрукар пазбегнуў ужывання царкоўнаславянізма *воскресение* ‘сёмы дзень тыдня’.

Аднак лексема *воскресение* ў яе царкоўна-рэлігійным значэнні ў выданнях Ф. Скарыны сустракаецца часта: *проповgдати изъмртвых* ***воскрgсgние*** *инанgбgсaхъ вознgсgние* [2, с. 130–131]; *Тамо ест великая тайна о Бозе в Троици Едином.. и о* ***воскресении*** *его из мертвых* (Прадмова да Псалтыра) [3, с. 154]; *Стихами и гаданием е пишеть и о* ***воскресении*** *тел наших из мертвых наясней пророкуеть* (Прадмова да ўсёй Бібліі) [3, с. 65]; *Іона, сын Амафов, той три дни сущи во чреве китове, тридневное Христово* ***воскресение*** *преобразовал, – пятый* (Прадмова да ўсёй Бібліі) [3, с. 67].

Ф. Скарына прапанаваў і назвы іншых дзён тыдня ў адпаведнасці з беларускай моўнай традыцыяй: *понgдgлокъ* [2, с. 145], *второкъ*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[2, с. 149], *чдтвдрътокъ* [2, с. 163], п"*токъ* [2, с. 173]. Пры гэтым неабходна заўважыць, што для серады выдавец пакінуў кніжна-славянскую няпоўнагалосную форму: *Во среди* [2, с. 157].

У “Саборніку” – іншым выданні, пададзеным Ф. Скарынам у “Малой падарожнай кніжыцы” – змешчаны тагачасныя беларускія назвы месяцаў: *врдсднь, листопадъ, груднь, прасиндць, стычднь, люты, мардць, квдтднь, маї, чірвдць, ліпдць, сдрпднь* [2, с. 182–205]. Паралельна з беларускімі выдавец прапанаваў назвы месяцаў грэчаскага і лацінскага паходжання, замацаваныя ў праваслаўнай традыцый (*сдптдвриї, ѡктовриї, нодмвриї, ддкавриї, гдниарь, фдвраль, мартъ, апріль, маї, їюнь, чірвдць, їюль, ліпдць, авгистъ, сдрпднь* [2, с. 182–205]), але перад беларускімі лексемы Ф. Скарына пазначыў *зовдмы, рдкомы*, паказаўшы, што больш роднымі, сваімі для яго і мяркуемых чытачоў, з’яўляюцца беларускія найменні.

Заўважым, што “Малую падарожную кніжыцу” Ф. Скарына выдаў не пазней за 1522 год у Вільні. Пры падрыхтоўцы да выдання частак Бібліі ў Празе ў 1517–1519 гадах у прадмовах і пасляслоўях выдавец для ўказання даты напісання і выдання твора выкарыстаў агульнапрынятыя царкоўнаславянскія найменні месяцаў: *Божиею милостию доконана ест сия книга.. в славном старом месте Празском под лѣты пречистаго божиего из девици Марии нарожения тысещнаго пятьсотаго и осмънадесятаго мѣсеца* ***генуаря*** *дня втораго* (Пасляслоўе да кнігі прамудрага цара Саламона, якая называецца “Еклесіяст або саборнік”) [3, с. 30]; *А совѣршена ест.. в вѣликом старом месте Празском под лѣты нарожения сына божия тысеща пятьсот і осмънадесеть мѣсеца* ***генуаря*** *дня девятого* (Пасляслоўе да кнігі “Песня песням”) [3, с. 34].

Дарэчы, варыянтнае ўжыванне назваў месяцаў было характэрным для мовы помнікаў старабеларускай пісьмовасці. Падобныя паралельныя варыянты сустракаюцца ў мове “Дзённіка” Фёдара Еўлашоўскага, дзе беларускія адзінкі ўжо маюць значныя сляды ўплыву польскага мовы *генваръ, февраль, июль, августъ, септембръ, ѡктобръ, новембръ, декабръ – стычень, лютый, марецъ, кветень, червецъ, липецъ, серпень, вресень, паздерникъ, листопадъ, кгрудень* [4, с. 341].

Пры апісанні каляндарных рэлігійных свят Ф. Скарына ў большай меры арыентуецца на кніжнаславянскую традыцыю: ***Покровъ***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прꙋсты# богородіцꙋ [2, с. 184]; ***Прꙋображꙋніе*** *гда бога нашꙋго їса х^с^та* [2, с. 204]; ***Оуспꙋніе*** *прꙋсвты# богородицꙋ* [2, с. 205]; ***Благовꙋтꙋніе*** *прꙋч^с^ты# владычицꙋ нашꙋ# богородицꙋ присно дꙋвы марїи* [2, с. 196].

Для абазначэння некаторых значных свят царкоўнага календара Ф. Скарына звярнуўся для беларускай народнай традыцыі і падаў варыянтныя найменні. Так адбываецца ў "Пасхаліі" – календары, які выдавец размясціў у "Малой падарожнай кніжыцы". У мове календара ў стылістычна і семантычна роўных умовах ужываюцца лексемы *Пасха* і *Вялікдзень*: ***пасха*** *хр^с^тва на април#* [2, с. 210]; *хрꙋстианом* ***пасха*** *гі април#* [2, с. 212]; *Благовꙋт в суботу ꙋ нꙋдꙋ поста* ***вꙋликъдꙋнь*** *д април#* [2, с. 213]; ***вꙋликъ дꙋнь*** *гі април#* [2, с. 214]; ***вꙋликдꙋнь*** *si април#* [2, с. 216]. Прыклады сведчаць аб дапушчэнні Ф. Скарынам разнастайнасці варыянтаў беларускага каляндарна-абрадавай лексемы. Слова пішацца з захаваннем слабога рэдукаванага ъ паміж зычнымі і без яго: ***вꙋликъдꙋнь*** і ***вꙋликдꙋнь***. Сустракаюцца і асобныя напісанні частак кампазіта: ***вꙋликъ дꙋнь.*** Апошняе напісанне добра пазначае паходжанне назвы са спалучэння кароткага прыметніка і назоўніка.

Найменні *Вялікдзень* і *Пасха* настолькі трывала замацаваліся ў народным уяўленні беларусаў, што і да нашых часоў у беларускіх гаворках лексемы функцыянуюць раўнапраўна для наймення свята Уваскрэсення Хрыста.

Нагадаем, што ў некаторых беларускіх гаворках, напрыклад, у Гомельскай вобласці, адзначаецца фанетычны варыянт, даволі блізкі па гучанні да раманскіх моў: ***Паска –*** *дзень, у які уваскрэс Хрыстос. Яяк накрасім, паскі напячом. Страў розных нагатуем ды і гуляем дзень* (в. Церахоўка, Добр.) [5]; *Хто как называйет, патаму што ў нас в дзеревне ўже людзі пріежают. Хто* ***Пасха****, Хто* ***Паска*** *называют* (в. Івакі, Добр.); ***Паска*** *– бальшы празнік* (г. Добруш).

Заўважым таксама, што ў гаворках найменне *Пасха (Паска)* мае і традыцыйнае страва, што гатуецца ў гэты святочны дзень. Прычым на Гомельшчыне так называюцца абодва традыцыйныя пачастункі: і пірог, што робіцца з мукі і яек, які часта фіксуецца пад назвамі *булка* ці *куліч*, і выраб з тварагу, свежага ці запечанага, з дабаўленнем яек, масла, разынкаў, курагі, карыцы і іншай смакаты: ***Паска – булка,*** *якую пякуць с суботы на пасхальную нядзелю. Пекць паску будзем, не* ***кулічы*** (в. Церахоўка, Добр.); *На Вялікдзень* ***пасху*** *пяклі* (г. Добруш);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Кулічы *пяклі* (г. Добруш); *С творага пячэцца тварожная паска. У печы запекаецца* (в. Грушаўка, Добр.); ***Твораг*** *– страва на Вялікдзень* (г. Добруш).

У прадмовах да выданняў Ф. Скарыны адзначаецца і сямейна-абрадавая лексіка, што называе падзеі і рэаліі сямейнага жыцця: нараджэнне, хрышчэнне, сватанне, вяселле, пахаванне, памінкі і інш.

Пры звароце да сямейна-абрадавай лексікі выдавец прыцягвае і царкоўнаславянскія моўныя элементы, і лексічныя адзінкі, што выкарыстоўваюцца ў беларускай народнай традыцыі: *И яко* ***жених*** *со* ***дружиною*** *своею тако сын божий со апостолы своими* ***брак*** *духовный с церковию и со избранными ея тридесят и полъчетверта лета деяше..* (Прадмова да “Песні песням”) [3, с. 31]. Нават пры выкарыстанні алегорый, крыніцай якіх яскрава праступаюць Біблейскія тэксты, Ф. Скарына не пакідае па-за ўвагай народныя традыцыі, і тэксты прадмоў стварае шляхам арганічнага злучэння народна-традыцыйных беларускіх рыс з агульнай царкоўна-рэлігійнай стылістыкай твора: *Яко же на* ***браку*** *бывають разноличьные твари первая ест* ***жених*** *вторая* ***невеста*** *третии суть* ***друзи жениховы****, а четъвертыи* ***дружина невестина*** *тако же и во книзе сей четыри гласы черленым писмом вкупе розмолвяющие написаны суть* [3, с. 31].

Праведзеныя назіранні над лексікай каляндарных і сямейных абрадаў у выданнях Ф. Скарыны паказваюць, што беларускі першадрукар імкнуўся напоўніць мову рэлігійных твораў адметнасцямі беларускай жывой народнай мовы. Больш паспяхова гэта атрымалася ў тэкстах неканонічных твораў, не звязаных з царкоўнаславянскімі крыніцамі.

3.2 Адлюстраванне старажытных уяўленняў і абрадавых традыцый усходніх славян у творчай спадчыне Максіма Багдановіча

Максім Багдановіч – паэт, пісьменнік, публіцыст, які непасрэдна фарміраваў і плённа развіваў беларускую літаратуру на пачатку 20 ст. і тым самым стаяў ля вытокаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Ад іншых дзеячаў беларускага адраджэння і пісьменнікаў пачатку 20 ст. ён адрозніваецца перш за ўсё тым, што дзіцячыя і юнацкія гады будучага класіка беларускай літаратуры прайшлі далёка ад Беларусі, на волжскіх берагах Ніжняга Ноўгарада. Аднак ужо з самага дзяцінства Максіма літаральна акружала найбагацейшая

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

культура як усходніх славян увогуле, так і беларусаў, у прыватнасці. Шматлікія працы і слушныя даследаванні бацькі паэта – этнографа, фалькларыста, вядомага даследчыка ўсходнеславянскай вусна-паэтычнай народнай творчасці Адама Ягоравіча Багдановіча не маглі не паўплываць на свядомасць Максіма і адлюстраваліся ў будучых паэтычных творах.

У вершах паэта адзначаецца своеасаблівае ўспрыманне акаляючай прыроды. Як і ў фальклоры, прыродныя рэаліі ў М. Багдановіча часта персаніфікуюцца, надзяляюцца чалавечымі якасцямі. Паэт быццам адчувае прыроду, размаўляе з раслінамі, разумее іх жыццё: *..і толькі* ***бярозы*** *шапталісь, Толькі* ***асіны*** *шумелі, і толькі* ***калоссі,*** *Ў полі шырокім качаясь, зямлю цалавалі* (“Ноч”) [6, т. 1, с. 200]; *На магіле адзінока* ***Каліна*** *расце* (“Над магілай”) [6, т. 1, с. 196]; *Хмурыя, цёмныя гудзяць і шэпчуць* ***елі****.. Ноч ідзе: месяц тонкі, белы выплывае Там, дзе падняла* ***ель*** *зялёны свой крыж* (“Хмурыя, цёмныя гудзяць і шэпчуць елі”) [6, т. 1, с. 204]; *Падымалі крыжы ў неба* ***елі*** (“Хрэсьбіны лесуна”) [6, т. 1, с. 208].

М. Багдановіч плённа і творча апрацоўвае папулярны фальклорны прыём вобразнага паралелізму, заснаваны на параўнанні жыцця людзей і прыроды: *"Сцежка ў полі пралягае траўкай зарастае. Каля сцежкі пахіліўся* ***явар*** *да* ***каліны****, — Там кахаліся калісь-то хлопец і дзяўчына Ой, ішла дарога долам, ды ішла і горкай, — Не схавалася дзяўчына ад тэй долі горкай: — Бо ляжыць яе дарожка, траўкай зарастае; Сумна глянуць, цяжка бачыць, жаль душу праймае"* (“Сумна мне..”) [6, т. 1, с. 81].

Асобая трапяткая ўвага ў вершах паэта назіраецца да кветак: *Так марылі* ***астры*** *і ждалі вясны* (“Астры”) [6, т. 1, с. 194]. Але самым вядомым у творчасці М. Багдановіча з’яўляецца васілёк: *Аж бачу – мне сіняй галоўкай ківае Наш родны, забыты ў цяні* ***васілёк****. «Здароў будзь, зямляча!»* (“На чужыне”) [6, т. 1, с. 201]. Пры гэтым паэт не ўжыў беларускую лексему *валошка*, а карыстаўся агульнаўсходнеславянскім словам *васілёк*, што не проста з’яўляецца вынікам моўных пошукаў маладога паэта пачатку 20 ст., абумоўленым неўнармаванасцю тагачаснай беларускай літаратурнай мовы, а сведчыць аб імкненні аўтара ўспрымаць культуру беларусаў ва ўсходнеславянскім кантэксце.

Менавіта дзякуючы знакамітым радкам гэта кветка з часам стала ўспрымацца сімвалам Беларусі і зараз атаясамліваецца з краінай. А распачаў гэту традыцыю ў пачатку 20 ст. М. Багдановіч: *І тчэ забыўшыся рука Замест персідскага узора Цвяток радзімы* ***васілька*** (“Слуцкія ткачыхі”) [6, т. 1, с. 90].

У паняцце традыцыйнай духоўнай культуры арганічна ўваходзяць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

народныя вераванні і ўяўленне прыроды як жывога арганізма, які не толькі жыве самастойным жыццём, але і напоўнены разнастайнымі духамі. “Для ўсходніх славян і зараз не існуе неадушаўлёных прадметаў: яны вераць, што камні растуць, дрэвы размаўляюць, зоркі прыглядваюцца да лёсаў людзей. Такая персаніфікацыя не проста паэтычныя вобразы, людзі глыбока вераць у гэта”, – сцвярджае вядомы этнограф Д. К. Зяленін [7, с. 411].

Вершаваная творчасць М. Багдановіча дае прыклады ведання і зацікаўленасці паэта старажытнай усходнеславянскай міфалогіяй. У творчасці М. Багдановіча сустракаюцца ўзгадкі міфалагічных персанажаў: *Вадзянік, Лясун, Русалка.*

Самым блізкім да чалавека па сваёй прыродзе лічыўся *Лясун*. У беларускай мове яшчэ сустракаецца яго “імя” *Лесавік*, у рускай мове гэты персанаж завецца *Леший, Лешак, Лесной, Лесник, Лесовой, Лес, Боровик*, а ва ўкраінскай – *Лісовік*. Ад людзей ён адрозніваўся толькі тым, што мае сінюю кроў, няма ні брывоў, ні расніц і ён не адкідвае ценю. Ён можа па сваёй волі павялічвацца ці памяншацца: у лесе ён становіцца ростам з лес, у полі – з траву [8, с. 102].

У павер’ях усходніх славян *Лясун* паўстае як “стары чалавек вялікага росту з белым, як бяроста, тварам, з вялікімі вачыма, у звярынай шкуры” [8, с. 102]. Часам лічылася, што ў *Лесуна* “доўгі сплюшчаны наперад твар, востраканечная галава, клінападобная барада, толькі адно вока і адна нага, пяткаю наперад” [8, с. 102].

М. Багдановіч прапанаваў сваё ўласнае бачанне гэтай істоты. Указанаму міфалагічнаму ўсходнеславянскаму персанажу прысвечана нізка вершаў: *На моху між спелай брусніцы* ***Лясун*** *адзінокі ляжыць* (“Лясун”) [6, т. 1, с. 215]; *Ўсё здаецца: ўстаў* ***лясун*** *вялікі* (“Пугач”) [6, т. 1, с. 212].

Паэт вельмі дакладна малюе лесуна, ствараючы вобраз з самымі падрабязнымі дэталямі: *Каравая моршчыцца скура, Аброс цёмным мохам, як пень, Трасе галавою панура, Бакі выгравае ўвесь дзень* (“..Прывольная, цёмная пушча”) [6, т. 1, с. 207]; *Чую я –* ***лясун*** *касматы Тут залёг* (“Лясун”) [6, т. 1, с. 215]; *Брыдзець, пахіліўшысь панура,* ***Лясун*** *на раздоллі дарог* (“Старасць”) [6, т. 1, с. 216]; *Гэта сумны, маркотны* ***лясун*** *Пачынае няголасна граць* (“Чуеш гул..”) [6, т. 1, с. 52]; *І жыў* ***Лясун*** *у тым бары.Зрубалі бор. — Лясун загінуў* (“Возера”) [6, т. 1, с. 53].

Аднак паэтычная фантазія аўтара заснавана на пераасэнсаванні фальклорных матываў. Здаўна лічылася, што “месца знаходжання лесуна – ад узлесся да ўзлесся, а ў самай глыбіні лесу, у гушчары знаходзіцца яго дом, дзе жывуць яго жонка і дзеці. Звычайна Лясун не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сядзіць дома, а ходзіць па лесе, адпачывае і начуе ў выпадковых месцах – на верхавінах высокіх дрэў, у дуплах, у густым зарасніку буралому” [8, с. 102].

Лясун – персанаж славянскай міфалогіі, што мае старажытнае дахрысціянскае паходжанне. Карані веры славян у лесуноў і іншых духаў сягаюць у часы язычніцтва, ці паганства. М. Багдановіч скрозь прызму ўласнага паэтычнага натхнення пераасэнсаваў язычніцкія і хрысціянскія матывы і апеў у аднайменным вершы *хрэсьбіны лесуна*: *Бор шумеў, навяваў зводны сон, А ў ім ціха гул раздаваўся, – Гэта ў небе лясун калыхаўся На вяршынах вялізных сасон. .. І ў сіняй нябеснай купелі Душу дзікую ён ахрысціў* (“Хрэсьбіны лесуна”) [6, т. 1, с. 208]. Тут адзначаюцца вынікі шчыльнага перапляцення старажытнай дахрысціянскай беларускай міфалогіі і беларускіх сямейна-абрадавых традыцый, народжаных прыняццем хрысціянства.

У іншых вершах М. Багдановіч звярнуў увагу на некаторых іншых персанажаў усходнеславянскай і, у прыватнасці, беларускай міфалогіі. Сустракаюцца ў мове твораў і *русалкі*, і *вадзянік*.

Вадзянік – персанаж не толькі беларускай міфалогіі. У рускай мове ён называецца *Водяной*, ва ўкраінскай народнай традыцыі завецца *Водяник*. Знешнасць Вадзяніка ўяўлялася нашым продкам па-рознаму. Часта яго ўяўлялі “старым чалавекам вялікага росту з зялёнымі або чорнымі валасамі, з чырвонымі, як вуголлі, вачыма, з барадою з водарасцей; усё цела *Вадзяніка* пакрыта цінай і граззю. Вадзянік мог мець выгляд сівога дзеда ў чырвонай сарочцы, або схуднелага старога з сіняй скурай” [8, с. 28]. Падобныя паданні былі добра вядомы М. Багдановічу. Паэт не проста апавядае ў вершы пра Вадзяніка, а ўвесь твор – лірычны маналог – будуе ад імя гэтага персанажа: *Сівавусы, згорблены, я залег між цінай* (“Вадзянік”) [6, т. 1, с. 55].

Па сваім прадвызначэнні *Вадзянік* жыве ў глыбокіх ямах на дне рэк і дапамагае рыбакам і млынарам. Але калі ён злуецца, то рве рыбацкія сеткі і разбурае запруду каля млына. Па павер’ях, асцярожна трэба купацца ноччу, бо вадзянік можа зацягнуць у сваё царства. Небяспечна і выратоўваць тапельца, бо вадзянік можа раззлавацца.

А ў М. Багдановіча *Вадзянік* паўстаў трошкі іншы: спакойны, мірны і сумны: *І гадамі грэюся – сплю на дне ракі. Твар травой аблутаны, быццам павуцінай, Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі* [6, т. 1, с. 55].

У міфалогіі ўсходніх славян русалка з’яўляецца ўвасабленнем воднай і лясной стыхіі. Спрадвеку лічылася, што “*Русалкамі* становяцца дзяўчынкі, памерлыя да хрышчэння, дзяўчаты-тапельцы, а таксама дзяўчаты, якіх праклялі маці” [8, с. 135]. У народных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўяўленнях русалкі пражывалі як у вадзе, так і ў лесе, а таксама ў полі.

Водныя русалкі могуць патапіць тых, хто купаецца апоўдні і апоўначы, або заходзіць у ваду без крыжа. Прычым тапельцы звычайна становяцца работнікамі вадзяніка, а дзяўчаты – русалкамі. Відаць, пра такіх водных русалак апавядаў М. Багдановіч: *Ў іх* [сецях] ***русалкі*** *заблуталі косы, – Рвуць і блутаюць срэбныя ніці* (“Над возерам”) [6, т. 1, с. 54].

З беларускай міфалогіі ў вершы М. Багдановіча трапіў і змяіны цар: *Зіхацяць маей кароны Залатыя рожкі, Цёмным блескам адлівае Уся луска мая* (“Змяіны цар”) [6, т. 1, с. 56].

Прыняцце хрысціянства на Русі ў 9 ст. выклікала з’яўленне ва ўсходнеславянскіх мовах рэлігійнай лексікі. Хрысціянства прынесла новую мадэль Сусвету. Цяпер славяне з усімі няшчасцямі, бедамі, скаргамі і праклёнамі звярталіся да Бога як да найвышэйшага суддзі, які часцей за ўсё адзіны можа дапамагчы. Натуральна, што хрысціянскія матывы і вобразы таксама адлюстраваліся ў творах М. Багдановіча: *Асвячае мне вобраз* ***Хрыста****... яго крыж.. Ажываеш, здаецца, душою гарыш. Але толькі чаму ж так малы гэты час?! Зноў навокал цемень. Свет зірнуў і пагас. Не глядзіць на мяне ясны вобраз* ***Хрыста*** (“Цемень”) [6, т. 1, с. 214]; *Што ж, пастаў прад* ***абразамі****, запаліўшы, свечку* (“Ян і маці”) [6, т. 1, с. 83]; ***Псалтырь****, покрытую нежесткай, бурой кожей Я взял* (“Кніга”) [6, т. 1, с. 362]; ***Маліся*** *ж, каб з літоўнасці стрымала Тут смерць сваю нязвонкую касу* (“Санет”) [6, т. 1, с. 138].

Свядомасць чалавека адлюстроўвае карціну свету як надзвычай складаную з’яву. На працягу ўсяго існавання свету людзі шукалі прычыны адсутнасці гармоніі чалавечага жыцця. У свядомасці сфарміраваўся інварыянтны міфалагічны канцэпт *лёсу і долі*, у якім славянскі менталітэт вылучыў спецыфічныя рысы, што праявіліся ў мовах славянскага этнасу. Вершы М. Багдановіча далі цікавы матэрыял для назіранняў адлюстравання тэмы лёсу ў славянскіх мовах. Культурна-лінгвістычны партрэт канцэпту *лёс — доля* склалі выразы, дзе *доля* – асноўнае паняцце міфалагічнай карціны свету – служыць персаніфікацыяй поспеху: *Не схавалася дзяўчына ад тэй* ***долі*** *горкай* (“Сумна мне”) [6, т. 1, с. 81]; *Так свабодна, так ярка пражыць – Лепшай* ***долі*** *няма на зямлі* (“С. Е. Полуяну”) [6, т. 1, с. 104]. Беларуская мова атрымала падобныя выразы ў спадчыну ад усходнеславянскай культурнай традыцыі. Ствараючы вобраз долі, народная фантазія абагуліла жыццёвыя назіранні ў формулах, якія ўявілі ідэал жыццёвай з’явы. Для нашых продкаў *доля* здавалася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нябачнай субстанцыяй, што змяняе формы: *Там, злякаўшысь, схавалась, лягла* ***Доля*** *горкая ў чорным цяні..* ***Долю*** *чорную ноч не схавае, Калі выльецца песня жывая!* (“Дождж у полі і холад..”) [6, т. 1, с. 218].

Фрагменты карціны свету, спраектаваныя ў чалавечую свядомасць, выявіліся ў самых розных праявах. Лексіка, узнікшая на аснове міфалагічнага славянскага светапогляду, асэнсаваная М. Багдановічам, склала своеасаблівы мастацка-вобразны статут абагульненняў і назіранняў славян над светам прыроды і светам чалавека. Захаваныя і дайшоўшыя да нас, гэтыя выразы раскрываюць светапоглядныя асновы старажытных славян.

Вершы М. Багдановіча прасякнуты элементамі старажытнай духоўнай культуры ўсходніх славян. Так, лірычны герой паэта шчыра вітаецца з зарой: *Добрай ночы, зара-зараніца!* (“Добрай ночы, зара-зараніца”) [6, т. 1, с. 63]. Паэт услед за ўсходнеславянскімі фальклорнымі творамі ўжывае адметны эпітэт, выражаны прыдаткам і заснаваны на асацыятыўным спалучэнні аднакарэнных лексем. Спалучэнне падобных пар назоўнікаў надзвычай характэрна для беларускай паэтыкі. У гэтых радках спляліся фальклорныя традыцыі і самабытны талент аўтара. Значэнне суфікса (‘асоба жаночага полу’) фармалізавала персаніфікацыю. Паэт захаваў гукапіс радкоў. Шматразовыя паўторы зычных [з], а таксама кальцавая структура верша стварылі перакрыжаванні пачуццёвых асацыяцый, своеасаблівае гукавое святло і незвычайную музычнасць:

Добрай ночы, ***зара-зараніца****!*
Ужо імгла над зямлёю лажыцца,
Чорнай рызай усё пакрывае,
Пылам зор небасхіл абсевае.
Цішыня агартае мне душу!
Вецярок прыдарожнуто грушу
Ледзьве чутна варушэ — калышэ,
Міла бомы сьмяюцца у цішы,
Ціха срэбрам грукае крыніца.
Добрай ночы, ***зара-зараніца****!*

Фальклорныя матывы вяснянак – славянскага гукання вясны пасля зімовага холаду – М. Багдановіч творча выкарыстаў у лірычным аповедзе прыходу вясны: *Прыйдзе вясна! Гукне: «Прачніся, зямля! прабудзіся З цяжкага сна!» Сонца прагляне, зазелянее Траўка ў лугу, Гукне вясна і, як ветрам, развее Гора-нуду!* (“Прыйдзе вясна”) [6, т. 1, с. 197]. Тут ужо не чалавек клікае (“*гукае*”) вясну, а зямля і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вясна пераклікаюцца. Такім чынам, паэтава свядомасць аб'яднала некалькі старажытных славянскіх элементаў: адухаўленне зямлі і кліканне вясны.

У старажытнасці людзі не маглі растлумачыць і абгрунтаваць многія прыродныя з'явы. Адсюль – надзяленне чалавечымі якасцямі прыродных рэалій. Існаванне М. Багдановіча ў духоўнай прасторы старажытнай ўсходнеславянскай культуры паўплывала на ператварэнне ў яго вершах некаторых з'яў прыроды ў жывыя істоты: *За сцяной запевае завея* ("Ноч") [6, т. 1, с. 70]. Адметна, што перш за ўсё гэта адносіцца да зімовых прыкмет: *Разгулялася вясёлая мяцель, Прабудзіўся, ў поле кінуўся* ***Падвей****. Ў галаву яму ударыў снежны хмель, - І не змог ён бурнай радасці сваей* ("Падвей") [6, т. 1, с. 217].

Паводле старажытнай беларускай міфалогіі *Падвей* – гэта "злы дух, які круціцца ў віхры, прыносіць разбурэнні і хваробы" [8, с. 110]. Бацька паэта, А. Я. Багдановіч, у сваім даследаванні "Пережитки древнего миросозерцания у белорусов" занатаваў павер'е аб Падвеі: "*Падвей* – гэтай той дух, які круціцца ў віхры. Ён насылае на людзей асаблівую хваробу, якая таксама называецца Падвеем: наляціць віхор на чалавека і скруціць яму галаву набок, адніме мову, а то і скурчыць руку ці нагу" [8, с. 110]. Праз творчае ўспрыманне М. Багдановіча *Падвей* атрымаўся адметны: *І спеў ліецца ўсё мацней, – Гулянку справіў пан Падвей. Па вулках вее дзікі хмель, Гудзіць сп'янелая мяцель. У бубны дахаў вецер б'е, Грыміць па ім, звініць, пяе* ("Завіруха") [6, т. 1, с. 100].

У паэтычных і празаічных творах М Багдановіча можна знайсці элементы сямейнай абраднасці, да якой традыцыйна адносяць вясельны, радзінна-хрэсьбінны і пахавальны абрады.

Перш за ўсё, неабходна прыгадаць, што ўслед за бацькам Максім Багдановіч праводзіў цікавыя этнаграфічныя даследаванні. Выдзяляюцца ў гэтых адносінах цыкл публіцыстычных артыкулаў "Образы Галиции в художественной литературе". У артыкуле "Равнина" М. Багдановіч прыводзіць апісанне ўкраінскага вяселля, узятага з аповесці І. Франко "Вялікі шум": "А в субботу после полудня зароилося Думячихино подворье от девушек, парней и свашек в праздничном убранстве. Начался свадебный обряд плетеньем венков и печеньем каравая" [6, т. 3, с. 113]. Безумоўна, гэтыя апісанні нагадалі паэту і вясёлыя шумныя вясельныя гулянні беларусаў.

У творчай спадчыне М. Багдановіча адзначаецца і ўзгадванне сямейна-абрадавага свята *радзін*: *Пасля* ***радзін*** *ты ўсё штодня марнееш: Асунулася цела, зблякла твар* ("..Пасля радзін") [6, т. 1, с. 163]. Прыкметай індывідуальнага стылю паэзіі М. Багадновіча пры гэтым з'явіўся сум і смутак, якім паэт насычае нараджэнне дзіця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Больш натуральнымі і дарэчнымі сумныя матывы выглядаюць у звароце да аповеду пра *хаўтуры*: *Чорны крэп, спеў царкоўны, пах ладана, Труп, ляжачы ў труне нерухома* (“***Хаўтуры***”) [6, т. 1, с. 241].

Даследаванне паэзіі М. Багдановіча сведчыць аб выдатным веданні паэтам каляндарна-абрадавых традыцый усходніх славян. Ён заўважае пра *масляніцу* – усходнеславянскае свята развітання з зімой, апошні тыдзень перад Вялікім Пастом. Традыцыйнай ежай на *Масляніцу* станавіліся бліны як сімвал сонца з ікрой як сімвал багацяя і жыцця. І ў такой самай сувязі чытаем аб масляніцы ў вершы-байцы “Икра”: *На **масляница** слышал я от друга: «Не говорите никогда мне про икру»* [6, т. 1, с. 336].

Ва ўжо ўзгаданых публіцыстычных артыкулах “Образы Галиции в художественной литературе” М. Багдановіч звярнуў увагу на вядомае ўсходнеславянскае свята *Меланья*: *На **Меланью** (31 дек.) к скотине в ее хлевы приходил Бог* [6, т. 3, с. 118]. Паводле ўкраінскай каляндарна-абрадавай традыцыі 13 снежня (у адпаведнасці са старым стылем – 31 снежня) адзначался *Меланья (Маланка, Меланка)*.

Даследчыкі заўважаюць, што тэрмін *Маланка, Меланка, Миланка* ў фальклоры абазначае некалькі паняццяў: святочная дата ў календары, абрадавы хлеб, гераіня навагодніх песень, антрапаморфная маска-персанаж, група масак-удзельнікаў абраду, традыцыйны навагодні абрад, архаічны тып калядных абходаў. Свята ўстаноўлена ў гонар знатнай рымлянкі Меланіі (Маланкі), якая з юных гадоў і да смерці (5 ст.) шанавала Хрыста. Адзначался Маланка і ў беларусаў. Традыцыйна *Маланка* ўзгадваецца разам са *Васіля*: *А яшчэ ў **Васіля** павінна быць дзяўчына, яе называлі **Маланка**. **Маланку** мы ўпрыгожвалі, дзелалі карону, фартух з абруса, а таксама адзявалі ружовыя рукавіцы. **Васіль з Маланкай** ішлі ў хату і прасіліся пашчадраваць, каб **Маланка** песні паспявала* [9, с. 176].

Лексічнае багацце мовы вершаў М. Багдановіча ўказвае на глыбокае веданне ім духоўных скарбаў культуры ўсходніх славян. Так, паэт узгадвае аб розных спосабах варажбы і гадання:

– варажба ў калядную ноч: *Ты **ночкаю каляднай варажыла** І ў воду воск напоўправідны ліла* (“Ты ночкаю каляднай варажыла..”) [6, т. 1, с. 220]; *Цёмна неба начное, - **Ноч** даўно **пераважыла** дзень* [6, т. 1, с. 156];

– гаданне паводле кукавання зязюлі: *Ня кувай ты, шэрая зязюля, Сумным гукам у бары; Мо і скажэш, што я жыці буду Але лепш не гавары* (“Ня кувай ты, шэрая зязюля..”) [6, т. 1, с. 82].

Даследаванне паэтычнай і публіцыстычнай спадчыны М. Багдановіча паказвае, што ў сваіх творах пісьменнік творча перапрацоўваў духоўную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спадчыну ўсходніх славян, прапускаў яе праз асобаснае ўспрыняцце. У выніку – і рэлігійны, і міфалагічны матывы арганічна спалучыліся, хутчэй за ўсё яшчэ на падсвядомым узроўні ўвайшлі твораў, як паэтычныя, так празаічныя, што заканамерна адбілася на іх мове.

3.3 Духоўная і матэрыяльная культура беларусаў у творчасці Максіма Танка

Беларускія творцы выкарыстоўвалі і выкарыстоўваць культурныя набыткі народа. Адным з такіх паэтаў быў Максім Танк. Увабраўшы з дзяцінства ў творчую свядомасць народныя традыцыі і абрады, М. Танк уводзіў іх у сваю паэзію.

Ва ўзнёслым лірычным аповедзе аб беларускай восені паэт заўважыў аб традыцыйнасці для восеньскай пары вяселляў: *У беларускую восень Нат і верабей багацее, Лес на грыбы не скупіцца, Пуні хмялеюць ад сена, Мёдам вуллі набракаюць, Сцежкі гараць ад лістоты, Скрыпкі звіняць на* ***вяселлях*** *І маладзіцы дабрэюць — У беларускую восень* [10].

Вясельныя традыцыі беларускага народа перададзены ў многіх вершах М. Танка. Апавядаў паэт пра гаротнасць жыцця беларускай сялянкі ў панскія часы і заўважаў, што сабе на пасаг дзяўчына ткала палотны: *Ткала, ткала я палотны Цэлыя ночы і дні, Ткала ў роднай матулі З лёну свае васмярні.* ***Замуж*** *за Кліма пайшла я. Вечная ў хаце бяда, – Ніва, як палец, вузкая,Ў хлебе цвіла лебяда* [10].

Пра вяселле М. Танк больш дэталёва прыгадаў у вершы аб нешчаслівым каханні “Што ж ты клічаш на вяселле?”: тут і абавязковыя на вяселлі спевы і танцы, і традыцыйны пачастунак гарэлкай, і, канешне, атрыбуты, без якіх немагчыма ўявіць беларускае вяселле – вэлюм (вянок) і каравай: *Што ж ты клічаш на* ***вяселле****? Ці жартуеш, ці не знаеш, Што калі прыйду, дык буду Не спускаць з цябе пагляду, Калі* ***песню*** *хто зацягне, Сцяўшы зубы, прамаўчу я. Калі ў* ***танцы*** *цябе стрэчу, Дык не выпушчу з абдымкаў.* ***Караваем*** *пачастуеш – Ён калом у горле стане. А* ***гарэлкі*** *паднясеш мне – Што ж, знай, вып’ю я за тое, Каб твой* ***вэлюм*** *стаў як ночка* [10].

З традыцыяй каравая на беларускім вяселлі звязана дастатковая колькасць рытуалаў. Пачэсную справу выпечкі вясельнага каравая давяраюць не кожнаму. Этнаграфічныя крыніцы сведчаць: *Пякла каравай хросная мама* (в. Жмураўка, Рэч.); *Каравай пеклі з цёмнай ржаной мукі, абязательна свяцілі вадой.. Пяклі два каравая. Адзін каравай – у маладой, а другі – у маладога* (в. Азершчына, Рэч.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Каравай пякла альбо родная, або хросная маці (г. Ветка); *Каравай пяклі радзіцелі нявесты* (в. Хальч, Ветк.); [3]. Часам каравай выпякалі *каравайніцы*. Гэты жанчыны павінны быць шчаслівымі ў шлюбе і мець дзяцей. Спецыяльныя парады існавалі для вытворчасці каравая: *Рашчыняюць каравай – спяюць, замесяць – спяюць. Така лапата була, на лапату яго кладуць, украшаюць і бублікі розныя дзелаюць і абараначкі ўсе, так, штоб ён ужэ быў красівы й нарадны* (г. Ветка). Каравай звычайна свяцілі: *Каравай гатавалі к свадзьбе ў печцы, свяцілі абязацельна вадзічкай святой, выпякалі з мукі, яечак, смятаны, бывала, што і сахару ні было* (в. Азершчына, Рэч.). У народнай абраднасці захаваліся цікавыя традыцыі, звязаныя з першым адрэзаным кавалкам каравая: *Первый кусок адразалі нявесце і жаніху* (в. Жмураўка, Рэч.).

Далейшы падзел каравая таксама меў адметнасці: *Каравай рэзалі сваты – два-тры мужчыны. Першы рэзаў, другі чарку наліваў, трэці – падаваў* (в. Церуха, Гом.); *Кросны з кроснай дзялілі каравай, а перад етым нада шчэ яго выкупіць. Давалі грошы, хто сколькі можа* (в. Азершчына, Рэч.)*; Паздравяць маладых, тады выносілі каравай, дзялілі яго кум і кума* (в. Азершчына, Рэч.); *Радзіцелі гасцюююцца-гасцюююцца, а патом ужо нагасцюююцца, давай дзяліць каравай. Вынесуць такую бальшую тарэлку, палаценца, кладуць на тарэлку, і вот на сталах пойдуць, сабіраюць каравай, а тады ўжо маладых вызываюць. Дружкі, падругі стаяць ужо з маладымі і вызываюць радню да іх. І радня тая – хто простань, хто што, і дзеньгі кладуць. Каравай у первую очарадзь сабярае хросная яе, сядзіць тамака за сталом, а патом вызываюць тых маладых. "Дару каравай на шчасце. Даю, штоб былі шчаслівыя, штоб дзяцей было багата"* (г. Ветка). Беларускі вясельны каравай асабліва ўпрыгожваўся. Не заставалася без увагі і дно вясельнага каравая: *А падошву всегда оставляют. Асобенна этат каравай давалі дзевачкам, тады замуж павыходзяць* (г. Рэчыца) [3].

Пра памянёныя традыцыі М. Танк добра ведаў, як і пра беларускую каляндарную абраднасць, з якой у вершах паэта назіраецца трывалая сувязь.

У старажытнасці ўсходнія славяне пачыналі новы год вясной, калі абуджаецца і аднаўляецца прырода. Матыў гукання вясны стаў пачаткам знакамітага верша паэта: *Паслухайце, вясна ідзе. Звініць ў маім акне жалеза. З вінтоўкай стражнік ноч і дзень Пільнуе куст пахучы бэзу..*(верш "Паслухайце, вясна ідзе") [10].

М. Танк добра ведаў народную беларускую паэзію і абраднасць беларускага народа. Паэт нават стварыў уласную вяснянку ў вершы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“Вясна-красна на ўвесь свет”, дзе ўспомніў і пра традыцыі беларускага валачобніцтва, і пра купальскія вянкі: *Мінулі завеі, панурыя дні; Гараць на усходзе зарніцаў агні. Вясна-красна на ўвесь свет! Іду валачобнікам я па зямлі, Вітаю вясну, што прыйшла на палі. Вясна-красна на ўвесь свет! Спяшайся, вясна, і маўчанне зімы Вятрамі, дажджамі грымучымі змый. Вясна-красна на ўвесь свет! Будзі жаўрукамі жытнёвую рунь, Палі незгасальную ў небе зару. Вясна-красна на ўвесь свет! Дай буйную завязь цяністым садам, Спакойныя хвалі купальскім вянкам. Вясна-красна на ўвесь свет! А мне памажы скласці гэткі напеў, Каб век ён у сэрцы народа звінеў. Вясна-красна на ўвесь свет!* [10]

Традыцыі радасці прывітання вясны адзначаюцца ў вершах М. Танка для дзяцей: *Як вясна прышла ў гаі, Разбудзіла ручаі І паклікала ізноў Птушак з выраю дамоў..* (верш “Як вясна прыйшла”) [10]; *Ірынцы спадабалася Цудоўная вясна. Як восені даждалася, Пайшла прасіць яна.. Прасіла яна шчыра так, Прасіла ўсю зіму, І мо' вясна аж з выраю Вярнулася таму* (верш “Ірынка”) [10].

У сваёй творчасці М. Танк успамінаў пра традыцыйныя жанры беларускай вуснай народнай творчасці: *У **казках, думах** песняроў Была ты* [Беларусь], *часам, сіраціная* (верш “Беларусь”) [10] і сам стварыў калыханкі: *Пачала кума-варона **Калыханку** напяваць* (верш “Калыханка”) [5], апяваў старажытных народных пацешнікаў-скамарохаў: *Здарожыўшыся, **скамарох** Аднойчы заснуў на аселіцы* (верш “Зарапад”) [10] і паводле лепшых фальклорных узораў ствараў метафарычныя малюнкі зорнага неба: *Ланцуг перагрызла **Мядзведзіца**. І Млечным Шляхам з сяла Праз нашу краіну азёрную, Прытопваючы, пайшла Збіраць медзякі зорныя* (верш “Зарапад”) [10], ухваляў пошукі лепшай долі: *Гнуцца, матуля, не будзем Больш у паноў за сярпом, ясную **долю** здабудзем* (верш “Ткала, ткала я палотны”) [10] і выказваў знакамітую і такую трапяткую традыцыйную для ўсходніх славян пашану хлебу: *І Хлебу нізкі, да зямлі, Аддаў паклон, як брату* (верш “Хлеб”) [10].

Такім чынам, М. Танк у сваёй паэзіі адлюстраваў шматлікія элементы духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. Праз прызму ўласнага творчага светаразумення паэт стварыў асаблівы прыклад асэнсавання народных каранёў і вытокаў, даўшы ўзор захавання родных традыцый нашчадкам.

Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1 Анічэнка, У. В. Беларуска-іншамоўны сінкрэтызм мовы выданняў Францыска Скарыны / У. В. Анічэнка, А. І. Жураўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 35 с.

2 Лабынцаў, Юрый. “Зерцало жития..”. З літаратурнай спадчыны Францыска Скарыны / Юрый Лабынцаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. – 222 с.

3 Скарына, Францыск. Прадмовы і пасляслоўі / Францыск Скарына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 238 с.

4 Жураўскі, А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / А. І. Жураўскі. Т. 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – 372 с.

5 Прыводзіцца фактычны матэрыял картатэкі лінгвістычнай лабараторыі кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» з указаннем лакалізацыі – населеных пунктаў раёнаў Гомельскай (Добр. – Добрушскі, Лельч. – Лельчыцкі, Рэч. – Рэчыцкі, Чач. – Чачэрскі) вобласці з захаваннем фанетычных і граматычных адметнасцей мясцовага вымаўлення.

6 Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / Максім Багдановіч. Т. 1: Вершы, паэмы, пераклад, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 752 с. Т. 3: Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 461 с.

7 Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин – М.: Наука, 1991. – 511 с.

8 Коваль, У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. – Гомель: Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 178 с.

9 Народная духоўная культуры Брагіншчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / склад. В. С. Новак, У. І. Коваль. – Гомель: Белдрук, 207. – 240 с.

10 Танк, Максім. Вершы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://maksimtank.ru/vershy. – Дата доступа: 31.05.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Навуковае выданне

Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна,
Хазанава Кацярына Львоўна,
Воінава Алена Мікалаеўна

Абрадавая лексіка ў гаворках Гомельшчыны: этналінгвістычны аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Падпісана ў друк 24.04.2015. Фармат 60×84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. др. арк. 15,8.
Улік.-выд. арк. 17,3. Тыраж 50 экз. Заказ 240.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/87 ад 18.11.2013.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ